М. А. Лазарук, Т. У. Логінава, Г. А. Сухава

Беларуская літаратура

7

Спампавана з сайта www.aversev.by

М. А. Лазарук, Т. У. Логінава, Г. А. Сухава

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА

Вучэбны дапаможнік для 7 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання

Дапушчана
Міністэрствам адукацыі
Рэспублікі Беларусь

МІНСК
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ
2017

Спампавана з сайта www.aversev.by

УДК 821.161.3.09(075.3=161.3=161.1)
ББК 83.3(4Беи)я721
Л17

Р э ц э н з е н т ы:

кафедра гісторыі журналістыкі і менеджменту сродкаў масавай інфармацыі Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (кандыдат філалагічных навук, дацэнт *І. Д. Воюш*);

настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 97 г. Мінска» *А. І. Савасцянік*;

кафедра літаратуры ўстановы адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава» (дацэнт кафедры кандыдат філалагічных навук *В. І. Русілка*);

настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Мінскі раённы ліцэй» *Н. А. Гедрэвіч*

На вокладцы рэпрадукцыя карціны С. Ю. Жукоўскага «Старая сядзіба. Май».

Умоўныя абазначэнні:

— абмяркоўваем разам;

— дадатковая інфармацыя;

— прыкладныя тэмы для даследчых праектаў;

— спасылкі на электронны адукацыйны рэсурс «Беларуская літаратура. 7 клас», размешчаны на Нацыянальным адукацыйным партале http://e-vedy.adu.by;

— партрэт і кароткія звесткі пра аўтара (http://e-vedy.adu.by);

— кароткі аналіз мастацкага твора (http://e-vedy.adu.by);

— спасылкі на заданні (QR-коды) для праверкі ведаў пры дапамозе смартфона ці планшэта.

ISBN 978-985-559-950-1

© Лазарук М. А., Логінава Т. У., Сухава Г. А., 2017
© Афармленне. НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2017

Спампавана з сайта www.aversev.by

Дарагія сямікласнікі!

Пачынаецца новы навучальны год, і вы ўзыходзіце яшчэ на адну прыступку ў вывучэнні літаратуры, а разам з гэтым і ў пазнанні жыцця. Чытанне мастацкіх твораў нібы цікавае падарожжа, поўнае нечаканых сустрэч з незнаёмымі (а часам і знаёмымі) краявідамі, а галоўнае — з вельмі рознымі па характары і паводзінах людзьмі.

Але вывучэнне літаратуры — не проста захапляльнае чытанне, задавальненне цікаўнасці. Гэта яшчэ і перажыванні, і напружаная праца думкі, якая дапамагае ўзбагаціць уяўленні пра жыццё, глыбей пазнаць тое, што адбываецца навокал, лепш зразумець людзей. Гэта адначасова і неабходнасць пранікнуць у таямніцы мастацкай творчасці, у сакрэты пісьменніцкага майстэрства, без чаго наша ўяўленне пра літаратуру будзе няпоўным, неглыбокім, павярхоўным.

У папярэдніх класах вы мелі магчымасць пераканацца ў тым, якія разнастайныя па змесце і форме, па тэмах і героях творы фальклору і літаратуры. У сёмым класе ваша ўвага будзе скіравана на высвятленне галоўных асаблівасцей літаратуры як мастацтва. Вы наведаеце некалькі краін гэтага чароўнага свету літаратуры. Адна з якіх — Паэзія, другая — Проза, трэцяя... Але не будзем спяшацца называць усё адразу...

Спампавана з сайта www.aversev.by

Каб падарожжа было цікавае, а ваша праца паспяховая, прапануем прытрымлівацца наступнага парадку пры вывучэнні твораў мастацкай літаратуры: спачатку ўдумліва прачытайце твор, потым асэнсуйце свае першапачатковыя ўражанні, паспрабуйце прааналізаваць тэкст і зрабіць высновы пра аўтарскую задуму, мастацкія спосабы яе ўвасаблення.

А як адпраўляцца ў дарогу без компаса? Таму прапануем яго ў форме навігацыйнага апарату (гл. http://e-vedy.adu.by), які дазволіць лёгка арыентавацца ў змесце вучэбнага дапаможніка і разам з тым пашырыць яго межы. Увесь размешчаны на партале электронны адукацыйны рэсурс «Беларуская літаратура. 7 клас» адпавядае структуры гэтага вучэбнага дапаможніка. Спасылкі на тэсты, трэнажоры, відэа, аўдыя і іншае неабходна шукаць у такім жа раздзеле. Шчаслівай дарогі!

Спампавана з сайта www.aversev.by

Чарадзейная сіла мастацтва

Калі гаварыць пра мастацкую літаратуру, перш за ўсё трэба вызначыць яе месца сярод іншых відаў мастацтва. Чым яна падобная да іх і чым адрозніваецца, якія мае асаблівасці?

Мастацтва — адлюстраванне рэчаіснасці ў мастацкіх вобразах.

На ўроках сусветнай і айчыннай мастацкай культуры вы даведаліся, што ўсе віды мастацтва паказваюць жыццё праз вобразы, у якіх выяўляюцца адносіны чалавека да сябе і розных з'яў жыцця. І сродкі, якімі карыстаюцца віды мастацтва, адрозныя. У адным выпадку гэта гук, мелодыя (музыка), у другім — фарбы, лініі (малюнак, жывапіс), у трэцім — рытмічныя або пластычныя рухі цела (танец) і г. д.

Мастацкі вобраз — спосаб адлюстравання рэчаіснасці па законах мастацкай творчасці (абагульненне, мастацкая выдумка, мастацкія сродкі і інш.).

Месца літаратуры сярод іншых відаў мастацтва. Літаратура займае асаблівае месца сярод розных відаў мастацтва. З многімі яна цесна звязана зместам, сюжэтамі, вобразамі, героямі. Творы літаратуры ці асобныя яе вобразы нярэдка становяцца асновай для музычных твораў, напрыклад песень; для твораў выяўленчага мастацтва — карцін жывапісу. А тэатр і кіно без літаратуры ўвогуле не могуць існаваць: для іх абавязкова пішуцца п'есы, кінасцэнарыі.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Літаратура — мастацтва слова. У літаратуры сродкам стварэння мастацкіх вобразаў служыць слова, наша мова. З дапамогай слова пісьменнік малюе карціны жыцця, расказвае пра падзеі і робіць гэта так, нібыта яны адбываюцца на нашых вачах, перадае думкі, настроі, пачуцці людзей, быццам бы гэтыя думкі і пачуцці нашы ўласныя.

З дапамогай літаратуры можна, застаючыся дома, не толькі пабываць у далёкіх краінах, але і перанесціся ў іншыя часы, гістарычныя эпохі, сустрэцца з людзьмі, якія жылі многа стагоддзяў назад, пазнаёміцца з імі, паслухаць іх. Побач з героямі літаратурных твораў можна пражыць не адно жыццё, а шмат. І ўсё гэта таму, што літаратура, як і іншыя віды мастацтва, валодае асаблівымі ўласцівасцямі. Нібы казачны чарадзей, яна можа стварыць уражанне сапраўднага жыцця, прымусіць нас паверыць у тое, пра што расказваецца ў творы, хоць на самай справе гэтага, магчыма, і не было зусім.

Роля фантазіі ў літаратуры і мастацтве. Аўтары мастацкіх твораў пішуць не толькі пра тое, што самі бачылі ў жыцці. Яны часта фантазіруюць, выдумляюць і сваіх герояў, і тое, што з імі адбывалася. Але мы верым ва ўсё гэта, бо расказваецца так цікава і захапляльна, так шчыра і пераканаўча, з такімі падрабязнасцямі, што не паверыць нельга.

Асоба мастака і роля таленту ў мастацтве. Для таго каб глыбей зразумець, што такое мастацтва, у тым ліку і літаратура, трэба больш уважліва прыгледзецца да яго стваральнікаў — пісьменнікаў, музыкаў, жывапісцаў, скульптараў. Мастак — гэта не проста чалавек, які выдатна авалодаў сваім рамяством. У мастацтве выключную ролю адыгрывае ***талент*** — асабісты дар, вялікія здольнасці ствараць шэдэўры на высокім узроўні, лепш, чым іншыя. ***Мастак*** — чалавек, які ўмее ствараць мастацкі твор (кнігу, карціну, музыку), мае павышаную ўражлівасць, адчувальнасць да ўспрымання жыцця, здольнасць узнаўляць яго ў памяці, яшчэ і яшчэ раз перажываць бачанае ці пачутае,

Спампавана з сайта www.aversev.by

а галоўнае — перадаваць свае пачуцці, думкі іншым людзям у жывых вобразах, трапных і запамінальных выказваннях, гарманічных мелодыях, шматфарбных карцінах.

У творы мастак выяўляе не толькі асабістыя адносіны да розных з'яў жыцця. Ён выступае як выразнік дум і настрояў многіх людзей, свайго народа.

Мастак — чалавек асабліва чулы і спагадлівы да чужога нешчасця, гора. Вось чаму ў беларускім фальклоры шмат казак пра такіх герояў і амаль у кожнага беларускага пісьменніка знойдзем вершы, паэмы, апавяданні пра вялікую сілу мастацтва.

1. Чаму літаратура сярод усіх відаў мастацтва займае асаблівае месца? Прывядзіце прыклады, калі творы беларускай літаратуры сталі асновай для твораў іншых відаў мастацтва.
2. Раскрыйце сэнс выказвання *«Літаратура — мастацтва слова»*. Пачніце з таго, што слова надзелена вялікай сілай уздзеяння на чалавека.
3. Якую ролю ў літаратуры і ўвогуле ў мастацтве адыгрывае фантазія?
4. Што такое талент? Чаму народ з такой пашанай ставіцца да таленавітых людзей, стваральнікаў мастацтва (ушаноўвае іх, узводзіць ім помнікі)?
5. Суаднясіце паняцці з відамі мастацтва.
6. Са спіса, рэкамендаванага настаўнікам для чытання летам, адбярыце 5 лепшых, на ваш погляд, твораў беларускай мастацкай літаратуры, якія можна параіць прачытаць кожнаму сямікласніку. Выкажыце ўласныя меркаванні наконт твора, спасылаючыся:
   - на інтарэс да праблемы, якая ўзнімаецца ў творы;
   - інтрыгу (загадку) у творы, якая прымушае дачытаць яго да канца;
   - задавальненне сваёй цікаўнасці (Чым для мяне карысны гэты твор? Ці дае ён адказы на пытанні, якія хвалююць мяне і маіх аднакласнікаў?).

   Абраныя вамі творы будуць абмеркаваны на ўроках дадатковага чытання.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Якуб Колас

У ЯГО БЫЎ СВЕТ ЦІКАВЫ…

(Урывак з паэмы «Сымон-музыка»)

З чаго складаецца Сымонкаў *«свет цікавы»*?[1]

У яго быў свет цікавы,
Свае вобразы, жыццё,
І ў душы яго ўсе з'явы
Сваё мелі адбіццё…
Так, і праўда: не падобны
Быў Сымонка на другіх:
Гэта быў хлапчук асобны.
У яго вачах жывых
Думка нейкая бліскала,
Утаропіцца, глядзіць,
І на губках смех, бывала,
Заблукае, задрыжыць…
Бедны хлопчык быў загнаны,
У бацькоў нялюбы сын,
Бо відочныя заганы
І меў толькі ён адзін.
Не такі, як усе дзеці,
Нейкі вырадак, дзіўны,

Патлумачце выдзеленыя паэтычныя радкі.

Нёс віну за ўсё на свеце,
Вінаваты без віны.

З ім і дзеці не дружылі,
Не прымалі да гульні,
І ў самоце[2] прахадзілі
Веснавыя яго дні.

Назавіце прычыну адзіноты хлопчыка і раскажыце, чым ён запаўняў яе.

І любіў ён адзіноту,
Бо так лепей было жыць:

---

[1] На прапанаваныя збоку ад тэксту пытанні пажадана адказваць пры паўторным чытанні твора.

[2] *Само́та* — адзінота, туга, смутак.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Тут ён мог сабе ў ахвоту
Песні пець і гаманіць.
Вось улетку дык раздольна:
Выйдзе з хаты ў поле, луг;
Цёпла ўсюды і прывольна,
Сонца многа, чысты дух[1].
На каменьчык сядзе ў збожжы,
Не схіснецца і маўчыць,
Ловіць сэрцам спеў прыгожы,
Як жытцо загаманіць,
Як зазвоняць, заіграюць
Мушкі, конікі, жучкі
І галоўкай заківаюць,
Засмяюцца васількі.
Спеў у сэрцы адклікаўся,
І так добранька было,
Што Сымонка сам смяяўся,
Ўсё смяялася, цвіло.
Заміраў тады хлапчынка,
І здавалася яму,
Што ён знае, як травінка
Сваю думае думу,
Што гаворыць жытні колас,
І аб чым шуміць ячмень,
І чаго спявае ўголас
Мушка, конік, авадзень,
Што ўгары над срэбрам жыта
Пяе жаваранак той
Так прыгожа-самавіта,
І зачым у высь блакіту
Ідзе ветрык пехатой,
У высь тую, дзе хмурынкі
Над зямлёй плятуць вянкі...

Чаму менавіта на ўлонні прыроды хлопчык адчувае сябе прывольна?

Разгледзьце ілюстрацыю мастака Мікалая Селешчука да паэмы Якуба Коласа «Сымон-музыка». Якімі радкамі з тэксту можна яе падпісаць?

[1] *Дух* — тут: паветра.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Ці ж не мілыя часінкі?
Ці ж не слаўныя дзянькі?
Замляваў увесь Сымонка,
Як увосень жураўлі
Крык музычны роняць звонка
Над прасторамі зямлі.
Шнур жывы, загнуты крукам,
Ледзь чарнеецца ўгары,
І ўсё стада з смелым гукам
Журавель вядзе стары;
Плыўка, згодна ходзяць крылы,
Як адно, у тахт адзін —
Пакідаюць край свой мілы,
Родны кут глухіх лядзін.
Шнур знікае, тоне ў багне
Мора сіняга нябёс,
У прастор і хлопчык прагне:
Там другі, напэўна, лёс.
І ён доўга, нерухомы,
Там стаіць і ўсё глядзіць
У край светлы, невядомы,
Дзе знікала тая ніць
Вольных птушак на ўсю зіму...
Ну, прашчайце да вясны!..
Поле, неба прад вачыма,
І ўжо крыкі не чутны.
Так і жыў ён, гадаваўся,
Бы пры сцежцы той гарох:
Сам з сабою забаўляўся,
Бегаў, бавіўся ў палёх,
І размовы вёў з жытамі,
І складаў ён песні дню,
З матылькамі, бы з братамі,
Час дзяліў свой і гульню.

Пра які лёс, на вашу думку, марыць герой?

Патлумачце выдзеленыя паэтычныя радкі.

Спампавана з сайта www.aversev.by

1. Якім вы ўяўляеце Сымонку? Намалюйце яго слоўны партрэт.
2. Як успрымае хлопчык навакольны свет, розныя з'явы прыроды? Якім паэтычным прыёмам (эпітэтам, метафарай, адухаўленнем, параўнаннем) карыстаецца аўтар, паказваючы прыроду ва ўспрыманні Сымонкі? Прывядзіце прыклады з твора.
3. З дапамогай эпітэтаў і метафар, выкарыстаных аўтарам, паспрабуйце апісаць стан Сымонкі, калі ён у летні дзень *«на каменьчык сядзе ў збожжы, не схіснецца і маўчыць»* або назірае за адлётам журавоў.
4. Як бы вы назвалі незвычайную ўспрымальнасць хлопчыка, яго тонкае адчуванне хараства навакольнага свету, яго фарбаў і гукаў? Прыгадайце надзеленых такімі ж здольнасцямі, як у Сымонкі, літаратурных герояў з твораў рускай літаратуры.
5. Праслухайце ўрывак з сімфанічнай паэмы «Сымон-музыка» Людмілы Шлег або ўрывак з музычнай паэмы «Сымон-музыка» (для аркестра беларускіх народных інструментаў) Валерыя Іванова. Ці сугучны музычны твор тым пачуццям, якія ўзніклі пры чытанні ўрыўка «У яго быў свет цікавы...»?
6. Праверце свае веды па творы (тэст па творы Якуба Коласа «У яго быў свет цікавы...»).
7. Разгледзьце фрагмент помніка Заіра Азгура. Ці адпавядае ваша ўяўленне пра Сымонку яго скульптурнаму ўвасабленню?
8. Як талент можа дапамагчы ў час вучобы ў школе і пры выбары будучай прафесіі?

З. Азгур. Помнік Якубу Коласу і яго літаратурным героям у Мінску (фрагмент)

Спампавана з сайта www.aversev.by

Гусляр — старажытнарускае слова. Людзі, што прысвяцілі жыццё складанню вершаў і выкананню іх пад музыку, былі вядомыя ў розных народаў свету яшчэ са старажытнасці. Паводле міфаў Старажытнай Грэцыі, першым музыкам быў Арфей — сын бога Сонца, і таму яго імя перакладаецца як «той, хто вылечвае святлом». Гэты вобраз з'яўляецца сімвалам мастацтва. З тых часоў паслядоўнікі Арфея вандравалі па краінах і пад гукі музычных інструментаў выконвалі ўласныя ці фальклорныя творы.

Янка Купала

КУРГАН

I

Паміж пустак, балот беларускай зямлі,
На ўзбярэжжы ракі шумнацечнай
Дрэмле памятка дзён, што ў нябыт уцяклі[1],
Ўдзірванелы[2] курган векавечны.

Дуб галлё распусціў каранасты над ім,
Сухазелле у грудзі ўпілося;
Вецер стогне над ім уздыханнем глухім —
Аб мінуўшчыне ў жальбах галосе.

Якія радкі з твора рыхтуюць чытача да ўспрымання трагічных падзей?

На Купалле там птушка садзіцца, пяе,
У Піліпаўку[3] воўк нема вые;
Сонца днём распускае там косы свае,
Ночкай зоры глядзяць залатыя.

Хмары неба ўсцілалі мо тысячу раз,
Перуны білі з краю да краю, —
Ён стаіць — гэта памяць людская, паказ...
Толькі гутарка ходзіць такая.

---

[1] *У нябы́т уцяклі́* — г. зн. мінулі, адышлі ў мінулае.
[2] *Удзірване́лы* — пакрыты дзірваном, густа зарослы травой.
[3] *Пілі́паўка* — час зімой, калі пачынаюцца моцныя маразы.

Спампавана з сайта www.aversev.by

II

На гары на крутой, на абвітай ракой,
Лет назад таму сотня ці болей,
Белы хорам стаяў, недаступнай сцяной
Грозна, думна глядзеў на прыволле.

У нагах у яго рассцілаўся абшар[1]
Хвоек гонкіх і пахані чорнай,
Сонных вёсак шары[2], хат амшалых[3], як мар,
Хат з сям'ёй душ падданых, пакорных.

Князь у хораме жыў, слаўны свету ўсяму,
Недаступны і грозны, як хорам;
Хто хацеў, не хацеў — біў паклоны яму,
Спуску, ласкі не знаў непакорам.

Патлумачце значэнне слова *слаўны* ў паэтычных радках.

Зневажаў, катаваў ён з дружынай сваей;
Стражы князевы — ў полі і дома,
Толькі модлы[4] раслі небу ў сэрцах людзей,
І пракляцце расло пакрыёма[5].

III

Раз бяседа[6] вялікая ў князя была:
На пасад дачку княжну садзілі[7];
За сталом він заморскіх крыніца цякла,
Бегла музыка ўкруг на паўмілі.

На вяселле-разгул наплыло, як на сход,
Госці знатных зусюль, за паўсвету,

---

[1] *Абша́р* — прастор.
[2] *Со́нных вёсак шары́* — нерухомыя абрысы, цені нібы паснуўшых вёсак.
[3] *Амша́лы* — пакрыты мохам.
[4] *Мо́длы* — малітвы.
[5] *Пакрыёма* — употай.
[6] *Бясе́да* — застолле.
[7] *Садзі́ць на пасáд* — выдаваць замуж.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Гэткай гучнай бяседы не помніў народ,
Гэткіх скарбаў, брыльянтаў, саетаў[1]!..

Дзень, другі ўжо грымела у князя гульня,
І музыкі, і чаркі звінелі;
Выдумлялі забаў новых кожнага дня;
Што хацелі — ўсяго госці мелі.

Ажно трэцяга дня князь прыдумаў адну
Для дружыны пацеху-забаву:
Загадаў ён пазваць гусляра-старыну,
Гусляра з яго ведамай славай.

IV

Акалічны народ гуслі знаў гусляра;
Песня-дума за сэрца хапала;
Вакол гэтай думы дудара-званара
Казак дзіўных злажылась нямала.

Кажуць, толькі як выйдзе і ўдарыць як ён
Па струнах з неадступнаю песняй, —
Сон злятае з павек, болю цішыцца стогн,
Не шумяць ясакары[2], чарэсні;

Пушча-лес не шуміць, белка, лось не бяжыць,
Салавей-птушка ў той час сціхае;
Паміж вольхаў рака, як штодзень, не бурліць,
Паплаўкі рыба-плотка хавае.

Прытаіцца да моху русалка, лясун,
Каня[3] вечнага «піць» не заводзіць;
Пад звон-песню жывучых гусляравых струн
Для ўсіх папараць-кветка ўзыходзіць.

! Самыя таямнічыя і паэтычныя паданні звязаны з загадкавай раслінай папараццю, якая нібыта зацвітае на Купалле. Кажуць, той, хто адшукаў кветку папараці, будзе шчаслівы.

---

[1] *Саéты* — багатае адзенне з атласу і шоўку.
[2] *Ясакáр* — таполя.
[3] *Кáня* — балотная чайка.

Спампавана з сайта www.aversev.by

V

Прывяла гусляра з яго ніўных сяліб
Дворня князева ў хорам багаты;
Пасадзіла на ганку, між клёнаў і ліп,
На цагляным парозе магната[1].

Невыдумная світка[2] — убор на плячах,
Барада, як снег белы — такая,
Незвычайны агонь у задумных вачах,
На каленях ляглі гуслі-баі.

Водзіць пальцам худым па сталёвых струнах,
К песні-музыцы ладзіцца, строе;
Водклік б'ецца ад струн па сцюдзёных сцянах,
Заміраючы ў сховах пакояў.

Вось настроіў, навёў тон у струнах як след,
Не зірнуўшы на гулі ні разу,
І сядзіць гэты сумны, як лунь[3], белы дзед
І чакае ад князя прыказу.

VI

— Што ж маўчыш ты, гусляр, ніў, лясоў песнябай,
Славай хат маіх подданых слаўны?!
Нам сягоння зайграй, нам сваіх песень дай, —
Князь умее плаціць незвычайна!

Запяеш па душы, дасі ўцехі гасцям —
Поўны гуслі насыплю дукатаў[4];
Не пад мысль песня будзе каму-небудзь нам —
Канапляную возьмеш заплату[5];

---

[1] *Магна́т* — памешчык, буйны землеўладальнік.
[2] *Сві́тка* — вопратка, пашытая з даматканага сукна.
[3] *Лунь* — ястраб-мышалоў, у якога светлае апярэнне.
[4] *Дука́т* — старажытная манета.
[5] *Канапля́ную во́зьмеш запла́ту* — будзеш павешаны на вяроўцы, звітай з канапель.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Знаеш славу маю, знаеш сілу маю...
— Многа знаю і чуў аб табе я, —
І я сам, як і ты, так табе запяю...
— Ну, пара пачынаць, дабрадзею!

Гэтак слухае, выслухаў князя гусляр,
Заіскрыліся вочы сівыя,
Патануў у скляпеннях адзін, другі ўдар,
І заплакалі струны жывыя.

VII

«Гэй ты, князь! Гэй, праслаўны на цэлы бел-свет!
Не такую задумаў ты думу, —
Не дае гуслярам сказу золата цвет,
Белых хорамаў п'яныя шумы.

Скурганіў[1] бы душу чырванцом тваім я;
Гуслям, княжа, не пішуць законаў:
Небу справу здае сэрца, думка мая,
Сонцу, зорам, арлам толькі роўна.

Бачыш, княжа, загоны, лясы, сенажаць, —
Ім пакорны я толькі з гуслямі,
Сілен, княжа, караць, галаву сілен зняць, —
Не скуеш толькі дум ланцугамі.

Славен, грозен і ты, і твой хорам-астрог,
Б'е ад сцен цэгел лёдам зімовым;
Сэрца маеш, як гэты цагляны парог,
І душу — як скляпоў гэтых сховы.

VIII

Глянь ты, слаўны ўладар, на палеткі свае:
Сарачні там сох[2] бачыш, як блудзе;
А ці чуў ты, аб чым там араты пяе,
Дзе і як жывуць гэтыя людзі?

---

[1] *Скурганіць* — загубіць, умярцвіць.
[2] *Сарачні сох* — сорак саракоў — вельмі многа.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Глянь у лёхі[1] свае, ў падзямеллі глянь, князь,
Што настроіў пад хорамам гэтым:
Брацці корчацца там, табой кінуты ў гразь,
Чэрві точаць жывых іх, раздзетых.

Ты ўсё золатам хочаш прыцьміць, загаціць[2]...
Ці ж прыгледзеўся, хорамны княжа?
Кроў на золаце гэтым людская блішчыць,
Кроў, якой і твая моц не змажа.

Ты брыльянтамі ўсыпаў атласы і шоўк —
Гэта цёртая сталь ад кайданаў[3],
Гэта вісельні петляў развіты шнурок,
Гэта, княжа, твае саматканы.

IX

Стол ты ўставіў ядой, касцей шмат пад сталом —
Гэта косці бядноты рабочай;
Пацяшаешся белым, чырвоным віном —
Гэта слёзы нядолі сірочай.

Хорам выстраіў ты, твайму воку так міл,
Адшліфованы цэгла і камень, —
Гэта — памяткі-пліты з няўчасных магіл,
Гэта — сэрцаў скамененых пламень.

Люба чуці табе скочнай музыкі звон:
Ты, дружына п'яце асалоду, —
А ці ўслухаўся ты, як плыве з яе стогн,
Стогн праклящця табе, твайму роду?!

---

[1] *Лёхі* — скляпы, падземныя памяшканні, сховішчы.

[2] *Загаці́ць* — тут: затраціць на што-небудзь невымерна вялікія сродкі.

[3] *Кайданы́* — злучаныя ланцугом жалезныя кольцы, якія надзяваюцца на рукі і ногі тых, хто абвінавачваецца ў цяжкіх злачынствах.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Ты збялеў, ты дрыжыш, слаўны княжа-ўладар!
Госці хмурны, а дворня знямела...
Ну, што, княжа? Пара даць за песню мне дар!
Выбачай, калі спеў мо няўмела».

X

Які сродак мастацкай выразнасці выкарыстаны аўтарам для стварэння вобраза гнеўнага, помслівага князя?

Князь стаіць, князь маўчыць, жуда, помста б'е з воч;
Гулі зглухлі, ні жартаў, ні смехаў...
Думаў князь, выдумляў, грымнуў шабляй наўзбоч,
Толькі з лёскатам выбегла рэха.

— Гэй ты, сонцу раўня, не на тое пазваў
На вяселле цябе сваёй княжны!..
Ты — шалёны старык! Хто цябе дзе хаваў?
Ты, знаць, вырадак цемры сярмяжнай[1].

Ты адважыўся мне на сляпы перакор
Вызваняці сусветныя трэлі;
Платы маю шмат я для такіх непакор,
Хто сябе проці мне стаць асмеліў.

Я па-князеўску ўсім і плачу, і люблю!
Ты не хочаш дукатаў — не трэба!..
Узяці старца і гуслі жыўцом у зямлю!
Знае хай, хто тут пан: я — ці неба!

XI

Падхапілі, ўзялі гусляра-старыка,
Гуслі разам яго самагуды;
Па-над бераг круты, дзе шумела рака,
Павялі, паняслі на загубу.

Месца выбралі здатнае, вырылі дол,
Дол тры сажні[2] шырокі, глыбокі;

---

[1] *Це́мра сярмя́жная* — зняважлівая клічка бедных, цёмных, непісьменных сялян, якія насілі даматканыя сярмягі.

[2] *Са́жань* — старажытная мера даўжыні, роўная прыблізна 2 м 13 см.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Закапалі, убілі асінавы кол,
Далі насып тры сажні высокі.

Не часалі дамоўкі[1] яму сталяры,
Не заплакалі бліжнія вочы;
Змоўклі гуслі і ён з той пары — да пары;
Сум і сціша залеглі, як ночай.

Толькі князеўскі хорам гудзеў, не маўчаў:
Шалы, музыка ў тахт рагаталі;
Не адну віна бочку князь кончыў, пачаў:
Шлюб-вяселле ўсё княжны гулялі.

XII

Пацяклі, паплылі за гадамі гады...
На гусляравым наспе жвіровым
Палыны узышлі, вырас дуб малады,
Зашумеў непанятлівым словам.

Лет за сотню звёў час, ці і болей мо лет,
Зацвілі пераказы ў народзе;
Кажуць людзі: ў год раз ночкай з гуслямі дзед
З кургана, як снег, белы выходзе.

Гуслі строіць свае, струны звонка звіняць,
Жменяй водзіць па іх абамлелай,
І ўсё нешта пяе, што жывым не паняць,
І на месяц глядзіць, як сам, белы.

Чаму, паводле твора, гусляр раз у год выходзіць з кургана? Для чаго ён спявае сваю песню? Падумайце: хто здольны зразумець гусляра?

Кажуць, каб хто калі зразумеў голас той,
Не зазнаў бы ніколі ўжо гора...
Можна тут веры даць, толькі слухаць душой...
Курганы шмат чаго нам гавораць.

1910

[1] *Дамо́ўка* — труна.

Спампавана з сайта www.aversev.by

1. Падзяліцеся агульнымі ўражаннямі ад паэмы Янкі Купалы «Курган».
2. Чаму, на вашу думку, аўтар пачынае твор пра падзеі сівой мінуўшчыны паэтычнай легендай пра старажытны курган?
3. Як паказана сіла гусляровай музыкі? Прывядзіце прыклады з тэксту.
4. Знайдзіце радкі, у якіх гучыць адказ гусляра на абяцанне ўзнагароды: *«Поўны гуслі насыплю дукатаў»*. Патлумачце іх.
5. Як паказваецца жыццё сялян і князя праз апісанне старой вёскі і хорама? Якія выяўленчыя сродкі выкарыстаў аўтар?
6. Як характарызуецца ў паэме гусляр? Якімі рысамі надзяляе яго паэт? Прывядзіце адпаведныя цытаты з твора.
7. Разгледзьце ілюстрацыю Міколы Басалыгі да паэмы «Курган». Якой частцы сюжэта адпавядае змест мастацкага палатна?
8. Якім бачыць мастак Васіль Шаранговіч галоўнага героя паэмы «Курган»? Параўнайце вобразнае адлюстраванне гусляра з папярэднім. Паразважайце, з дапамогай якіх дэталей мастакі перадаюць свае адносіны да гусляра.
9. Параўнайце вобразы гусляра і князя ў паэме. Пачніце з апісання знешняга выгляду герояў, звярніце ўвагу на сацыяльнае становішча, ацаніце характары і паводзіны, погляды на жыццё, вызначце аўтарскія адносіны да герояў.
10. Дайце ацэнку ўчынку гусляра і паводзінам князя (трэнажор «Гусляр і князь»).
11. Многія радкі з паэмы «Курган» сталі афарызмамі[1]. Адшукайце іх і прыгадайце жыццёвую сітуацыю, у якой іх можна было б выкарыстаць.

М. Басалыга. Ілюстрацыя да паэмы «Курган»

В. Шаранговіч. Ілюстрацыя да паэмы «Курган»

[1] Гл. «Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў» на с. 231—235, далей — «Слоўнік».

Спампавана з сайта www.aversev.by

12. Размясціце ілюстрацыі Арлена Кашкурэвіча да паэмы Янкі Купалы «Курган» у адпаведнасці з развіццём сюжэта (трэнажор «Сюжэт паэмы Янкі Купалы “Курган”»).

13. Знайдзіце ў тэксце і зачытайце вершаваныя радкі, у якіх выказана мастацкая ідэя твора.

14. Гусляр жыццём заплаціў за сваю песню. Выкажыце свае адносіны да герояў, якія ахвяруюць сабой у імя справядлівасці.

15. Адкажыце на пытанні віктарыны па паэме Янкі Купалы «Курган».

16. Праслухайце кантату Ігара Лучанка «Курган». Чаму паэма так часта прыцягвала ўвагу беларускіх кампазітараў?

17. Уявіце, што ў вас з’явілася магчымасць задаць пытанні героям паэмы. Што б вы ў іх спыталі?

18. Наведайце Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы ў Мінску ці яго філіялы (Вязынка, Акопы, Ляўкі) або наладзьце завочную экскурсію, што дазволіць вам паглыбіць веды пра асобу пісьменніка.

19. Апошнімі радкамі паэмы Янка Купала сцвярджае, што *«курганы шмат чаго нам гаворацъ»*. Падрыхтуйце разгорнуты адказ на пытанне «Пра што можа расказаць адзін з сімвалаў Беларусі — Курган Славы?».

20. Вывучыце адзін раздзел з паэмы (на выбар) на памяць.

ПРА ПАЭМУ

Паэма — вялікі вершаваны твор, у якім услаўляюцца велічныя або незвычайныя падзеі, што моцна ўсхвалявалі аўтара, расказваецца пра гераічныя ўчынкі і подзвігі выдатных людзей, паэтызуюцца моцныя, выключныя характары. У паэме звычайна гаворыцца пра нешта значнае, узнёслае: барацьбу з ворагамі, гераічныя ўчынкі і подзвігі, пра высокія імкненні людзей.

Паэма як жанр бярэ свой пачатак з народных песень гераічнага зместу.

Вылучаюцца паэмы *гераічныя, гістарычныя, драматычныя, лірычныя, ліра-эпічныя, рамантычныя* і інш.

Спампавана з сайта www.aversev.by

У рамантычных паэмах дзейнічаюць высакародныя і моцныя духам, смелыя і бясстрашныя, гордыя і непадкупныя героі. Яны не мірацца з несправядлівасцю і ахвяруюць сабой дзеля людзей. А жыццё падаецца не такім, якое яно ёсць у рэальнасці, а такім, якім яно, на думку аўтара, павінна быць.

Паэма Янкі Купалы «Курган» — рамантычная па сваім змесце. Яна мае трагічную развязку сюжэта — смерць гусляра і разам з тым яго фантастычнае ператварэнне *(«ў год раз ночкай з гуслямі дзед / З кургана, як снег, белы выходзе»)*, як грознае напамінанне пра далёкія і страшныя падзеі.

Паэма — вялікі вершаваны твор, у якім расказваецца пра важныя падзеі і яркія характары, выяўляюцца глыбокія перажыванні аўтара і яго герояў.

Чаму вершаваны твор «Курган» Янка Купала назваў паэмай?

ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДА РАЗДЗЕЛА

1. Што яднае ўсе віды мастацтва і чым яны адрозніваюцца? Прывядзіце прыклады.
2. Якімі здольнасцямі звычайна валодае таленавіты чалавек — мастак, музыка, паэт? Падрыхтуйце праект «Пяць ідэй для школы, каб выявіць і развіць таленты».
3. Назавіце вядомых вам беларускіх пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў, скульптараў.
4. У чым тоіцца «чарадзейная сіла» мастацтва?
5. Праверце свае веды па раздзеле «Літаратура — мастацтва слова» (тэст «Чарадзейная сіла мастацтва»).

Спампавана з сайта www.aversev.by

У вершах і ў прозе

Літаратурныя творы бываюць двух відаў. Адны пішуцца вершамі, другія — празаічнай мовай. Вершаваныя творы друкуюцца кароткімі радкамі ў слупок:

Ой, зіма,
Зіма,
Зіма!
Весялей цябе
Няма!
Горка,
Санкі,
Гоман,
Смех.
Сіні вечар,
Белы снег.
Усе дзеці
На каньках,
Колькі радасці
Ў вачах!

Пятрусь Броўка.
«Зімовыя малюнкі».

Празаічныя творы пішуцца і друкуюцца на ўсю старонку, сказамі, якія могуць быць і кароткія, і вельмі доўгія: *«Кожная пара года па-свойму прывабная, прыгожая. Я люблю вясну, калі з трэскам ломіцца на рацэ лёд і гаманкія поўныя воды нясуць*

Спампавана з сайта www.aversev.by

крыгі. Растае снег, бягуць ручайкі, спяваюць жаўрукі. Апранаюцца ў зеляніну хмызнякі, зямля, атуленая цяплом, чакае блізкай навальніцы» (М. Лупсякоў. «Мэры Кэт»).

Адрозненне вершаваных твораў ад празаічных. Вершаваныя творы звычайна невялікія па аб'ёме, празаічныя — значна большыя: верш — на адну старонку, празаічны твор — на сотні старонак.

Але адрозненне вершаў ад празаічных твораў не толькі ў іх знешнім выглядзе. Розніца паміж імі, прычым вельмі істотная, у асаблівасцях іх мовы. Вершы часцей чытаюцца ўголас, дэкламуюцца і гучаць размерана, складна, напеўна, бо яны напісаны рытмічнай мовай. Прозу мы звычайна чытаем моўчкі. Калі ж яе чытаць уголас, яна ўспрымаецца як звычайная, спакойная размова, як паведамленне, апісанне ці разважанне пра ўбачанае або пачутае аб нейкім чалавеку або нейкай падзеі, выпадку з жыцця. У прозе мова свабодна арганізаваная, гучыць звыкла, натуральна, а ў вершах яна строга падпарадкоўваецца ***рытму***. Чытаючы верш, мы выразна адчуваем, як голас раўнамерна то ўзвышаецца, то паніжаецца, нібы адбівае такт, быццам перадае нейкі музычны найгрыш сугучнасцю канчаткаў радкоў — ***рыфмай***. Яе роля ў вершы вельмі значная. Яна падкрэслівае і ўзмацняе адчуванне рытму, робіць яго больш напеўным, музычным, мілагучным. Рыфма строга падпарадкавана раскрыццю сэнсу, зместу твора.

Роля сродкаў мастацкай выразнасці ў вершаваных і празаічных творах. У вершаваных творах многа розных вобразных выразаў, паэтычных прыёмаў — параўнанняў, эпітэтаў, метафар, гукавых паўтораў, пытальных або клічных сказаў, якія робяць верш напоўненым моцнымі ўражаннямі, перажываннямі, а яго мову надзвычай эмацыянальнай, узрушанай.

У празаічных творах такія сродкі і прыёмы таксама ўжываюцца, але больш рэдка, мы іх быццам і не заўважаем. Галоўнае ў прозе — стварэнне пэўнай карціны жыцця, дакладнае, хоць і таксама вобразнае, апісанне жыццёвага факта ці эпізоду, паводзін чалавека. Нібы на карціне жывапісу, наша ўвага спыняецца не толькі на дадзеных буйным планам фігурах людзей

Спампавана з сайта www.aversev.by

ці прадметах, але і на розных падрабязнасцях — рысах твару, дэталях адзення, іншых штрыхах, што характарызуюць героя або канкрэтныя абставіны яго жыцця, побыту.

Паэзія і проза — два розныя віды літаратурнай мастацкай творчасці.

1. Падумайце, пра які від літаратурнага твора (прозу ці паэзію) гаворыцца ў наступных радках: *«Мова гэтых твораў вельмі эмацыянальная, узрушаная, таму іх часцей дэкламуюць на ўрачыстасцях. Пры гэтым голас чытальніка гучыць складна, напеўна, раўнамерна то павышаецца, то паніжаецца, нібы адбівае такт ці перадае нейкі музычны найгрыш».*
2. Чым празаічныя творы адрозніваюцца ад вершаваных? Акцэнтуйце ўвагу на знешніх адметнасцях гэтых твораў, на асаблівасцях мовы.
3. Паразважайце, чаму пры апісанні карціны больш падыходзіць празаічная мова. У якіх жыццёвых абставінах можна карыстацца паэтычным словам?
4. Параўнайце вершаваныя і празаічныя творы (трэнажор «У вершах і ў прозе»).

Якуб Колас

РУЧЭЙ

Між алешын, кустоў,
Дзе пяе салавей,
І шуміць, і грыміць
Срэбразвонны ручэй.

Як матулька, вярба
Хіліць голаў над ім.
І глядзяцца кусты
Пышным верхам сваім.

Абступаюць яго
Чараты, асака,
Падыходзіць мурог
Да яго здаляка.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Часам зорка ўначы
На яго кіне зрок,
І хмурынка не раз
Зазірне ў ручаёк.

І схіляе трава
Над ім пасмы-брыжы.
А ён, жэўжык-пястун,
Гучным смехам дрыжыць.

То заскочыць у гай,
То курган абаўе,
Дзе сярдзіта бубніць,
Дзе лагодна пяе.

Люба слухаць той спеў,
Несціханы, густы,
І пад песні яго
Адпачынеш і ты.

Паўтарэннем якіх зычных гукаў перададзена адчуванне спакою?
Зачытайце радкі, дзе ўжыты такі ж мастацкі сродак. Паўтарэнне якога гука дапамагае ўявіць начное жыццё ручайка?

1. Якія пачуцці абудзіў у вас верш? Назавіце найбольш яркія вобразы твора.
2. Зачытайце радкі, у якіх паэт убачыў ручаёк *вясёлым і гарэзлівым; лагодным і ласкавым; хмурым і сярдзітым.*
3. Растлумачце ролю эпітэтаў, параўнанняў, адухаўленняў у стварэнні вобраза ручая, выяўленні агульнага настрою твора. Пры неабходнасці звярніцеся да «Слоўніка».
4. З дапамогай якіх выяўленчых сродкаў створаны мастацкі вобраз ручайка ў наступных вершаваных радках?

А ён, жэўжык-пястун,
Гучным смехам дрыжыць.

То заскочыць у гай,
То курган абаўе,
Дзе сярдзіта бубніць
Дзе лагодна пяе.

Спампавана з сайта www.aversev.by

5. Вызначце, колькі націскных складоў у кожным радку. У якой паслядоўнасці паўтараюцца яны ў вершы?
6. Як называецца сугучнасць складоў у канцы вершаваных радкоў? Назавіце словы, якія рыфмуюцца.
7. Узнавіце радкі верша «Ручэй» (трэнажор па вершы Якуба Коласа «Ручэй»). Вызначце ролю рыфмы ў гучанні верша.
8. Праслухайце песню Мікалая Чуркіна «Ручэй» на словы гэтага верша. Параўнайце ўражанні ад верша і песні.
9. Паспрабуйце перадаць асаблівую прыгажосць, якую раскрыў нам паэт, празаічнай мовай. Складзіце пейзажную замалёўку на тэму верша. Выкарыстайце такія ж сродкі мастацкай выразнасці, што і ў вершы.
10. Вывучыце верш на памяць.

Тарас Хадкевіч

КРЫНІЧКА

(Урывак)

Чалавек сядзеў на краі кручы[1] над Дзвіной. Круча тут абрывалася стромкай карычневай сцяной і толькі ўнізе, пры самай рацэ, заканчвалася пакатым шаўкавіста-зялёным схілам. І там, унізе, ля купкі раскідзістага вербалозу, булькатала крынічка. З кручы яна здавалася люстэркам, намнога святлейшым, чым вада ў Дзвіне. Але люстэрка тое, калі прыгледзецца ўважліва, не было застылае. Яно жыло, варушылася, пералівалася цераз ніжэйшы край, і імклівыя струменьчыкі праклалі ў траве і прыбярэжным пяску раўчукі да Дзвіны...

Крынічку Петрык ведаў здаўна. Колькі ён папапіў вады з яе, бегаючы ўлетку з хлапчукамі па ўзбярэжжы! Пад вербалозам быў убіт у зямлю альховы калок і на яго надзеты карэц[2], зроблены з бяросты старым пастухом Нічыпарам. Але прыемней

[1] *Кру́ча* — абрывісты, круты бераг ракі.
[2] *Карэ́ц* — самаробны (з кары дрэва) кубак для піцця вады.

Спампавана з сайта www.aversev.by

было піць не з карца, а прылёгшы грудзьмі на край крынічкі. П'еш крыштальнай чысціні ваду і бачыш, як глыбока на дне варушацца жвір[1] і каменьчыкі, нібы нехта нябачны гуляе з імі, і чуеш, як плюскоча крынічка, быццам яна размаўляе з табой. Вада ж сцюдзёная, смачная, нап'ешся і адчуваеш, як у цябе прыбавілася бадзёрасці і сілы.

Стары Нічыпар казаў хлопчыкам, што памятае гэтую крынічку змалку. Яна амаль не змянілася за доўгія гады яго жыцця — такая ж, як і даўней, празрыстая і гаманлівая. Вясновай яснай раніцай, казаў ён, можна ўбачыць, як нізка пырхаюць, кружацца над ёй птушкі, любуючыся сабой, як у люстэрку. І кружацца, і спяваюць, прыхарошваючыся. А калі які злы паляўнічы-браканьер параніць у лесе беланогага прыгажуна лася, дык лось прыходзіць сюды, п'е з крынічкі, і рана неўзабаве загойваецца. Казаў яшчэ дзед Нічыпар, нібыта ў летнюю месячную ноч расчэсвае каля яе свае шаўкавістыя косы русалка, выйшаўшы з глыбінь Дзвіны.

Што да птушак і лася, дык тое, можа быць, і праўда. А ў русалак Петрык не верыць. Старая гэта казка. Ніякіх русалак у Дзвіне няма, ды і наогул яны — выдумка. Ці мала што можа нагаварыць дзед Нічыпар, адно зачапіся з ім ды распусці вушы!

...Бурліць, плюскоча крынічка. Вербалоз прасцірае да яе гонкія галіны.

Імклівымі ручайкамі пераліваецца, сцякае з яе ў Дзвіну крыштальная вада, і магутная задумлівая рака нібы прыслухоўваецца да яе гоману, булькату. Пераліваецца, сцякае па раўчуках у траве і пяску вада, а крынічка заўсёды поўная. І калі Петрык праходзіць ці спыняецца каля яе, яму здаецца, што яна расказвае нешта нязнанае, таямнічае. І яшчэ — што яна жывіць Дзвіну, і каб не было такіх крынічак, не было б і той прыгажосці, якой дыхае светлаплынная Дзвіна з яе раскошнымі, гаманлівымі берагамі.

[1] *Жвір* — тут: буйны пясок.

Спампавана з сайта www.aversev.by

1. Як выглядала крынічка з абрывістага берага Дзвіны? Прачытайце яе апісанне. Назавіце дзеясловы, якія дапамагаюць уявіць яе зменлівасць і рух.
2. Чым вабіла крынічка Петрыка? Знайдзіце ўжытыя аўтарам параўнанні і ўвасабленні, вызначце іх ролю ў тэксце.
3. Якой памятае крынічку стары Нічыпар? Перакажыце эпізод, які раскрывае яе лекавыя ўласцівасці.
4. Вызначце мастацкую ідэю твора і зачытайце адпаведныя радкі.
5. Чым адрозніваецца ўрывак з празаічнага твора ад папярэдняга верша на тую ж тэму? Ці можна ў яго мове выдзеліць такія ж, як у вершы, роўныя па колькасці складоў часткі, радкі? Ці ёсць у ім сугучныя словы, рыфмы?
6. Як лепш чытаць гэты тэкст: эмацыянальна, з выразным захапленнем, ці спакойна, разважліва? Чаму?
7. Якімі сродкамі ствараецца замалёўка крынічкі?
8. Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Вітольда Бялыніцкага-Бірулі «Зялёны май». Звярніце ўвагу на настраёвасць, агульную прыгажосць пейзажу і на тое, як перададзена мастаком хараство лясного возера. Якія радкі з твора Т. Хадкевіча можна выкарыстаць для апісання мастацкага палатна?

В. Бялыніцкі-Біруля.
Зялёны май

9. Паспрабуйце напісаць замалёўку пра ручай, крынічку, раку ці возера, падобную да гэтага твора.

Выкарыстайце ўжытыя аўтарам дзеясловы, якія перадаюць рух вады *(бурліць, плюскоча, пераліваецца, сцякае, булькоча, варушыцца)*, а таксама прыметнікі-азначэнні, якія характарызуюць якасць вады і самой крынічкі *(сцюдзёная, смачная, празрыстая, крыштальная, гаманлівая)*.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Васіль Быкаў

НЕЗАГОЙНАЯ РАНА

Буяе над абшарамі сцюдзёны асенні вецер, змятае пад прызбы пажоўклае лісце, гайдае мокрае галлё ў садку. Гарэзным свавольнікам выскаквае ён з-за вуглоў на цесны панадворак, цярэбіць саламяную страху хлеўчука, нібы дурэючы, тузае па Тэклінай спіне блытаныя махры яе хусткі. Ад ветру і холаду ў старой макрэюць запалыя вочы, яна раз-пораз выпростваецца і, прыставіўшы да чурбана выслізганае тапарышча, ражком хусткі выцірае слёзы. Потым яна стомлена ўздыхае і акідвае позіркам тыя некалькі паленцаў, што ўжо адсечаны ад жардзіны. Жанчына вельмі стамілася, а насекла столькі, што не хопіць і разу прапаліць у печы. Спачыўшы з хвіліну і аддыхаўшыся, яна зноў прыступае нагой на тую жардзіну і ўзмахвае вышчарбленай сякерай.

Над пустым бульбянішчам Тэклінага агарода, над недалёкім выганам і дарогай, што, узбегшы на ўзгорак, хаваецца ў шэрай далечы, марудна паўзе восеньскі адвячорак. Некуды спяшаюцца імклівыя пакудлачаныя хмары ў небе, за хатамі ў вёсцы трывожна бляе авечка, і недзе разважна гергечуць гусі.

Тэкля сячэ, адпачывае ў кароткіх перапынках і ўвесь час азірае дарогу. Відаць па ўсім, што яна кагосьці чакае, і гэтае чаканне балючым адбіткам тугі і надзеі свеціцца ў яе слязлівых вачах.

Нарэшце на пагорку з’яўляецца імклівая постаць веласіпедыста, і Тэкля па нейкіх адной ёй вядомых прыкметах пазнае ў ім калгаснага пісьманосца. Веласіпедыст набліжаецца абочынай дарогі, потым, унізе, пад пагоркам, злазіць з машыны, выводзіць яе з калдобін і зноў сядае, локцем адкінуўшы на спіну цяжкую сваю сумку.

Па меры яго набліжэння старую ўсё больш ахоплівае нецярплівасць. Яна кладзе сякеру і з незагароджанага двара выходзіць на гразкую вуліцу. Рукі яе неспакойна блукаюць па грудзях,

Спампавана з сайта www.aversev.by

без патрэбы абмацваюць світку, твар зморшчыўся ў пакутлівым выразе чакання, і ў вачах — нясцерпная туга надзеі. Калі пісьманосец звярнуў з дарогі ў вуліцу, жанчына па гразі шкандыбае насустрач, нібы баючыся, што ён без увагі абміне яе.

Пісьманосец прыцішвае бег веласіпеда, але не спыняецца, а, узняўшы на жанчыну насуплены твар зморанага чалавека, груба папракае старую:

— Ну што ты мяне пільнуеш усё? Няма ж табе нічога. Нічога няма! — крычыць ён у твар жанчыне і знікае за рогам.

Старая нібы камянее на месцы, доўга яшчэ глядзіць услед праезджаму, і ў вачах яе — боль і здзіўленне. Нейкі час яна стаіць так без слоў і без руху, аглушаная няласкай чалавека. «Нічога няма», — шэпчуць яе засмяглыя палінялыя вусны, і жанчына паволі ўнікае ў сэнс гэтых грубых слоў. Разбітай цяжкай хадою яна вяртаецца на панадворак да сваёй сякеры, але не падымае яе, а доўга стаіць над жардзінай і ўсё пазірае ў імглістую далеч. Па яе пасівераных рудых шчоках ціха коцяцца слёзы.

Яна доўга яшчэ глядзіць на сумны пагорак, гразкую дарогу і бачыць над гэтай мясцінай цёплы ліпеньскі дзень, высокае яснае неба і густое жыта абапал дарогі. Гэта было ў той, ужо далёкі, памятны год, калі пачалася вайна. І тады яна таксама стаяла тут і з роспаччу ў сэрцы пазірала на гэты шлях, а ногі яе імкнуліся бегчы туды, за ім, адзіным сынам, яе Васем. Шпаркай хадой рухавага чалавека ён хутка аддаляўся, па самыя плечы затулены ўмалотнай высокай збажыной, не азірнуўся, аж покуль не адышоўся далёка. А яна, не адрываючы ад яго позірку, несціхана

Спампавана з сайта www.aversev.by

галасіла, вочы засцілалі слёзы і не давалі нагледзецца апошні раз на сваю васямнаццацігадовую надзею, сваё шчасце, частку яе матчынага сэрца. Толькі пасля ён спыніўся, павярнуўся да маткі, да роднай хаты і вёскі, пастаяў так, памахаў рукой, бы навек развітваўся з усім родным, сваім маленствам, маладосцю, і потым хутка знік за пагоркам.

І знік, відаць, назаўсёды...

Шаснаццаць страшных, нясцерпных год штогадзінным болем адмералі свой лік у матчыным сэрцы. Шаснаццаць год чакання, надзей, незабыўнага трывожнага спадзявання. Часам прыходзілі пісьмы ў розных канвертах і з зусім аднолькавым зместам: радавы Сподак Васіль Іванавіч у спісах забітых і прапаўшых без вестак не значыцца. Яны бянтэжылі і абнадзейвалі, гэтыя пісьмы, але ішоў час, а надзеі не спраўджваліся. Суседзі часам казалі такое, супраць чаго з усёй матчынай сілай пратэставала сэрца, якое верыла і чакала ўдзень і ўначы. Гэтая вера трымала старую ў жыцці, вымушала на клопаты аб сабе, але ж гэтулькі год мінала дарэмна...

Тым часам марудна цямнела, далячынь спавілася шэрай смугою, у паветры заснавала надакучлівая восеньская золь[1].

Абудзіўшыся ад задумення, старая сабрала на руку нарыхтаваныя паленцы і, крануўшы закрутку сенцаў, увайшла ў хату. Тут было ўжо цёмна, ледзь свяцілася ў паўзмроку абшкрэбаная, закураная печ, стуліўся ў куце стол і дзве лаўкі — уся хатняя абстаноўка. Светлымі квадрацінамі сінелі яшчэ два акенцы, у адным чарнела заткнутая шыба. Старая паклала ля печы дровы, прыслухалася да знаёмай цішыні пустой хаты і, не распранаючыся, апусцілася на лаўку. Так яна сядзела доўга, думала ўсё пра адно і тое ж: дзе ён, ці жывы, ці не?

Спакваля змрок зусім затуліў пакой, толькі ўсё яшчэ бялела ля парога печ ды шарэлі вокны. Тэкля ўсё сядзела не кратаючыся, склаўшы на каленях рукі і схіліўшы ў задуме голаў. Яна моцна скаланулася, калі на ганку грукнулі нечыя крокі, і, як

[1] *Золь* — непагадзь, сырое, халоднае надвор'е.

Спампавана з сайта www.aversev.by

заўсёды на ўсялякі стук, абамлела яе сэрца. «Ён!» Не маючы ўжо сілы ўскочыць і кінуцца насустрач, яна застыла ў напружаным пакутным чаканні. Нехта ўвайшоў у сенцы, зашкрэбаў рукой па сцяне, шукаючы клямку. І хутка адчыніў дзверы. «Няўжо, няўжо, няўжо?» — у нямым запытанні стукала сэрца і пра́гнула, каб было так. Але спадзяванні жанчыны хутка рушыліся.

— Ці тут вы, цётка? — пачуўся з парога знаёмы голас суседскай дзяўчыны Ульянкі.

Збянтэжаная неспадзяванасцю, Тэкля маўчала, не ў стане супакоіць даўні прывычны боль.

— Што ж гэта вы лямпы не паліце? А я прыйшла па запалкі, калі багаты. У нас, каб на іх ліха, гэтыя курцы за дзень усе павыцягалі. Не накупляешся на іх, дымакураў.

Тэкля моўчкі слухала і не чула дзявочай гамонкі, у галаве яе плылі маркотныя даўнія думкі. Неяк няўцямна старая намацала на прыпечку няпоўны карабок запалак, аддала дзяўчыне. Тая ўсё балбатала пра тое ды гэта, а потым, нібы адчуўшы, як далёка яе размова ад сэрца жанчыны, змоўкла і, ужо ўзяўшыся за клямку, уздыхнула:

— Не мучцеся вы ўжо. Што ж зробіш? Калі дзе жывы, дык вернецца. А калі не... Калі не, дык трэба забыцца ўжо.

— Ці ж можна забыцца? — пакутліва адгукнулася Тэкля. — Калі б хоць ведала, што няма, дык лягчэй было б. А так вось... У заўтрашні дзянёк якраз нарадзіўся ён, перад Пакровамі. Нарадзіўся на белы свет, а шчасцейка, відаць, не суджана было. Ляжаць, можа, дзе адны костачкі — ведаць бы хоць, у якой зямельцы — ці ў сваёй, ці — крый божа — у нямецкай.

Дзяўчына няёмка пераступіла ля парога, баючыся, што старая расплачацца і немаведама як тады супакоіць яе матчына гора. Але працяглы боль ужо высушыў слёзы старой Тэклі, толькі сэрца гарэла ад нясцерпнай пакуты.

У гэты вечар яна не паліла ў грубцы і не засвяціла лямпы. Яна ўзлезла на печ, трохі яшчэ цёплую зранку, і, накрыўшыся світкай, скурчылася на ўскрайку. Яна не заснула, ды і не намагалася зрабіць гэта, а ляжала так, не заплюшчваючы вачэй,

Спампавана з сайта www.aversev.by

і ў змроку хаты перад ёй паўставалі даўнія, але незабыўныя малюнкі.

...Ён нарадзіўся ў гэткі ж, як сёння, ветраны восеньскі дзень — маленькі крыклівы хлопчык. Бацька толькі што перахварэў на тыф, ужо ўзняўся, хадзіў, але быў яшчэ кволы і слабы. Першы сынок стаў вялікай уцехай у гэтай крайняй у вёсцы хаціне. Абое з бацькам яны выняньчылі, выхадзілі яго, радаваліся яго першым крокам і першым словам. Ішоў неўзаметку час, і рос бялявы, ціхмяны хлопчык — ласкавы, велікалобы, жвавы. У пяць год ён ездзіў з бацькам у поле, на начлег, пасвіў гусі, а потым, калі нарадзілася Марыська, стаў няньчыць яе. Вучыўся ён добра, на святы прыносіў маленькія школьныя прэміі: сшыткі, пенал, каляровыя алоўкі. Суседзі хвалілі сына, і часта матчына сэрца мацней білася ад радасці.

І Васілька пасля школы падаўся далей, у гарадскі тэхнікум, дзе вучыліся на настаўнікаў. Тады ж яна зведала першы боль ростані і першую чароўную радасць сустрэчы. Ён быў зусім яшчэ падлетак, а ўжо яго паважалі ў вёсцы, суседкі зайздросцілі Тэклі, мужчыны хвалілі сына, а ён усё, як і ў дзяцінстве, быў ціхмяны, сарамлівы і стрымана ласкавы з маці. Яна тады ўжо засталася адна — бацька няшмат пражыў са слабым здароўем і неяк памёр напрадвесні. У той год Васілька канчаў вучобу, пасталеў, падрос, раздаўся ў плячах. І аднойчы, на нейкае свята, у час яго кароткага гасцявання дома, адчула маці, што ўжо скончылася дзяцінства яе белагаловага хлапчука і з ім — яе, матчына, улада над сынам.

Ёй добра памятны той цёплы майскі адвячорак, калі ў паветры пахла таполяй, маладым бярозавым лісцем. Гудзелі на панадворку хрушчы, недзе ў вёсцы граў гармонік, і яна, успомніўшы, што трэба да вечарынкі накарміць сына, пайшла за хату ў агародчык гукнуць яго. Ён там чытаў нешта, але, калі маці ўбачыла яго, Васіль, безуважны да кнігі, неяк устрывожана і пільна пазіраў з-пад рабіны на палымяны разліў зары. Маці пяшчотна паклікала, але ён не паварушыўся нават, усё глядзеў

Спампавана з сайта www.aversev.by

на захад, а потым азваўся і сказаў такое, што назаўжды разбурыла спакой у матчыным сэрцы:

— Мама, глянь: бачыш, які захад? Праўда, падобна на вялізнае пажарышча? А бадай, і сапраўды запалае зямля. Вайна будзе, мамачка. Я пайду туды, застанецеся вы з Марыськай.

Яна моцна спалохалася, памятае, зразумеўшы страшны сэнс тых слоў, заплакала, а ён ускочыў, абняў яе і супакойваў, як мог, кажучы, што, можа, яшчэ ўладкуецца ўсё паціху. Але калі яна сціхла, працяла благое прадчуванне, ён сказаў ужо сур'ёзна і цвёрда, як узмужнелы, сталы мужчына:

— Усё ж, калі што здарыцца, я пайду, мама. Прызавуць ці не, а пайду: так трэба.

Яна не разумела ўсяго, але верыла, што калі казаў ён гэта, то сапраўды так трэба было, і не адгаворвала, не ўпрошвала яго.

І ўсё ж у сэрцы яе ён заставаўся маленькім добрым белагаловым хлопчыкам, якому патрэбна была яе любоў і яе клопат. Усё здавалася ёй у страшныя гады вайны, што яму недзе цяжка, што ён знемагае ад болю, ад сцюжы, ад голаду. І яна не знаходзіла сабе месца ў хаце — хацелася бегчы, знайсці яго, памагчы, прыняць частку яго цяжару на свае плечы. Але куды было бегчы і дзе шукаць?

Ішлі гады. Яны неслі роспач, радзей кароткую, як пробліск восеньскага сонца, радасць. Людзі прыходзілі з вайны, з партызан, многія былі паранены, але жывыя, за другіх прыйшлі весткі аб іх гібелі. Па іх паплакалі маці і патроху супакоіліся — страчанага не вернеш. Тэкля ж усё чакала — доўга, цярпліва, без скаргаў, а ён не ішоў, не адзываўся. Яе суцяшалі суседзі, колькі разоў угаворвала Марыська, якая ўжо выйшла замуж і жыла ў далёкай вёсцы. Зяць пры кожнай сустрэчы цярпліва запрашаў яе да сябе — там гадаваліся ўнукі, і яна была дужа патрэбна. Але Тэкля ўсё не магла адцурацца хаціны, дзе нарадзіўся сын і якую яна ўпарта доўгія гады берагла для яго.

У хаце пакрысе ўсталёўваецца сляпая асенняя ноч, глухая ціш, апроч Тэклі, тут нікога няма. Быў некалі кот, ды і той звёўся чамусьці. Вялікае гора прыбіла ўсякі інтарэс да жыцця,

Спампавана з сайта www.aversev.by

зламала характар, спарахніла душу — нічога няміла цяпер старой адзінокай жанчыне.

Яна ўсё ляжыць, расплюшчыўшы вочы, думае свае невясёлыя думы і напружана ўслухоўваецца. Так ужо прывыкла за шаснаццаць год і трывог, і чаканняў — слухаць кожны шолах і кожны гук у ваколіцы.

Але ўсюды ціха, толькі шамаціць у страсе халодны вецер ды недзе на дарозе гудзе машына. Яна, відаць, набліжаецца, буксуе, пэўна, у калдобінах тых, ля пагорка. Знячэўку сінявата дрыготкае святло яе фар слізгае па вокнах і кладзе ў куце пад столлю вузенькую бліскучую паску. Машына гудзе бліжэй, паска паволі сунецца па закураных, патрэсканых бярвеннях, шырэе; з'яўляюцца чорныя палосы рамы, і вось ужо на сцяне — бліскучы косы адбітак Тэклінага акна з адной чорнай заткнутаю шыбай. Акно ўсё хутчэй слізгае па сцяне ў другі кут і ўрэшце знікае, асвяціўшы на момант вялізны цвік і каўнер павешанага на ім кажушка. У хаце зноў робіцца цёмна, машына з цяжкім ляскатам і гулам мінае Тэклін падворак.

Тэкля нерухома слухае, думае сваё і раптам усхопліваецца ад новай надзеі. А можа, гэта ён, можа, ён са станцыі прыехаў, стаіць цяпер ля роднае хаты, вось-вось увойдзе. Тэкля ўзнімае голаў, слухае і сапраўды чуе няпэўныя крокі на ганку і ціхі кароткі стук. Ён! Старая ўзнімаецца на печы, спускаецца і, сцягнуўшы за сабою ватоўку, таропка бразгоча зашчапкай. Яна расчыняе дзверы сенцаў — у твар ёй б'е вільгаць і холад восеньскай ночы, наўкола цішыня і цемра. На ганку нікога, на панадворку змрок. З хвіліну яна ўзіраецца ў ноч, слухае, і сэрца яе зноў захлынаецца ад роспачы, не хоча ніяк пагадзіцца з крушэннем надзеі. Асцярожна мацаючы ботамі гразкі дол, яна заходзіць за рог, доўга ўглядаецца ў вуліцу — нідзе нікога.

Потым яна вяртаецца і зноў ляжыць на печы з расплюшчанымі вачыма і слухае, слухае ўсю ноч. Пад ранак жанчына ўсё ж засынае і нібы ў працягу сваіх думак бачыць дзівосны сон.

Бачыць яна: нібы настае новы, заўтрашні дзень — дзень нараджэння Васількі. Яна нешта завіхаецца на панадворку

Спампавана з сайта www.aversev.by

і ўсё пазірае на дарогу, чакае і пэўна ведае, што сёння павінен з'явіцца ён, яе надзея. Жанчына ўсё рыхтуецца да гэтай сустрэчы, але чамусьці няма радасці на яе сэрцы ад хуткага спаткання — нешта замінае ёй, гэтай радасці. Урэшце чаканне сустрэчы і зусім знікае. Жанчына паліць у печы, ёй памагае дачушка Марыська. Яны пякуць бліны і між справай ласуюцца святочным наедкам, зусім забыўшыся ўжо пра Васільку і яго хуткае вяртанне. І раптам суседская Ульянка стукае і нешта крычыць у акно — Тэклі не чутна слоў, але яна здагадваецца, што гэта вяртаецца ён. Старая выбягае з хаты і бачыць, як на той жа дарозе, што і шаснаццаць год назад, ідзе яе сын, яе дарагі Васілька. Але ён ідзе вельмі марудна, часта спыняецца, становіцца на калені — з ім штосьці здарылася, яму, відаць, вельмі цяжка. Маці, ахопленая нястрымным роспачным хваляваннем, наўпрасткі, праз бульбянішча і гразь, у адной кофце, без хусткі бяжыць насустрач сыну. Яна ўжо ведае, што нешта страшнае, непапраўнае здарылася з яе Васількам. Жанчына, галосячы, падбягае да сына — ён, прыўзняўшыся на руках, ляжыць на дарозе, і яго малады, такі ж, як і шаснаццаць год назад, без ніводнай маршчынкі, твар спагадліва ўсміхаецца. Але што гэта? Чаму ў сына няма ні рук, ні ног, замест іх адны толькі кароткія кульцяпкі? І чаму кроў на яго пілотцы з маленькай зялёнай зорачкай? Маці, млеючы ад жаху, хапаецца за сына, прабуючы ўзняць, і галосіць, а ён спакойна так кажа: «Нічога, мама, усё благое скончылася. Цяпер жыць будзем...»

А потым яна бачыць яго ў роднай хаце, быццам ён сядзіць на покуці і ўжо не ў чырвонаармейскай форме, а ў шэрым пінжачку, які справіў перад вайной, і сур'ёзна кажа маці: «Ну і нічога, хоць я і загінуў, але зноў жывы».

Ад нясцерпных жахаў яна прачынаецца на досвітку і, знясіленая ад перажытага за ноч, нерухома ляжыць, не ведаючы, што і падумаць. Яна прыпамінае сон, удумваецца ў яго адметныя драбніцы, зноў пакутуе ад такога выразнага, свежага ў пачуццях відовішча, і чым далей, тым болей у старой мацнее ўпэўненасць, што ён вернецца. Гэтая ўпэўненасць і жаданне,

Спампавана з сайта www.aversev.by

каб усё здзейснілася, ужо не даюць старой чакаць у бяздзейнасці, яна ўзнімаецца, хуценька накідвае на плечы сваю світку. У хаце сцюдзёна, ужо даўно і зусім астыла печ, у вокнах сінее свежы ранак, і Тэкля кідаецца да таго, з разбітай шыбай, каб убачыць дарогу. Але дарогі яшчэ не відно, ледзь-ледзь цямнее пад нізкім хмарным небам пусты пагорак — і ўсё. Старая сноўдае па хаце, не ведаючы, што рабіць, за што ўзяцца, а думкі яе — на той дарозе, і сэрца ўсё больш ахоплівае нецярплівасць. Яна ўжо верыць, што ён недзе вяртаецца, і ўвесь час то падбягае да акна, то выходзіць на панадворак і да болю ў вачах узіраецца ў шэрую далячынь.

Калі добра развіднела, Тэкля ўжо не магла стрымаць сябе і, выйшаўшы на вуліцу, пачала ўглядацца ў дарогу. Спачатку там было пуста, потым з'явілася нейкая фурманка, на ёй сядзелі двое мужчын і кабета. Старая ўсё ўглядалася ў іх — пільна і доўга, захлынаючыся ад нецярплівасці, а яны, бесклапотна гутарачы аб нечым і перасмейваючыся, так і мінулі вёску. Потым зноў на дарозе доўга не было нікога, аж пакуль здалёк не паказалася нейкая адзінокая постаць. Яна з'явілася, паматлялася на краявідзе і недзе знікла. У Тэклі адразу адарвалася нешта ўнутры, тупа ўдарыла ў голаў здагадка: «Ён!» Яна прыгледзелася яшчэ і ўжо не магла стрымацца. Не зачыніўшы нават сенцаў, у бахілах набасанож старая хутка пайшла па дарозе. Спачатку яна абмінала гразь, пазіраючы то пад ногі, то на пагорак, потым прыбавіла кроку і ўжо не разбірала дарогі. У нізіне ля калдобін, калі знік з вачэй пагорак, яе ахапіла трывога. Здалося жанчыне, што яна позніцца, што ён упаў там і ляжыць пакалечаны, і маці, цяжка дыхаючы, кінулася подбегам.

Сэрца яе ледзь не разрывалася ад гора і напружання, пакуль яна выйшла з лагчыны. Вось-вось, здавалася, яна ўбачыць яго, як у тым сне, на дарозе, зняможанага, пакалечанага. Яна, захліпаючыся ад стомы і хвалявання, узлезла на пагорак, але дарога была пустая. Гэта было першае расчараванне, але яно не пахіснула веры жанчыны. А можа, ён далей, можа, за параснікамі ці ў Лужку, думалася ёй, і старая, не спыняючыся, бегла далей.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Над шырокімі прасцягамі, раллёй і голымі пералескамі непрыкметна зачаўся сумны восеньскі дзень, было ветрана і сцюдзёна. Нізкае неба поўнілася цяжкімі азызлымі хмарамі — яны суцэльным бясконцым статкам плылі з захаду, несучы першы зазімак.

Тэкля не спынілася ні на пагорку, ні ля параснікаў, яна не магла ўжо суцішыць хады — усё ў ёй ірвалася наперад, туды, адкуль яна чакала яго. Увесь час здавалася старой, што вось-вось яна дасягне горкі ці абміне хмызняк і ўбачыць яго, і жанчына ўсё прыбаўляла хады.

Але ён не паказаўся ні з-за горкі, ні з-за параснікаў, а сілы старой пачалі слабець. Адзін раз яна прытулілася да тэлефоннага слупа, нібы ўпершыню здзівіўшыся марнасці надзеі, зірнула назад, наперад. Як добра, падумала старая, што бацька пахаваны дома, на вясковых могілках, што ў яго дагледжаная магілка, а дзе ён? Дзе пахаваны ён? — нема крычала яе душа. Няўжо сапраўды ўсё скончана і ніколі ёй не дачакацца яго і давядзецца падацца ў чужыну да зяця?.. Але чаму пахаваны? Не можа быць, каб памёр ён, ён павінен жыць, ён ідзе гэтай дарогай, дык трэба спяшацца сустрэць яго. І яна шкандыбала па гразі ў невядомую далеч дарогі.

Апоўдні мінула знаёмыя мясціны, вядомыя вёскі. Дарога ўсё вілася ў восеньскіх прасторах, усё з прагнасцю азірала яе маці, але яго не было нідзе. Яна ўсё ішла, але вельмі знемагла ўжо, часта адпачывала на ўзмежках, ля слупа, на камянях. Спыніцца яна не магла, не магла і вярнуцца: ёй здавалася, што жыццё яе сына — у той дарозе.

А то ёй сустрэўся трактар, ён цягнуў вялізную чырвоную малатарню, а на ёй і на трактары сядзела некалькі хлопцаў. Старая саступіла з дарогі ўбок ад грукату і лязгу і ўважліва агледзела седакоў. Адзін, што сядзеў збоч трактарыста ў кабіне, здаўся ёй неяк вельмі падобны да яе Васількі; трактар праехаў, а яна ўсё глядзела ўслед. Хлопец у расшпіленай ватоўцы на малатарні нешта крыкнуў ёй і засмяяўся — яна не пачула яго слоў, але чамусьці аж схамянулася ад яго маладога свавольніцкага смеху.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Пад вечар яна ўжо ледзь брыла дарогай, спынялася, задыхалася ад стомы. Старэчы позірк, што так натхнёна вёў яе ўдалеч, пагас пакрысе, як пагасла і яе нясцерпная надзея сустрэць яго. І ўсё ж яна з дрыготкім сэрцам узіралася ў дарогу з-за кожнай павароткі.

Урэшце беспадстаўная вера жанчыны пачала марнець. Усё часцей вярталася думка, што дарэмныя яе надзеі, бескарысны клопат. Не прыйдзе ён сёння і ніколі, бо яго няма ўжо на белым свеце. Усё быў зман, пустыя спадзяванні, і яна прагла толькі даведацца, дзе пахаваны яе сын. Гэта было іншае пытанне, але яно апанавала маці з гэткай жа нязмернай сілай, як і тое, што датычылася яго жыцця.

У небе ўсё гусцелі барвовыя хмары, яны не плылі цяпер, а збіраліся, тоўпіліся над прасторамі, быццам задумаўшы нешта нядобрае. Расплываўся з-за краявіду сіняваты змрок, далячынь сцямнела, насупілася ў прадчуванні непагадзі. Пэўна, блізіўся вечар ці мо ад хмар цямнела да часу. На сіверным ветры замільгалі рэдкія сняжынкі.

Тэкля некуды ішла, ужо і сама не ведала, куды і па што. Усё больш апаноўвалі яе роспач і гора, яна ведала пэўна, што шчасце не спаткае яе на гэтай дарозе. Але не магла яна і вярнуцца назад — не было ўжо сілы ў яе на тое вяртанне.

Дарога прывяла старую ў нейкі лясок. Абапал шляху цесна стаялі елкі, шумелі, гулі ў ветранай высі іх верхавіны. На доле шамацела змеценае ў каляіне лісце, блішчалі лужыны рудой, мутнай вады. Тэкля ішла па дарозе, абапіраючыся на кій, ледзь пераступаючы збалелымі, натруджанымі нагамі. Аднак лес неўзабаве скончыўся, дарога пабегла ўніз да самотнай пустой лугавіны, і жанчына, схамянуўшыся, раптам спынілася.

На пагорку, збоч ад дарогі, на ўзлеску незвычайна ярка і чыста неяк у гэты халодны восеньскі вечар бялеў каменны абеліск з зоркай наверсе — звычайны вайсковы помнік тым, хто не дайшоў да Берліна. Хістаючыся ад горкіх прадчуванняў, што хлынулі ў яе душу, Тэкля сышла з дарогі і, узнімаючы нагамі некрануты пласт шапатлівага лісця, падалася да помніка.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Ён быў дагледжаны, падпраўлены і нядаўна пабелены, гэты журботны напамінак вайны. Невялікая магілка з завялай травою і высахлымі немудрагелістымі вянкамі старанна падраўняна; пагабляваныя штыкеціны агароджы афарбаваны зялёнай фарбай — як і належыць вайскоўцам. На адным баку абеліска чарнела ўмураваная ў яго дошчачка з не дужа зграбна напісанымі, але выразнымі літарамі — спісам пахаваных байцоў. У роспачы павісшы грудзьмі на агароджы, старая ўпілася ў гэтыя радкі жалобных слоў.

Помнік загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны ў вёсцы Барташы

Не, яго не было тут. «Лейтэнант Авяр'янаў, гвардыі старшына Кузняцоў, радавыя Бондараў, Піліпенка, Чарных і іншыя». Але хто ж гэтыя іншыя, чаму не напісаны іхнія імёны? А можа, і ён тут у ліку гэтых невядомых «іншых»?

Радкамі з апавядання В. Быкава дайце назву помніку.

Яна ўжо не магла ісці адгэтуль, учапілася рукамі ў халодныя штыкеціны, і з глыбіні яе жарам гарэўшых грудзей вырвалася страшнае пытанне:

— Сыночак мой, дзе ж ты?

Чарнела неба ад хмар, шумеў голым веццем узлесак, стыла шэрая далячынь. Доўга яшчэ ляцела на ветры тое яе запытанне, і нема крычала матчына сэрца ад нясцерпнае раны вайны.

1. Які эпізод апавядання вас найбольш усхваляваў? Чым асабліва ўзрушыў?
2. Растлумачце сэнс назвы апавядання. Якую іншую назву можна яму даць?
3. Колькі часу ахоплівае асноўнае дзеянне твора ад знаёмства з гераіняй да таго моманту, калі мы пакідаем яе каля вайсковага помніка?

Спампавана з сайта www.aversev.by

Пры дапамозе якіх прыёмаў аўтар расказаў амаль пра ўсё жыццё Тэклі і яе сям'і за такі кароткі час?

4. Якім чалавекам паўстае Васілёк з успамінаў Тэклі? Зачытайце яго апісанне-партрэт.
5. Як раскрываюцца душэўныя пакуты старой маці праз іншыя вобразы-персанажы апавядання — пісьманосца, суседкі Ульянкі, хлопца на малатарні? Як гэтыя маладыя людзі рэагуюць на паводзіны старой Тэклі? Ці адчуваюць яны трагедыю маці, якая страціла сына? Абгрунтуйце сваё меркаванне, абапіраючыся на тэкст твора.
6. Як раскрываецца вобраз гераіні праз замалёўкі прыроды (пейзаж), праз апісанне Тэклінай хаты і двара? Прывядзіце прыклады з тэксту.
7. Вызначце элементы сюжэта ў творы: завязку, развіццё дзеяння, кульмінацыю і развязку.
8. Складзіце план апавядання і падрыхтуйцеся да яго пераказу.
9. Якімі словамі можна перадаць перажыванні маці, чый сын не вярнуўся з вайны *(журботныя, цяжкія, горкія, балючыя, маркотныя, пакутлівыя, шчымлівыя)* або якімі іншымі? Выкажыце ўласныя пачуцці да старой Тэклі.
10. Да якога жанру належыць твор В. Быкава «Незагойная рана»? Пры неабходнасці звярніцеся да «Слоўніка».
11. Уявіце, што вы скульптар, які працуе над помнікам Невядомаму салдату. Выкарыстайце апісанне помніка ў апавяданні, ілюстрацыю, уласныя назіранні, інтэрнэт-рэсурсы і перадайце сваё ўяўленне пра яго. Патлумачце, чаму менавіта такім павінен быць гэты помнік.

Васіль Зуёнак

* * *

З вайны сустрэлі мацяркі сыноў
І выглядалі-радзілі[1] нявестак.
А сын яе дадому не прыйшоў.
Прыйшло кароткае:
«Прапаў без вестак...»

[1] *Ра́дзіць* — тут: раіліся паміж сабой.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Сябры пасумавалі, землякі,
Слязу змахнула ўпотайкі дзяўчына:
Не вернецца... Знаць, лёс яе такі...
Ды толькі сын для маці не загінуў.

Знаходзіць маці тысячы прычын,
Чаму так доўга сын яе ў дарозе,
Чаму не йдзе разгладзіць ёй маршчын
І высушыць на родным твары слёзы.

Яна між рэчаў самых дарагіх
Кашулі сына беражна хавае,
Святочным днём падоўгу каля іх
Стаіць,
гамоніць з імі,
плача і ўздыхае...
І ёй успамінаецца тады,
Як сын казаў: «Вярнуся, не загіну,
Чакай мяне... Чакай!..»
Ідуць гады,
І кожны дзень чакае маці сына.

1. Якое ўражанне пакінуў у вас гэты верш?
2. Вызначце тэму твора і яго галоўную думку.
3. У якіх радках перададзена глыбіня мацярынскага гора? Якімі сродкамі мастацкай выразнасці карыстаецца пры гэтым аўтар?
4. Праслухайце песню «Нашы маці» (музыка Юрыя Семянякі на словы Алеся Бачылы). Што яднае вобразы гераінь-матуль у творах паэтычнага і музычнага мастацтва?
5. Абгрунтуйце меркаванне, што верш В. Зуёнка і апавяданне В. Быкава раскрываюць пачуцці і перажыванні мацярок, якія не дачакаліся сваіх сыноў з вайны, але робяць гэта пры дапамозе розных сродкаў і прыёмаў.
6. Якія радкі з верша можна выкарыстаць у якасці эпіграфа да апавядання В. Быкава «Незагойная рана»?

Спампавана з сайта www.aversev.by

ПРА ПЕЙЗАЖ

Важную ролю ў характарыстыцы дзеяння твора, перадачы настрою, перажыванняў герояў адыгрываюць замалёўкі прыроды. У апавяданні В. Быкава «Незагойная рана» яны сустракаюцца часта. *«Буяе над абшарамі сцюдзёны асенні вецер, змятае пад прызбы пажоўклае лісце, гайдае мокрае галлё ў садку... Над пустым бульбянішчам Тэклінага агарода, над недалёкім выганам і дарогай, што, узбегшы на ўзгорак, хаваецца ў шэрай далечы, марудна паўзе восеньскі адвячорак. Некуды спяшаюцца імклівыя пакудлачаныя хмары ў небе, за хатамі ў вёсцы трывожна бляе авечка, і недзе разважна гергечуць гусі»*.

Такой паўстае прырода ў пачатку твора.

«Тым часам марудна цямнела, далячынь спавілася шэрай смугою, у паветры заснавала надакучлівая восеньская золь... У небе ўсё гусцелі барвовыя хмары, яны не плылі цяпер, а збіраліся, тоўпіліся над прасторамі, быццам задумаўшы нешта нядобрае. Расплываўся з-за краявіду сіняваты змрок, далячынь сцямнела, насупілася ў прадчуванні непагадзі».

Гэта — з сярэдзіны апавядання.

І вось заключныя мазкі карціны: *«Чарнела неба ад хмар, шумеў голым вецем узлесак, стыла шэрая далячынь...»*

Нават калі б мы нічога не ведалі пра змест твора, яго герояў, толькі па гэтых апісаннях прыроды, фарбах і адценнях пейзажу можна было б зрабіць выснову, што расказваецца ў ім пра падзеі нярадасныя, нават пакутлівыя.

На такую думку нас наводзяць асобныя заўвагі, намёкі ў апісаннях прыроды: *«сцюдзёны асенні вецер»*, *«трывожна бляе авечка»*, *«барвовыя хмары тоўпіліся, быццам задумаўшы нешта нядобрае»*, *«далячынь насупілася ў прадчуванні непагадзі»* і інш.

Пейзаж, або апісанне прыроды, у мастацкім творы не толькі знаёміць чытача з месцам і часам (пара года, час дня) дзеяння, але і характарызуе агульны настрой аповеду, душэўны стан героя, яго перажыванні, пачуцці, роздумы пра жыццё, у адным

Спампавана з сайта www.aversev.by

выпадку цяжкія, маркотныя, у іншым — радасныя, узнёслыя. Гэта залежыць ад задумы пісьменніка, ад таго, што ён хоча сказаць чытачу. Так, у адрозненне ад апавядання «Незагойная рана», дзе прырода паказваецца халоднай, няўтульнай, змрочнай, у творы «У яго быў свет цікавы...» яна малюецца лагоднай, як бы спачувальнай, прыветнай у адносінах да Сымонкі. Менавіта на ўлонні прыроды хлопчык адчувае сябе прывольна. Яго душэўны стан перададзены праз успрыманне прыгажосці навакольнага свету. Здольнасць героя пачуць, *«што гаворыць жытні колас і аб чым шуміць ячмень»*, і ўбачыць, *«як галоўкай заківаюць, засмяюцца васількі»*, дапамагае зразумець уражлівую душу дзіцяці.

Пейзаж у літаратурным мастацкім творы, як і ў карцінах жывапісу, можа мець і такую мэту — паказаць прыгажосць таго кутка зямлі, дзе жывуць героі ці сам аўтар, але і ў гэтым выпадку ён не з'яўляецца простым апісаннем прыроды, ён выяўляе настрой, пачуцці аўтара, яго адносіны да жыцця.

Пейзаж — апісанне прыроды, якое мае важнае значэнне для характарыстыкі дзеяння, душэўнага стану героя.

1. Якую ролю адыгрывае пейзаж у паказе жыцця, характарыстыцы герояў твора?
2. Узнавіце веды пра пейзаж (трэнажор па артыкуле «Пейзаж»).
3. Прапануйце сваё апісанне прыроды да твора В. Быкава «Незагойная рана». Вызначце яго ролю ў тэксце (указвае на пару года; канкрэтызуе месца дзеяння; перадае душэўны стан героя і інш.).

Спампавана з сайта www.aversev.by

ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДА РАЗДЗЕЛА

1. Якія два асноўныя віды літаратурных твораў вы ведаеце?
2. Чым адрозніваюцца вершаваныя творы ад празаічных: па знешняй форме, па асаблівасцях мовы (у дачыненні да рытму, да вобразна-выяўленчых сродкаў), па ўздзеянні на чытача?
3. Якія вершаваныя творы вам асабліва падабаюцца? Чаму?
4. Назавіце вашы любімыя празаічныя творы. Чым яны зацікавілі вас, чым запомніліся?
5. Якія творы мастацкай літаратуры (паэтычныя ці празаічныя) бліжэй да твораў музыкі, а якія — да твораў жывапісу? Паспрабуйце паказаць гэта на канкрэтных прыкладах.
6. Суаднясіце назвы твораў з іх відамі (трэнажор «Вершаваныя і празаічныя творы»). Як называецца сугучнасць складоў у канцы радкоў?
7. Праверце свае веды па раздзеле (тэст «У вершах і ў прозе»).

Спампавана з сайта www.aversev.by

Загадкавая краіна паэзія

Паэзія — самы няўлоўны сакрэт,
Які не будзе нікім рассакрэчаны...

Пімен Панчанка.

Пасля гэтых слоў Пімена Панчанкі, узятых у якасці эпіграфа, не можа не ўзнікнуць пытанне: для чаго ж тады шукаць разгадку таямніц паэзіі? Навошта гэтыя цяжкія і разам з тым дарэмныя намаганні?

Аднак сэнс, напэўна, ёсць! І вельмі сур'ёзны! Бо колькі існуе чалавецтва і развіваецца мастацтва слова (і гэта не адно тысячагоддзе!), людзі шукаюць разгадку таямніц паэзіі. Шукаюць яе, калі задумваюцца над тым, чаму так хвалюе добрая песня, чаму так прываблівае, кранае хораша і дасціпна сказанае слова. Пра тайны паэзіі многа разоў выказваліся самі паэты, даследчыкі літаратуры, крытыкі.

! Беларуская паэтэса Ніна Мацяш так расказвае пра нараджэнне верша: «Нараджэнню верша заўсёды папярэднічае нейкае несвядомае ўнутранае накапленне, а тады ўжо часта дастаткова літаральна дробязі — рэплікі, руху, промня на вадзе, начніцы ў святле вулічнага ліхтара — і раптоўна ўсярэдзіне нешта затрымціць, і густы, неўразумелы гул (яго прыблізна можна зраўнаць з гулам нябачнага мора) уладна запаўняе ўсю істоту, зводзіць свядомасць да аднаго — да напружанага ўслухоўвання ў самога сябе, дзе з нейкіх нетраў да яе прабіваюцца першыя словы, музыка першых радкоў... Гэта немагчыма вытлумачыць!»

Атрымліваецца, як у той казцы пра зачараваны скарб. Увесь свой век герой настойліва шукае скарб. Сам не знаходзіць —

Спампавана з сайта www.aversev.by

працягваюць пошукі яго дзеці, унукі, праўнукі, потым і іх дзеці. Але чаму? Ды таму, відаць, што з гэтым звязана нешта вельмі важнае для іх — надзеі і мары пра лепшае, прыгажэйшае жыццё, жаданне чагосьці нязвыклага, прывабнага і сапраўды таемнага, загадкавага.

Сакрэты паэзіі. Сакрэты паэзіі сапраўды вельмі няпростыя, аднак яна, нібы тая далёкая зорка ці прыгожая экзатычная краіна, што ўяўляецца нам у снах ці марах, кліча да сябе, прываблівае ўсіх, хто неабыякавы да прыгожага, узвышанага.

І для тых, хто вельмі хоча пазнаць яе, паэзія ўсё ж прыадкрывае свае тайны. Праўда, пры гэтым яна яшчэ больш заварожвае сваімі загадкамі. Хто хоць раз дакрануўся сэрцам, душой да паэзіі, той ужо ніколі не пазбавіцца цягі да прыгажосці, заключанай у паэтычным слове.

Вось так вобразна пра яе гаварыў наш выдатны паэт Максім Танк:

...Паэзія — гэта адвечная цяга
Вяршынь да нябёс,
А траваў і дрэваў —
Да сонца.
Паэзія — гэта вясёлкавы мост
Ад сэрца людскога
Да мары...

Іншымі словамі, паэзія — гэта тая сіла, што надае высокі сэнс жыццю, робіць яго змястоўным і прывабным, абуджае ў чалавеку нястрымнае памкненне да прыгажосці, гармоніі са светам.

Паэзія з'яўляецца невычэрпнай крыніцай духоўнага хараства нашага народа. Менавіта паэзія прамаўляе нашы запаветныя мары і спадзяванні, вучыць праўдзе і чалавечнасці.

Толькі ёй пад сілу ўзняць душу чалавека над будзённасцю.

Час здольны змяніць свет, высушыць рэкі і занесці пяском гарады. Але, як адзначаюць самі паэты, крыніца паэзіі нязменна будзе бруіць з чалавечай душы, з самага сэрца народа. Гэта крыніца непадуладная часу.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Максім Танк

ПАЭЗІЯ

Я ведаў, што ты — бліскавіца,
Што хмары рассекла;
Я ведаў, што ты — вызваленне
З няволі і пекла,

Вясновая кветка,
Што камень прабіла магільны,
Разведчыка след
На дарозе крамністай і пыльнай;

Я ведаў, што ты — пацалунак,
Ты — дружба і радасць,
Ты — чорствага хлеба скарынка
І сок вінаграда.

А ты аказалася большым:
Ты — кроў, што пульсуе па жылах,
Ты — сонца, якое
Прасторы святлом азарыла,

І без чаго, як без маці
Або без радзімы,
Ні нараджацца, ні жыць
На зямлі немагчыма!

1. З чым параўноўваецца ў вершы паэзія?
2. Чаму, на вашу думку, аўтар дае так многа яе азначэнняў, супастаўленняў з рознымі прадметамі і з'явамі жыцця? Ці можа гэта сведчыць пра тое, што змест паэзіі нельга вызначыць адным-двума словамі, што сама паэзія патрабуе адрозных, кантрасных вобразаў-параўнанняў?
3. Якія вобразна-выяўленчыя сродкі дапамагаюць аўтару стварыць такія запамінальныя вобразы паэзіі? Які з іх пераважае?

Спампавана з сайта www.aversev.by

4. Якую інтанацыю (спакойную, разважлівую ці, наадварот, напружаную, узнёслую) вы выбераце для выразнага чытання верша? Абгрунтуйце свой выбар.

5. Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Ісаака Давідовіча «Вершы». Ці можна сцвярджаць, што мастацкая ідэя верша адпавядае зместу мастацкага палатна? Свой адказ абгрунтуйце.

І. Давідовіч. Вершы

ПРА ВЕРШАСКЛАДАННЕ

Рытм і яго роля ў вершы. Найважнейшай адзнакай верша з'яўляецца ***рытм***. Рытмічнае гучанне вершаванай мовы дасягаецца перш за ўсё раўнамерным чаргаваннем націскных і ненаціскных складоў або паўтарэннем асобных груп складоў, сярод якіх абавязкова ёсць адзін націскны, а пры ім адзін або два ненаціскныя. Такія групы складоў называюцца ***стопамі***. Напрыклад, возьмем радок з твора «У яго быў свет цікавы...»:

Ло́віць сэ́рцам спе́ў прыго́жы...
— — — — — — — —

Як бачым, у гэтым радку націскі падаюць на кожны няцотны склад (першы, трэці, пяты, сёмы) і такім чынам утвараюць чатыры двухскладовыя стапы. Раздзелім іх вертыкальнымі рыскамі:

— — | — — | — — | — —

Двухскладовая стапа з націскам на першым складзе называецца ***харэем***. Яна ў радку паўтараецца чатыры разы, таму ***вершаваны памер*** вызначаецца як чатырохстопны харэй.

Двухскладовыя і трохскладовыя стопы. Стопы ў вершах бываюць двухскладовыя (харэй, ямб) і трохскладовыя (дактыль, амфібрахій, анапест). На схеме яны выглядаюць так:

Спампавана з сайта www.aversev.by

харэй ___́ ___
ямб ___ ___́
дактыль ___́ ___ ___
амфібрахій ___ ___́ ___
анапест ___ ___ ___́

Усе гэтыя стопы і вершаваныя памеры прыведзены і тлумачацца ў «Слоўніку». Звярніцеся да яго і ўважліва перачытайце працытаваныя там вершы. Паспрабуйце перадаць іх рытмічныя асаблівасці ў схемах радкоў.

! Назва *харэй* паходзіць ад грэчаскага слова, якое перакладалася як «танцавальны». А *ямб* атрымаў сваю назву ад імя міфічнай служанкі Ямбі, якая спявала багіні Дэметры вясёлыя песні. Таму гэты памер супрацьпастаўляецца як «спеўны» «танцавальнаму» харэю.

Адметнасці вершаў. Памер верша залежыць не толькі ад стапы, але і ад колькасці стоп у радку. Даўжыня радка моцна ўплывае на гучанне верша, на яго рытм. Параўнаем два вершы:

Паміж пу́стак, бало́т белару́скай зямлі́...
Янка Купала. «Курган».

Схема радка:

___ ___ ___́ | ___ ___ ___́ | ___ ___ ___́ | ___ ___ ___́

Стапа анапеста паўтараецца чатыры разы, гэта значыць, перад намі чатырохстопны анапест. А вось у вершы Я. Коласа «Ручэй» — двухстопны анапест:

Між але́шын, кусто́ў...
___ ___ ___́ | ___ ___ ___́ |

І ў першым, і ў другім вершы анапест, але гучанне радкоў рознае.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Рытм у вершы ствараецца не толькі чаргаваннем стоп і іх колькасцю ў радку, але і паўтарэннем саміх радкоў, што асабліва заўважаецца дзякуючы ***рыфме*** — сугучнасці канчаткаў:

Наш мілы дзядзька, наш Антон**і**,
Ў дзіцячым часта быў палон**е**...

Рытм верша ствараецца таксама і паўтарэннем ***строф*** — роўных частак верша з аднолькавай колькасцю радкоў, аб'яднаных пэўнай рыфмоўкай:

На усходзе неба **грае**
Пераліўным ***блескам***.
Сыпле золата над **гаем**
І над ***пералескам***.

Чуць-чуць дрогне, **праліецца**
Чырвань на ***усходзе*** —
Гэта неба **усміхнецца**
Людзям і ***прыродзе***...

Якуб Колас. «Усход сонца».

Страфа ў паэтычных творах мае важнае значэнне. Паўтараючыся, строфы надаюць вершу большую рытмічнасць, дзеляць яго на роўныя часткі, у аснове якіх ляжыць пэўная інтанацыя і нават пэўная закончаная думка (як абзацы ў празаічнай мове).

1. Як дасягаецца рытмічнае гучанне вершаванай мовы?
2. Чым адрозніваюцца двухскладовыя стопы ад трохскладовых?
3. Складзіце памятку «Як вызначаюцца вершаваныя памеры».
4. Да вершаваных радкоў падбярыце адпаведную рыфму (трэнажор «Вучымся кіраваць рыфмай»).
5. Што такое страфа ў вершы? Чым яна нагадвае абзац у празаічным творы?
6. Адкажыце на пытанні віктарыны па вершаскладанні.
7. Суаднясіце назвы вершаваных памераў з іх схемамі — ямб, харэй, дактыль, амфібрахій, анапест.

__́ __; __ __́ __; __ __ __́; __ __́; __́ __ __.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Раней гімназістаў вучылі пісаць вершы, а ў дапамогу ім выдаваліся слоўнікі рыфм. На самай справе паэзіяй такі занятак ніяк не назавеш, а вось цікавай гульнёй — можна. І называецца яна бурымэ.

Напрыклад:

Хай кожнаму ў жыцці шанцуе,
Хто нашы прыказкі шануе.

Прафесіяналізм бурыміста заключаецца ў тым, каб імгненна рыфмаваць.

8. Праект «Майстэрства рыфмоўкі» прадугледжвае назіранне за спосабамі рыфмоўкі канкрэтнага аўтара. Занатуйце рыфмы М. Багдановіча. Паспрабуйце пераняць манеру аўтара, навучыцца бачыць знешняе падабенства супрацьлеглых паняццяў, і як вынік — спасцігнуць майстэрства рыфмоўкі.

Максім Багдановіч

МАЁВАЯ ПЕСНЯ

Музыка перш за ўсё...
Поль Верлен[1].

Па-над белым пухам вішняў,
Быццам сіні аганёк,
Б'ецца, ўецца шпаркі, лёгкі
Сінякрылы матылёк.

Навакол усё паветра
Ў струнах сонца залатых,
Ён дрыжачымі крыламі
Звоніць ледзьве чутна ў іх.

І ліецца хваляй песня —
Ціхі, ясны гімн вясне.
Ці не сэрца напявае,
Навявае яго мне?

[1] *Поль Верлéн* (1844—1896) — французскі паэт.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Ці не вецер гэта звонкі
Ў тонкіх зёлках шапаціць?
Або мо сухі, высокі
Ля ракі чарот шуміць?

Не паняць таго ніколі,
Не разведаць, не спазнаць:
Не даюць мне думаць зыкі[1],
Што ляцяць, дрыжаць, звіняць.

Песня рвецца і ліецца
На раздольны, вольны свет.
Але хто яе пачуе?
Можа, толькі сам паэт.

Што, на вашу думку, яднае твор жывапісу і верш М. Багдановіча?

Э. Рымаровіч. Вясна на возеры Баторына

! Верш М. Багдановіча «Маёвая песня» — адзін з лепшых пейзажных твораў беларускай паэзіі, жывапіс словам і музыка ў слове. Нездарма эпіграфам да яго ўзяты радок з верша французскага паэта з беларускімі каранямі Поля Верлена: «Музыка перш за ўсё...».

1. Якія пачуцці выклікаў у вас гэты верш? Прачытайце яго яшчэ раз, услухайцеся ў яго гучанне, пастарайцеся ўлавіць агульны настрой, заўважыць словы і выразы, што перадаюць гукі прыроды.

[1] *Зы́кі* — гукі.

Спампавана з сайта www.aversev.by

2. Знайдзіце ў вершы паэтычныя азначэнні — эпітэты. Зачытайце тыя з іх, якія дапамагаюць перадаць шматколернасць і шматгалоссе веснавога дня.
3. Адшукайце ў вершы маляўнічыя выразы, пры дапамозе якіх ствараецца вобраз прыроды. Прыслухайцеся да гучання наступных радкоў:

Ці не вецер гэта звонкі
Ў тонкіх зёлках шапаціць?
Або мо сухі, высокі
Ля ракі чарот шуміць?

Якая з'ява прыроды перадаецца праз паўтор зычных гукаў (тут — ***ц, ч, з, с, ш, х***)?
4. Звярніце ўвагу, як мякка, меладычна гучаць радкі:

Ці не сэрца напявае,
Навявае яго мне?

З дапамогай паўтарэння якіх гукаў дасягаецца такая меладычнасць?
5. Якую ролю адыгрываюць у вершы дзеясловы? У якім часе яны паказваюць дзеянне і як гэта ўплывае на ўспрыманне вобраза прыроды?
6. Праслухайце песню Ігара Паліводы на тэкст гэтага верша і выкажыце сваё ўражанне ад музычнага твора.
7. Вызначце памер верша паводле радка «*Б'ецца, ўецца шпаркі, лёгкі...*».
8. Паспрабуйце ўзнавіць паэтычнае апісанне веснавога дня ў вершы М. Багдановіча (трэнажор па вершы М. Багдановіча «Маёвая песня»). Абгрунтуйце меркаванне, што верш раскрывае яшчэ адну невычэрпную крыніцу паэзіі — зачараванне прыгажосцю прыроды, гармоніяй яе фарбаў і гукаў.

! Да з'яўлення твораў мастакоў-імпрэсіяністаў (ад фр. *impression* — уражанне), якія шукалі новыя спосабы для выражэння адценняў перажывання або думкі, у мове мастацкай літаратуры выкарыстоўвалі, пераважна, звыклыя прыметнікі для перадачы колераў: чырвоны, аранжавы, жоўты, сіні, зялёны, блакітны, фіялетавы. Імпрэсіяністы ўвялі моду на паўтоны. Ім не хапала звычайнай слоўнай колеравай палітры. Тады з'явіліся такія колеры: фісташкавы, каралавы, колер фуксіі і інш.

Спампавана з сайта www.aversev.by

9. Праект «Ці можа слова фарбу перадаць?». Складзіце слоўнік «Фарбы прыроды Беларусі». Для абазначэння колераў прыдумайце назвы, блізкія да нашых рэалій (напрыклад, бурачковы, саламяны, верасовы і інш.). Ваша работа стане надзейным памочнікам паэтам-пачаткоўцам. Паспрабуйце самі скласці верш (вершаваныя радкі) з выкарыстаннем новых колераў.

10. Наведайце літаратурны музей М. Багдановіча ў Мінску ці наладзьце завочную экскурсію, каб паглыбіць свае веды пра асобу пісьменніка.

11. Вывучыце верш на памяць.

ПРА ГУКАПІС

Выяўленчыя сродкі мовы ў мастацкіх творах бываюць розныя. Стварацъ вобразы, карціны пісьменнік можа пры дапамозе ***тропаў*** — слоў або выразаў у пераносным значэнні (эпітэтаў, параўнанняў, метафар і інш.); паэтычных фігур, а таксама шляхам гукавой арганізацыі мовы сказа або вершаванага радка. Ужыванне пісьменнікам тропаў, а таксама іншых паэтычных сродкаў, абумоўлена характарам твора, залежыць ад яго тэмы, мастацкай ідэі, яго характару, жанру. Пісьменнік карыстаецца тымі сродкамі моўнай выразнасці, якія найбольш дапамагаюць раскрыць аўтарскую задуму. Ён працуе над кожным сказам, дабіваецца мілагучнасці мовы, стараецца пазбегнуць такіх гукавых спалучэнняў, якія перашкаджаюць чытанню сказа, адцягваюць увагу ад яго зместу.

Адным з відаў інструментоўкі верша з'яўляецца ***гукапіс*** — ужыванне ў мастацкім, пераважна вершаваным, тэксце аднолькавых або падобных гукаў, якія ўзмацняюць мілагучнасць і сэнсавую выразнасць мовы. Паўтарэнне аднолькавых галосных гукаў, якое дапамагае стварэнню вобраза, называецца *асанансам*, паўтарэнне зычных гукаў — *алітарацыяй*.

Чытаючы вершы, мы не задумваемся, якая складаная і напружаная праца пісьменніка схавана за імі, як адшліфаваны кожны сказ, дапасавана кожнае слова. Гукавая арганізацыя мовы (інструментоўка) у мастацкіх творах не зводзіцца толькі да мілагучнасці, яснасці сказа, выразнасці радка. Дзякуючы

Спампавана з сайта www.aversev.by

адпаведнаму падбору гукаў пісьменнік можа ствараць вобраз, перадаваць гукавое ўражанне ад жыццёвых з'яў: свіст ветру, шум лесу, журчанне ручайка, шорах каласоў, шум гарадской вуліцы...

Знайдзіце ў раней вывучаных творах прыклады гукапісу. Вызначце яго ролю ў стварэнні паэтычнага вобраза.

Данута Бічэль

РОДНАЕ СЛОВА

Пад казачным дубам над Нёманам сінім
хлапец прызнаваўся ў каханні дзяўчыне.
І рэхам той шэпт адгукаўся між гаю:
— Кахаю... кахаю... кахаю... кахаю...

Я чула пяшчотнае, шчырасці поўнае,
маё, беларускае, роднае, кроўнае,
такое раптоўнае, такое чароўнае.
Такое ласкавае, цёплае, чыстае,
як сонца, агністае, як Нёман, празрыстае,
як казка, быліна, як песня, жаданае,
дагэтуль зусім у жыцці не спазнанае,
вясновае слова ад шчырага сэрца.
Яно празвінела над хвалямі ў рэчцы.
Вятрыска шаптаў яго з лісцем між гаю —
кахаю, кахаю... кахаю, кахаю...
Шапталі яго сенажаць і дуброва —
людзьмі перачутае, некаму нова,
адзінае, дзіўнае, светлае слова...
Кахаю... Люблю...
Беларускаму краю
бясконца я слова «люблю» паўтараю.
Калоссям жытнёвым, зялёнай дуброве
кажу гэта слова на матчынай мове.

Спампавана з сайта www.aversev.by

1. Якім пачуццём прасякнуты верш?
2. Вызначце тэму верша. Звярніце ўвагу на тое, як па-асабліваму раскрываецца яна ў творы.
3. Знайдзіце ў вершы радкі, у якіх характарызуецца роднае слова. Назавіце паэтычныя азначэнні, праз якія аўтар выяўляе свае адносіны да матчынай мовы. Зачытайце іх з адпаведнай інтанацыяй (спакойна-апавядальнай, усхваляванай, замілаванай, урачыстай ці якой іншай).
4. Як уплывае на гучанне верша рыфма? Звярніце ўвагу на паўтарэнне галосных гукаў ***о***, ***а*** ў словах, якія рыфмуюцца. Вызначце вершаваны памер.
5. У вершы некалькі разоў паўтараецца радок *«...Кахаю, кахаю...»*. Што нагадвае вам гучанне гэтага паўтора?
6. Узнавіце радкі — прызнанне ў любові да роднага краю (трэнажор па вершы Д. Бічэль «Роднае слова»).

Мікола Арочка

ХЛЕБ РОДНАЙ МОВЫ

Шчодрым дамашнім богам
Ляжыць на стале маім бохан —
Па зярнятку з вякоў назапашаны,
У дзяжы ліхалеццяў заквашаны,
Замяшаны на мудрасці, поце
І апалены духам на подзе[1]
Жыцця!
Як ніколі я сёння жадзён яму,
Гэтаму хлебу надзённаму!
Лусту кладу на настольніцы,
Крою дзецям: ешце па поўніцы!

[1] *Под* — ніжняя паверхня ў печы, на якой выпякалі хлеб; тут: складаны і пакутлівы працэс станаўлення, загартавання беларускага народа і яго мовы.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Калі выпадзе з рук — абдзьмухніце,
Не кідайцеся ім, не тапчыце!
Наядайцеся змалку уволю,
Каб ён вечна вам пах
Родным полем,
Баравінай, зялёнай лагчынай
І рукамі матулі,
Айчынай!

1. Традыцыйна хлеб лічыцца асновай жыцця чалавека. Спрадвеку да яго ставіліся з вялікай любоўю і павагай. Прыгадайце знаёмыя вам народныя выслоўі, дзе хлеб выступае сімвалам дабрабыту чалавека.
2. Хлеб і Радзіма — паняцці роднасныя, надзвычай значныя для чалавека. Які яшчэ складнік нацыянальнай культуры беларусаў дае падставу паэту назваць верш «Хлеб роднай мовы»?
3. Назавіце сродкі мастацкай выразнасці, якія дапамагаюць зразумець, што ў вершы гаворыцца не толькі пра хлеб, але і пра складаны працэс фарміравання нашай мовы.
4. Чаму менавіта сёння, як ніколі раней, аўтар *«жадзён яму, гэтаму хлебу надзённаму»*? Чым можна патлумачыць такую вострую патрэбу (надзвычай смачнымі гатункамі хлеба; хваляваннем, што аднойчы сярод шматлікіх прысмакаў можа не знайсціся хлеба; трывогай, што аднойчы можна назаўсёды пазбавіцца роднай мовы, ці нечым іншым)?
5. Знайдзіце і зачытайце вершаваныя радкі, у якіх перададзена любоў аўтара да дарагіх яго сэрцу рэчаў, да роднай зямлі, выказаная як запавет нашчадкам.
6. Прыгадайце вершы, прысвечаныя роднай мове. Што вы ведаеце пра складаны шлях яе станаўлення?

Спампавана з сайта www.aversev.by

Еўдакія Лось

ДЗЯЎЧАТЫ МІНУЛАЙ ВАЙНЫ

Якімі толькі мянушкамі
Не клікалі гэтых салдат
З няпудранымі вяснушкамі,
У шынялях да пят!..
Крочылі полем спаленым,
Шляхамі страшнай вайны,
І плакалі на развалінах,
І мерзлі ў акопах яны...
У лужах сцюдзёных мыліся,
Прычэсваліся пад дажджом,
Па косах сваіх журыліся
Пад гулкі гарматны гром...
Паходамі, зброяй занятыя,
Справай ваеннай пары,
Былі яны проста дзяўчатамі,
Што там ні гавары.

Параўнайце вобразы дзяўчат на вайне, створаныя мастаком і паэтам. Што агульнае і адрознае ў настраёвасці мастацкага палатна і вершаванага твора?

Р. Кудрэвіч. Вясна. 1945

Спампавана з сайта www.aversev.by

Пужаліся свісту міны,
Чужых незычлівых вачэй,
А гінулі — як мужчыны,
Абняўшы зямлю ямчэй.

1. Праз якія мастацкія вобразы паэт перадае мастацкую ідэю верша? Вызначце ролю сродкаў мастацкай выразнасці ў раскрыцці тэмы твора.
2. У якіх вершаваных радках найбольш выразна перададзена трагедыя дзяўчат на вайне? Зачытайце іх з адпаведнай інтанацыяй.
3. Звярніце ўвагу на рыфму і вызначце яе ролю ў вершы:

   ...гэтых салдат — у шынялях да пят...
   ...у лужах мыліся — па косах журыліся...
   ...зброяй занятыя — былі проста дзяўчатамі...

4. Як аўтар ставіцца да такой з'явы, як жанчына на вайне?
5. Праслухайце музычны твор Дзмітрыя Кабалеўскага «Рэквіем». Які настрой выклікаў у вас музычны твор? Чым сугучны ён з пачуццямі, якія ўзніклі пры чытанні верша? Знайдзіце ў «Слоўніку» азначэнне слова *рэквіем*.

Ніл Гілевіч

МАЦІ

Я ўзыходжу на двор,
Я кажу ёй: «Са святам!» —
І цалую знаёмыя родныя вусны,
І бяру пад руку,
І іду з ёй у хату,
Дзе ад прыпечка б'е
Дух гарачы капусны.

Я гляджу ў яе вочы,
Што свецяцца шчасцем,
Гладжу рукі сухія,
Прапахлыя зеллем,
І хілюся да сэрца...

Спампавана з сайта www.aversev.by

А трэба б упасці
Перад ёю — нядужнай, сівой —
На калені...

Вочы маці!
У доўгія зімнія ночы
Вы над намі
Вясёлымі зоркамі ззялі,
Вы ў нясцерпнай дрымоце
Зліпаліся, вочы,
І ўсё ж усміхаліся нам,
Забаўлялі...

Рукі маці!
Вы ў працы не зналі прынукі,
Вы насілі штогод
Мазалі́, як бабіны,
Вы аж нылі увечары,
Мілыя рукі,
Спавіваючы нас
Перад сном галубіным.

Сэрца маці!
Наш боль быў тваім,
Не іначай,
Сорам наш
Ты насіла вялізарным горам,
Кропля ж кожная
Радасці светлай дзіцячай
Напаўняла цябе,
Разлівалася морам...

А цяпер ёй —
Адно б на сынка наглядзецца...
Жаль, і горыч, і боль
Мне душу працінае:

Спампавана з сайта www.aversev.by

Як жа позна,
Як позна — любімыя дзеці —
Мы няўдзячнасць сваю
Разумець пачынаем...

1. Чым вас кранула споведзь сына? Зачытайце радкі, якія сведчаць, што да маці вярнуўся ўжо дарослы сын.
2. Герой верша перадае палітру пачуццяў, звязаных з вобразам маці. Да прапанаваных паэтычных вобразаў падбярыце адпаведныя вершаваныя радкі і патлумачце іх. Напрыклад: *мацярынскае сэрца* — увасабленне дабрыні, спагадлівасці, любові, самаахвярнасці — *«Наш боль быў тваім..., / Сорам наш / Ты насіла вялізарным горам...»*; *вочы маці* — увасабленне чысціні, радасці, пяшчоты — ...; *рукі маці* — увасабленне штодзённай непасільнай працы і клопату пра дзяцей — ... .
3. Назавіце вобразна-выяўленчыя сродкі, якія дапамагаюць перадаць сыноўнія пачуцці.
4. Вызначце ролю шматкроп'яў у канцы строф.
5. Як вы разумееце наступныя радкі:

Як жа позна,
Як позна — любімыя дзеці —
Мы няўдзячнасць сваю
Разумець пачынаем...?

Паразважайце, як трэба адносіцца да маці, каб пазбегнуць запозненага шкадавання пра сваю няўдзячнасць.

6. Прыгадайце вершы, прысвечаныя маці. Падрыхтуйце паштоўку з цёплымі словамі самаму дарагому чалавеку.

ПРА ПАДТЭКСТ

Сакрэты ў паэзіі розныя і часта нечаканыя. Адзін з іх — незвычайная сціслась і разам з тым змястоўнасць паэтычных твораў, шматзначнасць кожнага слова, кожнага гука, нават паўзы ў вершы. Усё тут можа набываць асаблівае значэнне: не

Спампавана з сайта www.aversev.by

толькі думкі, заключаныя ў словах, але і тое, што не выказваецца, а падразумяваецца. Творы паэзіі надзвычай багатыя рознымі вобразнымі выразамі — параўнаннямі, метафарамі, паэтычнымі фігурамі. Гэта робіць іх мову мнагазначнай, патрабуе пры аналізе асаблівай увагі да кожнай умоўнасці, падрабязнасці.

Так узнікае падтэкст.

Верш Н. Гілевіча «Маці» — хвалюючы маналог пра маці як самага дарагога чалавека, пра бязмежную любоў да яе, сыноўнюю ўдзячнасць, хоць і запознена выказаную.

Верш М. Арочкі «Хлеб роднай мовы» — таксама задушэўны маналог аўтара, на першы погляд, здаецца, пра свежы і духмяны бохан хлеба. Але асноўная думка як бы стоена паміж словамі, прыхавана за імі — беларускі народ і яго родная мова прайшлі доўгі і пакутлівы шлях станаўлення і загартоўкі, пакуль дачакаліся росквіту. Гэта думка адчуваецца ў інтанацыі, у змястоўных паўзах паміж словамі, нібыта падказана зместам папярэдніх радкоў верша.

Гэта асабліва важна, калі мы чытаем такі твор уголас, хочам перадаць сваім слухачам усе адценні зместу. Не толькі тыя, што вымаўляюцца словамі, але і тыя, што схаваны за словамі. Яны перадаюцца пры чытанні пры дапамозе адпаведнага тону, інтанацыі, выразу вачэй або твару, гэта значыць пры дапамозе адпаведнай мімікі, а таксама адпаведных позы і жэстаў.

Падтэкст — спосаб паказу жыццёвай з'явы, калі важныя думкі і пачуцці не выказваюцца непасрэдна, адкрыта, а як бы стоены за іншымі словамі, узгадваюцца па інтанацыі, намёку.

Прывядзіце прыклады вядомых вам вершаў з выразным падтэкстам. Якую ролю ён выконвае ў паэтычных творах?

Спампавана з сайта www.aversev.by

Якуб Колас

ДЗЯДЗЬКА-КУХАР

(Урывак з паэмы «Новая зямля»)

Наш дзядзька, мілы наш Антоні,
Ў дзіцячым часта быў палоне;
Вось так гуртом яго абсядуць
І час работы яго крадуць;
Насі «катла»[1], кажы ім казкі,
Ідзі на поплаў з імі ў краскі[2],
Давай адказы на пытанні,
Тлумач ты ім усё дазвання:
Адкуль, з чаго дзе што бярэцца,
Вось гэта, тое як завецца
І чаму так, чаму не гэтак?
Прыхілен дзядзька быў да дзетак.
Ён быў настаўнікам, суддзёю,
Калі, бывала, між сабою
Паспораць дзеткі ці паб'юцца,
Дык да каго тады звярнуцца,
Як не да дзядзькі, да Антося?
Ох, слаўна з дзядзькам ім жылося!
Яшчэ замецьце, што з малымі
Ён размаўляў, як са старымі,
І з імі радзіўся, спрачаўся —
Як роўны з роўнымі трымаўся!
Калі ж хто часам з ім не зладзіць,
То дзядзька толькі вус пагладзіць,
Але не скажа ён нічога,
Бо ведаў, чым даняць малога, —

В. Шаранговіч. Дзядзька-кухар

Л. Ран. Дзядзька Антось

Параўнайце вобразы дзядзькі Антося на рэпрадукцыях карцін.
З дапамогай якіх дэталей мастакі перадаюць свае адносіны да героя?

---

[1] *Насі́ць катла́* — занятак з дзецьмі: гуляць з малым, носячы яго за плячыма.

[2] *Кра́скі* — кветкі.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Прапануйце жыццёвую сітуацыю да фразеалагізма *закідваць вуды*. Патлумачце іншыя ўстойлівыя спалучэнні слоў, ужытыя ў творы.

Гаворыць з тым, з кім дзядзька ў згодзе.
— Калі такі ён, ну, то годзе! —
І дзядзька змоўкне, пачакае,
Кісет дастане і закурыць
І вочы чутачку прыжмурыць,
Як бы і ў памяці не мае
Таго, што з хлопцам пасварыўся.
— А як авёс наш урадзіўся?
Схадзіць бы ў Ліпава пабачыць! —
Ўжо знаюць дзеці, што то значыць
Гаворка дзядзькава такая,
Куды ён вуды закідае:
У Ліпава пайсці з ім! Божа!
І хто ўстаяць прад гэтым зможа?
Ды гэта ж — свята, ягамосці[1]!
Набок тут норавы і злосці!
І мяккім робіцца паганы —
Хоць ты яго кладзі да раны.
Адно вазьмі яго з сабою,
Усюды пойдзе за табою
І ўсё забудзе, ўсё даруе,
На дзядзьку больш не засярдуе.
А чым жа Ліпава так міла?
Чым так дзяцей яно маніла?
І што за Ліпава такое?
А гэта — поле маладое
Сярод лясоў, як скінуць вокам;
На тым абшары на шырокім
Раскошна нівы красавалі,
А ў іх мільёны красак ззялі,
Як бы на небе тыя зоркі.
Лужкі, дарожкі і пагоркі,

[1] *Ягамо́сці* — яго, ваша міласць (форма звароту да каго-небудзь).

Спампавана з сайта www.aversev.by

І купкі хвоек маладыя,
Дзе матылёчкі залатыя
На сонцы крыльцамі блішчалі,
Жучкі і конікі трашчалі
І ў стройны звон свой зык злівалі.
Былі там пасекі. Штогоду
Тут сотні блізшага народу
Дзялянкі лесу карчавалі
І на трацяк[1] іх засявалі —
Капу[2] да скарбу[3], дзве дадому...
Ну, як тут вытрываць малому,
Таму, хто з дзядзькам пасварыўся?
Як бачыш, з дзядзькам ён гадзіўся.
А пойдзеш ў Ліпава лясамі,
Напэўна стрэнешся з ласямі,
І зайца ўгледзіш, і вавёрку,
І норы воўчыя на ўзгорку...
Ну, ўсякіх дзіў там ёсць багата!
А дзядзька ўсё табе пакажа.
Цікавасць ўсю тваю развяжа...
О, дзядзька спосабаў меў многа
Даняць праціўніка малога!
Пайсці ў грыбы ці ў тую ж рыбу,
Або паехаць у сялібу,
Ці ў млын малоць на хлеб збажынку —
Ўсё гэта квапіла хлапчынку,
Цягнула крэпенька, бывала,
І, як рукою, злосць знімала.
І дзядзька майстар быў на штукі,
І быў механік на ўсе рукі:
І дудку скруціць вам, і стрэлку

Прыгадайце, як дзядзька Антось наладжваў добразычлівыя адносіны з пляменнікамі.

[1] *Трацяк* — трэцяя частка чаго-небудзь (ураджаю, сенакосу).
[2] *Капа́* — тут: старая мера лічэння — 60 штук.
[3] *Скарб* — тут: дзяржаўная казна.

Спампавана з сайта www.aversev.by

І нарысуе нават елку, —
Такую выштукуе цацку;
А ў Свержань пойдзе — купіць пляцку[1]...
Дык і не дзіва, што любілі,
Што на руках яго насілі.
А жывучы каля зямлянкі,
Паміж лясоў, сярод палянкі,
Яшчэ крапчэй яны здружылісь,
Адзін к другім цясней хілілісь.
— Ану, давай, брат, запрабуем,
Хоць на цікавасць пакаштуем,
Які тут сок на новым месце?
Мо з хлебам можна яго есці?
— А дзядзечка! Мой залаценькі!
Пастаў нам соку, дарагенькі!
— Вазьмі, вазьмі мяне з сабою! —
Тут каля дзядзькі чарадою,
Як чэрві, дзеці мітусяцца.
А дзядзька моўчкі стаў збірацца:
Дастаў сякерку і свярдзёлак,
Пад паху сунуў ён аполак[2]
На латакі[3] і на падстаўкі
Ды вынуў два гаршкі з-пад лаўкі.
— Ну, хто са мною йдзе? — пытае.
— Я!
— Я!
— І я! — крычыць малая
Ў канцы дзяўчынка Міхаліна...
Ідуць у лес, крычаць, гукаюць,
Як вучні, вырваўшыся з школы,

---

[1] *Пля́цка* — булачка ў выглядзе аладкі, спечаная з пшанічнай мукі.

[2] *Апо́лак* — выпуклая з аднаго боку дошка, якая атрымліваецца пры апілоўцы бярвення.

[3] *Лата́к* — адкрыты жалабок для сцёку.

Спампавана з сайта www.aversev.by

І ўсе давольны і вясёлы —
А дзядзька ўперадзе тралюе
І галаву ўгару ўскідае,
Бярозу добрую шукае,
З салодкім сокам, баравую,
Дзе б бобам кропелькі сачылісь.
Знайшлі бярэзіну, спынілісь.
Залысіў дзядзька дрэва злёгку
(Сякерка востра, кара крохка),
Зрабіў заруб, латак прыправіў,
А пад латак гаршчок паставіў.
І соку кропелькі, як слёзы,
Як град, пасыпаліс з бярозы,
Аж шкода нейк было дзярвякі:
Здаваліс ранай тыя знакі,
Адкуль паліўся сок халодны
І пакідаў свой комель[1] родны.
Я помню дзень той. Вечарэла,
Зайшло ўжо сонейка, цямнела,
Агоньчык дзеці раскладалі,
Паленцы, трэсачкі збіралі,
І дзядзька тут жа, распрануўшысь,
Сядзеў на кукішках, сагнуўшысь.
Прад ім стаяў гаршчок, і міска,
І кошык з бульбай; тут жа блізка
Відзён і збан быў паліваны,
Да палавіны ў дол ўкапаны,
Кружочкам шчыльненька накрыты...
— Алеська! Скокні, брат, вазьмі ты
У хатцы тарачку[2] на печы!
Ну, варушыся ж ты, старэчы! —

Знайдзіце ў тэксце апісанне гаспадарчых рэчаў, якія спатрэбіліся дзядзьку Антосю для прыгатавання клёцак, і патлумачце іх прызначэнне.

[1] *Ко́мель* (каме́ль) — ніжняя частка дрэва.

[2] *Та́рачка* — прадмет кухоннага ўжытку — металічная пласцінка з дзірачкамі, якая служыць для расціравання чаго-небудзь (рус. *тёрка*).

Спампавана з сайта www.aversev.by

Наўкол пляменнікі сядзелі,
На дзядзьку пільна ўсе глядзелі,
Як ён, рукавы закасаўшы,
Па тарцы шоргаў, шапку зняўшы.
І кожны лёгка б дагадаўся,
Што тут сакрэт якісь хаваўся,
Памеркаваўшы, як цікава
Была для хлопцаў гэта справа
І як іх дзядзька завіхаўся.
А хто б яшчэ мог болей цяміць,
Таму б адразу прыйшло ў памяць,
Што дзядзька бульбу драў на клёцкі,
Каб згатаваць не па-жаноцку.
Бо што жанкі? Раз што панята,
Ноль — слова нашага ім брата;
Як іх на розум тут ні ставяць,
Яны ж сваё ўсё права правяць
І робяць так, як і рабілі,
Калі пяшком пад стол хадзілі.
Але вось ён пакажа носа,
Стварэнне вы доўгавалоса,
Калі ён тут пагаспадарыць
І сам ды з сокам клёцкі зварыць!
Вось будзе штука вам, дык штука!
На тое ж спроба і навука.
А сок быў свежы, такі хвацкі,
Такі салодкі, забіяцкі!
Ён быў галоўнаю віною
Таго, што позняю парою
Сядзелі дзеці чарадою,
І з дзядзькі вочак не спушчалі,
І стравы важнае чакалі.
— Эх, — цмокнуў дзядзька, — наямося! —
Зірнулі хлопцы на Антося,

Спампавана з сайта www.aversev.by

І сліну ўсе яны глынулі,
Паветра носам зацягнулі...
Глядзелі хлопцы, як на дзіва,
Як дзядзька, цеста замяшаўшы,
Качаў галушкі, міску ўзяўшы.
А чыгунок, бы пан пузаты,
Кіпіць, пыхціць, шуміць заўзята,
Бо не з вадою ён, а з сокам.
Ідзе тут справа ненарокам;
Дзяржыся, браце! І чуць толькі
Ўзнялося булбатачак колькі,
Дык дзядзька зараз стаў пакрышку
Ў чыгунчык клёцкі кідаць з лыжкі;
Укіне лыжку, памяшае
Ды зноў другую набірае.
А хлопцы нават паўставалі,
Ў чыгунчык вочы паўстаўлялі,
Глядзяць, не моргнуць яны вокам:
Эх, мусіць, смачны клёцкі з сокам!
— Ну, дзядзька, можа, і гатовы? —
Не сцерпеў Костусь, мовіў слова.
— Які ты, хлопча, нецярпячка,
Няхай цябе затопча качка! —
Гаворыць дзядзька на хлапчынку. —
Няхай паварацца часінку,
Каб сокам добра пранялiся,
Тады, брат, — эх! адно дзяржыся! —
І дзядзька цмокнуў выразліва,
І хлопцы зноў ждуць церпяліва,
А дзядзька, стоячы, паволі
Памешваў клёцкі. — Ну, даволі! —
Сказаў Антось, і ўсе ўздыхнулі,
Як бы гару з плячэй сапхнулі,
І бліжай к дзядзьку падступілісь.

Спампавана з сайта www.aversev.by

— Глядзі, мо ўжо пераварылісь, —
Алесь зазначыў палахліва.
— Ну, — Костусь кажа, — ото дзіва!
Не бойся: дзядзька лепей знае...
І стаў на клёцку дзядзька дзьмухаць:
Пакаштаваць каб было можна,
І ў рот падносіць асцярожна.
Замерлі хлопцы, ані зыку:
Мінута важна і вяліка;
Глядзяць на дзядзьку і чакаюць,
І дзядзьку поглядам пытаюць:
«Ну як? Ці смачны? Ці салодкі?»
У зубы клёцку, бы ў ляшчоткі[1],
Заціснуў дзядзька і губамі
Варушыць борзда, як, часамі,
Трусок ці зайчык над капустай,
Каб лепш дазнацца смаку-густу.
Пацмакаў дзядзька і ўсміхнуўся,
Зірнуў на хлопцаў, адвярнуўся
І тут, нічога не сказаўшы,
Як плюне дзядзька, пажаваўшы!
Трах у чыгунчык ён нагою!
І так абцёрся ён рукою,
Што губы й нос чырвоны сталі
І нават вусы затрашчалі.
А хлопцы проста збілісь з тропу[2]
І ў нейкім страсе і ў захопу
На дзядзьку-кухара глядзелі,
Як бы яны аслупянелі.
Быў смешны дзядзька той часінай
З пустою лыжкаю, з тычынай,

Пры дапамозе якога мастацкага сродку створаны вобраз у выдзеленых паэтычных радках? Зачытайце іншыя прыклады з тэксту.

[1] *Ляшчо́ткі* — раздвоеная з аднаго канца дошчачка для заціску чаго-небудзь.

[2] *Збі́цца з тро́пу* — разгубіцца, заблытацца.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Якою трэскі ён варочаў,
А тут Алесь як зарагоча!
За ім адзін, другі паехаў.
Такіх было тут жартаў, смехаў,
Што ўсіх трасло і калаціла
І дзядзьку смехам захваціла.
— Ну, дзядзька, як на смак, прызнайся?
— Паскудства, брат, і не пытайся!

1. Якія радкі твора выклікалі ў вас усмешку?
2. Ад чыйго імя вядзецца аповед: *«Я помню дзень той. Вечарэла...»*? Хто гэты чалавек?
3. Падзяліце твор на часткі і дайце кожнай свой загаловак, карыстаючыся аўтарскімі радкамі. Напрыклад, частка пра чаканне смачнай ежы можа называцца *«Эх, — цмокнуў дзядзька, — наямося!»*. Падрыхтуйце план і выкарыстайце яго для пераказу.
4. Якім паказаны ў творы дзядзька Антось? Якая роля гумарыстычных апісанняў у раскрыцці яго характару? Прачытайце ў «Слоўніку», што такое іронія і гумар.
5. Якімі з пералічаных спосабаў і сродкаў стварэння камічнага карыстаецца аўтар, калі паказвае дзядзьку Антося ў розныя моманты яго кухарства: ужывае смешныя выразы; дае знарочыста няправільнае тлумачэнне нейкіх з'яў; малюе неадпаведныя паводзіны героя, калі той хоча выглядаць лепш, чым ёсць на самай справе, або знарок робіць наадварот? Прывядзіце прыклады.
6. Узнавіце аўтарскі тэкст (трэнажор па творы Якуба Коласа «Дзядзька-кухар»).
7. Суаднясіце сродкі мастацкай выразнасці з паэтычнымі радкамі (трэнажор па вобразна-выяўленчых сродках у творы «Дзядзька-кухар»).
8. Чаму можна навучыцца ў галоўнага героя твора? Працягніце пералік: не адказваць крыўдай на крыўду, адносіцца з павагай не толькі да старэйшых і равеснікаў, але і да малодшых па ўзросце... Пацвердзіце прыкладамі з тэксту.
9. Што б вы хацелі перанесці ў вашы ўзаемаадносіны з дарослымі і бацькамі пасля знаёмства з вобразам дзядзькі Антося?

Спампавана з сайта www.aversev.by

10. Наведайце Дзяржаўны літаратурны музей Якуба Коласа ў Мінску ці яго філіялы на Стаўбцоўшчыне або наладзьце завочную экскурсію, каб паглыбіць веды пра асобу пісьменніка.
11. Правядзіце конкурс на лепшага чытальніка ўрыўка з твора Якуба Коласа «Дзядзька-кухар».

ПРА ВЫРАЗНАЕ ЧЫТАННЕ ПАЭТЫЧНЫХ ТВОРАЎ

Літаратура як прадмет вывучаецца ў школе не толькі для таго, каб засвоіць пэўны змест, але і каб навучыцца разумець і ўспрымаць мастацтва слова, дакладна і прыгожа выказваць свае думкі і пачуцці.

Выразнае чытанне важнае для ўспрымання і разумення розных твораў — і празаічных, і паэтычных. Але асабліва — паэтычных, якія па сваіх якасцях (рытмічнасць, насычанасць мовы тропамі, гукавымі паўторамі) з даўніх часоў стваралісь найперш для прамаўлення ўголас. Менавіта пры выразным чытанні паэтычны твор найпаўней выяўляе свае вартасці.

Выразнае чытанне мае асаблівае значэнне для твораў, у якіх перадаецца размова дзейных асоб. Выказванні герояў, персанажаў часта маюць скрыты сэнс, пэўную эмацыянальную афарбоўку (задушэўную, урачыстую, журботную, камічную і г. д.), якую трэба перадаць чытачу або слухачу.

Пры падрыхтоўцы да выразнага чытання неабходна ўлічваць асноўныя **патрабаванні**:

- уважліва прачытаць твор, разабрацца ў тым, што пісьменнік хацеў выказаць у творы, як ён характарызуе сваіх герояў, выяўляе адносіны да іх або як выказвае ўласныя адносіны да жыцця, свае думкі;
- вызначыць спосабы раскрыцця зместу ў творы: аповед, апісанне, разважанне — і, адпаведна ім, якія інтанацыю, тэмп чытання, вышыню і гучнасць голасу трэба выкарыстаць, дзе расстаўляць лагічныя націскі, дзе захоўваць паўзы (у верша-

Спампавана з сайта www.aversev.by

ваных творах не толькі пры знаках прыпынку, але і ў канцы вершаваных радкоў);

- памятаць пра такія прыёмы выразнасці, як міміка, жэсты, рухі галавы, адпаведныя зместу твора, яго настрою, характарыстыцы герояў-персанажаў.

1. Якое значэнне мае выразнае чытанне для ўспрымання і разумення мастацкіх твораў?
2. Якія асаблівасці паэтычных твораў патрабуюць большай увагі пры падрыхтоўцы да выразнага чытання? Якія патрабаванні пры гэтым неабходна выконваць?
3. Назавіце асноўныя спосабы раскрыцця зместу ў мастацкім творы.
4. Прыгадайце дадатковыя прыёмы выразнасці чытання.

ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДА РАЗДЗЕЛА

1. Назавіце асаблівасці вершаваных (паэтычных) твораў, іх адрозненне ад празаічных па знешняй форме, мове, сродках, прыёмах паказу жыцця.
2. Назавіце асноўныя тэмы раздзела «Загадкавая краіна Паэзія». Што іх аб'ядноўвае?
3. Якімі прыёмамі і сродкамі карыстаецца аўтар верша, каб у невялікім аб'ёме раскрываць значны і глыбокі змест?
4. Вызначце ролю падтэксту ў паэтычных творах. Якія сродкі выражэння падтэксту пры вусным чытанні вы ведаеце?
5. Чым дасягаецца рытмічнасць верша? Што такое стапа ў вершы? Што такое вершаваны памер? Якія памеры вы ведаеце? Што такое рыфма, страфа?
6. Як звязаны паэтычныя творы з іншымі відамі мастацтва?
7. Паспрабуйце напісаць некалькі вершаваных радкоў, напрыклад, на тэму «Скарбы», ужываючы рыфмаваныя словы: *мова — слова; скарбаў — фарбаў*. А першы радок можа быць такі: «Пявучая родная мова...».

Спампавана з сайта www.aversev.by

Па жаданні можна напісаць верш на самастойна абраную тэму ці на тэму «Зіма», выкарыстоўваючы такія рыфмаваныя словы:

… бег	… наваколле
… старанна	… мар
… раны	… дні
… снег	… скруха
… абшар	… вуха
… голле	… цішыні

А першы радок можа быць такі: «Зіма скавала рэчак бег…»

8. Разгадайце крыжаванку па тэме «Загадкавая краіна Паэзія».

9. Праверце свае веды па раздзеле (тэст «Загадкавая краіна Паэзія»).

Спампавана з сайта www.aversev.by



Цікавае і захапляльнае ў звычайным, паўсядзённым. Проза

Літаратура даследуе чалавека, жыццё, час.

Іван Мележ.

Вы пазнаёміліся з паэтычнымі творамі. Пераканаліся, што яны адрозніваюцца не толькі вершаванай формай, але і зместам, чытаюцца (ды і ствараюцца) пад асаблівы настрой, калі чалавекам валодаюць моцныя перажыванні, пачуцці. Гэтак жа пад настрой (не толькі радасны, але і журботны) мы слухаем музыку, песню або спяваем самі.

Асаблівасці празаічных твораў, іх сакрэты. У празаічных творах мы часцей сутыкаемся з жыццём паўсядзённым. Героі гэтых твораў занятыя звыклымі справамі, сустракаюцца, абменьваюцца думкамі, уражаннямі, спрачаюцца. Бывае, вядома, уступаюць і ў вострую барацьбу, здзяйсняюць подзвігі. Але ў цэлым гэта літаратура, збліжаная са звычайным жыццём і побытам людзей. Яна паказвае жыццё ў яго «натуральным» выглядзе.

Але проза таксама мае свае мастацкія сакрэты. Гэта толькі так здаецца, што ў празаічных творах аўтар, нібы падгледзеўшы, як паводзілі сябе людзі ў тым ці іншым выпадку, перадаў убачанае сваімі словамі, звычайнай (нерытмічнай) мовай, апісаў нейкі эпізод, як бы сфатаграфаваў гэты кавалачак жыцця.

Спампавана з сайта www.aversev.by

На самай справе ўсё не так проста. Нават у творах, дзе размова ідзе пра людзей, што сапраўды жылі і ўдзельнічалі ў апісаных падзеях. І не толькі таму, што пісьменнік пры гэтым не заўсёды мог прысутнічаць. Нават калі б ён і быў там, то наўрад ці змог бы запомніць кожны рух, кожны жэст героя, ды не аднаго, а многіх, наўрад ці мог дакладна ведаць, пра што думаў герой, якія пачуцці перажываў.

Усё гэта можна ўзнавіць толькі пры дапамозе вымыслу, фантазіі.

Для чаго пішуцца мастацкія творы? Мастацкі твор пішацца не толькі для таго, каб расказаць займальную гісторыю або паведаміць пра выпадак з жыцця. За кожным мастацкім сюжэтам ці вобразам стаіць глыбокі роздум пісьменніка пра жыццё, жаданне прапанаваць чытачу задумацца над важнымі пытаннямі, напрыклад: «Вось бачыш, што адбываецца... Чаму так паводзіць сябе чалавек, чаму сказаў такія словы?..»

Аўтарскі вымысел мае важнае значэнне для пазнання і разумення жыцця. У народзе кажуць: «Казка хлусіць, а чалавек думаць мусіць». Калі пісьменнік «выдумляе», «фантазіруе», ён робіць гэта дзеля таго, каб сказаць самую важную праўду, каб мы задумаліся над тым, што адбываецца ў жыцці і па якіх законах.

У мастацкім творы кожнае слова, сказ або штрых не з'яўляюцца выпадковымі. Яны маюць пэўны сэнс. Напрыклад, прачытайце радкі з апавядання Васіля Быкава «Назагойная рана»: *«Нізкае неба поўнілася цяжкімі азызлымі хмарамі — яны суцэльным бясконцым статкам плылі з захаду, несучы першы зазімак»*. Адзін толькі сказ, а ён ужо адразу настройвае нас на тое, што размова пойдзе пра нешта нядобрае, пра падзеі цяжкія, драматычныя. Так яно і ёсць у апавяданні.

Адным словам, мастацкая проза — гэта не проста займальнае чытанне. Пісьменнік як бы знарок скіроўвае нашу ўвагу на такія з'явы і факты, пра якія мы не вельмі задумваліся, каб паказаць, што за імі хаваецца нешта істотнае, важнае для

Спампавана з сайта www.aversev.by

чалавека. Для таго творы і пішуцца, каб прымусіць нашу думку засяродзіцца на пэўных падзеях, размовах, паводзінах людзей, разам з пісьменнікам разабрацца ў іх. І не проста адзначыць для сябе, што добра, а што кепска, а разважліва ўнікнуць у сэнс таго, што адбываецца ці адбылося, і ўжо на аснове гэтых роздумаў і назіранняў прыйсці да пэўнай высновы. Найлепшыя празаічныя творы — гэта тыя, што выклікаюць у нашай свядомасці глыбокі роздум, прымушаюць хвалявацца за лёс герояў, успрымаць іх учынкі, удачы і няўдачы як свае. Такім чынам, у празаічных творах асаблівае значэнне мае ***пазнанне жыцця***.

1. Раскрыйце сэнс эпіграфа да раздзела.
2. У чым галоўнае адрозненне празаічных твораў ад паэтычных? Назавіце іх асаблівасці.
3. Якое значэнне мае вымысел, фантазія ў паказе жыцця ў празаічных творах?
4. Паразважайце, што дае нам чытанне празаічных твораў у пазнанні жыцця. Паспрабуйце прывесці некалькі аргументаў на карысць чытання.

Змітрок Бядуля

НА КАЛЯДЫ К СЫНУ

Хмаркі насіліся над лесам.

Розныя па колеры і фасоне, яны часта ахаплялі вялікую частку неба і тварылі багатыя малюнкі к таемным казкам сталетняга лесу.

Удзень былі яны светла-пурпурныя, а ўночы залаціліся месяцам.

Чаго-чаго ў іх не было!

Цэлыя гарады з дзіўнымі замчышчамі, горы, выспы[1], азёры, агнявыя звяры, працэсіі святых у белых вопратках, незлічоныя легіёны ваякаў на конях...

[1] *Вы́спа* — невялікі востраў, часцей пясчаны.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Унізе лес гаварыў свае адвечныя гутаркі... Часам ён маліўся ціха-ціха, і толькі нейкі гук, нібы вокліч далёкага звону, даносіўся з чорнай глыбіні лясной далі...

Часам бываў ён немы, гэтак мёртва немы і спакойны, як бы прыслухоўваўся да нейкіх таемных надземных спеваў.

На хмаркі і на лес часта любіла пазіраць старая ўдава Тэкля, жонка нябожчыка Цыпрука, палясоўшчыка[1] пана Шчубальскага.

Жыла Тэкля адна ў старой хатцы на пагорку, ля лесу, хадзіла на падзённую, бокам-скокам, туды-сюды, і неяк гадавалася.

Пан не выганяў яе з гэтай разваленай хаты, хаця пасля смерці Цыпрука ён наняў новага палясоўшчыка, але таму пабудаваў і новую хату.

Тэкля любіла хадзіць па суседзях — вельмі гутарлівая баба была, але і любіла сядзець адна на прызбе[2] і думаць сваю думку.

Яна любіла пазіраць на стары лес і на сівыя хмаркі доўга-доўга, і старыя вочы прыкрываў смутак: успаміны старадаўнія, як цені, лезлі ў яе душу, праляцеўшыя гады маляваліся ёй ясна, жыва, быццам перад вачыма бачыць яна ўсё... Надта шкадаваць пройдзены час няма чаго — помніць яшчэ і цяпер пабоі і лаянкі п'янага Цыпрука свайго.

Затое адну пацеху мае яна, якая гоіць раны, адна надзея — гэта ядыны сын яе, Лаўрук. Во хто сядзіць у яе грудзях, як верабей у цёплым гняздзе.

Любіла яна сядзець на прызбе, пазіраць старымі вачыма на цёмны лес, на адвечныя хмаркі.

Усё жыццё яна была загнана ўсімі, і калі нават і бывалі хвілі радасці, то вочы не пакідалі выразу вечнага смутку.

Думала яна аб сыне сваім, які жыве ў вялікім горадзе, думала і цешылася...

Жыве ён сабе там панам, як людзі кажуць...

Лаўручок яе, быўшы яшчэ хлопчыкам гадоў дзесяці, спадабаўся вельмі пану Шчубальскаму за прыгожы від і спрытны

---

[1] *Палясо́ўшчык* — ляснік.

[2] *Пры́зба* — невысокі, звычайна земляны насып уздоўж сцяны хаты, зроблены для ўцяплення памяшкання.

Спампавана з сайта www.aversev.by

розум. Бяздзетны пан забраў яго к сабе, адзяваў па-панску і, падвучыўшы крыху, аддаў пасля ў горад вучыцца.

У лістах да пана часамі ўспамінаў ён сваіх бацькоў. З радасці і ўцехі яны проста не ведалі, што рабіць...

Жартачкі, гэткага ўдалага сына маюць! Першы раз, як ён на Каляды прыехаў з горада да пана, дык бацькі яго зараз жа прыляцелі на панскі двор і доўга адстойвалі ў кухні, пакуль сынок з'явіўся к ім. Шчасцю іх канца не было, як угледзелі яго ў чорных суконных вопратках з бліскучымі гузікамі — якраз асэсар[1]! Праўда, калі маці кінулася да яго абымаць і цалаваць, дык ён засаромеўся крыху і адсунуўся ўбок...

— Апанеў! — кажа потым маці. — І далікатным зрабіўся, і гаворыць па-панску!..

— Эт! — казаў бацька. — Думаеш што, ды і ён панам будзе! Глядзі, як ён ужо смяецца з нашай гутаркі ды з нас. Гэта мне не надта падабаецца...

Маці не звяртала ўвагі на гэта. Слепа радавалася, фанабэрылася перад суседзямі. Скора паны зусім выехалі адгэтуль. З таго часу яны ўжо болей не бачылі свайго Лаўручка...

Тым часам Лаўрук вучыўся далей, як скончыў гімназію, пан выправіў яго на адукацыю ва ўніверсітэт.

Бацькам сваім ён ніколі нічога не пісаў, але пан, аддаўшы ў арэнду двор, усё ж такі сам прыязджаў штогод даведацца і расказваў ім, што Лаўрук вучыцца ў адвакаты.

Цешылася маці: «Во будзе падмога на старасць!»

Цыпрук на гэта ёй часта гаварыў:

— Эт, дурная ты авечка. Яго падмогу сарока хвастом замяце. Чакай ад яго пад старасць пацехі, як ад рабой сучкі яек!

— Замаўчы ўжо! Стары, як малы!

— А ты, брат, баба, зусім дурная авечка! Ці ты не бачыш, што твой Лаўручок зусім чужым зрабіўся для нас з таго часу, як папаў пад панскую апеку. Нешта не цешыць ён мяне!..

Цыпрук памёр.

---

[1] *Асэ́сар* — судовая службовая асоба, засядацель.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Старая Тэкля засталася адна, і тады яшчэ болей запанавала ў душы яе цяга да сына. Гэта быў увесь яе скарб. Матчына сэрца адкрыла ўсе таемнікі свайго кахання.

Заўсёды, калі была яна адна, думала аб сыне. Суседкам гаварыла, што сынок такі і гэтакі, хваліла яго.

Смачна ёй была сухая скарынка хлеба, а без хлеба таксама было добра...

«Эт, — думала яна, — дык што ж там... абы толькі хацела, дык у Лаўручка свайго вунь як зажыла!.. Абы толькі захацела!..»

— Эх, Тэкля, Тэкля, — гаварылі ёй часта суседкі, — паехала б да сына ў горад! Ці табе гэтак і век свой дажываць! Ты ж адна, як корч той на пасецы!..

— Не бяда! — адказвала яна. — Абы толькі захацела! Мой Лаўручок гэткі багаты, як людзі кажуць, што, бадай, багацей за самога пана Шчубальскага! Абы толькі захацела!

Прайшло яшчэ пара гадоў. Зрабілася Тэкля сухой, нізенькай, згорбленай бабулькай, зморшчанай, як той грыб.

— Вось дурная! — казалі людзі. — Мае гэткага багатага сына, а сама бадзяецца невядома як і дзе!

Падышлі Каляды. Увесь абшар быў пакрыты снегам... Вёскі занесены гурбамі, быццам казачныя замчышчы... А лес зрабіўся сівым і паважным.

— Апошнія Каляды: зусім ужо я слабенькая...

Не хацелася ёй адной астацца ў пустцы каля лесу і пад выццё ваўкоў куццю[1] ладзіць.

І давай, быццам гарачыя вуголлі, закрытыя попелам, выгортаць з сэрца наверх свае захаваныя жаданні, сваю глыбокую веру ў даражэнькага сына.

«Давай, — думае, — дабяруся ўжо да яго... бадай, ці дацягну да вясны... Шмат дакучаць я яму не буду, бо дзе яму там клапаціцца аба мне і шкада ж яго...»

— Пайду да сына! — разнесла яна назаўтра па ўсёй ваколіцы і гэтак намалола ім рознай гутаркі, што проста ўсіх суседзяў

[1] *Куцця́* — урачыстая вячэра напярэдадні Каляд.

Спампавана з сайта www.aversev.by

зайздрасць прабрала: жартачкі, гэткага сына мае! Ён там у судах цэлы асэсар, паперы піша і ўвесь свет проста дагары нагамі круціць.

Ускінула Тэкля хатулачку[1] на плечы, пару лапцей на запас узяла, развіталася з бабамі і пусцілася ў дарогу. Да горада было міль шэсць.

Выбралася раніцай на снежнае поле.

— Кажуць, ён там ажаніўся з багатай паненкай. Напэўна, унукі-жэўжыкі ёсць, — на зморшчаным твары ззяла шчаслівая ўсмешка.

Яна адвярнула тоўстую хустку ад вачэй, каб разглядзець, ці шмат ужо дарогі прайшла.

— Ага! — і не думала. Ногі самі нясуць мяне, як бы трыццаць гадоў таму назад, і марозу не баюся!..

І яшчэ з большым імпэтам[2] няслі яе старыя ногі да роднага сына на Каляды...

І шчасце яе расло... Вось дзе жаданне сэрца яе споўніцца!.. Вось калі зажывець яна, як сыр у смятане!

— Глупства, што часамі нябожчык Цыпрук гаварыў... Як гэта ён мяне не прыме? Я ж яго матка!.. Я ж яго гадавала і карміла... Ён жа — уся пацеха мая.

Кончыўся дзень. Тэкля начавала ў незнаёмай вёсцы. Добрыя людзі накармілі яе і абагрэлі. Яна ўсім расказвала, што ідзе на Каляды да сына, — і гэткім тонам, гэткай шчаслівай гутаркай, ажно сяляне з нейкай асобай павагай пазіралі на яе ды пачалі прасіць, каб яна там у сына за іх заступы прасіла ў судах...

Ранюсенька яна зноў кранулася ў дарогу. Скрыпеў снег пад нагамі. Белыя абшары палёў драмалі пад супакоем нямой цішы...

Рэдка-рэдка калі дзе на хвоі закаркае варона ды, падымаючыся ўверх, страсяне з галін вялікія камы снегу...

---

[1] *Хату́лачка* — невялікі клунак рэчаў, звязаных у хустку, які звычайна носяць за спінай.

[2] *Імпэ́т* — імклівасць, хуткасць.

Спампавана з сайта www.aversev.by

М. Піманенка. Калядкі (другая палова 1880-х гг.)

Рэдка-рэдка калі фурманка пакажацца з лесу. Сярмяжнік занукае на кабылку сваю на розныя лады, упрэцца ў аглоблю, натужыцца і — ні з месца. Воз з бярвеннем цяжкі.

Рэдка-рэдка калі званочак зазвоніць, і панскія санкі віхрам пранясуцца па нямым белым гасцінцы...

Тэкля ідзе ды ідзе...

Млеюць старыя ногі... Атопкі[1] як калоды зрабіліся, цяжкія і цвёрдыя. Нічога — горад блізка.

Ужо здалёку відаць вежы цэркваў і касцёлаў, якія золатам у небе адліваюцца... Вось і муры рознафасонныя... Вось і гоман горада даходзіць да яе вушэй... Скора ўжо спраўдзіцца яе апошняе жаданне... У старых вачах бліснуў радасны аганёк...

— Нічога, у сына адпачну. Старыя косці выпрастаю!..

Вось пачаліся цёмныя вуліцы шумнага, як бы ашалелага горада... Тут ужо Тэкля збілася з толку. Не ведала, куды павярнуцца, у каго дапытвацца. Людзі спяшаюць, піргаюць[2]. Рамізнік[3] чуць не пераехаў яе. Страшна...

---

[1] *Атóпкі* — старыя зношаныя чаравікі, боты.

[2] *Пірга́ць* — тут: штурхацца.

[3] *Рамі́знік* — фурман нанятага экіпажа-карэты ці вазка.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Адважылася яна папытацца аднаго, другога, дзе тут яе сын жыве? Ён тут «аблакатам»... Лаўруком завецца.

Хто пажартаваў ды паглядзеў на яе, як на дурную... Хто адвярнуўся ды пайшоў сваёй дарогай, а хто з жалю торкаў ёй у руку капеечку... Гэткім чынам нехта давёў яе да гарадавога[1].

Той пачаў распытвацца і, ніякага толку не дабіўшыся, павёў яе ў вучастак. Там яна пераначавала, галодная і змёрзлая. Назаўтра, даведаўшыся, хто гэта яе сын, адвялі да яго.

Стукалася, стукалася яна ў дзверы, пакуль нехта адчыніў, высунуўся напалову. Паглядзеў на яе і крыкнуў:

— Ідзі, ідзі! Канца няма жабракам гэтым!

— Пусцеце... я да сына свайго іду, да Лаўрука!

— Да Лаўрука! Да сына?! Да Лаўрэнція Кіпрыянавіча?!

— Ага! Ага! Я маці яго.

Той змерыў яе з ног да галавы, пакуль яна расказвала, што яна з вёскі да Лаўрука на Каляды прыйшла, і з усмешкай пусціў у кухню.

Тут сабраліся слугі і давай шушукацца і распытвацца.

Тым часам адчыніліся дзверы з другой стараны ды ўвайшоў малады пан у чорным сурдуце[2]...

— Лаўручок мой! Сынок! — як непрытомная кінулася да яго Тэкля. — Роднен...

Ён раптам пачырванеў, паглядзеў на слуг ды хрыпла крыкнуў:

— Чаму вы пускаеце ў пакой розных жабрачак шалёных?! Ідзі! Ідзі! — звярнуўся ён да яе глуха, адрывіста. — Ідзі, старушка! Я цябе... не знаю...

— А сынок мой, а Лаўручок ты мой! Маткі сваёй не пазнаеш?! Гэта ж...

Ён бразнуў дзвярамі і пайшоў у пакоі... Той самы лёкай выправадзіў яе за дзверы...

---

[1] *Гарадавы́* — ніжні чын гарадской паліцыі ў царскай Расіі.

[2] *Сурду́т* — мужчынская двухбортная вопратка з доўгімі поламі, якая цесна аблягае цела.

Спампавана з сайта www.aversev.by

* * *

Як сышла з маляваных сходаў, як апынулася на шумным тратуары каля варот, яна сама не памятала. Ачухалася толькі тады, калі той самы лёкай яшчэ раз выйшаў да яе і торкнуў ёй у скручаныя ад холаду пальцы нейкія паперкі...

— Ад пана!..

Яна нават не чула, як з акалелых пальцаў выпаў гасцінец роднага, доўгажаданага сына. Некалькі трохрублёвых паперак прыліплі да макраватага тратуара.

1. Якія пачуцці выклікаў у вас гэты твор?
2. Паспрабуйце сфармуляваць праблему, узнятую аўтарам у апавяданні.
3. Як паказана жыццё Тэклі? Якой надзеяй жыла і цешыла сябе маці?
4. Раскажыце, як трапіў сын Тэклі і Цыпрука да пана Шчубальскага. З дапамогай якіх мастацкіх дэталей пісьменнік паказвае, што хлопчык паступова адрываўся ад роднага дому, цураўся сваіх бацькоў?
5. Якім вы ўяўляеце Цыпрука? Чаму так насцярожана ўспрымаў ён тое, што сын *«смяецца з нашай гутаркі»*? Знайдзіце адпаведныя дыялогі паміж бацькамі і прачытайце іх па асобах.
6. Чаму Тэкля не хацела верыць перасцярогам Цыпрука і суседзяў? На што яна спадзявалася? Перакажыце эпізод, як паступова выспявала ў Тэклі думка пайсці ў горад да сына.
7. Ці выпадкова маці выправілася да сына напярэдадні свята? Пры адказе звярніцеся да рэпрадукцыі карціны М. Піманенкі «Калядкі», якая перадае адпаведны святочны настрой.
8. Як раскрываюцца перажыванні Тэклі праз малюнкі прыроды ў час яе дарогі да сына? Прывядзіце прыклады з тэксту.
9. Як сустрэў горад Тэклю? Ці ёсць у апісанні горада прадчуванне таго, што сустрэча з сынам будзе горкай?
10. Знайдзіце апісанне, як паводзіў сябе Лаўрук пры сустрэчы з маці. Паразважайце, ці была нечаканай такая развязка апавядання.

Спампавана з сайта www.aversev.by

11. Як вы думаеце, ці мог Лаўрук-адвакат быць абаронцам простых людзей у судзе?

12. Размясціце эпізоды апавядання ў храналагічнай адпаведнасці з развіццём падзей (трэнажор па творы Змітрака Бядулі «На Каляды к сыну»).

13. Паспрабуйце прадставіць змест апавядання «На Каляды к сыну» ў драматычных сцэнках. Такіх сцэнак можа быць дзве. Першая — у вёсцы, на лавачцы каля Цыпруковай хаты, яна перадае размову Тэклі з суседкамі пра сына. Другая — у горадзе, у доме сына — цяпер ужо адваката Лаўрэнція Кіпрыянавіча. Вызначце дзейных асоб гэтых сцэнак, рэмаркі (заўвагі пра месца і час дзеяння, як выглядаюць героі), падрыхтуйце выказванні герояў (рэплікі), прадумайце дэкарацыі, афішу.

14. Праверце свае веды (тэст па творы Змітрака Бядулі «На Каляды к сыну»).

ПРА МАСТАЦКУЮ ДЭТАЛЬ

У празаічных творах важнае значэнне маюць не толькі апісанні падзей, паводзін, учынкаў герояў, але і «падрабязнасці» — асобныя, на першы погляд дробныя, штрыхі ў характарыстыцы герояў, заўвагі, жэсты, словы, рэплікі.

Напрыклад, у апавяданні З. Бядулі «На Каляды к сыну» праз асобныя заўвагі, штрыхі вельмі выразна паказваецца, як мяняюцца адносіны да бацькоў сялянскага сына Лаўручка, якога прыгрэў пан Шчубальскі і які, нарэшце, зусім адцураўся бацькоў.

У першым выпадку, калі маці пры сустрэчы з Лаўручком у доме Шчубальскага кінулася яго абдымаць, ён *«засаромеўся... і адсунуўся ўбок»*.

У другі раз, калі зусім старая, ледзь жывая Тэкля прыйшла (таксама на Каляды) у госці да сына, які стаў ужо адвакатам Лаўрэнціем Кіпрыянавічам, ён, убачыўшы маці, *«раптам пачырваней, паглядзеў на слуг ды хрыпла крыкнуў:*

— Чаму вы пускаеце ў пакой розных жабрачак шалёных?!»

Спампавана з сайта www.aversev.by

Апавяданне заканчваецца таксама вельмі характэрнымі заўвагамі пра тое, як Тэклю выправадзілі з дома сына, як ад яго імя лёкай *«торкнуў ёй у скручаныя ад холаду пальцы нейкія паперкі...»*.

«Яна нават не чула, як з акалелых пальцаў выпаў гасцінец роднага, доўгажаданага сына. Некалькі трохрублёвых паперак прыліплі да макраватага тратуара». Гэтыя кароценькія падрабязнасці маюць глыбокі сэнс. З аднаго боку, яны да канца раскрываюць крывадушнасць сына, у якога на нейкі момант як бы «загаварыла сумленне», і ён зрабіў намаганне загладзіць сваю віну, адкупіцца за здрадніцтва. А з другога — праз заўвагу пісьменнік паказвае, як была ашаломлена маці паводзінамі сына, што не звярнула нават увагі на тыя «паперкі».

Такія канкрэтныя і разам з тым вельмі змястоўныя заўвагі, штрыхі называюць мастацкімі дэталямі.

Як у паэзіі яркія моўныя вобразы (метафары, адухаўленні, эпітэты, розныя эмацыянальныя звароты, паўторы), так у прозе дакладныя, трапныя заўвагі — мастацкія дэталі — адыгрываюць надзвычай важную ролю ў раскрыцці зместу, характарыстыцы персанажаў. Па адной такой дэталі можна меркаваць пра характар героя, яго схільнасці, псіхалогію, маральныя якасці.

Вядома, не кожная падрабязнасць зместу мастацкага твора мае такі важны, глыбокі сэнс, аднак, чытаючы празаічны твор, патрэбна быць вельмі ўважлівым не толькі да развіцця галоўных падзей, але і да дэталей. Яны могуць сур'ёзна дапамагчы ў разуменні таго, што хацеў сказаць пісьменнік, у правільнай ацэнцы характараў.

Мастацкая дэталь — асабліва значны, вылучаны элемент мастацкага вобраза, выразная падрабязнасць у творы, якая падкрэслівае аўтарскае стаўленне да герояў і падзей.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Іван Навуменка

НАСТАЎНІК ЧАРЧЭННЯ

Да вайны яшчэ ў той школе, дзе вучыўся Косця Кветка, маляванне і чарчэнне выкладаў старамодны настаўнік Апалінарый Феакціставіч, па празванні Цыркуль. Гэтую мянушку Косця прыклаў свайму настаўніку, як толькі перайшоў у шосты клас, і яна прыжылася.

Высокі, тонкі, у чорным, яшчэ царскіх часоў, сурдуце, Апалінарый Феакціставіч знешне на самай справе апраўдваў дадзенае яму празванне. Але менш за ўсё гэтага абцягнутага чорным сукном чалавека можна было назваць сухім і чэрствым. Ён быў старамодным, крыху напышлівым, але толькі не сухім.

Прадмет свой Апалінарый Феакціставіч ведаў добра, але быў надзвычай мяккім чалавекам, і гэтай мяккасцю яго карысталіся не на карысць вучобе. Вучні ведалі, што да рэвалюцыі іх настаўнік выкладаў у гімназіі латынь. І хоць цікавасці да латыні шасцікласнікі, вядома, не праяўлялі абсалютна ніякай, тым не меней на ўроках Апалінарыя Феакціставіча часта гучала гэтая мёртвая, але прыгожая мова.

Аматарам лацінскай мовы часцей за ўсё прыкідваўся Косця. Можа, яму падабалася ўзрушанасць старога настаўніка, які, хвалюючыся, вымаўляў незразумелыя звонкія словы, магчыма, ім кіравала самае звычайнае самалюбства, але Косця часцей за другіх ішоў на свядомую правакацыю. Калі хто-небудзь не зрабіў чарцяжа і прадчуваў немінучую пагібель, яго нязменным выратавальнікам быў Косця.

Пры ўваходзе Апалінарыя Феакціставіча ў клас Косця, які сядзеў на першай парце, напускаў на свой твар цень задумлівасці і летуценнасці. Настаўнік раскрываў класны журнал, але ў гэты час Косця ўжо сядзеў з паднятаю рукой.

— Я слухаю цябе, Кветка, — дазваляў настаўнік выказацца.

— Апалінарый Феакціставіч, як будзе па-лацінску кніга?

Стары настаўнік адрываў свой позірк ад класнага журнала, і на твары яго з'яўлялася ўсмешка. Ён, вядома, здагадваўся, што

Спампавана з сайта www.aversev.by

не прагай ведаць новае лацінскае слова гарыць яго яшчэ не сталы апанент[1]. Але пераадолець спакусу і не адказаць на пытанне Апалінарый Феакціставіч не мог. Той, над кім павіс дамоклаў меч[2] быць выкліканым і ісці са сваімі чарцяжамі да стала, на нейкі час быў выратаваны.

— Словы «свабода», «кніга» і «дзеці» на лацінскай мове маюць блізкае гучанне, — натхняўся стары настаўнік, — «лібэрас», «лібэра», «лібры»... Гэта ж так лёгка запомніць...

Інтарэс шасцікласнікаў да мовы Авідзія[3] і Гарацыя[4] ўзрастаў па меры таго, як набліжалася доўгачаканая хвіліна збавення — званок на перапынак. Нарэшце вартаўніца дрэнькала ў стары вышчарблены званок, і стрыжаныя шасцікласнікі гаманлівай талакой зрываліся з месца. Апалінарый Феакціставіч з разгубленай усмешкай закрываў класны журнал, у які ён за ўвесь урок не паставіў ніводнай адзнакі...

Вучні падрасталі, станавіліся старшакласнікамі, заводзілі прычоскі. У дзясятым класе здольны і няўрымслівы Косця ўжо не дазваляў сабе карыстацца слабасцю старога настаўніка. У адносінах класа да Апалінарыя Феакціставіча з'явілася нешта новае. Гэтае новае, бадай, можна было назваць прытоенай, схаванай недзе ў глыбіні юнацкіх душ павагай да свайго настаўніка. Маладосць нарэшце ацаніла вялікую, нязменную любоў і адданасць Апалінарыя Феакціставіча латыні — прадмету, які даўно можна было забыць...

Гэтую павагу класа адчуваў і сам настаўнік, хоць знешне, здавалася, яна не праяўлялася ні ў чым. Пасля ўдалага чарцяжа, зробленага кім-небудзь з дзесяцікласнікаў, Апалінарый Феакціставіч ставіў умельцу пяцёрку, закрываў журнал і, строгі, сур'ёзны, падымаўся над класам.

— Вам трэба думаць не толькі пра гэтыя чарцяжы, — заяўляў ён. — Пара ўжо кожнаму з вас зрабіць для сябе чарцёж

---

[1] *Апане́нт* — працаўнік у дыспуце, у спрэчцы.

[2] *Дамо́клаў меч* (з лац.) — тут: пагроза.

[3] *Аві́дзій* — рымскі паэт (43 г. да н. э. — 18 г. н. э.).

[4] *Гара́цый* — рымскі паэт (63—8 гг. да н. э.).

Спампавана з сайта www.aversev.by

усяго будучага жыцця. Але ў гэтым вам лепш за мяне дапаможа Авідзій...

Апалінарый Феакціставіч пачынаў чытаць Авідзія. Голас у яго быў слабы, прыглушаны, ён дрыжаў і зрываўся, але старога настаўніка слухалі з затоеным дыханнем. Ніхто не разумеў слоў лацінскага верша, які пражыў многія стагоддзі, але ўсе, здаецца, адчувалі магутнае, узнёслае пачуццё, схаванае ў далёкіх, урачыстых метрах[1]...

— Авідзій любіў сваю зямлю, як можа яе любіць вялікі сын сваёй Айчыны, — натхняўся стары настаўнік. — Таму яго слова будзе жыць да таго часу, пакуль будзе ўладарыць чалавек на зямлі. Тыраны прымусілі паэта пакінуць родны край. Ён жыў ля берагоў нашага Чорнага мора, якое называлася тады Понтам Эўксінскім...

Апалінарый Феакціставіч заўсёды тлумачыў Авідзія напышліва, у прыўзнятым, урачыстым стылі. Але цяпер гэта дзясятаму класу падабалася.

Косця тайна ад сваіх сяброў хадзіў у раённую бібліятэку і прасіў Авідзія. Авідзія ў бібліятэцы не было.

Бібліятэкарка дзівілася:

— Навошта ён здаўся вам, гэты Авідзій? Чалавек дзесяць яго прасілі ўжо. Па праграме ж яго не праходзяць?..

Зрэдку класу ўдавалася ўцягнуць Апалінарыя Феакціставіча ў размову, далёкую ад яго любімай латыні. Ён быў не вялікі майстар адказваць на пытанні юнакоў і дзяўчат, якія праз некалькі месяцаў збіраліся пайсці ў новы, невядомы і цікавы для іх свет.

— Мы з вамі, маладыя сябры, людзі розных эпох, — звычайна заяўляў стары настаўнік. — Мае жыццёвыя прынцыпы не падыдуць для вас. У вас ёсць нешта новае, чаго не ведала маё пакаленне. Мне ўжо цяжка дагнаць вас і нават цяжка вас добра разумець. Але ў нас з вамі ёсць адна такая рэч, якую нельга

[1] *Метр* — тут: верш.

Спампавана з сайта www.aversev.by

адабраць ні ад вас, ні ад мяне. Гэта наша Радзіма. Беражыце яе чэсць, нясіце яе славу наперад. А я ўжо стары і слабы чалавек...

У сярэдзіне навучальнага года Косця Кветка паступіў у лётнае вучылішча. Яму трэба было ехаць у далёкі горад, аж за Волгу. Косця прыйшоў развітацца з сябрамі. Затаіўшы дыханне, глядзеў дзясяты клас на Косцю, які першым, не дачакаўшыся атэстата, пакідаў школу і родны гарадок. Заняткі ў той дзень адмянілі з трэцяга ўрока.

Дзесяцікласнікі, употай згаварыўшыся, склаліся па рублю і купілі Косцю ў якасці развітальнага падарунка табакерку са срэбраным вечкам... Трэба было напісаць нейкія словы на вечку табакеркі, каб Косця не забываў свайго класа і свайго гарадка. Гэтыя словы якраз і прыдумваў дзясяты клас, калі ў пакой увайшоў Апалінарый Феакціставіч. Ён яшчэ не ведаў, што яго ўрок адмянілі, і яму хутка ўсё растлумачылі. Расказалі настаўніку і пра падарунак для Косці — табакерку, і пра тое, што трэба нешта выгравіраваць на срэбраным вечку...

Вось тады і напісаў Апалінарый Феакціставіч на дошцы словы, якія ўсім спадабаліся і вастрыём цыркуля з лепшай класнай гатавальні былі перанесены на вечка Косцевай табакеркі: «Patriam nostram amare et defendere debemus...».

Гэтыя словы як найлепей падыходзілі для ўрачыстасці моманту, і сутнасць іх таксама поўнасцю адпавядала намерам дзесяцікласнікаў.

«Радзіму нашу любім і абараняць яе павінны», — значылі ўрачыстыя лацінскія словы.

Косця ж станавіўся вайскоўцам, яму трэба было ведаць гэтыя словы. Але ў той дзень гэты лацінскі сказ, які быў напісаны на дошцы, мабыць, запомніў не адзін толькі Косця.

Косця паехаў у далёкі горад і прыслаў адтуль толькі два лісты. Але ў іх абодвух ён прасіў перадаць гарачае лётнае прывітанне Апалінарыю Феакціставічу. Дзясяты клас закончыў школу без ніводнага другагодніка, і па гэтай прычыне ладзіўся ўрачысты выпускны вечар. Але вечара ў той год не было — пача-

Спампавана з сайта www.aversev.by

лася вайна. Атэстаты выпускнікам аддалі без ніякіх цырымоній, і ніхто з іх не паступіў у інстытут. Хлопцаў на трэці дзень вайны мабілізавалі ў войска.

У гарадок прыйшлі фашысты. У школе размяшчаўся цяпер нейкі вайсковы штаб. У першыя ж дні нямецкага ўладарання былі арыштаваны мясцовы натарыус, старшыня абутковай арцелі і ляснічы. Яны лічыліся актывістамі і, на думку фашыстаў, уяўлялі сур'ёзную небяспеку для германскай імперыі. Апалінарыя Феакціставіча арыштавалі ў той жа дзень за знявагу нямецкай зброі. Адбылося гэта вось як. У гаспадыні, дзе кватараваў стары настаўнік, нямецкія салдаты рэквізавалі парасё. Свінчо не давалася ў рукі, і салдаты застрэлілі яго з аўтамата тут жа, на двары. Апалінарый Феакціставіч, які прысутнічаў пры гэтай баталіі, назваў салдат грабежнікамі. Яго, як злоснага бальшавіцкага агітатара, адвялі ў штаб на допыт да афіцэра. Але і там Апалінарый Феакціставіч не адступіўся ад сваіх слоў.

— Ёсць добрая лацінская пагаворка, якая ўзнікла да таго, як варвары разбурылі Рым, — ахвотна растлумачыў ён афіцэру. — «Aqvila non captat muscas...» — «Арлы не ловяць мух». У вашых салдат на шапках арлы, але яны падобныя да злых гіен.

Гэта былі апошнія словы, якія сказаў стары настаўнік. Яго расстралялі разам з натарыусам, старшынёй абутковай арцелі і ляснічым у бярозавым гаі за гарадком. Насельніцтву было аб'яўлена, што гэтыя людзі з'яўляюцца камуністамі і партызанамі...

А на трэцім годзе вайны, калі фронт яшчэ стаяў пад Арлом і Белгарадам, вясновай зорнай ноччу над занятым фашыстамі палескім гарадком доўга кружыў самалёт. Лётчык спусціў дзве асвятляльныя ракеты і, карыстаючыся поўнай адсутнасцю ў тутэйшага гарнізона зенітнай артылерыі, зацята абстрэльваў з кулямёта чыгуначную станцыю. Ён «пачаставаў» фашыстаў і дзвюма бомбамі, якімі знёс вадакачку. Тады былі забіты чатыры фашысты і яшчэ некалькі паранена. Праз тыдні два пастушкі

Спампавана з сайта www.aversev.by

прынеслі ў гарадок цікавую знаходку — звычайны кашалёк, у якім ляжаў кавалачак шоўкавай парашутнай матэрыі. На матэрыі быў зроблены надпіс на чужой мове і стаяў подпіс «Косця».

Дзяўчаты, якія закончылі дзесяцігодку, прачыталі незразумелы надпіс. На шоўкавай матэрыі былі напісаны словы, якія некалі дзясяты клас выгравіраваў на вечку срэбранай табакеркі: «Patriam nostram amare et defendere debemus»... Да самага таго дня, пакуль з гарадка не прагналі немцаў, пад страшным сакрэтам з вуснаў у вусны перадавалася навіна, што немцаў вясной бамбіў Косця Кветка...

У сорак пятым годзе, калі ўжо ішлі баі за Берлін, Косця Кветка вярнуўся ў родны гарадок. У яго было тры ордэны на гімнасцёрцы і пусты правы рукаў. Косця пацвердзіў, што гэта сапраўды ён бамбіў тады гарадок і скінуў свае вымпелы. За гэтую бамбёжку Косця атрымаў ад свайго начальства вымову — ён адхіліўся ад маршруту... Косця прывёз з сабой і табакерку, якую некалі ў складчыну падараваў яму дзясяты клас.

Спачатку Косця працаваў фізруком у той жа школе, дзе выкладаў чарчэнне і маляванне Апалінарый Феакціставіч. Цяпер ён ужо завочна скончыў інстытут і выкладае фізіку. Расказваюць, што настаўнік з Косці атрымаўся добры і вучні яго любяць. І калі тлумачыць Косця закон Архімеда, ён гаворыць не толькі пра выцесненую целам вадкасць, а і пра жыццё самога Архімеда з Сіракузаў, які храбра абараняў свой горад ад ворагаў.

1. Хто з'яўляецца галоўным героем апавядання — настаўнік Апалінарый Феакціставіч ці яго вучань Косця Кветка?
2. Ахарактарызуйце Апалінарыя Феакціставіча як настаўніка і чалавека (ацаніце яго паводзіны і ўчынкі, адносіны да вучняў, да свайго прадмета і асабліва да тых прадметаў, якія ён выкладаў раней).
3. Як спалучаецца гераічны ўчынак Апалінарыя Феакціставіча з папярэднімі яго характарыстыкамі ў творы *(старамодны, крыху напышлівы, надзвычай мяккі, па празванні Цыркуль)*? Пацвердзіце свае разважанні прыкладамі з тэксту.

Спампавана з сайта www.aversev.by

4. У апавяданні ёсць камічныя моманты. Прывядзіце прыклады. Як вы думаеце, ці крыўдны гэты смех для герояў? Абгрунтуйце свой адказ.
5. Ахарактарызуйце вобраз Косці Кветкі. У чым яны розныя, а ў чым падобныя са сваім настаўнікам? Якую галоўную навуку пераняў ад яго Косця Кветка?
6. Што для вас значаць словы *«Радзіму нашу любім і абараняць яе павінны»*?
7. Ці хацелі б вы мець такога настаўніка, як Апалінарый Феакціставіч, і такога сябра, як Косця Кветка? Растлумачце чаму.

Янка Брыль

УРОКІ ПАНІ МАР'І

(Урывак з аповесці «Сірочы хлеб»[1])

1

...Данік, як і кожны з малых, меў не адну, а некалькі мянушак — то Сівы, то Гусак, то Манька... Сівым яго празвалі за валасы, асабліва светлыя ўлетку, калі яны выгаралі на сонцы. Гусаком — таму, што калісьці, яшчэ пазалетась увосень, хлопцу нагнаў страху стары Міронаў гусак. «Манькай» у іхняй вёсцы называюць левую руку, а Данік хацеў чамусьці быць ляўшою і ўсё страшыў, крычаў: «Вось як дам табе з манькі!..» На кожную з гэтых мянушак можна было адказаць любому з сяброў таксама мянушкай, а то і пабіцца. Зрэшты, не ўсе мянушкі аднолькава прыжываюцца. З трох першых мянушак, з якімі Данік уступаў у жыццё, да хлопца прыліпла толькі адна — Сівы, і за яе Данік амаль не злаваўся.

[1] Дзеянне твора адбываецца ў былой Заходняй Беларусі, частцы нашай Радзімы, якая ў 1921 годзе паводле Рыжскага дагавора паміж Савецкай Расіяй і Польшчай была аддадзена пад уладу Польшчы. Заходняя Беларусь праіснавала ў складзе Польшчы да верасня 1939 года, а пасля была далучана да Савецкай Беларусі.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Была, аднак, яшчэ і чацвёртая мянушка... Жабраком называлі яго толькі Палуянавы хлопцы, Шурка і Павел[1].

2

Школа стаяла наводшыбе ад вёскі, на ўзгорку. Сама старая і ў акружэнні старых бяроз, што засланялі яе ад зімовых вятроў. Заманілі Даніка і гэтыя высокія бярозы, і прыгожыя дарожкі вакол школы. Не раз вясною ён глядзеў, як дзеці, што ўжо вучыліся, праскрабалі гэтыя дарожкі ў мураве, пасыпалі іх жвірам і абсаджвалі касачамі. А ў сярэдзіну школы, дзе вучацца, так дагэтуль яму і не ўдалося прабрацца.

Настаўнік, якога ў вёсцы называлі пан Цаба, Даніку не вельмі падабаўся.

Неяк улетку яны, пастушкі, спаткалі яго на пашы. Ішоў ён з-пад рэчкі з трыма вудамі, са збанком і з нейкай торбай за плячыма. Школьнікі, а з імі меншыя хлопцы паскідалі шапкі і адзін перад адным, як гусі, загаманілі: «Дзень добры! Дзень добры!..» Спыталіся нават, ці хутка ўжо ў школу.

— Яшчэ будзе тры нядзелькі, ды тады ў чвартэк[2], — сказаў настаўнік.

Потым пан Цаба паглядзеў на Даніка і спытаўся па-беларуску:

— А чый гэта такі Іванка, га?

---

[1] Данік быў сіратой, яго бацьку забілі на вайне. Маці была вымушана наймацца на работу да багатага Палуяна.

[2] У чацвер.

Спампавана з сайта www.aversev.by

— Ён не Іванка, ён Данік, — адказалі старэйшыя хлопцы. — Ён Зосін, а прозвішча іхняе Малец. У яго толькі маці, ён сірата.

— Дык, значыцца, ты — пан Даніла Малец, — засмяяўся настаўнік. — Ты таксама прыйдзеш вучыцца? Ходзь ту, не буй сен.[1] — Ён узяў хлопца за плячук і падцягнуў бліжэй да сябе. — А які ж ты, пане Малец, сівы, мурзаты, нястрыжаны!..

Пастушкі засмяяліся. Тады і з'явілася яшчэ адна мянушка: «Пан Даніла Малец адмарозіў палец». А Даніку было зусім не смешна.

— Ну, дык хочаш вучыцца?

Адказаць настаўніку трэба, ды і ў школу хочацца, і хлопец цераз сілу выціснуў:

— Ыгы.

— Не ыгы, а хачу. А рыбу вудзіш?

— Хачу.

Дзеці зноў засмяяліся. А чаго? І пэўна ж, хочацца з вудай на рэчку, але рэчка далёка за пашай, на лузе, і не заўсёды можна туды пайсці.

У руцэ пана Цабы пагойдваўся жоўты збанок, падвязаны за шыйку вяровачкай. Сівы цікнуў у яго раз, другі раз і, нічога не ўбачыўшы, спытаўся:

— Што там?

— Рыба, — адказаў настаўнік. — Не пашанцавала мне сёння, пане Даніла Малец, аднаго толькі акунька адшукаў.

— А чаму ж у торбе поўна?

— У торбе? Там сон руўнеж рыбы.[2]

— А вы ж кажаце — толькі адну злавілі.

— Ну адну. А гэтыя купіў.

— Дзе купілі?

— Дзе? У склепе, ктуры называ сен Немэн.[3] Ха, ха, ха!.. Не, злавіў усе, пане Малец, толькі адну нясу жывую.

---

[1] Ідзі сюды, не бойся.

[2] Там ёсць таксама рыбы.

[3] У краме, якая называецца Нёман.

Спампавана з сайта www.aversev.by

— А чаму вы лжаце?

— А што, ты ніколі не лжэш?

— Ыгы.

— Бачыў ты яго — ыгы. Ну што ж, пане Малец, я табе за гэта ксёнжку дам, калі прыйдзеш у школу. З цацкамі.

На развітанне хлопцы зноў паздымалі шапкі і адзін перад адным загаманілі: «До відзэня! До відзэня!..» А Данік стаяў разгублены, не ведаючы, верыць ці не верыць?.. І неяк прыкра было, невядома чаму...

Цяпер ён успамінае пра гэта, і зноў вяртаецца думка: верыць пану ці не?..

3

Пан Цаба не ашукаў — як толькі Данік прыйшоў у школу, ён даў і яму кніжку з цацкамі і неяк смешна назваў яе — «элемэнтаж»[1].

Літары даліся хлопцу няцяжка. Толькі з дзвюма з іх Данік, як і ўсе іншыя навічкі, меў многа клопату. Нейкае «*а* з хвосцікам» і «*э* з хвосцікам»; першае трэба вымаўляць, як «не то *а*, не то *он*», а другое — «не то *э*, не то *эн*»... Так муштраваў іх настаўнік. І вымаўляць удавалася толькі яму. Малыя неўзабаве вырашылі, што тут уся справа ў носе — які ў каго нос. У пана Цабы нос быў доўгі, чырвоны, і настаўнік гугніў у яго неяк вельмі ж адмыслова. А ў іх яно так не выходзіла гладка — ні «он», ні «эн»...

Пасля пачалі складаць з літар словы: «ма-ма», «та-та», «А-нэ-ля»... Мама і тата — таксама, як і ў нас. Анэля — гэта імя дзяўчынкі. Такой дзяўчынкі ва ўсёй Галынцы не было, і таму Данік назваў Анэляй іхнюю пярэстую, вельмі ж пацешную цялушку.

Неяк зімою, прыйшоўшы са школы, Данік адразу ўзяўся за ўрокі, як ён рабіў цяпер, ужо не пасучы, заўсёды. Мамы не было

[1] Буквар.

Спампавана з сайта www.aversev.by

дома. Ён сам дастаў з печы капусту, з паліцы — хлеб, пад'еў, прыбраў са стала і разгарнуў «элемэнтаж».

Пачаў чытаць вершык, які трэба было вывучыць на памяць. У вершыку польскі хлопец Янэк хваліўся сваёй маме, што ён наловіць многа рыбы. А потым:

Ловіл Янэк до полудня,
Маёнц пружнон храпкэн...[1]

На гэтай «храпкэн» Сівы і засеў. Што гэта за «храпка»? Думаў, думаў — дарэмна. Успамінаў, успамінаў... Не, настаўнік не гаварыў ім нічога пра гэтае слова. У мамы не спытаешся: яна пайшла з кудзеляй. Ды, зрэшты, колькі ў яе ні пытайся, толькі і будзе адказу: «А багі яго ведаюць! Адчапіся. Што я табе — пані ці настаўніца? Бабуля твая, нябожчыца, пакаёўкай у пана была: тая табе адказала б!..»

Раптам Данік успомніў, у каго сёння маці з кудзеляй, і ўсё яму стала ясна. Ну, калі не адразу цяпер, дык хутка будзе ясна, — вось толькі ён пойдзе туды, да Кужалевічаў, ды пакажа гэтую «храпкэн» сябру свайму — Міколу...

Данік хуценька апрануўся і пабег да Кужалевічаў.

Аднак і Мікола не змог яму нічога адказаць.

— Я, брат, у іхнюю школу і дня нават не хадзіў.

Стары Кужалевіч, дзядзька Рыгор, ляжаў на печы, лапцямі на хату. Здавалася — спіць, адно ж паварушыўся і кажа:

— А пакіньце вы з гэтым настаўнікам! Які ён паляк! Ён жа з Бярозаўкі. Ведаю я і бацьку яго, і самога. З багатай хаты, нічога не скажаш. У Нясвіжы вучыўся, па-руску. А цяпер вось у панскую скуру палез. Ужо, бачыш, і паню сабе падхапіў, ажаніўся. Сястра, кажуць, нейкага паліцыянта. Угрунтаваўся добра. А нашага брата, калі каторы і вучоны, настаўнікам, нябось, не паставяць. Ды не кожны і захоча, як гэты Цаба. Храпка, шмапка...

Данік глядзеў на Міколу. Сябар яго ўстаў, падышоў да паліцы і зняў з яе нейкую кнігу.

---

[1] Вудзіў Янак да паўдня, маючы дарэмную ахвоту.

Спампавана з сайта www.aversev.by

— Гэта Купала, — сказаў ён. — Той самы, што і пра Машэку напісаў. Памятаеш? — падміргнуў ён Даніку. — І пра мяне ён напісаў, — гартаў кнігу Мікола. — Глядзі вось, верш «Я шавец-маладзец». І пра цябе напісаў. Пра цябе і пра маму тваю. Вось паглядзім. Ага! Ну, слухай.

Гэта была размова беднай маці-сялянкі з хлопцам сваім, які пасвіў чужыя каровы.

У хлопца было тое, чаго ў Даніка ніколі не будзе, — бацька і браты. Было і тое, чаго ў Даніка яшчэ няма, — служба ў чужых людзей. Было, аднак, і галоўнае, што радніла Сівага з тым пастушком, — горкая доля.

Мікола чытаў, стоячы сярод хаты:

— Як у служкі сходзяць леты —
Ў пастуха,
Пытай, маці, птушкі гэтай —
Канюха.
Запытайся гэтай хмары —
Гэтых слёз;
Гэтай кветкі на папары —
Гэтых лоз;
Гэтай грушы сярод поля
І балот:
Яны ўсе аб маёй долі
Вядуць шчот.

Ну, і галоўнае, што ты, браце Даніла, запамятай назаўсёды:

— Не плач, маці, і не злуйся
На жыццё,
Як я ў сілачку ўбяруся,
Змагу ўсё.

Вось так, брат, і запісана. Зразумела?

У адказ Данік змог вымавіць толькі сваё «ыгы». За яго адказала маці.

Спампавана з сайта www.aversev.by

— Як жа хораша, божачка, — уздыхнула яна. — Чула, Алена, га? — спыталася ў Міколавай маці, якая таксама не прала, а слухала.

— Ну што, Данік, — сказаў Мікола, — хочаш вось так навучыцца чытаць?

— Ыгы!..

— Калі «ыгы», дык ідзі цяпер і вучы сваю храпку, а ўвечары прыходзь.

І вось быў вечар, у які яшчэ адзін заходнебеларускі пастушок з мужыцкай прагнасцю на ўсё жыццё запамінаў трыццаць дзве літары ўжо не чужое граматы. І была пасля вечара ноч, у якую ў старой, занесенай снегам хаціне доўга не мог заснуць маленькі чалавек.

4

...Данік ужо ў трэцім класе. Першыя школьныя радасці даўно прайшлі. Праўда, вучыцца «па-панску» з кожным годам як быццам лягчэй. Ужо і сам пан Цаба гаворыць з імі толькі па-польску. Вось і цяпер ён тлумачыць ім нешта, але Сівы не чуе, бо задумаўся.

Ад невясёлых думак ён абмакнуў у чарніла тупы канец алоўка і напісаў на парце: *Д. Малец*. Па-беларуску, вядома. Настаўнік заўважыў гэта і паставіў «грамацея» ў куток, дзе яшчэ, напэўна, стаяў неаднойчы і тата...

Пакуль Данік стаяў на каленях, гасцінцам з мястэчка брыла па адліжным снезе Акуліна. У старых салдацкіх валёнках, засопшыся, яна несла з пошты вялікі пакунак. Вось яна мільганула ў акне... у другім...

— Кніжкі! Кніжкі нясе! — загаманілі дзеці.

Акуліна ўнесла пакунак, напусціла з двара холаду, навалакла шлапакамі снегу.

— Ух, панок! — уздыхнула яна, папраўляючы хустку. — Хай іх нечага ліха! Наце вам і запіску яшчэ.

— А ты не лайся, дурніца. Ідзь прэч!

Акуліна згорбілася і пайшла.

Спампавана з сайта www.aversev.by

— Ну вось, — сказаў настаўнік. — Вось вам і тое, чаго так хацелася вашым бацькам. Тутай сон бялоруске элемэнтажэ «Зорка». Хто з вас умее ўжо чытаць па іх?

Данік азірнуўся. Ды і азірацца не трэба — і так чуваць, як загаманіў, узняў рукі ўвесь клас:

— Я! Я! І я!..

— Праве ўшысцы,[1] — загугніў пан Цаба. — Ну што ж, не тшэба мне будзе лішне заўрацаць[2] сабе галаву.

Ён памаўчаў.

— А хто ж вас навучыў? — спытаўся.

Аказалася — каго бацька, каго нават маці, каго старэйшы брат, а трох — Яна Бусліка, Уладзімежа Чарадойлу і Шымона Мамоньчыка, як назваў іх настаўнік, — навучыў Данель Малец.

— Ты? — спытаўся пан Цаба. — Ану, устань!

Данік устаў і павярнуўся да класа.

— А хто цябе навучыў? Ну, чаго ты ўнурыўся?

Сівы маўчаў, толькі глядзеў на пана спадылба.

— Не повеш? — зноў па-польску спытаўся пан Цаба. — Не повеш? Мысліш, я сам не вем? Ідзь зноў до свэго конта!..[3]

Данік павярнуўся і, па прывычцы, стаў на калені.

Ён не сказаў, не назваў свайго сапраўднага настаўніка. І не скажа. Не пану аб гэтым казаць!..

Цяпер, стоячы ў кутку на каленях, Данік то думае, то нават шэпча:

— Панскі падліза... Запрадаўся з душой...

Гэта — пра Цабу. Так гаварыла ўся вёска.

5

Даніку ўжо адзінаццаць. Ужо другі год хлопец сядзіць у трэцім класе. Што, хіба ён вучыцца дрэнна? Ды не! Цяпер ужо не толькі ўся школа, а ўся Галынка ведае, што ён, Зосін Данік,

---

[1] Амаль усе.

[2] Марочыць.

[3] Не скажаш? Думаеш, я сам не ведаю? Ідзі зноў у свой куток!

Спампавана з сайта www.aversev.by

вучыцца лепш за ўсіх. Найбольш чытае — і беларускіх, і рускіх, і польскіх кніжак, абы дзе якую дастаў. А вось застаўся ў трэцім класе на другі год. Хто ведае — можа, і яшчэ год будзе сядзець... Такі ўжо заведзены лад у паноў: хто не адходзіць у школу да чатырнаццаці год — плаці штраф або адседжвай у каталажцы[1] пры гміне[2].

Маме ні штрафу плаціць, ні адседжваць, вядома, не хочацца, дык вось Данік і ходзіць другую зіму ў трэці клас. Ісці ў чацвёрты, у местачковую школу, — і няма за што, і няма ад каго. Трэба ж і маме дапамагаць. Шэсць чужых кароў і сваю Рагулю пасе ён улетку.

А ў школу, у чацвёрты клас, так хочацца!..

Вясной, калі ён скончыў трэці, быў у іх сам «пан кіроўнік» — дырэктар местачковай сямігодкі.

«Пан, зразумела, — звярнуўся ён да іхняга Цабы, — лепшых вучняў накіруе да мяне, у чацвёрты клас, а гэтага, Мальца, — у першую чаргу, абавязкова».

«Пане кіроўніку, — загугніў Цаба, — ён, Данель Малец, вельмі бедны, сірата. Дарэмная гаворка».

«Ну што ж, як не, дык не», — сказаў кіроўнік.

А тут учора дзядзька Пятрусь[3] прыслаў пісьмо і грошы. Вось табе і «не, дык не»!

---

[1] *Катала́жка* — месца ўтрымання асуджаных.

[2] *Гмі́на* — самая дробная адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў Польшчы.

[3] Дзядзька Пятрусь — брат бацькі Даніка.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Тут на думку хлопцу ўзыходзіць, што школа ў мястэчку таксама панская, як і ў Галынцы... «А ці добра, што я пайду туды, што я хачу вучыцца, хоць і па-польску? Што ж я — хачу панам Цабам зрабіцца?.. Ды дзядзька ж піша, каб я вучыўся! — успамінае ён з палёгкай. — У школе буду вучыцца па-польску, а дома — па-свойму. І буду шмат чытаць, буду такі разумны, як тата, як дзядзька Пятрусь, як Мікола!..»

6

Выхавацелька чацвёртага класа — пані Мар'я, або кіроўнічыха, як называюць яе вучні, — увайшла пасля пераменкі ў клас з вялікім пачкам чырванабокіх яблыкаў.

— Лісты кляновыя прынеслі? — спыталася яна.

— Прынеслі! Во якія! Во! — загаманілі вучні.

— А-ёй, навошта гэтак шмат? Я ж казала — па два-тры, не больш.

Пані Мар'я гаворыць па-польску чыста, не так калечана, як пан Цаба.

— Але нічога, дзеці, — кажа яна. — Зробім так: кожная парта атрымае адзін яблык, паложыць некалькі лістоў, а на іх зверху — яблык. Праўда, на кляновыя лісты яблыкі не падаюць, бо на клёнах яны не растуць, але гэта таксама нічога: гэта вельмі нагадвае восень, яе хараство. Дык пачынаем, дзеці. Не спяшайцеся. І кожны няхай памятае: хто нарысуе лепш — з'есць яблык, а хто палянуецца — будзе есці лісты.

Сказала і засмяялася, а клас — за ёю. Якая яна добрая, вясёлая! Зусім не такая, як муж яе, пан кіроўнік, — нейкі маўклівы і нават страшнаваты. Дзяўчаткі, дык тыя гавораць «наша пані Мар'я», як быццам яны любяць яе больш за хлопцаў. І ўсё падлашчваюцца, усё шчабечуць: «проша пані» ды «проша пані»!..

Як толькі ў класе ўсталявалася цішыня, пані Мар'я села за стол і дастала з шуфляды класны журнал. І вось гартае яго і нешта запісвае.

Спампавана з сайта www.aversev.by

А Данік, які сядзіць на першай парце, насупраць стала, малюе, а сам усё глядзіць на кіроўнічыху, — то крадком цікне спадылба, а то, калі яна не бачыць гэтага, пазірае адкрыта.

Сёння дваццатае верасня. А Даніку здаецца, што толькі ўчора поп адслужыў ім у царкве малебен на добры пачатак школьнага года. Вучыцца весела, час ідзе хутка. Чаму ж, аднак, сёння яму не рысуецца?

Толькі і глядзеў бы, здаецца, на паню Мар'ю... Чаму? Найбольш, мусіць, за тое, што яна чытала ім пазаўчора.

Пазаўчора яна прынесла на ўрок польскай мовы маленькую кніжку і сказала: «Сёння мы прачытаем апавяданне выдатнага польскага пісьменніка Генрыка Сянкевіча пад назвай «Янка-музыка».

За чатыры гады Данік — нават у пана Цабы, а найбольш дык сам, з кніжак, — навучыўся ўжо разумець па-польску амаль усё. Зрэшты, чытаючы, пані Мар'я растлумачвала ім паасобныя словы. І ўсё зразумела для іх, хоць у школе амаль адны беларускія дзеці з мястэчка і з навакольных вёсак. Дзеці яўрэйскіх крамнікаў, краўцоў, анучнікаў і кавалёў таксама лепш, чым па-польску, гавораць на беларускай мове. Вучняў-палякаў зусім няшмат: сынкі і дачушкі «ўжэнднікаў[1]» і паліцэйскіх, сем чалавек на ўвесь вялікі клас.

Усё зразумела Даніку яшчэ і таму, што ў апавяданні, якое чытала ім настаўніца, гаварылася пра такіх жа, як ён, дзяцей вясковай беднаты, Янка-музыка — польскі хлопец-пастушок, таксама сірата, а маці — батрачка, якіх недзе там, у Польшчы, называюць «каморніцамі». Музыка — гэта мянушка Янкі. Для яго ўсё іграла — і лес, калі ён шуміць і звініць галасамі птушак, і луг, дзе ноччу крумкаюць жабы і крычаць драчы, і вёска, калі яна вясновай ноччу спявае-гамоніць спачатку дзявочымі песнямі, а потым — пераклічкаю пеўняў... Рэха іграла таксама. Іграліі на ветры нават і рагі вялікага сахара́[2], якім малы Янка растрасаў гной на панскім полі.

---

[1] *Ужэ́ннік* — адміністрацыйны работнік.

[2] *Сахо́р* — жалезныя вілы для накідвання гною.

Спампавана з сайта www.aversev.by

— Малец, устань!

Данік прахапіўся ад задумы і ўстаў.

— Ты чаму не рысуеш?

— Я рысую.

— Ну дык сядай і рысуй.

Так, рысаваць трэба ўсё ж такі лепш. «Спачатку лёгенька алоўкам, а тады пойдуць фарбы», — успамінаў Сівы словы настаўніцы. Хлопец глядзіць на яблык, на кляновыя лісты.

Як яны хораша жаўцеюць на іхнім клёне перад хатай! Непрыкметна адчэпліваюцца хвосцікам ад галінкі і асядаюць у бясшумным палёце, лажацца на пясок і на траву. Добра збіраць іх у пучкі — маме, хлеб пячы, — добра ўглядацца на іх далікатныя жылкі або шалахцець па іх босымі нагамі. А яблыкі!.. Улетку Данік часта спаў у садку каля хаты, пад іхняй адзінай яблыняй белы наліў. Звечара ён доўга не мог заснуць, бо ўсё прыслухоўваўся, як яблыкі ападаюць у мяккую, глыбокую траву, як яны на ляту торкаюць, непакояць лісты і галінкі. Часта ён уставаў з-пад коўдры і, стоячы на каленях, мацаў навокал рукамі ў халоднай расе. Знойдзеш-абмацаеш яблык і ўвап'ешся зубамі ў кіславата-салодкую смакату!.. Зоркі — высока над хатай і яблыняй, жабы гудуць на балоце, у садзе звіняць камары... Ночка і сапраўды спявае — так ціха і так шматгалоса...

Той польскі хлопчык Янка-музыка і сам захацеў іграць. Змайстраваў сабе скрыпку з гонціны, начапіў драцяныя струны. Ды яна не хацела іграць так, як тая, што іграла ў карчме або ў панскім двары. І Янка вырашыў украсці сапраўдную скрыпку — у панскага лёкая. Яго злавілі. Нядошлага хлопчыка-сірату панскі суд у гміне прысудзіў да пакарання розгамі. Біў музыку гмінны вартаўнік, дурнаваты Стах, такі самы, відаць, як той Васіль, што трымаў калісьці Даніка, пакуль Палуянаў Павел ударыў яго кіем па галаве.

Пані Мар'я нешта ўсё піша ў журнале. Доўгія чорныя вейкі яе зусім прыкрылі вочы. Яна не бачыць Даніка, і вось ён зноў глядзіць на настаўніцу.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Янка-музыка крычаў: «Ма-ту-ля!..» І пані Мар'я, чытаючы, неяк дзіўна вымаўляла гэтае слова. Тройчы. За першым разам яна сказала яго, потым спынілася і, заплюшчыўшы вочы, устрасянула галавой. А ўжо за трэцім разам у вачах яе паказаліся слёзы... Так, ён убачыў гэта, бо ён сядзіць якраз перад сталом...

Доўгія чорныя вейкі настаўніцы нечакана прыпадымаюцца. Вялікія карыя вочы яе глядзяць у шэрыя, ужо спалоханыя, вочы Даніка.

— Малец!

Сівы ўстае і чырванее. Ужо не толькі яна, а ўвесь клас — ён адчувае гэта — глядзіць на яго.

— Што ты зрабіў, пакажы!

Данік падае настаўніцы сшытак.

— Ну, вядома. Усе ўжо малююць, а Малец... Я пажартавала, што гультаі будуць есці лісты, — іх мы, магчыма, і на калені паставім. Як табе гэта падабаецца? Трэба рабіць, а ты сядзіш ды думаеш пра нябесныя мігдалы[1]...

Пад смех усяго класа Данік садзіцца і пачынае маляваць. Ён кладзе, як і трэба, спачатку светла-жоўтую фарбу, дадаўшы да яе крышку зялёнай... Ды вось не клеіцца штосьці, не так выходзіць, як хочацца... Данікаў сусед па парце — Санька Сурновіч, хлопец з мястэчка. Яны ўжо трохі пасябравалі. У Санькі выходзіць зусім інакш. Бачыш, як захапіўся, — і галаву схіліў, і шчаку падпёр языком...

— Добжэ, Сурновіч, добжэ, — гаворыць пані Мар'я. Яна ўжо стаіць каля Санькі; схілілася над ім, усперлася рукой на парту. — Ты толькі, Сурновіч, лягчэй, не так рэзка. І не спяшайся. Дай мне пэндзаль. Падсунься трошкі.

Яна падсела да Санькі і ўжо малюе сама.

— Вось так, вось так, — прыгаворвае. — Што ж, прыйдзе час, і наш Аляксандр Сурновіч будзе — хто ведае? — можа, Янам Матэйкам...

---

[1] *Мігда́л* — міндаль. *Думаць пра нябесныя мігда́лы* — марыць пра нешта недасяжнае.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Усе смяюцца, а Санька шморгае носам і сарамліва апускае галаву.

— Ян Матэйка, дзеці, — гаворыць настаўніца, — гэта быў такі польскі мастак. Слаўны мастак, на ўвесь свет. Ну, а ты што тут робіш, задуманы? Пакажы.

Данік падае ёй свой сшытак, кладучы яго на Санькава месца.

— О, што гэта — аладка з хвосцікам?

Усе смяюцца, а пані Мар'я бярэ ў Даніка яго пэндзлік, набірае чырвонай фарбы і пачынае папраўляць яго няшчасны яблык.

Ах, і чаму ж яна не сядзіць побач з ім, а з Санькам?! Данік глядзіць на белую маленькую руку настаўніцы, потым крадком цікуе на мілы, прыгожы твар яе, абапал якога звісаюць чорныя кучаравыя пасмы коратка, «пад польку», астрыжаных валасоў. І ў душу яго само чамусьці просіцца слова «матуля», пачутае ад яе пазаўчора.

— Вось так, вось так, — прыгаворвае пані Мар'я, малюючы. — І трэба, Малец, не глядзець, не марыць, а рабіць сваё...

Не, ніколі, відаць, яна не палюбіць яго так, як Янку-музыку! І ніколі не сядзе побач з ім, Данікам, і не пахваліць яго так, як Саньку!..

7

За вокнамі — позняя, мокрая восень.

Чацвёрты і пяты класы злучаны ў адзін пакой — на «беларускую гадзіну». Вучні-палякі пайшлі на гэты час дахаты, аднак і без іх у вялікім пакоі двум класам вельмі цесна.

Такіх гадзін бывае толькі дзве на тыдзень, і ў кожным класе іх вядзе пані Мар'я. І яна, і муж яе, пан кіроўнік, вучаць тут ад самага пачатку панскай улады. Дзеці даўно ўжо ведаюць, што яна палячка. А вось дзе яна навучылася па-беларуску — аб гэтым яшчэ не дазналіся нават і яўрэйскія дзяўчаткі, якія ведаюць усе таямніцы з жыцця местачковых «ужэнднікаў».

Спампавана з сайта www.aversev.by

Пані Мар'я піша з кніжкі на дошцы. «На дварэ дождж, а ў сенях вялікая лужына. Пусты ўлетку нашы сёлы. Венцер[1] новы, маеш час — залатай», — выводзіць яна сваім прыгожым прамым почыркам. Спісаўшы ўсю дошку, яна загадвае чацвёртаму класу перапісаць практыкаванне і падкрэсліць назоўнікі адной рыскай, а прыметнікі — дзвюма.

У пятым класе будзе вуснае. Настаўніца бярэ беларускую чытанку «Родны край» і кажа, як заўсёды, па-польску:

— Вядомая беларуская паэтэса Цётка пісала і вершы, і прозу. Цяпер мы пазнаёмімся з яе навелай «Міхаська». Увага.

І пачала чытаць.

І як заўсёды, калі пані Мар'я чытае па-беларуску, голас яе адразу стаў яшчэ мілейшы. Дзяўчаткі і хлопцы з пятага класа, якія сядзелі па чацвёра-пяцёра на адной парце, заціхлі і загледзеліся на настаўніцу. Цяжка было пісаць і чацвёртаму класу. А найцяжэй, здаецца, Даніку... Ды і навошта яму гэтыя назоўнікі, прыметнікі, пустыя сёлы і незалатаныя венцеры, калі пані Мар'я чытае?..

Перад вачыма Сівага, нібы наяве, разгортваецца роднае жыццё і першая праца — пасьба. Толькі ж не так ужо цёмна і горка было заўсёды, як там, у кнізе. У Даніка, хоць ён таксама сірата, слёз было менш, чым радасці. Хлеб сірочы, вядома, нялёгкі, аднак пра яго пакуль што больш думала мама.

Сівы ўспамінае, як яны, галынкаўскія пастухі, збіралі жоўтую лотаць на залітых вясновай вадою паплавах, бегалі па цёпленькіх, празрыстых дажджавых лужынах на траве, гулялі на выгане ў «чыжыка» і ў лапту, хадзілі ўлетку на Нёман... Там яны купаліся на водмелі з вясёлым гоманам, вудзілі печкуроў, падпускаючы ім каламуты. Вада ў Нёмане, нават і каля берага, на мелізне, не ідзе, здаецца, а бяжыць, і каламута сыходзіць хутка: як ты ні калупай дно пальцамі ног — зноў відаць светлы, цвёрды пясочак... Увосень цвітуць на ўзлеску за ракою верасы, залітыя ласкавым сонцам. Пад босымі нагамі шалахціць

[1] *Ве́нцер* — рыбалоўная сетка ў выглядзе мяшка, нацягнутага на абручы.

Спампавана з сайта www.aversev.by

залатое лісце, суха патрэскваюць сучкі на мяккай аўчыне імху, кропелькамі крыві стракацяць у бруснічніку кіслыя ягады. Як жа добра тады гайдацца на маладых, гнуткіх бярозках і перагуквацца, ловячы звонкае рэха. Як добра рэзаць вецце і вязаць лазою венікі — хто больш!.. А ў полі пастухі палілі бульбоўнік і пырнік і, калі асядала магутнае, шыпучае полымя, пяклі ў прыску салодкую духавітую бульбу. Ну, хіба ж тады было да слёз!..

А ў Міхаські — таго, што ў кнізе, — былі як быццам адны толькі слёзы. І восень такая, і ўсё жыццё. І сапраўды — «на дварэ дождж, а ў сенях вялікая лужына». Міхась быў рабы, нядошлы, і ніхто яго чамусьці не любіў. Не, Даніка ў Галынцы не любілі толькі Палуянавы хлопцы. І здзекаваліся яны з яго нядоўга, пакуль ён не «ўвабраўся ў сілачку», як той хлапчына, пра якога Даніку чытаў калісьці сябар яго — Мікола Кужалевіч. Зачапі толькі Сівага — ён дасць і з правай, а калі мала, дык ён і з «манькі» дадасць!.. А той Міхась вечна збоку сядзеў, наводшыбе, і хлопцы — хто зараза — часта крыўдзілі яго.

Пані Мар'я чытае пра восень і дождж... Нехта падстрэліў недзе жорава, і, абяссілены, ён асядаў на лузе. Пастухі пачалі яго з крыкам лавіць, а ён — не давацца. Падумаў на Міхаську, што гэта купіна, і стукнуўся ў яго грудзьмі. Міхась затуліў яго халатам. А сябрукі, адбіраючы жорава, затузалі хлопца так, што ён самлеў. Хлопцы спалохаліся, адхаялі яго, завялі дахаты і жорава яму аддалі. Так яны і заселі ў запеку ў мачахі — галадалі, хварэлі і пацяшалі адзін аднаго...

— Малец, чаму ты не пішаш?

— Я пішу, — усхамянуўся Данік.

Ён схіліўся над сшыткам, а пані Мар'я паківала галавой, памаўчала трохі і зноў чытае.

Да вясны жораў паправіўся і зажыў у хаце царом над курамі. Міхась раставаў, як той снег за акном. Аднойчы напрадвесні мачаха сядзела за кроснамі, а ён азваўся з запека: «Мама!..» Упершыню пачула баба такое слова ад пасынка. І толькі спалохалася — смерць!.. «Мама, мамачка, жорава дай!..»

Спампавана з сайта www.aversev.by

Чаму на гэтых словах пані Мар'я спыняецца? Нават, здаецца, з прыплачам у голасе, як у той дзень, калі яна чытала ім пра Янку-музыку... Чаму і ў Сівага таксама слёзы закружыліся ў вачах?..

Жораў ішоў за труной Міхася, а потым, калі засыпалі магілу, узняўся і паляцеў. А на зямлі застаўся толькі сумны крык яго, і дождж, і слёзы...

— Ну а цяпер пакажы мне, Малец, што ты там напісаў?

Данік устрапянуўся і, зачырванеўшыся, паднёс настаўніцы разгорнуты сшытак.

— Вядома ж, і палавіны нават не зроблена, — сказала пані Мар'я. — Ну, хлопча, няма з табой ніякай рады. Застанешся ты сёння пасля заняткаў. На каленях трохі пастаіш. Бо трэба пісаць, а не думаць і вечна глядзець...

І вось чацвёрты клас пайшоў дахаты, а Данік стаіць на каленях. За сцяной, у другім пакоі, пані Мар'я вядзе ў пятым класе арыфметыку, замяняючы настаўніка Дулембу. Вучні нешта, мусіць, рашаюць, і голасу кіроўнічыхі не чуваць. Можа, сядзіць над класным журналам. І ўжо не плача, відаць, ні над Янкам-музыкам, ні над Міхаськам...

Сівы сядзіць на пятках, калупае мох у пазе сасновай сцяны і злосна, да слёз злосна думае пра настаўніцу.

Яшчэ толькі ўчора яна здавалася яму не такой, як усе іншыя настаўнікі, не такой, як быў пан Цаба. «Мілая пані Мар'я...», — крывіць сам сябе Данік. Ён думаў так неаднойчы, калі ішоў дахаты або ўпотай глядзеў на яе цераз парту і стол... Эх, дурань! Ён думаў нават, чаму яна — такая добрая, разумная, прыгожая, — чаму яна не мама яго, чаму ён не можа прытуліцца да яе, падставіць сваю сівую, астрыжаную галаву пад яе цёплую маленькую руку... У кіроўнічыхі двое дзяцей: дзяўчынка Вандзя вучыцца ў другім класе, а хлопчык Адась яшчэ зусім малы. Данік бачыў аднойчы, як пані Мар'я вяла іх за рукі па дарожцы вакол царквы. А ён, дурань, глядзеў з-за дрэва, слухаў іх смех і гутарку і... зайздросціў. Думаў, якая яна добрая, прыгожая,

Спампавана з сайта www.aversev.by

якія яны шчаслівыя з такою мамай — гэтыя Вандзя і Адась!.. Ах, які дурань! Як дрэнна думаў ён тады пра сваю маму! Яна, бачыш, і ў школу не правяла яго ні разу, і не пахадзіла вось так, і не спытала ніколі, ці не цяжка яму і пра што ён чытае... Усё завіхаецца вечна, усё маўчыць... Ну, дык вось табе, Сівы, і «мілая пані Мар'я»!..

Што гэта — нехта галосіць? Так, галосіць!

Данік устаў і падышоў да акна. Працёр запацелую шыбу: за гразкаю плошчай — цагляны дом пастарунка[1]. На ганку стаіць паліцыянт. І нікога навокал няма, толькі шэрае сумнае неба і гразь...

— А сы-ынок мой, а род-нень-кі!.. — зноў пачулася галашэнне.

Хто ж гэта?.. Данік працёр запацелую шыбу да самага нізу і ўбачыў — на тратуары, трохі правей ад акна, стаяла нейкая цётка.

— Ціха, Ганна, нічога ты не паможаш, — пачуўся голас мужчыны. Яго — не відаць: мусіць, за ганкам стаіць. А цётка не хоча заціхнуць.

— А дзе ж той Бог, а дзе тыя добрыя людзі?.. А за што ж вы яго катуеце-е?!

— Ціха, дурніца! Ну вось, дачакалася!..

З ганка пастарунка сышоў паліцыянт і ўжо ідзе сюды, абыходзячы лужыны... Данік не вытрымаў: узлез з каленьмі на акно, адчыніў фортачку і задрыжаў — не то ад холаду, не то ад голасу жанчыны.

— Няхай бяруць! — ужо не плакала, а крычала яна. — Няхай катуюць і мяне! Няхай!..

Дзядзька паказаўся з-за ганка і шмыгануў перад акном па мокрых, гразкіх дошках тратуара.

— Стуй! Чэкай, хаме! — крычыць паліцыянт і сам ужо бяжыць сюды па гразі.

---

[1] *Пастару́нак* — мясцовае аддзяленне паліцыі ў Заходняй Беларусі.

Спампавана з сайта www.aversev.by

А цётка не ўцякае... У нейкім шэрым бурносе[1], у лапцях, у хустцы-канаплянцы... І не ўцякае!..

Данік прыўстаў і ўсадзіў у фортачку твар.

— Ідзі, ідзі! — гаворыць цётка. — Ідзі, напіся, крук, і маёй крыві! Бог мілы дасць — захлынешся!.. Ах, Божа мой!..

Данік убачыў толькі, як ён, паліцыянт, замахнуўся... Тады, заплюшчыўшыся ад жаху, малы закрычаў. Толькі адно, толькі самае першае слова:

— Мам-ма!!

І тут яго схапілі пад пахі нечыя дужыя рукі, знялі-сцягнулі з падаконніка на падлогу.

Данік апрытомнеў, убачыў, што гэта яна — кіроўнічыха. Яна стукнула фортачкай, зашчапіла яе, стала спінай да акна, засланіла сабою ўсё... А ён памкнуўся наперад, хацеў ёй крыкнуць нешта такое, пасля чаго яна назаўсёды перастала б для яго быць настаўніцай, а ён — яе вучнем... Ды вось пані Мар'я закрыла аберуч твар, і плечы яе задрыжалі. Данік адступіўся. Крыку за вокнамі ўжо не чуваць... І цішыня пустога класа, і гэтыя малыя белыя рукі, што ўпершыню закрылі мілы калісьці твар настаўніцы, і плечы яе, што дрыжаць, — усё гэта нібы вярнула яго зноў сюды, на гэтую падлогу перад партамі... Данік спалохаўся, абмяк, адышоўся на сваё месца і стаў на калені.

— Што ты робіш, дзіця маё! Што ты крычыш! — яна ўжо стаяла за яго спінай.

А ён не хацеў нават азірнуцца. «Ідзі ты к чорту! Разам з усімі вамі — к чорту!..» — гаварыў ён без слоў, усімі сіламі сваёй уражанай, як быццам ужо не дзіцячай душы. Але слёзы, гарачыя слёзы нянавісці і жалю, самі каціліся з яго вачэй...

— Устань!

Данік унурыў галаву яшчэ ніжэй.

— Устань, Малец, кажу табе!..

---

[1] *Бурно́с* — даўгаполая з шырокімі рукавамі сялянская вопратка з саматканага сукна.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Яна ўжо гаворыць без слёз. І ён ужо не плача. Слёзы самі паўзуць па шчоках Сівага, а ён ужо калупае пальцамі сухі, шорсткі мох у пазе, а потым нібы адрывае руку ад сцяны, і пальцы самі сціскаюцца ў кулак.

— Устань, Данік! — яна назвала яго так упершыню. — Ну, я прашу цябе — устань...

Данік устаў. Ён не глядзіць на яе, бо ўжо не можа ўзняць вачэй. Не можа і не хоча. І вось да твару яго дакранаецца цёплая далонь. Пальцы спаўзаюць па шчацэ да падбародка і хочуць знізу прыўзняць хлопцаў твар.

— Не трэба, Данік, злаваць на мяне...

Ды ён не хоча слухаць, не хоча і гэтай рукі. Матнуўшы галавой, ён вызваляе свой падбародак з яе цёплых пальцаў.

— Ну што ж, ідзі дахаты. Толькі ціха. Дай я цябе правяду цераз гэты пакой.

Пяты клас — чуваць Даніку — ужо шуміць за сцяною. Ісці тудою сапраўды не варта. Данік бярэ з парты торбу і шапку, ідзе следам за кіроўнічыхай. Цераз настаўніцкі пакой яна выпускае яго на ганак. Хлопец не кажа нават таго «до відзэня», якое павінен сказаць. Не можа вымавіць. Ды і не хоча. Спыніўшыся на нейкі момант, ён глядзіць цераз гразкую плошчу туды, дзе на ганку цаглянага дома зноў стаіць той — ненавісны, жахлівы — у цёмна-сінім шынялі...

Неяк увечары, дома, калі маці наліла яму паабедаць з дарогі, Данік, нават не сеўшы за стол, сказаў:

— Дай мне адну залатоўку.

— Вось як! — здзівілася мама. — Навошта?

— Трэба.

— Казалі хіба, каб прынёс?

— Каб не трэба было, не прасіў бы.

— Садзіся вось ды еш.

— Еш... Ты вось давай, а то — еш...

— Будзеш заўтра ісці, дык дам.

— Дай цяпер. Мне вельмі ж трэба!..

Спампавана з сайта www.aversev.by

— Ну ж і слата ты, Даніла! Канца, ты думаеш, не будзе гэтым залатоўкам? Пойдзеш вясной у поле ды выграбеш, знойдзеш яе, другую, за бараной?..

Зося гаварыла гэта, ужо корпаючыся ў сваёй старой пасажнай скрыні[1], дзе ляжаў яе шэры бурнос з бакавою, нядаўна прышытай кішэнню.

— На, бяры. Надзьмуўся, як індык. Садзіся еш.

Ён узяў залатоўку, схаваў яе ў сумцы, тады ўжо сеў за стол і падсунуў да сябе місу з крупнікам. Пакуль ён еў, маці доўга глядзела на яго, стоячы сярод хаты, і нарэшце сказала:

— А натура, дальбог жа, таткава!..

Назаўтра ў школе, як толькі адзвінеў на вялікую пераменку званок і пані Мар'я выйшла з класа, Санька Сурновіч, якога ўжо называлі Матэйкам, ускочыў на парту і закрычаў:

— Увага, увага! Сёння Малец частуе! Рыхтуйцеся, хто галодны!..

— Я галодны! А я галаднейшы! Давай, Данік! Чым частуеш? — закрычалі хлопцы.

Данік сядзеў за партай і толькі ўсміхаўся.

— Чым я цябе пачастую? Свежым снегам? Што ён выдумаў!

І Сівы штурхануў свайго сябра, Саньку Сурновіча, пад бок: маўчы!..

— Эй, снеданне нясуць! Нех жые![2]

З пятага класа — адтуль быў выхад на двор — увайшлі дзяжурныя. Рыжы і кучаравы Абраша Цымес, сын каваля Ярухіма, надзьмуўшыся, нёс перад сабою бачок з гарачай кавай. За ім ішла, несучы два накрытыя сурвэткамі кошыкі, Аня Нупрэвіч, па мянушцы Каза, бойкая, крыклівая дзяўчынка з рубцом-разрэзам на верхняй губе.

— Г-гоп! — паставіў на стол бачок Абраша Цымес.

— Чаго напалі? — закрычала Каза на дзяцей. — Не ўсе адразу!..

---

[1] *Пасáжная скры́ня* — драўляная скрыня для захоўвання рэчаў, каштоўнасцей, якія бацькі давалі маладой, калі яна выходзіла замуж.

[2] Няхай жыве!

Спампавана з сайта www.aversev.by

У школе быў нядаўна заведзены такі парадак, што дзецям выдавалася «бясплатнае падмацаванне». Кубак кавы і лустачка хлеба — заўсёды адно. Дзеці «ўжэнднікаў» і паліцэйскіх падыходзілі да гэтай справы «з гонарам» — бралі толькі каву і запівалі ёю свае дамашнія бутэрброды. Іх пераймалі ў гэтым сынкі і дачушкі багатых яўрэяў. Іншыя дзеці елі звычайна і сваё, і школьнае. Шмат было і такіх, для каго гэты кубак кавы і лустачка хлеба былі адзіным падмацаваннем. З такіх звычайна кпілі панскія і купецкія дзеці.

Пра гэтыя іх кепікі найбольш балюча і злосна думаў Данік Малец. Ён разумеў ужо і чуў ад старэйшых, што «падмацаванне» гэтае — нікчэмныя крошкі ад тых шматлікіх падаткаў, якія паны здзіралі з працоўных, — крошкі, кінутыя «на адчэпнае»...

— Ну, Абраша, ты — свой чалавек! Поўны, брат, налівай!

Абраша любіў гэтую справу. З чарпаком у левай руцэ, з лістом паперы ў правай (ён быў ляўша), вясёлы рыжы Цымес чытаў па спіску прозвішчы:

— Бурак Люба!

— Ёсць!

— На, палучай на чай, — і наліваў ёй чарпаком у падстаўлены кубак.

— Ян Цівунок!

— Ёсць!

— На, палучай на чай. Онэфатэр Эля! Стэфан Чачотка!..

— Ёсць! Ёсць! — адказвалі выкліканыя. Атрымаўшы «на чай», яны падыходзілі да Казы, якая выдавала хлеб.

Як толькі ўсе расселіся на партах і пачалі жаваць ды сёрбаць, Санька Сурновіч зноў закрычаў:

— Увага!

Тады Данік аберуч дастаў з-пад парты і ўзняў над галавою вялікую вязку нанізаных на шпагат абаранкаў. Яны, здаецца, ажно засвяцілі! Вялікія, салодкія, па пяць грошаў!..

— Ура! Нех жые! — закрычалі дзеці.

— Спісак давай! Чытай, Матэйка, па нашаму спіску! — скамандаваў Данік.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Санька стаў за сталом, дастаў з кішэні складзены лісток са сшытка і пачаў чытаць:

— Янка Цівунок! Біруля Ніна! Хана Партной!..

Для тых, каго ён выклікаў, Данік здымаў са шпагата вялікі, яшчэ духмяны абаранак. І спіс, і абаранкі закончыліся разам.

— Вунь які! Ты, брат, давай усім!..

— Усім не магу! Не хапіла!

І вось тады Чэсік Бэндзіньскі, сын каменданта пастарунка, усхапіўся са сваёй парты і, яшчэ не глынуўшы мамусінай булкі з маслам і сырам, закрычаў:

— Я ведаю! Ведаю ўсё!

— Што ты ведаеш? Што? — падышоў да яго Данік.

— Ну але, што ты ведаеш? — падышоў да яго і Санька.

— Усё ведаю! І скажу!

— Што ты скажаш? Каму?

— Пані Мар'і, каму ж!

— Эх ты, лупаты!

— А ты хамула! Мала вас яшчэ наглушылі!..

— Матэйка, Сівы, — па мордзе яму!..

Хлопцы не заўважылі, як з настаўніцкага пакоя ўвайшла ў клас і апынулася ў самым кірмашы іх выхавацелька. Яны пачулі толькі яе голас:

— Ціха! Што тут у вас? Я кажу — ці-ха!..

Крычала яна не адна, — разам з ёю ўвайшоў пан Дулемба, якога хлопцы з пятага класа празвалі Павуком.

— Будзе ціха, халера, ці не?! — крычаў ён, натапырыўшы жоўтыя вусікі.

— Пан дазволіць, пане Каролю, я разбяруся сама, — сказала яму пані Мар'я. — Дзе дзяжурныя? Што гэта ў вас за парадак?

Абраша Цымес і Каза, абое з недаедзенымі абаранкамі і з кубкамі ў руках, толькі хацелі пачаць апраўдвацца, але Чэсік Бэндзіньскі перабіў іх.

Ён падышоў да настаўніцы бліжэй і сказаў:

— Я ўсё ведаю! Гэта — камуна!

Спампавана з сайта www.aversev.by

— Якая камуна! Што ты пляцеш?

— Я не пляту. Я, проша пані, усё адразу разгадаў. Гэты вось, Малец, — ён тыцнуў рукой у грудзі Даніку, — падвучыў іх сабраць грошы...

— Няпраўда, — перабіў яго Санька. — Мы не падвучвалі, мы грошай не збіралі...

— Сціхні ты! — крыкнуў Чэсік.

Ён хацеў яшчэ нешта крычаць, але настаўніца спыніла яго і звярнулася да Даніка:

— Малец, ты купіў абаранкі?

— Я.

— А дзе ты ўзяў гэтулькі грошай?

— Мама дала.

— А навошта ты гэта зрабіў?

— Пані Мар'я, — умяшаўся Дулемба, — я думаю, што ён маніць. Ты, дурань, гавары!..

Кіроўнічыха пачырванела і нейкі момант глядзела на Павука.

— Пане Каролю, — сказала цвёрда, з прыціскам, — я прасіла ўжо даць мне святы спакой. Гэта мой клас, і я сама разбяруся... Малец, навошта ты гэта зрабіў?

Данік глядзеў і не моргаў.

— У мяне сёння дзень нараджэння.

— Няпраўда! Ён маніць! — закрычаў Бэндзіньскі.

— А ты адкуль гэта ведаеш, Чэсь? — павярнулася да яго пані Мар'я. — Як можна так гаварыць пра калегу?

— Бо ён не ўсім па абаранку даў, а толькі па нейкаму спіску. Вось па гэтаму — у Сурновіча!

Дурны Санька! Ён не схаваў у кішэнь, а яшчэ ўсё трымаў у руцэ той лісток са сшытка. Настаўніца ўзяла лісток і пачала вадзіць па ім вачыма.

— На больш у мяне грошай не было, — гаварыў Данік. — Каб мама больш дала, дык я...

Пані Мар'я ўзняла позірк над спіскам і паглядзела хлопцу ў вочы. Доўга так, пранікліва. Аднак ён, па-ранейшаму, нават не моргаў.

Спампавана з сайта www.aversev.by

— Так, Малец, — сказала нарэшце настаўніца, — ты ў нас заўсёды нешта прыдумаеш. Больш мне гэтага не рабі. Нават і ў дзень нараджэння. Ты разумееш?

— Разумею, проша пані. Я больш так не буду.

— І добра. Цяпер, дзеці, канчайце хутка снеданне. Засталося на гэта, — яна зірнула на ручны гадзіннік, — чатыры хвіліны. Хадзем, пане Каролю, справа скончана. Дзеці — заўсёды дзеці.

<...>

9

У лютым, калі зіма пачынае прыхворваць адлігамі, якія з'ядаюць снег, калі пеўні пяюць на ўсё горла, думаючы, што вось ужо і вясна, кіроўнічыха цяжка захварэла. Яе павезлі нават у павятовую бальніцу, а праз два тыдні прывезлі назад, і пані Мар'я ляжала дома.

Вучні сумавалі па ёй, а найбольш, здаецца, Данік. Роднай мовы цяпер — ні гадзінкі, і выхавацелька ў іх новая — худая крыклівая панна Рузя, якая вучыць і нецікава, і нудна. Адзнакі запісвае ў тоўсты блакнот, які хавае ў чорную сумачку. З усіх пяці адзнак яна найбольш любіць «тры з мінусам» і за ўсё ўсякае лаецца. Ад яе Данік упершыню пачуў чатыры новыя польскія словы — матолак, драць і «божы конь»[1].

Панна Рузя часцей за ўсё стаіць каля белай кафлянай грубкі, залажыўшы назад сухія бяскроўныя рукі з пярсцёнкамі. Грэецца.

Аднойчы на рысаванні яна стаяла так, а потым пачала:

— І не брыдка вам, драні? Ваша ранейшая настаўніца колькі ўжо часу хварэе, а вы?.. Хоць бы разочак схадзілі адведаць! Ганьба!..

На пераменцы клас загаманіў аб гэтым. Найбольш крычала Каза — што яна, калі так, павядзе ўсіх сама. І пасля заняткаў дзеці пайшлі. Доўгай чародкай шлёпалі яны па мокрым снезе лапцямі, ботамі, чаравікамі, кідаліся снежкамі, крычалі. Уся вуліца, здаецца, ведала ўжо, куды яны ідуць.

---

[1] Недарэка, дрэнь і асёл.

Спампавана з сайта www.aversev.by

— Не бойцеся, — гаварыла Каза. — Пана кіроўніка цяпер дома няма. Ён яшчэ вучыць у сёмым. У іх цяпер фізіка.

Кіроўнік жыў у глухім, «свіным», як казалі, завулку, у таго бязрукага дзядзькі, які нават зімой насіў летнюю шапку царскага чыгуначніка.

Дзядзька спаткаў іх у сенях каля парога, прымусіў яшчэ на двары паабціраць венікам ногі, а потым ужо загадаў:

— Ціхенька, хораша трэба, без шуму. Пані хворая. Ну, чаго ж вы?

Нават Каза і тая хавалася за другіх. І ўсе пачалі на Даніка:

— Ты, Малец, ты ідзі!

— Каторы гэта? Ён? — спытаўся дзядзька. — Ну, новыя боты, чаго ж ты — валяй! А вы — за ім.

Дзядзька ўзяў Даніка за рукаў. Падвёў да дзвярэй другой, «тыльнай» палавіны хаты і пастукаў у дзверы.

— Прашу! — адказаў яму знаёмы дзецям і так даўно не чуты імі голас.

Сівы шмарганўў носам і рашуча ўзяўся за клямку. Дзеці шыбанулі, хто ў кут, а хто адразу на двор, і Данік апынуўся за парогам адзін.

— А, Малец, гэта ты! — пачуўся голас ад акна. — Прыйшоў адведаць, хлопчык, сваю настаўніцу? Як гэта хораша! Ды ідзі ж ты сюды, павітаемся! Ну?..

І пані Мар'я працягнула да яго рукі. Данік ішоў туды, як заварожаны. Яна ляжала галавою да акна, завешанага фіранкай, па шыю схаваўшыся пад беленькай коўдрай. Чорныя, кучаравыя валасы яе «полькі» растрэсліся на падушцы, а чырвоныя, нібы прыпухлыя губы ўсміхаліся. Калі Данік зусім падышоў, пад далонямі пані Мар'і загарэліся яго шчокі і вушы, а на лбе — зусім нечакана — горача чмокнулі пацалункам губы настаўніцы.

— Харошы мой!.. І чаго ж ты так засаромеўся? Ну, сядзь. Вазьмі вунь крэсла, каля стала.

Данік узяў тое крэсла, паднёс яго да ложка і сеў на краёчку. І гэтак няёмка яму!.. Боты — і выцер жа іх здаецца! — усё ж такі наслядзілі на чыстай чырвонай падлозе.

Спампавана з сайта www.aversev.by

— Ну, раскажы мне, Данік, як ты цяпер вучышся? За што ты двойку атрымаў?

— Не двойку, — адказаў Сівы, — тры з мінусам.

— Ха, ха, ха! Ах ты, мой жулік! Хіба ж гэта не тое самае? Ды яшчэ для цябе — для выдатніка. Чаму ты панну Рузю не слухаеш?

— Яна... Яна толькі крычыць...

— І трэба крычаць на вас. Што, можа, не? Не можна не любіць настаўніцу: яна — другая мама.

— Яна... не...

— А я? — пані Мар'я нахмурыла бровы, а ўсё ж усміхаецца.

Данік узняў вочы і зноў апусціў іх — не вытрымаў.

Яна працягнула руку, як тады, калі ён стаяў на каленях, і ўзяла яго цёплымі пальцамі пад падбародак. Глядзіць у вочы і ўжо неяк сумна ўсміхаецца.

— Ты не злуеш на мяне? — спыталася цішэй. — За тое, калі ты крычаў у акно?.. Ах, Данік, Данік! Падрасцеш — зразумееш мяне, успомніш. Бо я разумею вас вельмі добра...

Яна адняла руку ад яго падбародка, памаўчала трохі, а потым усміхнулася зноў.

— Ну, быў у цябе яшчэ раз дзень нараджэння? Не чырванейся. Ты зманіў, я ведаю. Я правярала — ты нарадзіўся ў ліпені, а не ў лістападзе. І спісак ваш я не паказала нікому. Хіба, можа, хто-небудзь...

Данік успомніў Павука-Дулембу і Чэсіка. Гэта, мусіць, яна пра іх намякае?..

— Я разумею цябе — ты любіш толькі бедных. І я, Данік, не з багатай сям'і. Вы тут усе не любіце паноў. А я — таксама палячка. І гэта, хлопчык, не адно і тое ж. І ў нас, у Польшчы, усякія людзі ёсць. Ты зразумееш мяне, калі падрасцеш.

Пані Мар'я памаўчала зноў.

— Зірні, вунь там, — паказала яна на этажэрку. — Тую вунь кніжку вазьмі і падай мне. Таўсцейшая, у чырвоным пераплёце.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Ну, вось. А цяпер вазьмі вунь там, на століку, ручку і памачы яе ў чарніліцу. Дай мне.

Ён нёс яе, гэтую ручку, асцярожненька, бо здавалася, што чарнільная кропля сарвецца з пяра і капне... Нават і носам баяўся шмаргануць, хоць і трэба было... Ну, аддаў!..

— Дзякую, Данік.

Пані Мар'я левай рукой трымала перад сабой разгорнутую кнігу, а ў правай — ручку.

— Адгадай, — сказала, зноў нахмурыўшы бровы, — адкуль я ведаю па-беларуску? Не адгадаеш! — усміхнулася задаволена. — Я вучылася ў рускай гімназіі. Яшчэ перад вайной, калі мой бацька працаваў у Расіі настаўнікам. А па-вашаму я навучылася тут. Увечары вучылася сама, а ўдзень вучыла вас. Сяму-таму гэта не падабаецца... Ды нічога... А напішу я тут, усё ж такі, па-свойму. Ты мне падай прамакатку. Са століка.

Пакуль ён браў прамакатку, а потым стаяў з ёю каля ложка, пані Мар'я напісала нешта ў разгорнутай кнізе, пасля прамакнула напісанае і закрыла кнігу. Ён яшчэ ўсё не ведаў, што гэта і да чаго.

— Вазьмі, Данік. Гэта — табе. Чытаць будзеш дома. І лепш не паказвай нікому. Добра?

Сівы многа чытаў, і ён ужо ведаў, што тут трэба было б зрабіць... Не, не таму, што ведаў, а проста вельмі хацелася схіліцца над яе рукой, хоць дакрануцца да гэтай белай маленькай рукі губамі. Ды ён жа не рабіў так ніколі, нават маме сваёй... Як жа ты тут асмелішся цяпер?..

— Дзенькуе, — шапнуў ён, апусціўшы вочы.

— Добра, хлопчык. Чытай, вучыся. Ты пойдзеш далёка...

— Мамуся! — пачуўся звонкі дзіцячы голас. — А я іду зноў!

З дзвярэй у кутку пакоя, якія вялі, відаць, у кухню, убег малы хлопчык з доўгімі, як у дзяўчынкі, светлымі валасамі.

— Ну, Адась, павітайся, — з усмешкай сказала яму пані Мар'я.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Малы паглядзеў на Даніка, усміхнуўся і працягнуў руку.

— Чэсць! — сказаў ён. — Я называюся Адась.

— А я Данік.

— Данік? Мамуся, так называюцца?

— Называюцца, сынку. Ну, ты ідзі да бабулі. Ты нам перашкаджаеш. Будзь ветлівы. Добра?

— Добра. Я толькі мамусю пацалую. О так! Цяпер адно вочка, а цяпер — другое. О так! І пабягу, бо як татусь зловіць мяне тут — будзе крычаць, што я цябе непакою...

Калі Адась пабег на кухню, пані Мар'я памаўчала, а потым, гледзячы на Даніка, усміхнулася.

— Харошы хлопчык мой сын? — спыталася яна. Данік кіўнуў галавой, і пані Мар'я ўсміхнулася зноў. — А Вандзю маю ведаеш? Яна таксама харошая. Я хачу, каб яны былі разумныя, добрыя, высакародныя людзі. Бо дрэнных, Данік, і так зашмат...

Яна памаўчала зноў.

— Ну што ж? — спыталася. — Ты вось, відаць, любіш мяне, вашу кіроўнічыху?.. Не чырваней, я ведаю, што вы мяне так называеце. Ты вось прыйшоў, і я вельмі рада. Ну а чаму не прыйшлі ўсе? Чаму ты ўсіх не прывёў?

— Яны ў сенях... І на двары.

— На двары! Ах, жулік, і маўчыш?! Пакліч іх!

Данік адчыніў дзверы, выйшаў у сені, паклікаў. І вось яны, чацвёртакласнікі, пасыпаліся ў хату, як тая бульба з развязанага мяшка: «Дзень добры! Дзень добры! Дзень добры!» — пяць, дзесяць, дванаццаць разоў...

— Ах вы, разбойнікі! Ну, чаго ж вы стаялі там? А як павырасталі, а-ёй!..

Дзяўчаты акружылі ложак настаўніцы. Эх, падлізы! Цяпер — дык «проша пані! проша пані!», а адразу?.. Данік апынуўся ў іх чарадзе — хлопцы стаялі, вядома, далей — і толькі прыціскаў пад пахай сваю кнігу... Лепш за ўсё — зараз жа схаваць яе ў торбу.

Спампавана з сайта www.aversev.by

10

Рабенькі Янка Цівунок, якога за кірпаты нос празвалі Лычыкам, стаіць каля стала, спінаю да акна, і, як заведзены, расказвае вызубраны ўрок па гісторыі Польшчы.

Сакавіцкае сонца свеціць Янку ў патыліцу, і Даніку відаць, як вушы Лычыка, нейкія круглыя і адтапыраныя, прасвечваюцца, нібы яны з ружовай паперы.

— ...Калі туркі напалі на Аўстрыю, — гаворыць Янка, — аўстрыйскі цэсаж[1] папрасіў польскага круля[2] Яна Трэцяга Сабескага: «Прыйдзі і выратуй нашу Аўстрыю». Храбры круль Ян Трэці Сабескі сабраў сваё гераічнае войска і 12 верасня 1683 года пад Венай, сталіцай Аўстрыі...

— Досць! Досць, матолак![3] — перабівае яго панна Рузя. Яна не стаіць каля печы, а ходзіць па класе, залажыўшы назад рукі. — Што я казала табе? Не тарахці, як папугай, а гавары сваімі словамі. Ну!

— Храбры круль Ян Трэці Сабескі сабраў сваё гераічнае войска і 12 верасня...

— Матка боская! — зноў спыняе яго панна Рузя. — Ну, сабраў, ну, прыйшоў, ну, разбіў!.. Конь ты божы! Ды гавары ты нарэшце сваімі словамі!

Янка маўчыць, толькі вушы яго ружавеюць яшчэ больш. Запалку, здаецца, падсунь — успыхне.

— Далей! — загадвае яму панна Рузя. — Расказвай, ці спадабалася гэта аўстрыйскаму цэсажу.

— Аўстрыйскаму цэсажу гэта не спадабалася, — гаворыць Янка ўжо «сваімі словамі». Потым раптам хлопец збіваецца з польскай на беларускую мову: — І тады ён... Тады...

— Досць! — зноў перабівае яго настаўніца. — «І тады ён... Тады...» — крывіць яна. — Што за «тады» і што за «ён»? Што

---

[1] Імператар.

[2] Караля.

[3] Годзе! Годзе, недарэка!

Спампавана з сайта www.aversev.by

ён зрабіў, сустракаючы Яна Сабескага, і што зрабіў Ян Сабескі? Па-польску гавары!

Янка маўчыць. Ён апусціў галаву і, здаецца, занаравіўся зусім. Ну хоць бы вочы ўзняў! Тады заўважыў бы, як Данік Малец, стараючыся, каб не прыкмеціла настаўніца, паказвае яму, што зрабіў Ян Сабескі. Раз, другі раз, трэці раз паказаў... І вось нарэшце Лычык цікнуў на клас спадылба і здагадаўся.

— Тады круль Ян Сабескі, — пачаў ён, — падкруціў свой вус...

Клас грымнуў смехам.

— Ціха, драні! — старалася перакрычаць усіх панна Рузя. А потым, калі вучні сціхлі, яна, паглядзеўшы на Янку, сказала: — Сядай, матолак! Не буду я тут з табою надрываць свае лёгкія. Хто адкажа?

Узнялося некалькі рук. Асабліва — адна, з другой парты, старалася дастаць найдалей — ледзь не да самага твару настаўніцы.

— Бэндзіньскі, — сказала панна Рузя.

Чэсік апусціў сваю доўгую руку, устаў і бойка загаварыў:

— Калі наш храбры круль Ян Трэці Сабескі разбіў туркаў пад Венай, ён уязджаў у Вену на чале сваіх непераможных гусараў. Аўстрыйскаму цэсажу не спадабалася, што гэта не ён, а наш круль Ян Трэці Сабескі перамог туркаў, і ён не хацеў зняць капялюш перад нашым крулем. Ян Трэці Сабескі падняў руку, каб падкруціць свой вус, а аўстрыяк падумаў, што ён падносіць руку да капелюша, і тады ўжо ён схапіўся за свой капялюш. А потым...

— Старчы[1], Бэндзіньскі, сядай! — усміхнулася настаўніца.

Яна падсела да стала і выняла з чорнай сумачкі свой тоўсты блакнот. Нават і не прыўстаючы з першай парты, Данік бачыў, як яна адгарнула старонку на літару Б і напісала вялікае *пяць*. Пасля адгарнула старонку на літару Ц і падумала трохі, паставіла, таксама вялікае, *мінус тры*.

---

[1] Хопіць.

Спампавана з сайта www.aversev.by

— Ну, хто далей? — спыталася, гледзячы на клас.

Ды тут у дзверы з настаўніцкай нехта пастукаў і спытаўся:

— Можна?

Клас падхапіўся і не застыў, як звычайна, у маўклівым прывітанні, а загудзеў на трыццаць шэсць галасоў.

«А-а-а! О-о-о!» — чуваць было ў гэтым нястрымным гуле дзіцячай радасці.

— Ціша! — перакрычала іх панна Рузя. — Сядайце! Дзень добры, пані Анджэеўска! Прашу прайсці далей.

Пані Мар'я — у цёплым паліто і футранай шапачцы — стаяла каля дзвярэй і ўсміхалася. Такая бледная яшчэ, з пазападаўшымі вачыма...

— Я толькі зірну на іх разочак. Можна, панна Рузя?

І вось, выйшаўшы ад дзвярэй за стол, дзе так прывыклі бачыць яе чацвёртакласнікі, пані Мар'я памаўчала, апусціўшы вочы, а потым паглядзела на клас і сумна ўсміхнулася.

— Дзеці, — сказала яна, і голас яе задрыжаў, — мілыя дзеці, я вельмі рада, што вы яшчэ ўсё памятаеце мяне. Я так хацела б адказаць вам сэрцам за сэрца... Ужо цяпер, адразу, але... Ну што ж, мне не ўдасца прыйсці ў школу, відаць, да самай вясны...

Клас ахнуў зноў, і зноў панна Рузя перакрычала яго, супакоіла.

— Я пацяшаю сябе тым... — пачала пані Мар'я, але голас яе зноў задрыжаў. — Ды што там пацяшацца: у маі ўбачымся зноў. — Яна ўсміхнулася. — Жадаю вам поспехаў, дзеці! Будзьце здаровы!

Кіроўнічыха неяк вельмі ж павольна выйшла з класа.

Панна Рузя пайшла праводзіць яе на вуліцу. А дзеці кінуліся да акон. Не ведаючы, што зрабіць і што сказаць, каб пані Мар'я зразумела іх, яны крычалі ў вокны і махалі рукамі.

А Данік, дык ён узлез з каленьмі на падаконнік і — як у той незабыўны дзень, калі на тратуары перад школай галасіла цётка, — узяўся рукой за раму фортачкі. Вось-вось, здаецца, крыкне. Але крычаць ён не мог...

Спампавана з сайта www.aversev.by

Пані Мар'я ўзышла на прыгорачак перад школай, азірнулася, памахала рукой і пайшла. На сярэдзіне плошчы азірнулася зноў, зноў памахала. Данік уздрыгнуў — ледзь прыкметна і для самога сябе. Хлопцу здалося, што памахала яна толькі яму, апошні раз і — назаўсёды...

11

Як толькі статак выйшаў за апошнія дрэвы двара і пачаў разбрыдацца па пашы, стары Мікіта спыніўся і палез за пазуху.

Дастаўшы з-за пазухі жалейку, ён гладзіў, абдзьмухваў яе, прылажыў да губ і зайграў. Над зялёным прасторам, над Данікам, які прысеў перад старым, над статкам і — гэй, далёка! — над палямі паплыла, палілася журботная песня...

Песня жалейкі ўваходзіць, як нешта жывое і роднае, у песні нябачных жаўранкаў, у позні салаўіны перасвіст — тут недалёчка, у садзе...

Каровы скубуць акрашаную буйной расою траву. Старанна, спакойна скубуць, нават хвастамі не махаюць і не паводзяць вушамі. І не варушыцца, глядзіць — не змаргне — падпасак...

Данік ляжаў, падпёршы шчаку далонню. Ён успомніў худы, скарэжаны злосцю твар панны Рузі і голас яе: «Прэч! Натыхмяст прэч зэ школы, драньі! І венцэй не пшыходзь!»[1] А ён усё ж такі прыйшоў назаўтра ў школу. Другі раз «прэч» не прыйшлося пачуць. Пан кіроўнік сказаў яму спакайней: «Малец, ты выключаны са школы, ідзі дадому і падумай, што ты натварыў». А што ён натварыў? Проста ім крыўдна было, што разам з паняй Мар'яй зусім пайшла са школы і родная мова. Ну, урокі ўрокамі, а на пераменках яны пастанавілі, што калі хто акажацца хоць слоўцам па-польску — пяць грошаў штрафу. Ды так і не зарабілі на гэтым ні гроша. Лупаты Чэсік Бэндзіньскі данёс... Пані Мар'я яшчэ ўсё хварэла, і за Даніка не было каму заступіцца. Ні Саньку, ні Цівунка, ні Казу — нікога не выключылі са школы,

[1] Прэч! Зараз жа прэч са школы, дрэнь! І больш не прыходзь!

Спампавана з сайта www.aversev.by

бо ён, Данік, не выдаў нікога з тых, што змаўляліся. А кіроўнік усё дапытваўся: «Хто цябе навучыў?..» Ніхто не навучыў — Сівы сам навучыўся!..

— Ты не гаруй, Даніла, — пачуў ён голас дзеда Мікіты. — Дзядзька грошай прышле. Падрасцеш яшчэ трохі, купіш каня, можа, і поля шматок... Больш дзядзька не прысылаў? Ну, чаго ты маўчыш?

— Няма, — адказаў падпасак. — Ні грошай, ні пісьма не шле.

Стары задумаўся.

— Нешта нам снеданне не нясуць, — сказаў пасля. Думаў хоць гэтым пацешыць, разварушыць свайго памочніка, аднак дарма — Данік усё маўчыць.

— Нічога, унучак, прыйдзе час — і нашы напішуць, і самі прыедуць да нас. Быць не можа інакш! Я — дык бог святы ведае, а ты дачакаешся... Ах, зараза! Гэта тая, Падласка!.. Бяжы ты, брат, адвярні іх ад поля!..

Данік пабег.

Адвярнуўшы статак ад жыта далей на траву, ён не захацеў вяртацца да старога, а сеў на ўзмежку і дастаў з-за пазухі кнігу. Тую самую. Адну толькі яе і ўзяў сюды з дому. Даўно ўжо ўсё прачытана, сёе-тое нават і перачытана, а ўсё ж... Ён адгарнуў вокладку. На тытульнай старонцы — «Баляслаў Прус. Навелы». А наўскасяк, таксама па-польску, напісана такім знаёмым почыркам:

«Даніку Мальцу, майму светлавокаму хлопчыку, каб дачакаўся светлага жыцця.

М. Анджэеўская.
24 лютага 1929 года».

Ужо ніколі, мусіць, яму не ўбачыць яе, не пачуць яе голасу. ..Няўжо так і будзе, што застанецца адна толькі думка, адзін успамін і гэтыя словы на кнізе?.. Цяпер яна ўжо, відаць, папраўлася, зноў сядзіць за сталом і чытае ці нешта піша... А хто ж

Спампавана з сайта www.aversev.by

сядзіць цяпер побач з Санькам на першай парце? Хто глядзіць, не змаргне, як калісьці...

— Чытаеш, Даніла? — пачуўся над хлопцам голас старога. Дзед падышоў неяк неўзаметку, нібы падкраўся. — А што ты чытаеш?

— Так сабе, польская кніга адна.

Стары паківаў галавою:

— Яшчэ ты, брат, не нацешыўся з панскай ласкі? Пакінь!

— Гэта, дзеду, не панская. Гэта ўсё пра такіх, як мы, пра тых, што бедныя, што працуюць... Хочаце, я і вам пачытаю?

Дзед усміхнуўся хітравата:

— Няхай ужо лепей па снеданні. А то нешта пад лыжачкай смокча...

— Вы не бойцеся — я так буду чытаць, што вы ўсё зразумееце. Добра?

І так жа хочацца хлопцу, каб і стары даведаўся пра тых, што ў кнізе, пра сапраўдных людзей з той Польшчы, што там вунь — далёка на захадзе! І пра такіх, як пані Мар'я... Не, пра яе, пра гэты надпіс на кнізе ён не скажа і дзеду. Нікому не сказаў і нікому не скажа...

Пытанні і заданні да раздзелаў 1—4

1. Хто такі Данік Малец? Чым вабіла яго школа?
2. Чаму пры першай сустрэчы хлопчыку не спадабаўся пан Цаба? Выберыце правільны варыянт: пасмяяўся з хлопца, паставіўшы яго ў няёмкае становішча; загаварыў на не зразумелай хлопчыку мове; паводзіў сябе з Данікам так, што нават абяцанне падараваць кніжку з малюнкамі не выклікала да яго даверу.
3. Ахарактарызуйце першага настаўніка Даніка. Што гэта за чалавек? Як ён стаў панам?
4. З якімі цяжкасцямі ў навучанні на польскай мове сутыкнуўся Малец у школе?
5. Чаму хлопчыку хацелася чытаць кнігі на роднай мове? Што агульнае было ў Даніка з героем верша Янкі Купалы? Зачытайце адпаведныя радкі.

Спампавана з сайта www.aversev.by

6. Як успрынялі вучні з'яўленне ў школе буквара «Зорка» на беларускай мове? Чаму? Прачытайце дыялог пана Цабы і Даніка. Якія рысы характару кожнага з герояў раскрываюцца ў час размовы?

Пытанні і заданні да раздзелаў 5—7

1. Па якой прычыне Данік быў вымушаны другі год сядзець у трэцім класе?
2. Чаму кіраўнік местачковай сямігодкі так лёгка адмовіўся ад самага здольнага вучня?
3. За што любілі пані Мар'ю яе вучні?
4. Якія душэўныя якасці настаўніцы праявіліся ў час чытання твораў Генрыка Сянкевіча «Янка-музыка» і Цёткі «Міхаська»? Чаму менавіта іх настаўніца чытала на беларускіх гадзінах?
5. Як складваліся ўзаемаадносіны Даніка са сваёй настаўніцай? Чаму напачатку пані Мар'я палічыла яго няўважлівым і недысцыплінаваным? Назавіце сапраўдную прычыну такіх паводзін хлопчыка на ўроку.
6. Што можна сказаць пра галоўнага героя, які так эмацыянальна ўспрыняў гісторыю пра Міхаську і пра лёс другога хлопчыка — Янкі? Паразважайце, кім мог стаць Данік з такімі незвычайнымі здольнасцямі і наколькі гэта было магчыма ў той час. Выкарыстайце тое, што Янка Брыль сказаў пра свайго героя: *«Данік з "Сірочага хлеба", вядома, не я, а тып, або заяўка на яго, мілы сябар майго дзяцінства, якога я зляпіў з многіх знаёмых хлопчыкаў, дадаўшы трохі і свайго. Свайго найбольш...»*
7. Чаму Данік не змог змірыцца з няроўным становішчам вучняў у класе? Як гэта характарызуе хлопчыка? Як пра гэта гаворыцца ў творы? Знайдзіце і зачытайце адпаведныя радкі.
8. Чаму паміж вучнямі ўзнік канфлікт і як паводзіла сябе пры гэтым пані Мар'я?

Пытанні і заданні да раздзелаў 9—11

1. Якой настаўніцай была панна Рузя? Што змянілася з яе прыходам у школу? Зачытайце адпаведныя радкі. Параўнайце яе з пані Мар'яй па характары, адносінах да вучняў, да беларускай мовы.

Спампавана з сайта www.aversev.by

2. Перакажыце эпізод сустрэчы Даніка з хворай настаўніцай. Як вы разумееце словы пані Мар'і: *«Я разумею цябе — ты любіш толькі бедных. І я, Данік, не з багатай сям'і. Вы тут усе не любіце паноў. А я — таксама палячка. І гэта, хлопчык, не адно і тое ж. І ў нас, у Польшчы, усякія людзі ёсць. Ты зразумееш мяне, калі падрасцеш»*.
3. Які апошні ўрок дала пані Мар'я Даніку, падараваўшы кнігу з надпісам? Прачытайце яго змест і назву кнігі. За што яшчэ герой удзячны сваёй настаўніцы?
4. Апішыце душэўны стан хлопчыка пры развітанні пані Мар'і з вучнямі, пацвердзіце гэта радкамі з твора.
5. Што прадпрыняў Данік у сувязі са знікненнем са школы беларускай мовы? Прыгадайце іншыя яго дзеянні па абароне ўласнай годнасці.
6. Чым закончылася вучоба Даніка? Якія змены адбыліся з героем за гэты час? Прадоўжыце пералік: хлопец пасталеў, навучыўся аналізаваць падзеі, рабіць вывады; навучыўся адстойваць сваё права на родную мову, ...

Пытанні і заданні да твора

1. Знайдзіце ў творы выразныя і змястоўныя штрыхі, падрабязнасці (дэталі) у паказе паводзін і характарыстыцы дзейных асоб (Даніка, пана Цабы, пані Мар'і, панны Рузі і інш.).
2. Як вы лічыце, чаму пісьменнік назваў аповесць «Сірочы хлеб»? Падумайце, прамы ці пераносны сэнс маюць гэтыя словы.
3. Сфармулюйце мастацкую ідэю твора.
4. Чым, на вашу думку, абумоўлена ўжыванне пісьменнікам вялікай колькасці польскіх слоў і выразаў (паланізмаў)?
5. Разгадайце крыжаванку па ўрыўку з аповесці Я. Брыля «Сірочы хлеб».
6. Выберыце з твора ўрывак для выразнага чытання або для інсцэніроўкі, сцэнічнага прадстаўлення.
7. Праверце свае веды па творы (тэст па ўрыўку «Урокі пані Мар'і»).
8. Янка Брыль карыстаецца рознымі спосабамі і прыёмамі раскрыцця зместу, характарыстыкі персанажаў. Вызначце гэтыя спосабы і прыёмы, звярнуўшыся да артыкула «Пра аповед, апісанне, дыялог».

Спампавана з сайта www.aversev.by

ПРА АПОВЕД, АПІСАННЕ, ДЫЯЛОГ

Апавядальныя, асабліва празаічныя, творы ўзнаўляюць перад чытачом больш або менш шырокую, з цікавымі падрабязнасцямі карціну жыцця. У іх мы знаходзім не толькі асобныя яскравыя выказванні пра героя, як у вершах, а і паказ яго ў канкрэтных абставінах, сітуацыях, адносінах з іншымі людзьмі.

З разнастайнасці спосабаў і прыёмаў паказу і складаецца тэкст. Асноўныя з іх — аповед, апісанне, дыялог.

Што трэба ведаць пра аповед. ***Аповед*** — гэта паведамленне пра развіццё падзей, паводзіны, учынкі, факты з жыцця героя (або герояў). Аповед заўсёды паказвае жыццё і герояў у руху, у дынаміцы, звязаны з развіццём сюжэта, пачаткам, разгортваннем, завяршэннем дзеяння — гэта значыць паступовым раскрыццём характару героя праз паводзіны, учынкі. Аповед, праўда, можа быць і па-за сюжэтам, выступаць у форме ўспамінаў пра жыццё і паводзіны героя ў мінулым, перад разгортваннем асноўнага дзеяння.

Чытаючы ўрывак «Урокі пані Мар'і» з аповесці «Сірочы хлеб», мы ўвесь час уважліва сочым за тым, як складваецца жыццё Даніка Мальца ў яго зносінах з іншымі людзьмі — пані Мар'яй, іншымі вяскоўцамі, вучнямі.

Але аповед як мастацкі прыём не можа перадаць усё, што звязана з героем, асабліва калі патрэбна даць уяўленне пра абставіны жыцця, месца дзеяння, знешні выгляд героя. Тады аўтар звяртаецца да такога прыёму, як апісанне.

У чым адметнасць апісання? ***Апісанне*** — мастацкая характарыстыка прыроды *(пейзаж)*, знешняга выгляду герояў *(партрэт)*. Пейзаж мае важнае значэнне: праз яго характарызуецца месца дзеяння, выяўляюцца адносіны героя (і аўтара) да жыцця, сваёй зямлі, захапленне яе прыгажосцю.

Ва ўрыўку з аповесці «Сірочы хлеб» такіх замалёвак прыроды шмат, напрыклад у шостым раздзеле — абзац, што пачынаецца словамі: «Як яны (лісты) хораша жаўцеюць на іхнім клёне перад хатай».

Спампавана з сайта www.aversev.by

Партрэт — гэта апісанне знешняга выгляду героя, напрыклад пана Цабы, пані Мар'і, панны Рузі ў «Сірочым хлебе», гусляра ў паэме «Курган».

Усе гэтыя спосабы паказу жыцця — аповед, апісанне з яго разнавіднасцямі (партрэт, пейзаж) — у мастацкім творы часта падаюцца асобнымі штрыхамі, дэталямі з мэтай характарыстыкі дзеяння або героя твора. Іх найважнейшая роля і заключаецца ў тым, каб раскрываць характар героя, яго думкі, перажыванні, а не проста для таго, каб паведаміць нейкія звесткі пра выгляд героя або пра месца яго пражывання ці знаходжання. Вось, напрыклад, як падаецца партрэт панны Рузі: *«...худая, крыклівая панна Рузя»*; і ў іншым месцы твора: *«Данік успомніў худы, скарэжаны злосцю твар панны Рузі»*. У абодвух выпадках перад намі не толькі апісанне знешняга аблічча панны Рузі, але і характарыстыка яе як чалавека, як настаўніцы. Гэтак жа і праз пейзаж могуць раскрывацца стан душы героя, яго настрой.

Роля дыялогу ў характарыстыцы героя. Асабліва важную ролю ў характарыстыцы герояў адыгрывае ***дыялог*** — размова дзейных асоб твора. У такой размове героі не толькі нешта паведамляюць адзін аднаму, але і выяўляюць уласныя адносіны да жыцця, падзей, іншых людзей. Праз выказванні выяўляюцца іх жыццёвыя намеры, іх перажыванні, пачуцці. Ва ўрыўку «Урокі пані Мар'і» з аповесці «Сірочы хлеб» дыялогамі з'яўляюцца, напрыклад, размовы паміж Данікам і яго настаўніцай.

1. Назавіце асноўныя спосабы паказу жыцця і характарыстыкі герояў-персанажаў у мастацкіх творах.
2. Прывядзіце прыклады аповеду з вядомых вам твораў. Пакажыце, як гэты прыём звязаны з сюжэтам, дзеяннем твора.
3. Для чаго ў мастацкім творы выкарыстоўваецца пейзаж, партрэт? Пацвердзіце свой адказ прыкладамі.
4. Патлумачце ролю дыялогу ў мастацкім творы.
   Паспрабуйце самастойна падрыхтаваць магчымы дыялог паміж паннай Рузяй і пані Мар'яй, зыходзячы з характару гераінь. Настаўніцы могуць абмяркоўваць пытанне «Што варта ведаць маім вучням?».

Спампавана з сайта www.aversev.by

Уладзімір Шыцік

ЛІСЦІК СЕРАБРЫСТАЙ ТАПОЛІ

За возерам, што плёскаецца зусім пад нашымі вокнамі, пачынаецца лес. Мы мала там бывалі, не знаходзячы для сябе нічога прывабнага. Лес быў дагледжаны, расчышчаны і нагадваў школьны парк. Іншая справа — востраў на возеры. Там усё было так, быццам рука чалавека ніколі не краналася гэтага кутка прыроды. На востраве нам было цікава, у лесе — не.

Але аднаго разу, пасля буры, Мішка Патупчык нацягаў на бераг ламачча і звязаў плыт. Гэта было нешта незвычайнае, і мы акружылі Мішку, шкадуючы, што нікому з нас не прыйшла такая думка раней. Паўтараць жа зробленае кімсьці было не ў правілах вучняў нашай школы.

А Мішка быццам не заўважаў нас і нашу зайздрасць. Ён спіхнуў плыт у ваду, працягнуў яго за прывязаную вяроўку крокаў на пяцьдзясят убок, якраз туды, дзе пачыналася глыбінная плынь, і скочыў на хісткія бярвенчыкі.

— Вясло, Патупчык, вясло забыўся, — пабег у ваду Сярожка Шарай.

Мішка толькі ўсміхнуўся. А я падумаў, што ён, напэўна, уявіў сябе адным са старажытных мараходаў, якія на плытах перасякалі цэлыя акіяны.

Відаць, Мішка разведаў усё папярэдне. Плынь аказалася імклівай, і неўзабаве ён быў ужо далёка. Мы пастаялі яшчэ крыху на беразе, прыкладаючы час ад часу далоні да лба, каб паглядзець, як ён там. А калі ўжо плыт з Мішкам стаў як маленькая карычневая кропка, разышліся.

Вярнуўся Мішка на самым змярканні. Сонца падсмаліла яго, і ў Мішкі былі ярка-чырвоныя рукі і ногі і лупіўся пакрыты вяснушкамі кірпаты нос. Мы рабілі выгляд, што нічога незвычайнага не адбылося, а самі ледзь стрымліваліся — так хацелася ведаць, што ж такога было з Мішкам.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Ён маўчаў. І толькі, калі ўжо вячэра падыходзіла к канцу, непрыкметна для астатніх і настаўніка падміргнуў мне з Сашкам. Гэта азначала, што мы павінны перад сном тайна прабрацца ў яго пакой. Вядома, нас не трэба было запрашаць двойчы. Больш за тое, мы ледзьве дачакаліся прызначанага часу.

— Ну як? — хрыплым шэптам спытаў Сашка, як толькі Мішка, выглянуўшы папярэдне ў калідор, зачыніў за намі дзверы.

— Возера, — адказаў Мішка.

— І толькі?! — мы былі расчараваны. Пра возера мы ведалі і без яго. Нават зараз, у гэты самы момант, яно глуха шумела, ліжучы высокімі хвалямі пясчаны бераг.

— Лясное.

— Здзівіў! — Сашка нават абурыўся.

І я не разумеў, навошта было хавацца сюды, каб даведацца пра звычайную рэч.

— Па-першае, яно чорнае-чорнае, а па-другое, з'явілася нядаўна. Ляснік казаў, недзе было землетрасенне і яно з'явілася.

Колер — дробязь, а што побач ёсць возера, пра якое нават астатнія хлопцы не ведаюць, — гэта ўжо сапраўды незвычайная падзея.

— А ты не памыляешся? — не паверыў Сашка.

— Самі ўбачыце.

Назаўтра пасля заняткаў мы зноў былі на востраве. Я прапанаваў узяць лодку, але сябры не падтрымалі. Лодка — не для першаадкрывальнікаў. Для гэтай мэты найлепшае — самаробны плыт.

Нас трох для кволага Мішкавага збудавання было замнога. Разы са два хвалі захлёствалі плыт, і мы аказваліся ў вадзе. Але ўрэшце дасягнулі другога берага. Выцягнулі плыт на пясок і пайшлі ў лес.

Дарогу Мішка запомніў добра. Праз якую гадзіну мы ўжо былі ля мэты.

На першы погляд у гэтым лясным возеры нічога асаблівага не было. Вялізная палонка пасярэдзіне зарослай мохам паляны.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Вакол растуць кусты алешніку, сям-там каля берага відаць шырокія лісты і кветкі гарлачыкаў. Вось толькі паверхня... Мішка не памыліўся: яна была цьмяная, быццам промні святла знікалі ў ёй без астатку.

— Як сажа, — усклікнуў Сашка.

— А што я казаў? — узрадаваўся Мішка.

А мне падумалася, што гэта возера падобнае на кавалак глыбокага космасу, дзе ўсё навокал чорна і да бліжэйшых зорак доўгія гады шляху. Але я не сказаў сябрам пра гэта параўнанне. Яны былі ўпэўнены, што я раўнадушны да космасу. А як я мог гаварыць, што некалі пайду ў прастору, калі нават фізкультурай займаўся па спрошчанай праграме? Таму я ніколі не марыў з хлопцамі ўголас пра падарожжы да зорак. Я нёс сваю мару ў сабе.

— Трэба нанесці на карту, — сказаў Сашка. Няўрымслівая яго натура патрабавала дзейнасці. — Стойце тут, я зраблю вымярэнні, — і ён пайшоў, шырока ставячы крокі, уздоўж азёрнага берага.

Мішка тым часам сарыентаваўся па сонцы, каб вызначыць каардынаты возера. Напэўна, гэта была дарэмная работа. Каардынаты школы мы вызначалі шмат разоў — і ўначы па зорках, і ўдзень па сонцы. А адсюль да школы было кіламетраў дзесяць прама на ўсход. Так што патрэбныя разлікі можна было зрабіць без алоўка. Але я зноў прамаўчаў. Хай робяць, як хочуць. Я ж ведаў адно: я прыйду сюды яшчэ раз, адзін, і прынясу акваланг. Я нарэшце адчую, што гэта такое — чорны і маўклівы космас.

Тым часам вярнуўся Сашка. Перыметр возера раўняўся тысячы шасцістам дваццаці крокам або прыкладна паўтара кіламетрам. Хлопцы хутка начарцілі картаграфічную сетку, потым нанеслі на яе абрысы возера.

— Вяртаемся, — сказаў Сашка, задаволена аглядаючы сваю работу.

— Пара ўжо, — згадзіўся Мішка, — хутка сцямнее. Ты што, начаваць тут збіраешся? — крыкнуў ён, убачыўшы, што я застаюся на месцы.

Спампавана з сайта www.aversev.by

— Хадзем, Віцік, — падбег да мяне Сашка, — мы ж разам усё рабілі, — па-свойму зразумеў ён мой настрой.

Я засмяяўся і далучыўся да хлопцаў.

Калі праз некалькі дзён я сказаў, што пайду ў лес, гэта не выклікала ні ў кога пытанняў. Раз не запрашаю ў спадарожнікі каго-небудзь, значыць, так мне лепш. Мы прывыклі паважаць справы і жаданні таварышаў.

Надвор'е было пахмурнае, і вада ў возеры здалася яшчэ больш цёмнай. Я добра плаваў і не баяўся ні глыбіні, ні віроў. А тут мне раптам стала страшнавата. Падумалася, што гэта проста багністае балота, дно якога ўсцілае звычайны тарфяны пласт. Але менавіта таму, што адчуў страх, няўпэўненасць, я прышпіліў балоны з паветрам, надзеў маску і падышоў да вады. Глеба пад нагамі была мяккая, як дыван, — прыбярэжнае дно было пакрыта мохам. Ногі не правальваліся, і я ўжо больш упэўнена пакрочыў далей.

Так, у чорным колеры вады было, напэўна, вінавата дно, бо сама вада мела зусім нармальны выгляд, з-пад маіх ног і рук выляталі шматлікія празрыстыя пырскі. Можна было вяртацца дадому. На ўсякі выпадак я яшчэ прайшоў далей, каб павярнуць і адтуль паглядзець на неба, і раптам паслізнуўся і праваліўся некуды ўніз. Я паспеў толькі ўбачыць зацягнутае хмарамі шэрае неба, яно чамусьці віднелася крыху ўбаку ад мяне, а яшчэ праз імгненне ўсё наўкол ахутала цемра. Дзіўна, але гэта адразу супакоіла мяне. Цемра ж была маёй мэтай. Я паварушыў рукамі, адчуваючы, што цела падпарадкоўваецца мне, і, значыць, варта толькі захацець, я магу адразу вярнуцца. Да таго ж у мяне на спіне між балонаў з паветрам быў маленькі водаструменны рухавічок. На крайні выпадак я мог скарыстаць яго.

Пад вадой, напэўна, была плынь. Я адчуваў, што мяне павольна цягне некуды далей. Але ліхтарык не ўключаў: мне патрэбна была толькі цемра, а ўсё астатняе не мела значэння. Мне здавалася, што я зусім не ў вадзе, а ў прасторы. Цела было лёгкае, нібы бязважкае. Я мог ляжаць, распластаўшы рукі,

Спампавана з сайта www.aversev.by

даць нырца, узляцець угару. Мне падабаўся мой стан, і толькі было шкада, што вакол не відно сузор'яў. Без іх не было сапраўднага космасу.

Але і цемра падманула мяне. Вочы хутка прызвычаіліся, і тады я заўважыў, што палосы дзённага святла прабіваюцца праз вадзяную тоўшчу і даходзяць сюды, выклікаючы да жыцця цені водарасцей і рыб. Аднак над галавой святла не было. Гэта азначала толькі адно: значная частка возера знаходзілася пад зямлёй.

Пакуль я раздумваў, ці не пара вяртацца, мяне аднесла да берага. Ён быў камяністы, гладкі, як сцяна. Памацаўшы яго рукамі і не знайшоўшы нічога адметнага, я адштурхнуўся і павярнуў назад. Але не паспеў праплысці якіх дзесяць крокаў, як зноў апынуўся на старым месцы. Ці то плынь аказалася мацнейшая, чым я разлічваў, ці з напрамку збіўся. Пад рукамі, здалося, была тая ж самая гладкая каменная глыба. Каб дарэмна не плутаць, прыйшлося запаліць ліхтар.

Абрысы навакольных прадметаў былі няпэўныя, хісткія. Але чым больш я ўглядаўся ў іх, тым мацней мяне ахоплівала здзіўленне. Падводныя скалы нагадвалі... дом. Час і вада разбурылі яго. Засталіся толькі рэшткі сцен з проймамі акон і дзвярэй.

Напэўна, затопленым аказаўся цэлы пасёлак. Побач з гэтым домам былі яшчэ збудаванні. Такія ж старыя, аблепленыя водарасцямі і ракавінамі. Час не пашкадаваў гэта былое чалавечае жытло. У дамах не засталося нічога з прадметаў або мэблі. Відаць, гэта быў век, калі людзі яшчэ не ўмелі рабіць сабе прылады з жалеза, а карысталіся драўлянымі і касцянымі рэчамі. Гэта, праўда, не надта адпавядала архітэктуры збудаванняў. Але тады мне было не да грунтоўнага аналізу і вывадаў.

Я пашукаў якіх-небудзь рэчаў — не вяртацца ж назад з пустымі рукамі, — я абходзіў адзін пакой за другім, разграбаў глей пад нагамі, мацаў сцены. Нічога не было.

Нарэшце мне надакучыла гэта блуканне, дый першы балон з паветрам апусцеў. Я рашыў вяртацца і проста так, у апошні

Спампавана з сайта www.aversev.by

раз, правёў промнем ліхтарыка па сцяне, што стаяла на маёй дарозе. Чорныя, замшэлыя камяні. І раптам сярод іх нешта бліснула.

Мне здалося, што гэта быў лісцік серабрыстай таполі, якіх шмат расло на беразе. Ён патануў і зачапіўся за каменны абломак. Яго знаходжанне тут было да таго неверагодным, што я не ўтрымаўся і памацаў лісцік. Ён варухнуўся, як на галінцы, — яго ножка якімсьці чынам трапіла між камянёў — і зноў вярнуўся на сваё ранейшае месца. Але гэта быў не сапраўдны лісцік. Пальцы выразна адчулі метал. Было толькі дзіўна, што ні вада, ні час не адбіліся на гэтым метале. Колькі я ні круціў лісцік — не заўважыў на ім ніводнай плямкі. Такую знаходку варта было паказаць хлопцам.

Ужо бралася на вечар, калі я вярнуўся ў інтэрнат. Як на тое, у калідоры носам к носу сутыкнуўся з настаўнікам. З ім былі Сашка і Мішка.

— Дзе ты прапаў? — закрычаў Сашка.

І я ўспомніў, што ў нас у гэты час лабараторныя заняткі па фізіцы. Мне стала няёмка перад настаўнікам.

— Ідзі паеш, — спыніў мяне настаўнік, калі я пачаў быў апраўдвацца, — потым раскажаш.

Я ўзлаваўся на сяброў: вось балбатуны, трэба было ім гаварыць, дзе я! Цяпер прыйдзецца, можа, яшчэ цэлы даклад рабіць, а я ж па сутнасці нічога не ведаю. Ні пра возера, ні пра рэшткі таго паселішча.

Але я памыліўся. Настаўнік да майго расказу паставіўся зусім спакойна, а выслухаўшы, сказаў:

— Ідзі ў лабараторыю.

Толькі адышоўшы, я ўспомніў, што забыўся паказаць яму лісцік. Аднак не вяртацца ж назад, я і без таго пазніўся.

Сашка з Мішкам корпаліся ля тэлепрыёмніка з электроннай аўтаматычнай настройкай. Гэта была наша навінка. Прыёмнік мог не рэагаваць на самыя моцныя сігналы, калі яны не адпавядалі зададзенай праграме па тэме. З мільёнаў перадач ён

Спампавана з сайта www.aversev.by

павінен быў выбіраць толькі тую, якая нам патрэбна, Мішка нават сумняваўся, ці прыме настаўнік па фізіцы нашу работу. Такі тэлепрыёмнік, сцвярджаў Мішка, больш падобны на кібернетычнага робата. Мне ж з Сашкам такое спалучэнне прыёмніка і робата спадабалася. Праца наша падыходзіла к канцу. Заставалася, уласна, адрэгуляваць блок настройкі. Калі я ўвайшоў, Сашка якраз гэтым і займаўся. Блок быў падключаны да прыборнага шчытка, дзе ўсе дадзеныя абагульняліся і ў выглядзе спакойнай хвалепадобнай лініі клаліся на доўгую папяровую стужку асцылографа.

— Гатова? — спытаў я, нахіліўшыся да Сашкі.

— Пара... — Сашка асекся.

Я зірнуў на яго, потым на папяровую стужку, якая павольна паўзла, закручваючыся ў адмысловым кальцы, і здзівіўся сам. Пяро асцылографа нібы кінулася ў дзікія скокі.

Некалькі імгненняў Сашка глядзеў на паласатую змейку-стужку, потым схамянуўся і зірнуў падазрона на мяне:

— Слухай, Віця, ты часам не праглынуў генератар сігналаў?

— Скажаш...

— Не, праўда, выйдзі на хвіліну.

Сашка ўжо злаваўся, калі я вярнуўся. Бо, аказваецца, гэта я дзейнічаў на нашы прыборы.

— Вытрасай кішэні, — загадаў мне Мішка.

І гэтае Мішава далучэнне да Сашкі зусім збянтэжыла мяне. Я паглядзеў на аднаго, на другога і раптам успомніў пра лісцік. Нічога іншага ў маіх кішэнях не было.

— Вось, — працягнуў я Мішку знаходку.

— Там? — спытаў ён, кіўнуўшы галавой у бок акна.

— Пад вадой, з разваленай сцяны выцягнуў.

— Давай, — выхапіў лісцік з маіх рук Сашка, — стаўце блок.

Як яму прыйшла ў галаву думка, што лісцік выпраменьвае і што гэта выпраменьванне трэба паспрабаваць злавіць тэлепрыёмнікам, не ведаю. У яго заўсёды ў галаве поўна самых неверагодных думак. Здаралася, за іх нам нават пападала.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Было ж, што мы спалілі энергакабель і школа некалькі гадзін сядзела без электрычнасці. Або другім разам, паверыўшы, што Сашка адкрыў новы, тэлепатычны метад уздзеяння на жывёл, мы ўначы забраліся ў вальер да тыгра (гэта было на экскурсіі ў Індыі) і нарабілі спалоху на ўсю акругу. Але так ці інакш на гэты раз ён прыдумаў здорава.

Сашка паставіў лісцік побач з антэнай і ўключыў прыёмнік. Электронны настройшчык адразу выбраў патрэбную хвалю. Яна была нейкая незвычайная, не ўласцівая нашым тэлеўстаноўкам.

— Касмічнага паходжання, — аж загарэўся Сашка.

А мы з Мішкам здагадаліся, што цяпер ён нас не падпусціць да прыёмніка і блізка. Космас быў яго заказнікам.

Экран міргаў, не ажываючы, аднак, зусім як тады, калі не працуе перадатчык. Але ён працаваў. Мы гэта самі бачылі. Сашка падсунуў лісцік яшчэ бліжэй да антэны і выключыў у лабараторыі святло.

Нейкі час экран не мяняўся, потым у ім нешта зварухнулася і... я працёр вочы. А калі адняў ад іх пальцы, на экране быў... той самы дом, які я бачыў пад вадой, толькі цэлы.

Адлюстраванне нядоўга было нерухомым. Хутка дом пачаў нібы адступаць на задні план, адкрываючы перад сабой чысценькі дворык. Некаторы час ён быў пусты, потым з ценю ад плота выйшаў чалавек. Высокі, стройны, хоць і не малады. Ён быў апрануты ў лёгкі зручны касцюм. Накшталт нашых сучасных спартыўных. Некалькі секунд чалавек моўчкі ўзіраўся, нібы сапраўды бачыў нас, і нарэшце загаварыў.

Прыёмнік, аднак, не перадаваў чамусьці гукі яго голасу. Сашка круціў лісцік і так і гэтак — нічога не было чутно.

Цішыню парушыў стук у дзверы.

— Гэй, вы, ноч ужо, — пачулі мы вокліч дзяжурнага, — зараз выключаю святло.

— Хадзем, Саша, — Мішка ўзяў сябра за руку, — заўтра даведаемся.

Той нехаця падпарадкаваўся.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Ці трэба гаварыць, што сон доўга не мог узяць мяне. Я варочаўся на ложку, і карціны, адна неверагоднейшая за другую, стаялі перад маімі вачыма. Я нібы бачыў невядомых касманаўтаў, якія прыляцелі на Зямлю тады, калі наша цывілізацыя толькі пачыналася. Потым той чалавек мне ўяўляўся зусім не чужынцам, а жыхаром міфічнай Атлантыды... Я не паспеў нічога дадумаць да канца. Відаць, дзяжурны пачуў, што я варочаюся, і ўключыў электраўсыпляльнік.

Раніцай, ледзь развіднела, я памчаў да Сашкі. Ён доўга не адчыняў і ўсё нешта незадаволена мармытаў.

— Хутчэй ты, — зазлаваў я.

— А куды спяшацца? — Сашка нават не скрануўся з месца.

— Мішка, ты чуеш? — закрычаў я на ўвесь калідор, хаця Мішкава галава ўжо тырчала з дзвярэй суседняга пакоя.

— Давай, давай! — населі мы ўдвух на Сашку.

Ён нехаця сабраўся і паплёўся за намі следам.

У лабараторыі было ціха і змрочна. Мішка, не запальваючы святло, уключыў тэлепрыёмнік. Экран замігаў у прыцемках сотнямі зеленаватых іскарак. Міналі секунды, мабыць, хвіліны. Учарашняй карціны не было.

— Пасунь лісцік, — шапнуў я, нібы, сказаўшы гэта ўголас, мог спалохаць таго невядомага дыктара.

— Не трэба, — раптам сказаў Сашка, — ён ужо нічога не пакажа.

— Што-о!!! — мы абярнуліся да яго.

— Я быў тут уначы... Не мог жа я спаць, як вы. Тут цывілізацыя, а вы... — напаў ён на нас з Мішкам.

— Ну!

— Не крычы, — агрызнуўся Сашка, — самі праспалі. Я толькі хацеў узмацніць зарад гэтага жалезнага абломка, які вы называеце лісцікам, і паклаў пад прамень тэлекамеры. Хто яго знаў, што ён зусім разрадзіцца.

Не ведаю, што зрабілі б мы з Сашкам, каб не настаўнік. Ён пачуў наш крык і прыйшоў у лабараторыю.

Спампавана з сайта www.aversev.by

— Ваюеце? — усміхнуўся настаўнік, і мы адразу астылі.

Ён выслухаў нас моўчкі, не сказаўшы ні слова асуджэння, быццам так і трэба было Сашку дзейнічаць. Потым сказаў:

— Нічога страшнага не здарылася. Думайце, шукайце, можа, Віцеў лісцік зноў загаворыць. А няўдачы бываюць нават у выдатных даследчыкаў...

Калі настаўнік пайшоў, мы яшчэ нейкі час пастаялі, пакуль у нас з Мішкам зусім не знікла злосць на Сашку. І тады далі адзін аднаму клятву:

— Будзем шукаць, нават калі на гэта спатрэбіцца ўсё наша жыццё.

1. Калі адбываецца дзеянне, пра якое распавядаецца ў творы? Якія выразныя прыметы часу сведчаць пра гэта?
2. Пра што марылі, чым захапляліся вучні гэтай незвычайнай школы?
3. Чым вабіла сяброў таямнічае лясное возера?
4. Падрабязна перакажыце гісторыю Віцевага падарожжа на возера, *«падобнае на кавалак глыбокага космасу»*.
5. Якія таямніцы хаваў прадмет касмічнага паходжання, падобны да лісціка таполі? Знайдзіце ў творы апісанне, якое раскрывае магчымасці металічнага прадмета.
6. Вызначце жанр твора. Што дазваляе аднесці «Лісцік серабрыстай таполі» да фантастычных твораў?

! Слова *фантастыка* паходзіць ад імя брата міфалагічнага бога сну, якога старажытныя грэкі называлі Фантазам. Адсюль пайшло слова *фантазія*. Ад гэтага ж кораня ўтворана і *фантастыка* — тэрмін для абазначэння літаратурных твораў, якія паказваюць неверагоднае як сапраўднае, а сапраўднае — як неверагоднае.

7. Прыгадайце клятву, якую далі сябры, і прыдумайце працяг апавядання з элементамі нерэальнага, фантастычнага, але магчымага і здзяйсняльнага. Каб вам было лягчэй уявіць таямнічы космас,

Спампавана з сайта www.aversev.by

Я. Драздовіч.
Жыццё на Марсе

Я. Драздовіч.
Жыццё на Месяцы

разгледзьце цыкл рэпрадукцый карцін Язэпа Драздовіча «Жыццё на Марсе», «Жыццё на Месяцы». Пачаць свой аповед можна парознаму, напрыклад так:

«— Паслухай, — пачуўся ў цемры даволі высокі, нават крыху напалоханы хлапечы голас, — як бы ты сябе адчуваў, каб зараз нечакана з'явіўся касмічны карабель з іншапланецянамі?

— Відаць, у мяне захапіла б дух, — пачуўся другі, ніжэйшы і грубейшы, голас.

— Вось і я прыблізна тое ж перажыў, калі ўчора, з самай раніцы, да мяне ў пакой...»

8. Фантастычныя творы карысталіся і карыстаюцца вялікай папулярнасцю сярод чытачоў. Выступіце ў ролі супрацоўніка выдавецтва. Падрыхтуйце водгук на апавяданне Уладзіміра Шыціка «Лісцік серабрыстай таполі». Ваша задача — пазнаёміць з аўтарам і яго героямі, выказаць свае адносіны да персанажаў апавядання і падзей. Канчатковая мэта — заінтрыгаваць чытачоў, зацікавіць іх творчасцю пісьменніка.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Мікола Лупсякоў

МЭРЫ КЭТ

1

Уся гісторыя пачалася вось з чаго... Прыходжу я ў школу, а мой сябар Янка Маркаўцоў у калідоры на вуха мне шэпча:

— Ведаеш, а ў нас у класе навічок. Дзяўчынка, аграномава дачка. Задавака — ого, брат! Бацьку ў калгас прыслалі. А яе маці — такі вучоны, што па калгасах ездзіць. У Міхалковых кватэру знялі, дык увесь дзень учора кнігі туды вазілі. Цяпер у Міхалковых у пярэдняй хаце кнігі, і ў шафах, і на паліцах — усюды.

— Ты мне не шапчы, — раззлаваўся я, — я дрэнна чую.

— Майн Рыд, Купер, Маўр! Чаго толькі там няма! І кнігі ўсе ў залатых пераплётах! — на ўвесь голас крыкнуў Янка.

— Во цяпер, — кажу, — чую, толькі крычы трохі цішэй, бо ад твайго крыку ў вушах баліць.

— Добра, буду крычаць цішэй, бо тая дзяўчынка яшчэ пачуе, — паслухмяна адказаў Янка. — Прозвішча яе Пшанічная, а завуць дзіўна — Эма. Каса ў гэтай Эмы аж да пояса, а партфель з замком «маланка». Сядзіць Эма цяпер з Ганнай Паяркавай.

— Каса, кажаш, доўгая?

— Ого, брат! Во дзе будзе нам работы! Во будзе смеху! А калі пойдзе скардзіцца, — упэўнена сказаў Янка, — прыгрозім! Так і скажам: пойдзеш да дырэктара, дык тады лепей і ў клас не заходзь.

— А калі бацька яе, аграном гэты самы, раззлуецца ды нашым бацькам працадні не запіша — тады што? — запытаўся я.

— А нічога, — адказаў Янка. — Мы тады выступім на сходзе і так раскрытыкуем, што яго з аграномаў здымуць.

— А і праўда, — згадзіўся я.

І вось заходжу ў клас. Як заўсёды, за якую хвіліну перад пачаткам урока. У класе цішыня, мільгаюць старонкі падручнікаў. Усе чакаюць настаўніка. За вокнамі светлая, ясная раніца.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Далёка на небасхіле палымнее ўсход, школьны сад падступаецца да самых нашых акон. Класная дошка зіхаціць: яе добра выцерлі мокрай анучкай.

Я борздзенька бягу да свайго месца, каб сесці раней, чым зойдзе настаўніца. Саджуся. Шпарка раскрываю партфель. Першы ўрок — літаратура. Тэма — Някрасаў. Біяграфія. «Мароз, Чырвоны нос». Я дастаю падручнік, сшытак, аловак, ручку. Кладу рукі на парту і з палёгкаю ўздыхаю. Цяпер можна і агледзецца. Дзе ж тая Эма, пра якую расказваў мне Янка? Ага, сядзіць разам з Ганнай Паяркавай. На пярэдняй парце, на Янкавым месцы. А Янка перабраўся ў самы задні куток. Цяпер яму раздолле! Добра было б і мне перабрацца, але ж адтуль усяго не пачуеш. І сяджу я на другой парце — якраз насупраць гэтай самай Эмы Пшанічнай. Ого, якая яна! У новенькай форме, кірпаносая, чырванашчокая, з доўгай касой і на руцэ — гадзіннік. Адразу відаць, што гэтая Эма вельмі культурная. Гаварыць з ёй, мусіць, трэба асцярожна, падбіраючы розныя прыгожыя словы. І як гэта яе бацька ў калгас прыехаў? І маці? Эма... У нас у школе ніводнай Эмы не было, і раптам — на табе! Сядзіць з гадзіннікам, як якая пекная паненка. Я на той гадзіннік ужо разоў дваццаць зірнуў бы, а яна... Рукі паклала на парту, локці ўшыркі. Слухае настаўніцу. Як жа ёй, задавацы гэтакай, паказаць, што ў нас з такімі, як яна, не жартуюць...

Тут настаўніца задала класу нейкае пытанне, і Эма Пшанічная падняла руку.

— Ну вось, паслухаем, што скажа навічок, — сказала настаўніца. — Калі ласка, Эма!

Эма паднялася ды так складна адказала, што мы ўсе раты паразяўлялі. Мы тады яшчэ не ведалі, што Эма — круглая пяцёрачніца. Я ўзлаваўся не на жарт. Вырваў з сшытка чысты лісток паперы і борздзенька напісаў першае, што прыйшло ў галаву: «Я, начальнік зграі разбойнікаў Пантона-Мантона-Дэмантона, папярэджваю цябе, што калі ты будзеш выскачкай

Спампавана з сайта www.aversev.by

і калі пачнеш скардзіцца на нас настаўнікам, дык мы ўтворым над табой суд разбойнікаў. Падумай над гэтым добранька!»

І падпісаўся: «Крыважэрны разбойнік Пантона-Мантона-Дэмантона». Радуючыся, што гэтак здорава ўсё выдумаў, я шпурнуў запіску на Эміну парту, а сам нахіліўся над падручнікам. Аднак я паспеў заўважыць, што Эма ўзяла запіску і пачала яе разгортваць. Я ўнурыўся ў падручнік, баючыся падняць вочы. Раптам — перад самым маім носам упала запіска. Я разгарнуў яе і прачытаў:

«Пантона-Мантона-Дэмантона! Калі толькі ты мяне кранеш хоць пальцам, я дам табе такой здачы, што ты дзясятаму закажаш. Ты яшчэ не ведаеш, што я была ў афрыканскіх джунглях, падарожнічала па Місісіпі, а хутка паеду ў Індыю». І подпіс: «Мэры Кэт».

Я сядзеў як мыла з'еўшы. Па-першае, як яна дазналася, што запіску напісаў я, а па-другое, не ведаў, хто такая Мэры Кэт, дзе яна пра яе вычытала. І тут я цвёрда — раз і назаўсёды — вырашыў: з гэтага дня я буду самы большы вораг Эмы Пшанічнай. Буду яе ненавідзець, буду ёй помсціць. Каб не быць пустабрэхам, адразу ж зляпіў з хлеба шарык, наслініў яго і запусціў у Мэры Кэт. Мэры Кэт азірнулася, гнеўна стрэльнула ў мяне вачыма. На маё няшчасце, усё гэта заўважыла настаўніца і падышла да мае парты:

— Антон Бубноў, гэта непрыстойна. Прасі прабачэння ў дзяўчынкі!

Я падняўся. Эма таксама паднялася, камечачы ў руках хлебны шарык. А настаўніца маўкліва пазірала на мяне, і ў яе позірку былі дакор і пагарда:

— Навошта ты пакрыўдзіў такую добрую, прыгожую дзяўчынку?

— Гэта не я, — сказаў я, — гэта нехта іншы.

— І ты яшчэ адмаўляешся? — сказала настаўніца. — Я ж бачыла. І ў цябе хапае сумлення зводзіць усё на другіх? Прасі прабачэння.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Я прамармытаў нешта.

— Мацней гавары! — загадала настаўніца.

— Прашу прабачэння! — уголас сказаў я. — Перасадзіце мяне на другую парту, бо тут я не магу.

— Не, — адрэзала настаўніца. — Будзеш сядзець тут. А цяпер выйдзі з класа, пахадзі па калідоры ды як след падумай...

Мэры Кэт з палёгкаю ўздыхнула.

Рэштку ўрока я прастаяў на калідоры, абдумваючы розныя помслівыя планы. І дзіва: чым больш я думаў, тым больш падабалася мне Эма.

2

У хаце чысціня, прыгажосць, утульнасць. Печ зранку прапалена, ад яе патыхае цеплынёй. Я сяджу за сталом. Урокі зроблены. Падручнікі, сшыткі, падрыхтаваныя да заўтрашняга дня, ляжаць у партфелі. На стале перада мною стаіць прыёмнік, можна павярнуць уключальнік і паслухаць музыку. Але я не раблю гэтага. Мне прыемна вось так сядзець і адпачываць. Пачынае вечарэць. Вецер, дождж, за вокнамі хістаецца рэдкае голле дрэў. Бульбу ў калгасе пакапалі, лён і каноплі падабралі і во-во пачнуць вазіць на завод. Цяпер у нас работы мала, толькі ля кузні людзі завіхаюцца: рыхтуюць сані — узімку вазіць з лугоў сена. Маці ўвесь дзень дома. Варыць, корміць карову, свіней. Тупае то на двор, то з двара. А я сяджу, незадаволены самім сабой і ўсімі. Сумленне точыць мяне. Ну навошта я пакрыўдзіў гэтую Эму? Што яна мне дрэннага зрабіла? Добра яшчэ, што настаўніца не сказала дырэктару. І які сорам: прабачэння прасіў! Цяпер хоць ты ў клас не паказвайся.

Я цяжка ўздыхаю і задумваюся над сваім лёсам. Некалі даўно, калі я быў яшчэ зусім малы, я прастудзіўся і захварэў на вушы. Мяне лячылі, але з таго часу я крыху пачаў недачуваць. Каб хто ведаў, як я тады мучыўся! Увесь час баяўся: што, як зусім аглухну? Я ўнурыўся ў самога сябе, мала з кім сябраваў,

Спампавана з сайта www.aversev.by

а дома, падрыхтаваўшы ўрокі, прывык сядзець адзін, як цяпер. Я прывык да такой адзіноты, яна мне падабаецца. У школе спачуваюць мне. І вучні, і настаўнікі добра разумеюць, што мне цяжка. Гэта першы выпадак, калі мяне папрасілі выйсці з класа. І мне раптам стала шкада самога сябе. Я рашыў, што цяпер ужо зусім не загавару з Эмай, буду не заўважаць яе, нават ніколі не гляну на яе. Прыгожая, выпеставаная, уся як лялька, яна выклікала ў мяне толькі пачуццё непрымірымай варожасці...

Блізіўся вечар. Змрок усё больш гусцеў, а я сядзеў адзін, аддаючыся сваім невясёлым думкам. Трэба было запаліць электрычнасць, але я не кранаўся з месца. Вярнуўся з поля бацька. Пахадзіў за перагародкай, голасна сказаў маці:

— Аграном гэты новы — талковы чалавек. Зямлю ён любіць і ведае.

3

Усю восень, аж да першых маразоў, я не размаўляў з Эмай, пры сустрэчах адварочваўся, на ўроках не пазіраў на яе, а калі нашы позіркі выпадкова сустракаліся, дык я надаваў свайму твару пагардлівы выраз. Я дамогся свайго: мяне пасадзілі на другую парту. Эму, відаць, здзівіла і ўразіла мая адкрытая пагарда. Некалькі разоў, неўпрыкмет, я заўважаў на сабе яе здзіўлены позірк. Чым больш я цураўся яе, тым часцей яна пазірала ў мой бок. Затое ўсё больш і больш радаваўся, бачачы яе збянтэжанасць і разгубленасць. «Так табе і трэба!» — разважаў я.

Неяк аднойчы ў выхадны дзень я ішоў па вуліцы і на рагу нос у нос сутыкнуўся з Эмай.

— Ой! — спалохана ўсклікнула яна.

Я моўчкі пачаў яе абыходзіць, але яна раптам схапіла мяне за руку.

— Слухай, Антон, чаго ты мяне цураешся? Што я табе зрабіла, Пантона-Мантона-Дэмантона? Я ж не вінавата, што настаўніца заўважыла, як ты кінуў шарык. Я ж нікому нічога

Спампавана з сайта www.aversev.by

не сказала... Капітан зграі, дзе твае разбойнікі, што ты ходзіш заўсёды адзін?

Я абыякава паглядзеў на Эму. Але ж хіба можна было не заўважыць яе — круглатварую, прыгожую, з доўгай касою, што была перакінута наперад цераз плячо. І ўсё ж пагарда перамагла. Я адвярнуўся і амаль подбегам пашыбаваў па вуліцы. Аглянуўся, яна пакрыўджана ўсміхнулася і нейкі час стаяла на месцы, пазіраючы сабе пад ногі.

У школе ў выхадныя дні для вучняў старэйшых класаў наладжвалі вечары мастацкай самадзейнасці і танцы пад баян. На такіх вечарах звычайна бывалі дзяжурныя настаўнікі. Да танцаў я не ахвотнік. Але на гэты раз я рашыў схадзіць, паглядзець, як вучні танцуюць. Мне раптам палегчала, я павесялеў, настрой мой палепшаў.

Старанна адпрасаваў свой новы касцюм у клетку, надзеў гальштук пад белую шаўковую кашулю, наваксаваў туфлі. Прыбраўшыся, я доўга круціўся перад люстэркам. З непрывычкі мне было сорамна ў маім новым адзенні, тым больш што я апрануў і нядаўна купленае новае паліто. Некалькі разоў я спыняўся, наважваючыся вярнуцца дадому, але нейкая сіла цягнула да школы.

Прыйшоўшы ў школу, здаў у гардэроб сваё паліто і ціхенька пашыбаваў па калідоры. У калідоры было шмат вучняў — найбольш дзяўчынак. Дзверы ў адным класе былі расчынены, там іграліі на баяне. Я падышоў да дзвярэй і пачаў глядзець, як вучні вучацца танцаваць. І раптам убачыў Эму. Яна сядзела поплеч са старшай піянерважатай і пра нешта з ёю гаварыла. Павярнулася, убачыла мяне і пырснула смехам. Пэўна, ёй кінулася ў вочы маё новае адзенне. І як гэта я забыўся, што магу сустрэць тут гэтую Мэры Кэт? Я ж за ўвесь дзень пасля той сустрэчы ні разу пра яе і не падумаў. А ёй, пэўна, здаецца, што гэта я для яе так прыбраўся. Не дачакаецца! Я з ёю не толькі сябраваць, а і зусім знацца не хачу. У яе сваё жыццё, у мяне — сваё. Я пагаварыў трохі з аднакласнікамі і пайшоў дадому.

Спампавана з сайта www.aversev.by

4

Кожная пара года па-свойму прывабная, прыгожая. Я люблю вясну, калі з трэскам ломіцца на рацэ лёд і гаманкія поўныя воды нясуць крыгі. Растае снег, бягуць ручайкі, спяваюць жаўрукі. Апранаюцца ў зеляніну хмызнякі, зямля, атуленая цяплом, чакае блізкай навальніцы. І вось ужо правуркатаў у небе гром, зацвіла вярба — можна рабіць дудкі. На паплавах ходзіць цыбаты бусел. Недзе ў затоках сонна крэкчуць жабы. Цёпла, прыгожа, прыемна. Некуды кліча, вабіць цябе жыццё, і ўздымаюцца грудзі ад глыбокага дыхання. А ў галаве — колькі думак, колькі мар! Але вось дні пацяплелі, выкаласілася жыта, вывеліся маладыя шпакі, густа зацвіў чабор на пясчаных узгорках, трава на заліўных лугах паднялася ў пояс, бульба зацвіла, запахла ўсюды сырадоем, цёплай зямлёй, гуркамі. Колькі багацця адразу і зацвіло, і забуяла на зямлі!

Я хаджу па ляску. Мне трэба зрэзаць вудзільна. З нажом-складанчыкам у руцэ я падыходжу да бярозкі, доўга аглядаю яе.

Іду сабе далей. Да наступнай бярозкі.

Я люблю таксама восень з яе першымі яснымі днямі, дажджом, з першымі замаразкамі і маразамі. А зіма! А першы снег! А іней на дрэвах і лёд на рацэ! І конь, запрэжаны ў сані, што імчыцца некуды далёка па дарозе!

Я сяджу дома пасля школы і чытаю кнігу. На дварэ першы сняжок і першы дужы марозік. Ісці нікуды не хочацца. Раптам пад акном мільганула постаць Янкі Маркаўцова — майго аднакласніка.

Я спакойна сяджу за сталом, чакаючы, калі ён зойдзе ў хату. Рыпяць дзверы. За перагародкай чуваць Янкаў голас:

— Добры дзень, цётачка! — гэта ён з маёй маці вітаецца.

— Добры дзень, Янка, — кажа маці.

— Антон дома?

— Дома. Кнігу чытае. Заходзь.

Янка ўвальваецца да мяне, цяжка дыхаючы.

Спампавана з сайта www.aversev.by

— Я зараз такое дзіва бачыў, што і не паверыш. Хадзем, пакуль не позна. Там столькі народу сабралася — як не з усяго калгаса. Я табе нічога не раскажу, гэта трэба пабачыць.

— А ты скажы.

— Не, — махае рукамі Янка. — Такое не раскажаш! Хутчэй апранайся, бо яшчэ спознімся.

Я паслухмяна кладу кнігу, апранаюся, і мы выходзім з хаты.

Янка вядзе мяне за вёску, да рэчкі. На ўзгорку мы прыпыняемся.

Адсюль ужо відаць рэчка і вялікае балонне[1], усё залітае вадою. Пад узгоркам стаіць немалы натоўп мужчын і кабет, а перад імі, па чыстым лёдзе, катаецца на каньках чалавек. Апрануты ў вязаны цёмна-сіні фізкультурны касцюм, на галаве ў яго шарсцяны берэт. Ды як катаецца! Такога я яшчэ і не бачыў. Па крузе. То перадам імчыцца, то спінай, то раптам як пачне кружыцца, што толькі берэт мільгае, а тады разгоніцца і імчыць на адной назе.

— Хто ж гэта такі? — пытаюся я ў Янкі.

— Адгадай, — адказвае. — Век не адгадаеш.

Збеглі мы з узгорка да балоння, і тут я ўтрапеў: каталася Эма Пшанічная. Прыгожая, зграбная, дужая, яна ўпэўнена насілася па лёдзе, на зайздрасць мне і ўсім. Кабеты перашэптваліся і ківалі галовамі: вось дык аграномава дачка!

Я ўспомніў апошнюю сустрэчу з ёю на вуліцы, і мне стала ясна, што дарэмна я радаваўся сваёй перамозе над ёю.

5

Гэтую ноч я амаль не спаў. Зайздрасць не давала мне спакою. Што за такая вучаніца ў нас? Калі яна паспела навучыцца так здорава бегаць на каньках? Успамінаючы яе, я ўсё больш адчуваў незразумелую для сябе трывогу. Нешта новае, хвалюючае падступалася да мяне. Я злаваўся на яе і чамусьці радаваўся

[1] *Бало́нне* — нізкі заліўны луг каля ракі.

Спампавана з сайта www.aversev.by

гэтай сваёй злосці. Радасць запаўняла мяне ўсё больш і больш. І раптам мне падумалася: а што, калі я куплю канькі і навучуся катацца так, як гэтая Эма? Вучыцца буду дзе-небудзь на далёкай крыніцы, каб ніхто не бачыў. Пакуль пойдзе снег — часу хопіць. А тады адразу здзіўлю ўсіх...

Гэтая думка захапіла мяне. Ды як! Ужо раніцою я пачаў прасіць у бацькі грошы на чаравікі і канькі. Бацька ніколі і ні ў чым мне не адмаўляў.

— Канькі? — толькі і перапытаў ён. — Добра. Даўно трэба было табе навучыцца на каньках хадзіць. Заўтра я еду ў райцэнтр і прывязу табе канькі.

І вось яны перада мною — новыя чаравікі з прыкручанымі нажавікамі. Я пазіраю на іх і дзіўлюся: як гэта я, жывучы ля ракі, не меў канькоў? Але на лёдзе мой настрой мяняецца.

Я іду да самай далёкай крыніцы, дастаю з-пад палы чаравікі з канькамі і пачынаю пераабувацца. Потым ступаю на лёд. І не магу ўстояць: мае ногі коўзаюцца — адна ўлева, другая ўправа, і мяне як хто збівае на дол. Мне робіцца сумна: дарэмна я ўсё гэта надумаў. Не дагнаць мне яе. Я падымаюся і адразу ж падаю яшчэ раз. Але блізка нікога няма, і я настойліва пачынаю трэніравацца і ўсё падаю на лёд і бокам, і спінаю, і жыватом. Урэшце к канцу дня мне ўдаецца ўсё ж праехацца на каньках добрыя гоні... Я весялею.

У нас вечарамі бывае вельмі прыгожа. Успыхвае электрычнасць у вокнах хат, запальваецца ліхтар на вуліцы ля крамы. Цісне мароз, дрэвы стаяць у інеі. У калгасным клубе пачынаецца кіно. Папыхвае паравік у школьнай майстэрні. Толькі мяне няма ні ў кіно, ні ў школе, ні ў клубнай більярднай. Я ў гэты час нясуся па рэчцы на каньках. Лёд спявае пад маімі нагамі. Мне горача. Твар аж палае ад гарачыні. Над рэчкай, у глыбіні неба, гараць вялікія і малыя зоры. Па берагах у цемені мільгаюць лазовыя кусты.

Я адзін. Штуршок за штуршком па знаёмай дарозе.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Нікога няма на рацэ. Цемень, лёд, вецер ды я! Адзін адным. Што там цяпер робіць гэтая Эма? Пэўна, у кіно пайшла, а можа, дома ўрокі вучыць. І зусім не ведае, што я тут адзін на рэчцы. І не трэба, каб ведала. Мне добра. А Эма хай сабе сядзіць там адна. Хай думае, што яна лепшая за мяне. Мне ўсё роўна. Мне добра вось так, аднаму, успамінаць пра яе. Зорны халодны вечар. Трашчыць мароз. А я катаюся і ўсё думаю, думаю. Дарэмна я тады не загаварыў з ёю. З ёй можна, бадай, і пасябраваць. Але ж калі б пасябраваў, дык хіба быў бы я цяпер вечарам адзін на рэчцы? Прэч, прэч такія думкі...

У вёсцы тухнуць агні. Позна, а я ўсё яшчэ катаюся. Мне добра, прыемна, і здаецца мне, што я чую лепей. Вунь загрымела далёка наперадзе, аж гул пайшоў — гэта лёд трэснуў. А вось зацахліла, залескатала — далёка на чыгунцы поезд ідзе. Прайшоў, і сціхла, толькі сабакі ў вёсках брэшуць. Цішыня. Зоры, як жывыя, пераміргваюцца ў небе. Мне пачынае падабацца мая адзінота. А наперадзе? Што чакае мяне наперадзе? Нарэшце я рашуча зварочваю на балонне, пад'язджаю да берага. У кустах скідваю чаравікі з канькамі, насоўваю валёнкі і іду ў вёску. Канькі нясу пад палой, каб ніхто не ўбачыў, калі сустрэнецца. Наперадзе ў мяне — прыемны, здаровы сон.

6

Ну ж і дзянькі пачаліся! Гэта ж не жартачкі — навучыцца катацца на каньках так, як Эма! Без усякіх падказаў. Першы дзень я быў і нос павесіў. У мяне балелі і бакі, і спіна, і ногі. А тут яшчэ я некалькі разоў выцяўся аб лёд, і каленкамі і бокам. Ішоў дадому і думаў, што я самы нешчаслівы на свеце чалавек. Дома, павячэраўшы, адразу ўпаў на ложак і заснуў як забіты. Мне снілася рэчка, сіні лёд. Ён быў вельмі слізкі. Я падаў, стагнаў ад болю, але не прачынаўся. Назаўтра ісці з канькамі на рэчку мне не хацелася. Але ж перад вачыма ўвесь час стаяла Эма. І вось пасля ўрокаў я зноў пачаў збірацца. Апрануў лыжны

Спампавана з сайта www.aversev.by

касцюм, пінжак, схаваў чаравікі з канькамі пад палу і падаўся на рэчку. Ішоў без ніякага жадання, як па прымусу. Хацеў нават вярнуцца з паўдарогі, але перадумаў: яшчэ сёння паспрабую. У кустах скінуў валёнкі, абуўся ў чаравікі, скінуў пінжак. І пачалося тое самае. Адзін раз праеду, адзін раз павалюся. Аднак жа ў гэты дзень выходзіла ўсё лепей. Я трохі стаяў на каньках, хоць і змарыўся так, што пот цурком ліўся па твары. Вечарам я ўжо катаўся. Праўда — дрэнна, але ж гэта быў толькі другі дзень! Цяпер я ўжо не сумняваўся, што і адзін навучуся хадзіць на каньках. Тут патрэбна толькі вытрымка, настойлівасць. Калі мне было цяжка, я садзіўся адпачываць і ўяўляў сабе той дзень, калі праеду перад Эмай на каньках. Я ўяўляў, як будуць дзівіцца знаёмыя і сябры, якой разгубленай будзе Эма. Гэта надавала мне сілы і заахвочвала мяне. І я зноў пачынаў катацца.

Але раптам мяне ахапіў непакой: а як хто-небудзь убачыць ды ўсім раскажа? Мяне кідала нават у холад ад гэтай думкі. Праўда, месца глухое і далёка ад дарогі...

Рукі і ногі мае ад няспынных трэніровак наліваліся сілай. Я адчуваў, як з кожным днём усё больш тужэюць мускулы, а рухі робяцца больш разважлівыя і дакладныя. Чым лепш удавалася мне коўзанне, тым весялейшы я рабіўся. І настаўнік, і вучні пачалі пазіраць на мяне, як мне здавалася, са здзіўленнем.

Першы ўстрывожыў мяне мой сябар Янка Маркаўцоў. Неяк на перапынку ён запытаўся:

— Слухай, Антон, чаго гэта ты ходзіш кожны дзень на раку? Што ты там робіш?

А за Янкам і іншыя пачалі чапляцца:

— Што гэта ў цябе за паходы такія?

Тут ужо я не на жарт спалохаўся: а што, як высачаць ды да часу пра ўсё дазнаюцца? Пра тое, што вучуся катацца, ведалі толькі бацька ды маці — і больш ніхто.

Каб не рызыкаваць, я змяніў распарадак дня. Урокі пачаў рыхтаваць адразу пасля школы, а вечарам, як толькі пачне цямнець, — на лёд. І вось імчу, любуючыся зманлівым разлівам

Спампавана з сайта www.aversev.by

электрычных агнёў у цемені. І такое тады ўсё добрае ўспамінаецца. Успамінаецца Кіці з рамана Льва Талстога «Анна Карэніна». Як яна здорава каталася на каньках! Успамінаюцца школа, настаўнікі, Эма. Аднойчы я нават канькамі на лёдзе выпісаў гэтае імя.

Добра было б прамчацца ўдваіх па лёдзе навыперадкі. Ды для гэтага мне яшчэ трэба трэніравацца ды трэніравацца! Але чаму я павінен вучыцца адзін? І ўсё больш і больш пачало з'яўляцца ў мяне жаданне: выйсці на каньках удзень на балонне, калі там будзе катацца Эма Пшанічная.

7

У наступны дзень я бяру канькі і бягу на лёд. Эма ўжо там — пра гэта мне сказаў Янка Маркаўцоў, якому я яшчэ ўчора адкрыў свой сакрэт. Ясны зімовы дзень. Чысты лёд аж зіхаціць на сонцы. Зграбная яе постаць у вязаным касцюме мільгае перада мною. Вось Эма робіць круг. Вось робіць васьмёрку. Раптам імчыцца на адной назе, потым кружыцца на месцы. І зноў — імклівы бег.

Ужо няма на беразе натоўпу, як гэта было спачатку. Канечне, я быў бы рады, каб былі на беразе людзі. Няхай бы падзівіліся, як я катаюся. Але ж гэта не так ужо важна. Важна, што я навучыўся. А слава — яна прыйдзе пасля, калі толькі ёй трэба будзе прыйсці.

Каля лёду я скідваю валёнкі, аддаю іх Янку, а сам абуваю чаравікі з канькамі.

Эма спыняецца і пазірае на нас. Я падхопліваюся і, на здзіўленне Янкі, смела імчуся па лёдзе. Я раблю спачатку круг — зусім такі, як яна. Потым васьмёрку. Потым імчуся на адной назе. Усё гэта выходзіць у мяне проста. Не горш, мусіць, чым у яе. Потым я імчуся наўпрост — аж пад самы далёкі бераг. Яна не вытрымлівае і зрываецца ўслед за мною. Але ж хіба ёй дагнаць мяне! Столькі дзён і вечароў быў я на лёдзе. Усю восень і пачатак зімы!

Спампавана з сайта www.aversev.by

Пад берагам я раблю яшчэ адзін круг і спыняюся. Яна — расчырванелая, здзіўленая — пад'язджае да мяне.

— Антон, — з усмешкай пытае яна, — калі гэта ты навучыўся катацца на каньках?

Разгледзьце рэпрадукцыі карціны Мікалая Казакевіча «Юнацтва», Сяргея Рымашэўскага «Выпадковая сустрэча» (гл. уклейку). Што, на вашу думку, яднае герояў мастацкіх палотнаў і апавядання?

— А вось і навучыўся, — не без гонару кажу я. — Не толькі ж табе адной катацца, Мэры Кэт. Дарэчы, Мэры Кэт — гэта гераіня з якога рамана? Нешта я ніяк не прыпомню.

— Ні з якога, — адказвае яна. — Я сама выдумала.

Мы пайшлі разам — плячо ў плячо.

— Антон, — раптам запыталася Эма, — а ты чуеш, як гудзе лёд пад нашымі нагамі?

— Чую, Эма, толькі вельмі невыразна, — адказаў я.

— А як цяпер на шляху аўтамашына гудзе, чуеш?

— Не, гэтага не чую, Эма.

— Пантона-Мантона-Дэмантона! Ты не крыўдуеш на мяне, што я так пытаюся? Давай не будзем сварыцца, а будзем дружыць.

Ну што было сказаць на гэта? Нейкая новая радасць запаўняла мяне. Дзень пачаў здавацца прыгажэйшым.

— Давай дружыць, — падумаўшы, згадзіўся я...

...Я чую. ...Я чую, як шуміць вецер, як размаўляюць вясною ручаі, як крычаць кнігаўкі, што прыляцелі на паплавы і лугі. Я чую шэпт першых лісцяў, гарачы, добразычлівы шэпт аб тым, што вось як прыгожа вакол... Калі і як такое са мною здарылася — я і сам сказаць не магу. Але ж здарылася! За доўгія месяцы ўпартай вучобы і працы! Нічога як быццам не адбылося асаблівага, і раптам усё ўварвалася ў вушы.

Нібы мяне закружыла ў радаснай прыгажосці жыцця.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Пытанні і заданні да раздзелаў 1—3

1. Раскажыце пра з'яўленне ў класе Эмы Пшанічнай. Знайдзіце апісанне знешняга выгляду дзяўчынкі. Зачытайце радкі, у якіх перададзена эмацыянальнае ўспрыманне новай вучаніцы Антонам Бубновым. Якое яно?
2. Што прымусіла Антона раззлавацца на гераіню? Як вы ставіцеся да гэтай з'явы?
3. Якія рысы характару Эмы выявіла яе запіска галоўнаму герою твора?
4. Янка Маркаўцоў прапануе Антону крыўдзіць новую вучаніцу (цягаць за касу), а каб Эма не пайшла шукаць справядлівасці да дырэктара — напалохаць дзяўчынку. Аднак калі аграном, бацька Эмы, раптам пакрыўдзіць іх бацькоў, то хлопец выступіць на сходзе ў іх абарону. У чым вы бачыце супярэчнасць у разуменні хлопцам справядлівасці? Паразважайце.
5. Якім вы ўяўляеце Антона Бубнова? Зачытайце радкі, у якіх герой тлумачыць прычыну сваёй адзіноты. Чаму Антон то вінаваціць сябе за свае паводзіны з Эмай, то зноў перажывае пачуццё варожасці да дзяўчынкі?
6. Навошта хлопчык стаў дэманстраваць сваю пагарду да Эмы? Як на самай справе ён ставіўся да гераіні? Узгадайце іх выпадковую сустрэчу і тое, як хлопец збіраўся на школьны вечар.

Пытанні і заданні да раздзелаў 4—7

1. Як успрыняў Антон паведамленне Янкі Маркаўцова пра захапленне Эмы? Якое рашэнне прыняў хлопец?
2. Знайдзіце ў раздзеле 4 вобразнае і эмацыянальнае апісанне змен пор года, багатае на сродкі мастацкай выразнасці. Назавіце вобразы, створаныя пры дапамозе эпітэтаў, увасабленняў. Ці не нагадваюць яны вам сапраўдны верш? Калі так, то чым?
3. Зачытайце апісанне пачуццяў, якія перажываў Антон, калі ўспамінаў пра Эму. Прывядзіце прыклады з твора, якія сведчаць, што новыя пачуцці надаюць Антону сілы пераадольваць цяжкасці, мяняцца, станавіцца лепшым.
4. Што дапамагло Антону наладзіць сяброўскія адносіны з Эмай?

Спампавана з сайта www.aversev.by

Пытанні і заданні да твора

1. Размясціце пункты плана паводле зместу апавядання (трэнажор па творы М. Лупсякова «Мэры Кэт»).
2. Чым апавяданне адрозніваецца ад іншых празаічных твораў, з якімі вы пазнаёміліся раней, па тэме, настроі? Якія пачуцці яно выклікае? У чым яно збліжаецца з паэтычнымі творамі?
3. У апавяданні аўтар карыстаецца рознымі прыёмамі паказу жыцця і характарыстыкі герояў — аповедам, апісаннем, дыялогам. Прывядзіце прыклады і раскрыйце іх ролю ў творы.
4. Што прываблівае вас у характарах і паводзінах герояў (адкрытасць, добразычлівасць, рашучасць, уменне разумець сяброў і дараваць ім памылкі, быць аб'ектыўным у ацэнцы сітуацый і сваіх паводзін, уменне пераадольваць цяжкасці, здольнасць прызнаваць свае памылкі, імкненне да самаўдасканалення і інш.)?
5. Праверце свае веды (тэст па творы М. Лупсякова «Мэры Кэт»).
6. Вывучыце на памяць урывак з апавядання ад слоў *«...Я чую. ...Я чую, як шуміць вецер...»* і да канца твора.

ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДА РАЗДЗЕЛА

1. У чым галоўнае адрозненне зместу, тэматыкі празаічных твораў ад паэтычных, вершаваных?
2. Якую ролю ў мастацкіх творах адыгрывае фантазія пісьменніка, мастацкі вымысел?
3. Чым адметныя фантастычныя творы? З якімі з іх вы пазнаёміліся на ўроках рускай літаратуры?
4. Што такое мастацкая дэталь? Прывядзіце прыклады яе выкарыстання ў адным з прачытаных твораў.
5. Назавіце асноўныя спосабы паказу жыцця і характарыстыкі персанажаў у мастацкіх творах. Прывядзіце прыклады аповеду.
6. Раскажыце пра ролю пейзажу, партрэта героя ў мастацкім творы. Пацвердзіце свой адказ прыкладамі.

Спампавана з сайта www.aversev.by

7. Што такое дыялог і якую ролю ён выконвае ў характарыстыцы персанажаў?

8. Вы ведаеце, якую важную ролю ў развіцці сюжэта твора пісьменнік адводзіць апісанню месца дзеяння. Рэжысёры таксама вялікую ўвагу надаюць выбару месца, дзе будзе здымацца фільм па матывах твора. Прапануем вам, узброіўшыся камерай (у тым ліку і мабільнага тэлефона), прыняць удзел у праекце «Я ведаю куточак Беларусі, дзе можна зняць фільм па апавяданні Змітрака Бядулі “На Каляды к сыну”» ці па іншым творы з вывучанага раздзела. Здымаючы, не выпускайце з-пад увагі аўтарскія апісанні, мастацкія дэталі. Спадзяёмся, што вашы ўважлівасць і назіральнасць будуць ацэнены аднакласнікамі, а магчыма, і вучнямі ўсёй школы, калі вы наладзіце калектыўны прагляд вынікаў вашай працы.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Паэзія ў прозе і проза ў паэзіі

Вы пазнаёміліся з двума рознымі відамі літаратурных твораў. І, здавалася б, ужо можаце арыентавацца ў вялікім кніжным моры, якое называецца «Мастацкая літаратура»: адна яе частка — паэзія, а другая — проза.

Аднак паміж паэзіяй і прозай няма рэзкага размежавання. У літаратуры можна сустрэць нямала твораў, напісаных празаічнай мовай, але з выразнымі адзнакамі паэзіі — павышанай эмацыянальнасцю, багаццем яркіх выказванняў, выразаў, узнёслай настроенасцю размовы. Дарэчы, такія якасці можна назіраць і ў творах, змешчаных у вашым вучэбным дапаможніку. Напрыклад, *«...Я чую. ...Я чую, як шуміць вецер, як размаўляюць вясною ручаі, як крычаць кнігаўкі, што прыляцелі на паплавы і лугі. Я чую шэпт першых лісцяў, гарачы, добразычлівы шэпт аб тым, што вось як прыгожа вакол...»* («Мэры Кэт» Міколы Лупсякова). Гэтыя радкі чытаюцца як сапраўдная паэзія. Яны напісаны вельмі пранікнёна, задушэўна. Пра такія творы гавораць: ***паэтычная*** (або ***лірычная***) ***проза***. І гучаць яны як вершы, хоць і напісаны празаічнай мовай.

Паэзія і проза цесна звязаны — у выніку такога ўзаемадзеяння з'яўляецца асобная разнавіднасць твораў. Гэта ***свабодны верш***. Знешне ён падобны да звычайнага верша: невялікі па аб'ёме, друкуецца ў слупок, кароткімі радкамі, хоць і не мае

Спампавана з сайта www.aversev.by

строгага рытму, рыфмы, але часткі маюць падабенства ў будове, па мове больш блізкія да прозы. З вершамі яго звязвае глыбокі, часцей філасофскі, роздум аўтара над рознымі з'явамі жыцця. Мова такіх вершаў лаканічная, афарыстычная (ад слова *афарызм* — кароткае і разам з тым вельмі змястоўнае выказванне), часта з падтэкстам.

Тое, што ў літаратуры з'яўляюцца творы, якія спалучаюць у сабе якасці паэзіі і прозы, — з'ява натуральная. Літаратура развіваецца, становіцца ўсё больш разнастайнай па змесце і форме, здольнай задавальняць самыя розныя густы і духоўныя патрэбы чытачоў.

1. Якія характэрныя адзнакі паэтычнай мовы вы можаце назваць? Паразважайце, ці заўсёды паэтычная мова ўласцівая толькі вершаваным творам.
2. У якіх творах, празаічных ці паэтычных, мова больш эмацыянальная, насычаная мастацкімі зваротамі, тропамі, гучыць узнёсла, музычна, усхвалявана?
3. Чым свабодны верш адрозніваецца ад звычайнага?

Змітрок Бядуля

ШЧАСЦЕ НЕ Ў ЗОЛАЦЕ

Мыла дзяўчынка бялізну кужэльную ў крыніцы. Стаяла яна на кладцы, закасаўшы рукавы з вышыўкамі, распусціўшы валасы русыя, пеючы песні дзявочыя.

Ехаў гасцінцам багаты паніч, ехаў, ды застанавіўся — відаць, дзяўчынка спадабалася яму. І давай ён гэткую гутарку весці:

— Я маю зямлі сем валок, стады мае багатыя, коні мае дарагія, парабкі

Спампавана з сайта www.aversev.by

мае адзін у адзін, як тыя дубы на ўзгорку. Пайдзі за мяне замуж, дзяўчынка!

— Ой, не пайду замуж за цябе: не трэба мне золата, серабра, не трэба багатага молайца. Я кахала аднаго — кахаць буду; цалавала аднаго — цалаваць буду. Ён у цябе парабкам служыць, па мне заўсёды тужыць...

Кланяўся пан нізка да зямлі — не памагло. Кленчыў, як той жабрак пад акном, — не памагло.

Ой, шчасце не ў золаце, паны!

1. Над чым прымусіў вас задумацца гэты твор?
2. Паспрабуйце ўзнавіць аўтарскі тэкст (трэнажор па творы Змітрака Бядулі «Шчасце не ў золаце»).
3. Прачытайце ўголас гэты твор так, каб адчувалася яго ўзнёсласць, яго высокая ідэя — «шчасце не ў золаце».
4. Узгадайце прыказкі і прымаўкі, якія адпавядаюць мастацкай ідэі твора.
5. Як вы адносіцеся да рашэння гераіні твора аддаць перавагу парабку перад панічом?
6. Што яднае твор «Шчасце не ў золаце» з апавяданнем? Пры адказе звярніце ўвагу на празаічную мову, сюжэт, герояў (дзяўчына і паніч), дыялог.
7. Якому віду мастацкай творчасці ўласцівыя сціслаcць у выказванні думкі, ужыванне паэтычных азначэнняў *бялізна кужэльная, валасы русыя, песні дзявочыя, стады багатыя, коні дарагія*, наяўнасць рыфмы і рытмічнае гучанне, калі асобныя выказванні нават можна запісаць у выглядзе верша:

Я кахала аднаго —
кахаць буду.
Цалавала аднаго —
цалаваць буду.
Ён у цябе парабкам служыць,
па мне заўсёды тужыць...?

8. Ці можна аднесці твор «Шчасце не ў золаце» да лірычнай прозы? Аргументуйце свой адказ.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Максім Танк

ДРЭВЫ ПАМІРАЮЦЬ...

...Дрэвы паміраюць,
Калі перастаюць пазнаваць
Змены года
І не адгукаюцца рэхам;

Вада — калі забывае,
Куды ёй плыць,
І нікому не спатольвае смагі;

Зямля — калі перастае
Радзіць хлеб
І быць калыскай песняў;

Чалавек — калі страчвае здольнасць
Здзіўляцца і захапляцца
Жыццём.

1. Якія думкі ўзніклі ў вас пры чытанні гэтага твора?
2. Паспрабуйце сфармуляваць тэму і мастацкую ідэю верша.
3. Прачытайце твор выразна і перадайце сэнс кожнай яго часткі.
4. Вызначце ролю падтэксту ў вершы. Пры неабходнасці звярніцеся яшчэ раз да артыкула «Падтэкст у паэтычным творы».
5. Паразважайце, ці вызначаецца верш гранічнай сціслацю ў выказванні думкі, шырокім выкарыстаннем афарыстычных выразаў? Ці мае строга вытрыманы рытм і рыфму?
6. Чым адметны гэты верш? Абапіраючыся на змест і форму твора «Дрэвы паміраюць...», абгрунтуйце наяўнасць у ім асноўных прымет свабоднага верша.
7. Вывучыце верш на памяць.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Алесь Разанаў

* * *

У парку,
ля раўчука,
ляжалі тры валуны.
Пафарбавалі іх сёлета
ў сіні колер —
і тысячагоддзі памерлі.

1. У чым выявілася арыгінальнасць твора? Ці адчулі вы кантраст першай фразы і апошняга радка?
2. Чаму тысячагоддзі памерлі?
3. Якую думку-ідэю выказвае аўтар у творы?
4. Зачытайце радкі, у якіх за словамі прыхаваны нявыказаны прама сэнс — падтэкст.
5. Прачытайце твор спачатку як звычайны тэкст, а потым — як верш, выдзяляючы кожны радок. У якім выпадку ён робіць на вас большае ўражанне?

Музей валуноў у Мінску

Разгледзьце фотаздымак экспанатаў Музея валуноў. Пра што могуць расказаць гэтыя камяні-веліканы?

Спампавана з сайта www.aversev.by

ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДА РАЗДЗЕЛА

1. Прыгадайце з прачытаных вамі раней твораў тыя, што напісаны празаічнай мовай, але ў асобных сваіх частках вельмі эмацыянальныя, задушэўныя, узнёслыя, паэтычныя.

2. Разгадайце крыжаванку па раздзеле «Паэзія ў прозе і проза ў паэзіі».

3. Праверце свае веды па раздзеле (тэст «Паэзія ў прозе і проза ў паэзіі»).

4. Стварыце слоўнік афарызмаў паводле вывучаных твораў Якуба Коласа, Янкі Купалы і Янкі Брыля. Падумайце, якую структуру будзе мець ваш слоўнік, тэматычную або алфавітную. Дапоўніце падрыхтаваны вамі зборнік афарызмамі з твораў іншых пісьменнікаў.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Мастацкая літаратура, публіцыстыка і навука

Калі мы гаворым пра літаратуру, звычайна маем на ўвазе мастацкія творы — вершы, апавяданні. Аднак ёсць і іншая літаратура. Тое, што друкуецца ў газетах, — таксама літаратура. Прычым надзвычай важная для людзей.

Да мастацкіх твораў мы звяртаемся не кожны дзень. Але, мабыць, няма такога чалавека, які б на працягу дня не пацікавіўся навінамі ў інтэрнэце, не заглянуў у газету, не паслухаў радыё або не паглядзеў тэлеперадачу. У кожнага ёсць такая патрэба — ведаць, што адбываецца на свеце, чым жывуць краіна, людзі.

Гэту патрэбу задавальняе ***публіцыстыка*** — асаблівы від літаратуры, які ў паказе жыцця грунтуецца не на фантазіі, а на адлюстраванні сапраўдных, рэальных падзей і фактаў. І віды твораў у публіцыстыцы свае — артыкул, рэпартаж, нарыс, фельетон.

Падобную ролю нярэдка выконвае і мастацкая літаратура, звяртаючыся да вострых праблем грамадска-палітычнага жыцця.

З другога боку, і публіцыстыка шырока выкарыстоўвае сродкі і прыёмы мастацкай літаратуры: метафары, параўнанні, эпітэты, апісанні, партрэтную характарыстыку, афарызмы, а таксама гумар і сатыру.

Асаблівасці адлюстравання жыцця ў мастацкай літаратуры і публіцыстыцы. Паміж мастацкай літаратурай і публіцыстыкай няма рэзкага размежавання, але розніца істотная. Мастацкія

Спампавана з сайта www.aversev.by

прыёмы і сродкі ў публіцыстыцы адыгрываюць дапаможную ролю. Галоўная мэта публіцыстычных твораў заключаецца не ў стварэнні мастацкіх вобразаў і карцін, а ў разглядзе і грамадскай ацэнцы жыццёвых з'яў. У гэтым публіцыстыка збліжаецца з навукай, у прыватнасці з такімі яе галінамі, як грамадазнаўства, гісторыя.

Да публіцыстычнай літаратуры блізкая ***дакументальная проза***. Гэта творы пра падзеі, якія сапраўды адбываліся ў жыцці звычайных і знакамітых людзей — нарысы, успаміны (мемуары), біяграфіі, аўтабіяграфіі, дзённікі.

1. Сфармулюйце галоўную мэту публіцыстычных твораў. Чым яна адрозніваецца ад мэты мастацкай літаратуры?
2. Чым дакументальная проза падобная да мастацкіх твораў, а чым — да публіцыстычных? Якія віды дакументальных твораў вы ведаеце?

Цётка

ШАНУЙЦЕ РОДНАЕ СЛОВА!

Артыкул — жанр навуковай або публіцыстычнай ці крытычнай літаратуры, у якім ставіцца і вырашаецца пэўнае пытанне.

Роднае слова!

З малых дзён чуем мы цябе з матчыных вуснаў. Ты нам тлумачыш усе дзівы свету, якія дзіцячае вока бачыць навокал сябе першы раз. І табе выказваем мы свой дзіцячы жаль, крыўду, жаданне, радасць...

Што можа быць даражэй сэрцу чалавека, як у сталых гадах пачуць цябе, роднае слова, у чужой старане? Здаецца, быццам з далёкай чужыны пераносіш ты нас у родны край — родную вёску, дзе мы ўзраслі, дзе першыя думкі складалі, дзе гора і радасць першы раз спазналі...

Чаму ж, роднае слова, гэтак часта забываюць цябе людзі — нават тут, між сваімі? Чаму сыны нашага народа так лёгка адракаюцца ад матчынай гутаркі?

Спампавана з сайта www.aversev.by

Кажуць: бо цёмны нашы беларусы. Але гэта няпраўда: забываюць родную мову, адракаюцца бацькоў і братоў сваіх найбольш тыя, хто дайшоў навук, выйшаў у людзі. Яны няцёмны: яны пераймаюць чужое — дзеля карысці.

У сэрцы такіх людзей загасла любоў да свайго народа і роднай мовы. Дачэсная карысць, жаданне пашаны ў чужых, смешны гонар — усё гэта заняло месца ў апусцеўшай іх душы. А за іх прыкладам і наша вясковая моладзь, наламываючы сябе, пачынае праз несвядомасць цурацца таго, што яе выдзяляе з-паміж іншых народаў, пачынае глядзець на ўсё сваё, роднае, чужымі вачыма, думаючы, быццам гэта добра, калі людзі «вышэйшых станаў» так робяць...

Бедны той, хто, апрача грошай, апрача багацця, каторае пры першым няшчасці счэзне дазвання, не мае скарбаў вечных — скарбаў душы. Такі скарб, каторы ніхто і ніколі адабраць ад нас не здолее, гэта любоў да Бацькаўшчыны, да свайго народа, да роднай мовы, — гэта вялікае мілаванне чалавека — слабага, пакрыўджанага.

Яркім полымем гарыць такая любоў у душы, сагравае яе, асвятляе дарогу ў жыцці. Хто любіць свой народ, хто ў кожным бачыць брата-чалавека, той не сагнецца перад крыўдай, перад здзекам: ён бачыць навакол сябе мільёны падобных сабе, і яго думкі, яго жаданні зліваюцца з думкамі і жаданнямі вялікай людской грамады. Такі чалавек ніколі не будзе адзін — самотны і пакінуты.

Але поруч з любоўю да сваіх братоў патрэбна яшчэ нешта, што злучае людзей у суцэльны народ, — гэта родная мова.

Яна, быццам цэмент, звязвае людзей. Яна дае ім найлепшы спосаб разумець адзін аднаго, адной думкай жыць, адной долі шукаць. Хто адрокся мовы бацькоў сваіх, хто ўздзеў чужую апратку — той адышоў ад народа далёка-далёка. Ён чужы ў роднай вёсцы, у сваёй сям'і. І на яго браты глядзяць, як на чужынца...

Да нашай моладзі звяртаемся мы з гэтымі словамі. Вы маладыя, найчасцей пападаеце між чужых людзей, што вашай

Спампавана з сайта www.aversev.by

мовы не шануюць, «простай», «мужыцкай» завуць. З вас часта насмяхаюцца, калі гаворыце па-свойму. І вы, чуючы гэта, пачынаеце саромецца матчынай мовы, свайго народа, сваёй радні. Так разрываецца тая жывая сувязь, што злучае вас з беларускім народам. Аб ім вы забываеце. Чужых багоў прымаеце: чужую гутарку, звычаі, чужое імя.

Быў у нас пясняр, што ў час спячкі народнай першы адважыўся клікаць беларусаў, каб шанавалі мову бацькоў і дзедаў сваіх. «Не кідайце мовы сваёй, каб не ўмёрлі», — пісаў Мацей Бурачок да беларусаў. І гэты вокліч збудзіў прыспаныя сэрцы. Народ прачнуўся. Ён пазнаў, хто ён. Родная мова яго — загнаная, пагарджаная — паднялася высока і стае ўжо поруч з «панскімі» мовамі. І здабывае пашану ў людзей: людзі бачаць, што мы яе шануем, што яна для нас мае вялікую цану, — ды самі пачынаюць інакш глядзець і на нас, і на яе.

На вас — моладзі — ляжыць вялікая павіннасць: развіваць далей родную мову, узбагачаць свой народ знаннем і культурай. Вы здабываеце навуку для сябе, дык дзяліцеся ёю з тымі, хто для вас цяжкай працай здабывае кусок хлеба. Толькі не кідайце роднай мовы: бо запраўды для свайго народа тады вы ўмёрлі!

Мейце сілу і адвагу дзяржацца роднага слова. Мейце смеласць усюды голасна казаць па-свойму. І, гледзячы на вас, асмеляцца і іншыя, зразумеюць, што шчырае сэрца беларускае б'ецца не толькі пад мужыцкай сярмягай[1], паверацъ ва ўласныя сілы свае і пойдуць цвёрдай ступой да лепшай будучыні, да ясных зор шчасця народнага.

1912

1. Да чаго заклікае Цётка беларускую моладзь сваім артыкулам? Зачытайце радкі з твора, дзе асабліва ярка выражана гэтая думка.

2. Знайдзіце адпаведныя радкі ў тэксце, у якіх раскрываюцца наступныя пытанні:

- Якую ролю ў жыцці маленькага чалавека выконвае родная мова?

[1] *Сярмя́га* — верхняе адзенне з даматканага сукна.

Спампавана з сайта www.aversev.by

- Чым запаўняюцца чалавечыя сэрцы, у якіх *«загасла любоў да свайго народа і роднай мовы»*?
- Які скарб ніхто і ніколі адабраць у нас не здолее?
- Які чалавек ніколі не будзе адзінокім — самотным і пакінутым?
- Што патрэбна яшчэ, акрамя любові да сваіх братоў, каб злучыць людзей у *«суцэльны народ»*?
- Назавіце асноўную прычыну разрыву сувязі чалавека з народам.
- Які заклік беларускага песняра Мацея Бурачка (Ф. Багушэвіча) першым прагучаў у абарону роднай мовы?
- На каго ўскладае Цётка адказнасць за далейшае развіццё роднай мовы?
- Што трэба зрабіць, каб нашчадкі зразумелі, што *«шчырае сэрца беларускае б'ецца не толькі пад мужыцкай сярмягай»*, каб паверылі ў сілы свае і пайшлі *«цвёрдай ступою да лепшай будучыні»*?

3. На прыкладзе адной з узнятых у артыкуле праблем пабудуйце сваё разважанне па схеме: тэзіс — аргументы і прыклады — вывад.

4. Назавіце адрасатаў зваротаў і заклікаў пісьменніцы. Вызначце ролю займеннікаў у раскрыцці аўтарскай думкі.

5. Якія прыёмы і сродкі мастацкай выразнасці выкарыстоўваюцца ў гэтым творы? Для чаго яны ўжываюцца (каб стварыць маляўнічую карціну жыцця; каб больш выразна выказаць думку; каб абудзіць пачуцці ў чытачоў; каб пераканаць чытачоў у неабходнасці шанаваць родную мову)?

6. Параўнайце, як раскрываецца тэма ў артыкуле Цёткі «Шануйце роднае слова» і вершы Д. Бічэль «Роднае слова». У якім з твораў аўтар адкрыта адстойвае сваю пазіцыю — заклікае шанаваць родную мову, а ў якім пераважае вобразна-эмацыянальнае раскрыццё тэмы?

7. Як вы лічыце, для чаго быў напісаны твор Цёткі? Які вывад можна зрабіць пасля знаёмства з ім?

8. Звярніце ўвагу на год напісання артыкула і паразважайце, наколькі надзённым з'яўляецца пытанне захавання роднай мовы.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Уладзімір Караткевіч

ЗЯМЛЯ ПАД БЕЛЫМІ КРЫЛАМІ

Нарыс[1]

(Скарочана)

Зараз вясна. Над усёй нашай краінай, наставіўшы белыя ветразі крылаў, планіруюць буслы. Іх многія і многія тысячы — хто лічыў? На вільчыках сялянскіх хат, на дрэвах, на калонах старых разбураных палацаў, на слупах капліц сярод маладога зялёнага жыта. Гнёзды паўсюль.

Этнаграфія — народазнаўства, навука, якая вывучае паходжанне, рассяленне, жыццё і побыт, матэрыяльную (жыллё, прылады працы, прадметы хатняга ўжытку, адзенне, ежа і інш.) і духоўную (народная мастацкая творчасць, вераванні, традыцыі, абрады, звычаі, норавы, сямейны побыт) культуру народа.

І таму мне здаецца, што ў гэтыя — і не толькі ў гэтыя — дні зямлю нашу, Беларусь, можна назваць «зямлёю пад белымі крыламі». І не здзіўляйцеся, дзяўчаты і хлопцы, на дзіўную назву кнігі, якая трапіла да вашых рук.

Да пэўнай ступені бусел — сімвал Беларусі. Вось так і планіруюць, планіруюць буслы. А мне пад іхні палёт асабліва добра думаецца пра Беларусь, нашу з вамі Радзіму. І для вас я і хачу, наколькі хопіць маіх ведаў і здольнасцей, расказаць пра яе.

Я аб'ездзіў на Беларусі амаль усё. Няшмат засталося нават глухіх куткоў, дзе я не пабываў бы. Таму я насмельваюся сказаць, што ведаю сваю краіну і яе людзей. І менавіта таму, дарагія дзяўчаты і хлопцы, я стану гаварыць з вамі толькі аб тым, што

---

[1] *На́рыс* — такое агульнае вызначэнне жанру гэтага твора даў аўтар. Калі больш дакладна, «Зямля пад белымі крыламі» — цыкл мастацка-этнаграфічных нарысаў пісьменніка пра сваю зямлю і свой народ, г. зн. шэраг твораў, якія спалучаюць у сабе адзнакі і мастацкай літаратуры, і навукі — этнаграфіі.

Спампавана з сайта www.aversev.by

сам бачыў і чуў. Гэта будзе кніга, напісаная сведкам, які многае (што датычыць сучаснасці) бачыў на ўласныя вочы. І я дужа хацеў бы, каб вы мне верылі, нават калі я стану вам расказваць самыя незвычайныя рэчы. Таму што жыццё багацейшае, чым мы яго ўяўляем. Жыццё часам бывае настолькі падобнае на казку, што нельга не ўскрыкнуць: «Ды не можа гэтага быць!»

Г. Вашчанка. Мацярынскія крылы

1. Чаму аўтар называе Беларусь *«зямлёю пад белымі крыламі»*? Прыгадайце легенды пра паходжанне назвы «Белая Русь».
2. Звярніцеся да рэпрадукцыі карціны мастака Гаўрылы Вашчанкі «Мацярынскія крылы». Што, на вашу думку, дазваляе суаднесці яе з творам «Зямля пад белымі крыламі»?
3. Аргументуйце аўтарскія радкі, што *«бусел — сімвал Беларусі»*. Назавіце іншыя сімвалы нашай краіны.
4. Як пісьменнік вызначыў жанр твора? Знайдзіце і зачытайце радкі з тэксту, у якіх аўтар акрэсліў яго мэту.

ЗЯМЛЯ МАЯ БЕЛАРУСКАЯ

Вёска, о родная вёска мая!

Дык вось, вёска. Яна не такая, як на Украіне або на Доне. Там не рэдкасць вёскі ў 200—300—1000 двароў. У нас 20—30 двароў — гэта ўжо вёска. Мала таго, на захадзе яшчэ й дагэтуль досыць многа хутароў... Ёсць, праўда, і вялікія вёскі, двароў на 1500, такія, як Рубель на Століншчыне. Але іх мала, напэўна, некалькі соцень, не больш.

За выключэннем некаторых раёнаў Палесся, беларускую хату ніколі не беляць знадворку, толькі ўнутры. Але старая беларуская вёска тым не менш, прайграючы ў весялосці знешняга

Спампавана з сайта www.aversev.by

выгляду перад вёскай, скажам, карпацкай або малдаўскай, мае нейкі дужа мілы, задумлівы і паэтычны каларыт, дзякуючы прысадам вялікіх дрэў на вуліцах і ў завулках, векавым дубам на сядзібах, вялізным дзічкам на былых межах, садкам і, урэшце, таму, што калі не адразу за хатамі, то хаця б на гарызонце амаль абавязкова відаць лясы ці пералескі, што калі не тут жа, то непадалёку — рака, рачулка ці возера. Шмат зеляніны, шмат вады, шмат неба над галавою.

У нас хату часта будуюць талакою[1], з тоўстых і смалістых сасновых бярвён. Таму што лесу ўсё яшчэ многа. Па той самай прычыне амаль няма глінабітнай падлогі, а ёсць падлога з дошак. Столь, вядома, таксама дошкавая, зверху, на гары, на яе насыпаецца пілавінне, для цеплыні. Стрэхі раней былі саламяныя або, на поўдні, з чароту, які даўжэй служыць. Таму даўжэй, што, калі страху растрэплюць вятры і дажджы, чарот можна зняць і зноў перакрыць ім хату. І так два-тры разы. Але і тады часта сустракаліся «шчапяныя» дахі. Цяпер гонтавы[2] дах бывае на хаце часцей за ўсё. За ім ідзе шыфер. Чарапіца сустракаецца досыць рэдка. Дахі двухскатныя.

Хата заўсёды будуецца вокнамі на вуліцу, уваход калісь быў, у пераважнай большасці выпадкаў, з двара, а цяпер усё часцей з вуліцы. Франтон[3] часта аздабляецца разьбою. На Давыд-Гарадоччыне, напрыклад, на ўсіх хатах знак сонца і расліны вакол яго. Разьба і навокал акон, і на аканіцах. Не ўсюды, але часта. Раней хату абкружала прызба, цяпер хаты, вядома, на фундаментах.

Для прыкладу апішу некалькі вёсак. Спачатку хутар. Расолы Астравецкага раёна на Гродзеншчыне.

---

[1] *Талака́* — калектыўная дапамога ў гаспадарчых работах, якая стала народным звычаем.

[2] *Го́нта* — дахавы матэрыял у форме невялікіх дошчачак, востра заструганых з аднаго боку і з пазам — з другога.

[3] *Франто́н* — трохвугольная або цыркулярная верхняя частка фасада будынка, абмежаваная схіламі даху і карнізаў.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Да бліжэйшай станцыі Гудагай некалькі кіламетраў лесам, палямі, пералескамі. Паўсюль раскіданы грады ўзгоркаў, а на іх сіні зубчасты лес. Між град палі канюшыны, залатыя лапікі стральчастага лубіну. Праз густыя зарасці чорнай вольхі бяжыць вясёлая і чысцюткая, на дзве трэці зацененая дрэвамі рачулка Лоша. «Лоша» па-літоўску «стронга»[1]. І стронга сапраўды водзіцца тут. На беразе рэчкі прыткнуліся наводдаль адна ад адной некалькі спраўных хат са студнямі, пунямі[2] і адрынамі[3], у якіх так добра спаць на сене. Крыху далей, у звіліне Лошы, векавыя дрэвы былога фальварка. Ад дома засталіся толькі прыступкі ганка, якія вядуць у нікуды. А ля дарогі высачэзны крыж з неашкуранага, крывога дубовага ствала з гэткай жа папярочынай. Кажуць, што крыж пастаўлены былой гаспадыняй фальварка ў памяць аб павешаным правадыры паўстання 1863—1864 гг. Каліноўскім, якога яна кахала.

В. Пяшкун. Вёска

Другі край рэспублікі. Паўдзённы. Лахва Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці. Рака з непрыгожаю назваю Смердзь ёсць, аднак, адна з найпрыгажэйшых рэчак, якія мне даводзілася бачыць у маім жыцці. Недзе кіламетраў за дзесяць да ўпадзення ў Прыпяць рака пачынае драбіцца на рукавы. Атрымліваецца некалькі астравоў, злучаных драўлянымі мастамі. На гэтых астравах хаты, што патанаюць у садах. Вада рукавоў цёмна-зялёная, з сонечнымі плямамі, бо над імі вербы ўтвараюць суцэльныя

[1] *Стро́нга* — рыба сямейства ласасёвых.
[2] *Пу́ня* — невялікая халодная будыніна для захоўвання сена.
[3] *Адры́на* — тое ж, што і пуня.

Спампавана з сайта www.aversev.by

тунэлі. І ў гэтых тунэлях, у імгле, цэлыя чароды чаўноў. Тут цудоўныя новыя пабудовы. У прыватнасці, школа. І нібы вакол мала вады, тут яшчэ і шмат сажалак, дзе разводзяць карпаў.

Той самы поўдзень, але Мазыршчына. Вёска Данілегі. Гэта адна з тых мясцін, дзе жыхары яшчэ носяць па нядзелях і святах старадаўнюю народную вопратку. Хаты, выцягнутыя ў два рады, так густа абраслі дрэвамі, што здаюцца пагружанымі на дно глыбокага зялёнага возера. Некаторыя з іх пабелены і знадворку. Часам — крытыя трысцём. Вокны абведзены сінім. Наваколле — дрымучыя лясы. Трапляюцца дубровы па 400—500 год. Гэта менавіта тут стаіць у атачэнні шасцісотгадовых дубоў — «дуб Крывашапкі», «цар-дуб», «дрэва вечнасці» — вось колькі ў яго назваў. Яму тысяча гадоў. Разменьвае другую тысячу. Немцы хацелі спілаваць яго і вывезці ў Германію, але партызаны паставілі варту. Не ведаю, ці трэба было. Немцам усё адно гэта не ўдалося б. З якою тэхнікай падступіцца да дрэва таўшчынёю з вялікі пакой?!

Возера Свіцязь, апетае Міцкевічам. Вялікі, амаль правільны круг, з усіх бакоў зарослы дужа старымі дубамі. Вада тут такая, што, калі нават проста выкупацца — валасы рыпяць дні два. У наваколлі яго тры досыць тыповыя вёскі. Міратычы, што працягнуліся доўгай паласою харошых хат. Тут захавалася даўно зачыненая чатырохсотгадовая драўляная цэркаўка з тыпу «патаемных». Назнарок малая, назнарок у гушчары, каб на час навалы і вайны не знайшлі. Яна славутая цудоўнай народнай разьбою.

Варонча. Вёска амаль гарадскога тыпу. Тут некалькі прадпрыемстваў. Але і гэта — вёска-музей. Тут, над запруджанай рачулкай, у гушчары, стаяў — а можа, і цяпер стаіць — васьмісотгадовы дуб, звязаны з імем Міцкевіча.

Унутры — дупло, у якім могуць паснедаць вакол стала чалавек дзесяць. Нават акенца ёсць, на другі бок. Можна высунуць галаву і глядзець проста з дрэва, як лясны дух. Наводдаль — руіны дужа даўняга касцёла і могілкі з цудоўнымі помнікамі

Спампавана з сайта www.aversev.by

з італьянскага мармуру. Тут пахаваны бацькі польска-беларускага паэта і фалькларыста Яна Чачота, блізкага сябра Адама Міцкевіча, а таксама — Верашчакі, сваяка Марылі Верашчакі, першага кахання паэта. Маёнтак Верашчакаў, Туганавічы, быў некалі побач. На яго месцы застаўся парк і «альтанка Марылі», некалькі ліп, пасаджаных кругам. Яны так зрасліся, што каб адна не ўпала — унутр гэтага драўлянага круга нельга было б трапіць.

Як бачыце, амаль у кожнай беларускай вёсцы ёсць што паглядзець. Толькі трэба ведаць, што глядзець.

1. Чым адметныя беларускія вёскі? Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Васіля Пешкуна «Вёска». Як вы лічыце, чаму мастак даў свайму твору такую назву?
2. Апішыце беларускую хату знадворку (стрэхі, столь, дах, франтон, аканіцы і г. д.).
3. З дапамогай чаго ствараецца паэтычны каларыт беларускай вёскі?
4. У чым выяўляюцца адносіны аўтара да таго, пра што ён расказвае?

Просім у хату, госцейкі нашы!

Але зойдзем у хату, якой яна была яшчэ не так даўно, а часам сустракаецца і зараз. Спачатку трапляем у сенцы. Яны і зараз служаць для гаспадарчых мэт. Тут вёдры, цэбры[1] з рознай рознасцю, маслабойкі (цяпер часта сепаратар) і г. д. Дзверы насупраць вядуць у камору, дзе таксама рэчы для гаспадаркі і на паліцах розныя прыпасы. Другія дзверы вядуць у халодныя пакоі. Іх адзін ці два. Раней гаспадыня ўлетку

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва — стварэнне мастацкіх вырабаў, якія маюць практычнае прызначэнне і разам з тым эстэтычную каштоўнасць (прыносяць эстэтычную асалоду), г. зн. мастацкае афармленне бытавых прадметаў, сярод якіх жыве чалавек.

[1] *Цэ́бар* — шырокая круглая драўляная пасудзіна з клёпак з двума вушкамі.

Спампавана з сайта www.aversev.by

выносіла сюды кросны, ткацкі станок, бо ў самой хаце горача. Тут жа ўлетку спалі старэйшыя (для маладых служыла і служыць адрына з сенам). Тут узімку ляжаць на аўсянай саломе яблыкі, рассыпаныя тоўстым пластом жалуды для свіней, іншыя прыпасы. Раней зрэдку, а цяпер досыць часта ў халоднай палове ёсць і грубка, так што пры выпадку (наезд гасцей ці яшчэ нешта) можна размясціць процьму людзей. У мінулым стагоддзі, калі шафаў, вядома, не было, а ў куфры (скрыні) не ўсё змяшчалася, тут стаялі і «кублы»[1] з лішнім адзеннем і іншым дабром.

У некаторых хатах да халоднай паловы была прыбудова, у якой спалі ў зусім нясцерпную спёку тыя, хто не хацеў ісці проста ў садок, пад дрэвы. Часам яе можна ўбачыць і зараз. Я аглядаў некалькі такіх, і «абстаноўка» іх заўсёды была аднолькавая: нізкая, дужа шырокая і доўгая «скрыня» на ножках, у ёй сяннік, набіты сенам, мякенькай аўсянай саломай ці гарахавіннем, радно[2], падушкі і полаг. Абавязкова. Ад камароў. Зроблены з радзіны, тканіны, падобнай на марлю.

Вернемся ў сенцы. Ага, мы забылі яшчэ вось што. Лесвіцу, «драбіны», або проста бервяно з засечкамі, якое вядзе на гару, дзе вісяць шынкі і летнія каўбасы (зімнія каўбасы, залітыя салам, і само сала — у дзежках і гарлачах; у сенцах ці ў каморы).

Цяпер — у хату. Выгляд яе для кожнай мясцовасці быў розны. У даўніну бывалі хаты з комінам (цяпер комінам завецца пячны дымаход), плеценым і абмазаным глінаю конусам, пад якім на жароўні ці ў свечніку гарэла лучына, а дым ішоў комінам праз страху і столь. Бывалі хаты з вялізным, таксама абмазаным, каўпаком ля ачага, дзе ў зімнія ночы (там было цяплей) збіралася прасці і майстраваць уся сям'я. Ды і ў розных мясцовасцях хаты былі розныя. На два пакоі (трысцен і ўласна хата), на два пакоі з прыбудовамі і г. д. Але найбольш тыповы выгляд быў такі. З трысцена, дзе елі летам і, хто хацеў, спалі

---

[1] *Ку́бел* — дзежка з вушкамі і векам, звычайна для захоўвання прадуктаў і рэчаў.

[2] *Радно́* — даматканае палатно.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Інтэр'ер беларускай сялянскай хаты.
Вязынка. Музей Янкі Купалы

Назавіце традыцыйныя рэчы ў інтэр'еры беларускай хаты.

зімой і куды ўзімку бралі маладняк быдла, быў уваход у хату. Ля ўвахода, справа, мыцельнік, месца для мыцця посуду і кухонных рэчаў. Пасля печ. За печчу, па правай сцяне пол (нары). Пад полам складалі розныя рэчы. Але ўжо тады замест пола часта стаялі шырокія ложкі, адзін з завескаю, для гаспадара. Уздоўж астатніх дзвюх сцен ішлі шырокія лавы, часам з тканымі налаўнікамі. На іх сядзелі і ноччу маглі спаць, асабліва калі бывалі госці.

Перад лаўкамі — стол. Заўсёды дужа белы, бо яго часта скрэблі нажом. Стол і лаўкі часцей за ўсё былі з тоўстых дубовых дошак. Ля той сценкі, дзе дзверы, стаялі куфры і — узімку — гаспадыніны кросны.

З упрыгожанняў былі абразы на покуце. Бывалі сярод іх і лубачныя[1], але здараліся й дужа цікавыя. Ці старажытныя, ці наіўныя, уніяцкіх яшчэ часоў, дзе святыя былі ў беларускіх народных вопратках. Асаблівым поспехам карыстаўся

[1] *Лу́бачныя абразы́* — абразы, надрукаваныя з лубка (ліпавай дошкі, на якой даўней гравіравалася карціна для друкавання). Надрукаваныя з такой дошкі абразы вызначаліся прастатой і даступнасцю вобразаў.

Спампавана з сайта www.aversev.by

святы Юры, які забівае дракона, і святы Мікола за сваё сялянскае паходжанне і за тое, што (па беларускай легендзе) аднойчы ўратаваў адзіную кабылку беднага мужыка, якая заблукала ў лесе. Не даў раздзерці ваўкам і памог ажарабіцца, а пасля прывёў гаспадару. Згодна з павер'ем, калі жарабятка падрасце, то на ім паедзе той, хто дасць волю народу.

І яшчэ адно ўпрыгожанне — тканыя посцілкі (у шашачкі, у шэсць, дванаццаць і дваццаць чатыры ніты і інш.).

І, вядома ж, ручнікі. Мноства. Раней вакол абразоў і акон. Цяпер каля карцін і партрэтаў. Ручнікі ў нас на Беларусі таксама розныя, па мясцовасці, і дужа разнастайныя. Узоры іншыя, чым у суседзяў, хаця ёсць і падобныя. Галоўная розніца — менш «раслін і кветак». Арнамент часцей геаметрычны. Меней чорнага колеру. Пераважае «вясёлка», жоўты, чырвоны, сіні, блакітны і іншыя такія колеры.

! Узоры на ручніках — зашыфраваная гісторыя жыцця народа. Кожны ўзор нешта абазначаў, толькі трэба было ўмець чытаць. Вядома, напрыклад, што голуб і галубка лічацца сімвалам кахання. У залежнасці ад таго, як яны былі вышыты, азначаць маглі рознае: голуб ідзе за галубкай — першае знаёмства хлопца з дзяўчынай; дзве птушкі павернуты галоўкамі адна да адной, часам букет паміж імі — каханне ў самым росквіце; калі птушкі павернуты ў розныя бакі — каханне скончылася. Ручнікі распавядалі пра жыццё народа і яго працу, пра шчасце і каханне, мары і спадзяванні.

Ну вось. А цяпер, паколькі я кепскаваты танцор, то пайду танцаваць ад печы. Печ — гэта цеплыня. Печ — гэта здароўе застуджанаму. Печ — гэта і гарачая, смачная ежа. На поўначы печ дужа вялікая і простая, хіба што з «пячуркамі» для запалак і лучыны на распал. Затое на поўдні яна меншая і часам нагадвае архітэктурную спаруду. Дзясяткі выступаў і ніш, у якіх гліняныя збанкі, ліверы (пасудзінка з дзвюма дзірачкамі, «цякло, бы з лівера, з вачэй»). Тут ёсць дзе ўстанавіць спарыш (два гаршкі, злучаныя ручкай, каб насіць на поле абед), паставіць

Спампавана з сайта www.aversev.by

і «ўдаву» — гаршчок, падобны на абаранак. Печ уся распісана кветкамі, дзяўчаткамі з каромысламі і коннікамі — улюбёны матыў. Зараз, у наш час, печ выцясняецца плітамі і плітамі газавымі, але пакуль ёсць у многіх хатах.

Дзе печ, там і тое, што з печы.

1. Назавіце прадметы хатняга побыту і рэчы, якімі карысталіся пры вядзенні гаспадаркі, патлумачце іх прызначэнне.
2. Пералічыце самаробныя прылады працы, якія адышлі ў нябыт, саступіўшы месца прамысловым вырабам.
3. Патлумачце выраз *«Праз куфар відаць жыццё чалавечае»*.
4. Раскажыце пра ролю ручнікоў у побыце беларусаў.
5. Уявіце сябе гаспадаром новай хаты. Раскажыце пра тое, як вы расставіце традыцыйныя рэчы (стол, куфры, нары або ложкі, лавы, кросны), каб атрымаўся яе тыповы выгляд. Не забудзьце знайсці месца для печы і мыцця посуду.
6. Назавіце прадметы ў інтэр'еры беларускай хаты, якія маюць практычнае прызначэнне і разам з тым прыносяць эстэтычную асалоду.
7. Складзіце этнаграфічны слоўнік прылад працы і прадметаў хатняга ўжытку. Выкарыстайце таксама веды, якія вы набылі падчас наведвання музеяў народнай архітэктуры і побыту.
8. Што новае вы адкрылі для сябе, пазнаёміўшыся з нарысам «Просім у хату, госцейкі нашы!»?

Хлеб і да хлеба

Беларус любіць смачна паесці.

На куццю на стол ставілася 12, 18, а то і 24 стравы. І ўсё гэта трэба пакаштаваць. Некаторыя са страў я апішу. Не сказаць, каб усё гэта заўсёды стаяла на стале, але гэта стравы нацыянальнай кухні.

Перш за ўсё страва інтэрнацыянальная. Аснова ўсяго. Хлеб. Пшанічны, як на поўдні, у нас пякуць рэдка. Беларус любіць чорны хлеб і сумуе па ім, трапіўшы туды, дзе яго няма. Так што хлеб у нас жытні, вельмі духмяны. Пякуць яго на подзе,

Спампавана з сайта www.aversev.by

на капусных або кляновых лісцях, а пасля, спырснуты вадою, астывае хлеб пад ручніком, напаўняючы хату найлепшым у свеце пахам. Няма нічога смачней, як адрэзаць гарачую лусту, густа пасаліць яе і з'есці.

Дарэчы, ад хлеба і вылячэнне. У незапамятныя часы беларус заўважыў, што плесня, якая ўтвараецца ў дзежцы на рошчыне летам — у гарачую пару, калі хлеб не пякуць, — загойвае нават раны, ад якіх вось-вось пачнецца гангрэна. Колькі трэба было ісці чалавецтву, пакуль яно вынайшла пеніцылін!

Улетку, калі дарагая хвіліна, елі праснакі (прэсны хлеб). Да белага ставіліся ў даўніну крыху недаверліва, «нэндза[1] прымусіць калачы есці» (г. зн. не здолеў пракарміцца з зямлі, пайшоў у горад на заробкі — апошняя справа! — а там, ясна ж, калачы). Але пірагі заўсёды любілі. З яблыкамі і ўвогуле з садавінай, з чарніцамі, кручаны з макам (струцаль). Калі пяклі іх, то рэшткі цеста раздавалі дзецям, каб кожны спёк сабе хаця б па маленькай булачцы, сваёй. І, як паўсюль у славян, існаваў «зайцаў хлеб», што бацька прыносіць з лесу ці з дарогі.

Хлеб даставаўся цяжка. Кінуць яго быў смяротны грэх. Выраніўшы, трэба было падняць кавалак, пацалаваць...

Бульба. Другі хлеб. Беларусы ведаюць каля тысячы страў з бульбы. Ад звычайнай, печанай на начлезе, якую так добра выкаціць з прыску, абскрэбці, разламаць і, калі яна яшчэ дыміцца, саліць і, захлынаючыся, глытаць — ад гэтай, печанай, і да «клёцак з душамі» (вялізныя клёцкі з цёртай бульбы, начыненыя мясам), да бульбы, фаршыраванай сушанымі грыбамі і запечанай у гарачай печы. Апісаць усе спосабы немагчыма. Але і проста вараная, з падгарэлымі вяршкамі, высыпаная на абрус на стале, яна — дзіва! Бяры і еш. А да яе сала, салёныя агуркі (з кропам, халодныя) і селядзец (раней бульбу мачалі ў селядцовы расол — лёк). Або зялёны канапляны ці залаты сланечнікавы алей, масла каровіна ці міска кіслага халоднага

[1] *Нэ́ндза* — нуда, цяжкае становішча, туга, тут: нішчымніца, галеча.

Спампавана з сайта www.aversev.by

малака, якое ў маёй мясцовасці падсольваюць. Кепска было раней, калі яшчэ не было бульбы. Тады замест яе былі параная рэпа, бручка ці нешта такое іншае.

! Радзіма бульбы — Паўднёвая Амерыка. Да нас бульба прыйшла з Расіі, яе з'яўленне звязана з імем Пятра I, які ў канцы XVII ст. прыслаў мех бульбы з Галандыі і загадаў яе разводзіць.

У тыя часы ніхто не мог ацаніць вартасць бульбы, яе разглядалі як заморскае дзіва, дэкаратыўную расліну. І многія выкарыстоўвалі ў ежу яе атрутныя плады, якія з'яўляліся замест кветак. Такая недасведчанасць людзей была нават прычынай бунтаў.

Дарэмна нас дражняць бульбаю. Ёсць бульба, ёсць і да бульбы. Я не кажу пра ежу даўніх беларускіх магнатаў, усе гэтыя «ласіныя губы ў падсалоджаным воцаце», «бабровыя хвасты» і іншае. Нават кухарская кніга XIX стагоддзя «Гаспадыня літоўская» (Беларусь тады часта называлі Літвою), кніга для сярэдніх класаў, дае тысячы рэцэптаў дужа складаных страў.

Добра. Ідзём далей. Што ў нас на першае?

Боршч раней у нас варылі досыць рэдка. Галоўнай была «капуста» з кіслай або свежай капусты. Затым ішлі «поліўка» — дужа тлусты гарачы суп, падбоўтаны мукой, «панцак» — пярловы суп з грыбамі. «Булён» — адкуль такая назва — невядома, бо гэта проста бульбяны суп, зашквараны салам, а зусім не французскі «бульён». Лапша з курынымі патрахамі. Супы па сезоне — шчаўе, маладая крапіва з яйкамі. Славуты халаднік з халодным мясам і гуркамі. Малочныя супы і сярод іх «гушча наліваная» — уласна, пшанічная каша, залітая гарачым малаком. І, урэшце, квас, род баршчу з буракоў. У чырвоны празрысты адвар клалі мяса, грыбы і іншае. Словам, як пісаў Я. Колас:

Аздоблен квас быў і грыбамі
(Выключна ўсё баравічкамі)
. . . . . .
Цыбуля, перчык, ліст бабковы —
Ну, не ўясісь, каб я здаровы!

Спампавана з сайта www.aversev.by

Над сваім апетытам беларус заўсёды пасмейваўся (уменне іранізаваць не толькі з кагосьці, але і з самога сябе — адна з самых, па-мойму, вартых рыс беларускага нацыянальнага характару): «Прадаў на рынку кабана, пайшоў закусіць. З'еў тры міскі капусты з боханам хлеба, сала хатняга з фунт. Тут купіў яшчэ тры порцыі смажанай каўбасы ды ўмяў. Пасля бульбы змамоніў міскі тры. Зноў баршчу міску ўбіў з булкай. А пасля як успомніў, што брат у салдатах, то як завязала».

Чуллівы чалавек, праўда? Есці не можа, калі брату цяжка.

...Першай стравы, здаецца, насёрбаліся. Пераходзім да другой. Нават не ведаю, з чаго пачаць. Занадта ўсяго. Ну ясна ж, на другое кашы. Усякія. Робяць у місцы з кашай «калодзеж», наліваюць туды падлівы з мясам і чэрпаюць па краях. «Калодзеж», ясна, шырыцца, і туды даліваюць і даліваюць, аж пакуль не зробіцца адна суцэльная «студня» з мяса. Тады яе дабіваюць лыжкамі і просяць яшчэ.

І яшчэ назаву некалькі назваў без усякай сістэмы. Скажам, калдуны, нешта накшталт вялікіх і доўгіх пельменяў. Ну і, вядома, яешня. Проста яешня «глазуха» і яешня, запечаная з мясам і салам у гаршку, — «верашчака».

Або мачанка з блінамі. Своеасаблівая падліва з мяса, рабрынак і сала, падбоўтаная мукой, у якую «мачаюць» бліны. На поўдні і ў Прыдняпроўі вялікім поспехам карыстаюцца «кіяшы» — вараная маладая кукуруза. На кіяш кладуць кавалак масла і, пакуль не растаў, падсольваюць і ядуць.

Цяпер пра мяса. Беларус згодзен толькі з другой паловай украінскай прыказкі «риба — линина, а м'ясо — свинина». Лін у нас не лічыцца добрай рыбай, засалодкі. Але свініна надзейна займае першае месца. Раней галоўным было сала, прычым асаблівым шыкам было есці «сала на повен рот, а хлеба так толькі, для смаку». Цяпер сала ўсё больш саступае месца летнім і зімнім каўбасам, паляндвіцам і іншаму. Вэнджаную ў хатняй капцільні шынку і так ядуць, і закусваюць, і проста перакус-

Спампавана з сайта www.aversev.by

ваюць, калі раптам перад абедам забурчала ў жываце... Ядуць, вядома, і ялавічыну, і бараніну. Ну і, вядома, птушка займае сваё месца на стале. У азёрных і балотных мясцовасцях, дзе і стрэльбы ёсць, і на рынак не дужа адвязеш, у сезон ядуць усё, аж да качак, запечаных з прыправамі ў гліне. Гэта на паляванні. І рэдка мне даводзілася есці нешта смачнейшае. Дужа смачная таксама качка з бруснічным варэннем, крышанымі бурачкамі і яблыкамі.

І, ясна ж, рыба. З яе таксама ёсць шмат страў, і апісаць іх тут усе няма магчымасці. Толькі пару слоў пра цудоўную юшку, празрыстую, бурштынавую ад тлушчу і ад таго, што цыбулю туды кладуць, зняўшы толькі верхнія сухія жоўтыя лушпайкі. Ніжнія, таксама жоўтыя, але яшчэ жывыя, не здымаюцца. У юшку ідуць прыправы і прысмакі. Часам робіцца юшка «ў дзве ці ў тры рэдзі». Гэта значыць, што спачатку варацца акуні ці яршы, пасля іх вымаюць, і толькі тады ў адвар кладзецца «сапраўдная рыба», рыбцы, ляшчы, сцерлядзь, калі трапіцца.

У ежу ідуць амаль усе гатункі рыб і іхняя ікра (яе некаторыя соляць). Не ядуць толькі ікры мірона, якая часам бывае атрутная. На поўдні ядуць яшчэ і ўюноў, якіх ловяць узімку так: устаўляюць у палонку кошыкі без дна, напханыя сенам. Але паўночней замест уюна часцей ідзе ў ход вугор. Яго вараць у юшцы, часцей вэндзяць. Добрая таксама і сялява, якую смажаць ва ўласным тлушчы.

Ракаў ядуць далёка не ўсюды. Нядаўна, ловячы рыбу з жыхарамі вёскі Церабяжоў на Століншчыне, убачыў на беразе поўна ракаў, дзе жывых, а дзе і высахлых. Выявілася, што, калі выцягваюць нерат, ракаў выкідваюць, «каб не паскудзілі раку».

— Што ж вы робіце? Смакоцце такое!

— Гідка.

Але як наварыў, сабраўшы (цяпер ужо аддавалі мне), і паказаў, што і як, то ўмялі за добрую душу... І так ва многіх мясцінах.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Не гідуйце, але ёсць пара мясцін, дзе арцелі ловяць жаб (не рапух, а зялёных жабак) і маюць з таго добры прыбытак. Яны ідуць за мяжу.

Пра што яшчэ... Ага, малако. І сырое, і кіслае, і смятана, і тварог. Як пісаў у паэме «Новая зямля» Якуб Колас:

Тварог, запраўлены смятанай,
Нясла з вялікаю пашанай.

Ну і, ясна, кісялі, узвары, яблыкі, свежыя, і мочаныя, і проста залітыя вадою з прыправамі, так што зімою як свежыя, але нібыта апушчаныя ў яблычны сок, памідоры і гуркі (узімку салёныя). На поўдні і ў Прыдняпроўі нават вінаград беларускіх гатункаў. Хто мае 20—30 лоз, той часам зберагае яго да вясны, уторкваючы чаранкі кожнай гронкі ў дужа познія грушы, што аж да Каляд цвёрдыя, як кій. Або ўстаўляе чаранок кожнага грона ў бутэльку з разбоўтаным попелам... І п'юць мёд, вядома, калі ён ёсць.

І, ясна ж, суніцы і чарніцы. Чарніцы часта ядуць, заліўшы ў місе малаком. Рот робіцца чорны, як у злоснага сабакі, затое смачна.

Нацыянальныя беларускія напоі — гэта квас і перш за ўсё бярозавік. Сок бярозавы п'юць і свежы, і даўшы яму перабрадзіць і крыху закіснуць. Так ён зберагаецца ў бочцы да жніва, і яго бяруць у поле. Кіславата-салодкі (часам у яго дабаўляюць хатні парэчкавы ці яблычны сок), рэзкі, дужа добры ў спёку... Папулярнасцю карыстаецца крупнік, звараны з мёдам, вострымі прыправамі, травамі і карэннем, а таксама «тройчы дзевяць», лячэбная настойка на дваццаці сямі травах. Рабінаўка, кмяноўка. Я ўжо не кажу аб настоях для лекаў, якіх сотні.

Чаму я апісваю вам гэта? А таму, што ежа розных народаў, як і вопратка, і жыллё, усё больш і больш падпадае стандарту.

І ў Маскве, і ў Кіеве, і ў Мінску, у хаце і ў сталоўцы — амаль паўсюль вы ясце тыя ж самыя катлеты ды біфштэксы, носіце

Спампавана з сайта www.aversev.by

тыповыя вопраткі з падобных матэрыялаў, усё больш забываеце непаўторнасць і адметнасць жыцця той мясціны, адкуль вы родам. А да канца забываць пра гэта нельга.

1. *«Беларус любіць смачна паесці»*. Аргументуйце гэта аўтарскае сцвярджэнне, ужываючы радкі з тэксту.
2. Якая роля адведзена хлебу ў нацыянальнай кухні беларусаў? Як традыцыйна выпякалі хлеб? Назавіце яго лекавыя ўласцівасці.
3. Чаму бульбу называюць другім хлебам? Назавіце прычыну яе папулярнасці. Прыгадайце стравы, якія гатуюцца з бульбы.
4. Выберыце правільны адказ (адзін ці некалькі) на пытанне «Чаму аўтар так падрабязна апісвае стравы нацыянальнай беларускай кухні?».
   - Імкнецца захаваць беларускую кухню як з'яву нацыянальнай культуры, па якой можна меркаваць пра народ, яго звычаі, побыт.
   - Вельмі любіць сваю краіну, яе матэрыяльную і духоўную культуру і хоча, каб чытач яе таксама палюбіў.
   - Спрабуе пераканаць, што ніводная краіна ў свеце не мае такога кулінарнага багацця.
   - Заахвочвае чытача паспытаць з такой любоўю апісаныя стравы, каб захаваць рэцэпты для наступных пакаленняў.
5. Паводле нарыса складзіце спіс (меню) страў для сям'і, якія традыцыйна ўжываліся ў час сенакосу (летам) і ў зімовую пару. Выберыце пераможцу, які, на ваш погляд, максімальна ўлічыў патрэбы сям'і.
6. Раскажыце пра стравы, якія гатуюць у вашай сям'і на святы. Ці ёсць сярод іх прыгаданыя У. Караткевічам?

Каля хаты ў садочку

Паўтару яшчэ раз: многае з таго, аб чым я расказваю ў гэтай частцы кнігі (побыт, этнаграфія, звычаі), прызабыта, сёе-тое адышло, адыходзіць у нябыт, або хаця і моцна зберагаецца, дык толькі ў некаторых мясцінах. Хата, двор, абстаноўка робяцца ўсё больш аднолькавыя. Даўно ўжо сталі звычнымі халадзільнікі,

Спампавана з сайта www.aversev.by

пральныя машыны, матацыклы. Над хатамі — крыжы тэлевізійных антэн. Усё гэта добра і радасна, але часам не шкодзіла б зберагчы частку старой непаўторнасці, часам хочацца бачыць старыя хаты хаця б у музеі пад адкрытым небам, часам на хвіліну абуджаецца сум, і хочацца ўпрыгожыць хату непаўторным старым ручніком або даматканай посцілкай.

Т. Чарных. Бэз

Ну вось. Хату пакінулі. Цяпер — двор. Да самой хаты прымыкае чысты двор, абсаджаны дрэвамі. Часцей за ўсё гэта вішні, слівы, арабіна. Часам тут жа, ля плота, узвышаюцца адна-дзве бярозы ці ліпа. Сам двор парос травою, пахучымі дробнымі рамонкамі, вясною — залатымі манетамі дзьмухаўцоў. Менавіта на чыстым двары пераважна размяшчаецца «склеп», або (на поўдні) «лёх». (Другі склеп, у якім частка запасаў заўсёды пад рукой, каб не бегаць кожны раз на двор, — у самой хаце ці ў сенцах, пад падлогай.) У склепе бульба, гародніна, бочкі з капустай, гуркамі, мочанымі яблыкамі, дзежачка з грыбамі і тоўчанай ягадай, а калі гаспадар рыбак, то, можа, і з салёнай рыбай.

Далей ідзе двор задні, для жывёлы. Яго абкружаюць хлявы, у якіх стаіць жывёла. Тут жа павець, або дрывотня, — крытае памяшканне, з трох бакоў запушчанае сценкамі. Тут складзены дровы, раней стаялі вазы, санкі, плугі, а цяпер абгоннік, каб, узяўшы ў калгасе каня, абагнаць бульбу.

Замыкаецца двор вялікаю клуняю (свірнам). У стараннага чалавека ёсць яшчэ капцільня.

Раней пры кожнай хаце на задворках было гумно, а то і два, з «ёўняю» (сушыльняй) — земляным, гладка ўбітым токам.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Адсюль вымалачаны хлеб ішоў у засекі клуні. Гумно было нібы сімвалам гадавой працы селяніна. І я ўспамінаю адзін з самых сумных і, аднак, самых аптымістычных беларускіх анекдотаў.

Згарэла гумно, поўнае снапоў. Згарэла праца за цэлы год. Гаспадар стаіць на папялішчы і бядуе: «Ой, і пагарэў ты, Яўхім! Вой, і пагарэў жа!! Ну й пагарэў!!! — і раптам: — Але ж затое і мышэй ляснула!!!»

Многа ляснула мышэй!.. Яшчэ адна рыса характару. Самасуцяшэнне, спалучанае з гумарам і стойкасцю. Знаходзіць выхад, хай маральны, з самага, здавалася б, безнадзейнага становішча.

Пры калектыўнай гаспадарцы патрэба ў гумнах адпала, і яны яшчэ толькі сям-там дажываюць на задворках свой век.

...Затое значна павялічылася колькасць лазняў. Іх і раней было нямала, а цяпер там, дзе няма агульнавясковай лазні, такія ёсць ледзь не ў кожным двары або, калі суседзі жывуць добра, на чатыры-пяць двароў.

Па́ры на каменку часта паддаюць разведзеным бярозавікам, квасам або вадою, у якой распарана мята ці іншыя пахучыя травы.

Парацца да знемажэння, а пасля бягуць акунацца ў рэчку або качаюцца ў снезе.

За двароам гарод і сад.

Садоў намнога пабольшала за апошнія дзесяцігоддзі. Акрамя агульных гатункаў, ёсць і свае, мясцовыя. Па-першае, лепшая ў свеце антонаўка, вялізная, жоўта-празрыстая. Ідзеш восенню садам, убачыш забыты яблык, адкусіш ад яго, халоднага, укрытага сцюдзёнай расою, — нібы дзесяць год скінеш з плячэй. Ну і потым такія славутыя грушы, як слуцкая бэра, ур'янтоўка, сапяжанка. Або духмяная лошыцкая вішня, што выспявае ў чэрвені.

Над гародам і садам — сонца. Віецца матавы гарох, пахне кропам і каноплямі, матылямі чырванее на градах мак, гудуць, вылятаючы з вулляў, пчолы. Лапушацца вялізныя, на чырвона-зялёных ножках-сцяблінках, лісты рэвеню, «беларускага

Спампавана з сайта www.aversev.by

апельсіна». А ўначы, калі ляжаш на посцілцы пад дрэвам, часам чуеш, як глуха, нібы гіры, падаюць на дах антонаўкі і бубняць, ракочуць, скочваючыся па ім.

На ўскраіне вёскі вадзяны млын. Уздыхае, ходзячы, кола, зелянеюць тванню латкі. У люстры сажалкі адбіваецца жоўтая вячэрняя зара і цені соснаў на тым беразе. Ластаўкі часам чапляюць крылом ваду, брохае рыба. Вечарамі на вадзяным млыне неяк таямніча і крыху трывожна. Нездарма млынароў некалі лічылі ведзьмакамі.

Ветракі ў нас досыць рэдкая рэч, хіба на Случчыне і пад Клецкам. Мне здаралася бачыць там стапяцідзесяцігадовыя ветракі, у механізме якіх не было ніводнай металічнай часткі. Усё дрэва. І ясна ж, цяпер не ім належыць першае месца ў пачэснай хлебнай справе. Элеватары, паравыя млыны, млынзаводы — куды ўжо цягацца з імі?!

1. Прыгадайце назвы сядзібных забудоў і патлумачце іх прызначэнне.
2. *За многія стагоддзі свайго існавання беларускі народ стварыў багатую і самабытную культуру, якая была ўвасоблена ў народным жыллі і бытавых рэчах. Захаваць гэтае багацце — задача, якая стаіць перад кожным з нас.* Якімі радкамі пісьменнік выказвае гэту думку? Знайдзіце іх і зачытайце.
3. Падзяліцеся на групы. Адна з груп выступіць у ролі садоўнікаў і паспрабуе пасадзіць сад з уласцівымі для беларусаў гатункамі яблынь, груш, вішань, а таксама засадзіць агарод. Другая — падрыхтуе апісанне традыцыйнага выгляду беларускага двара (чыстага) з яго забудовамі; двара для жывёл. Выкарыстайце рэпрадукцыю карціны Таццяны Чарных «Бэз».
4. Чаму неабходна захоўваць этнаграфічную спадчыну? Назавіце вядомыя вам музеі народнай культуры і раскажыце пра іх. Ці ажыццяўляецца мара У. Караткевіча пра неабходнасць захавання *«старой непаўторнасці»*?

Спампавана з сайта www.aversev.by

Людзі зямлі беларускай

Ці думалі вы самі пра беларусаў не як пра сваіх бацькоў, братоў і сёстраў, сяброў або аднавяскоўцаў, а як увогуле пра людзей з асобным характарам, як пра народ з аднолькавай мовай, мінулым, сучасным і будучым?

Ці задумваліся, які ён, беларус? Ну, па-першае, жывуць у Беларусі рускія (іх найбольш у гарадах), літоўцы (іхнія вёскі ёсць у Астравецкім і Радунскім раёнах), яўрэі, латышы (сям-там на паўночным захадзе Віцебшчыны), украінцы (у некаторых вёсках на поўдзень ад Гомеля і невялікімі гнёздамі на Піншчыне і Століншчыне). Акрамя таго, добра ведаючы побыт, дыялектныя асаблівасці мовы, песню Палесся, я асабіста выдзеліў бы палешукоў у асобную этнічную групу. Занадта асобны, непадобны іхні фальклор, побыт, нават склад розуму. Ну, ладна, гэта справа вучоных, а не наша.

Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Міколы Назарчука «Аднавяскоўцы» (гл. уклейку). Якімі паказаў мастак сваіх землякоў? Ці ёсць на мастацкім палатне нешта агульнае з апісаннем беларусаў У. Караткевічам? Зачытайце адпаведныя радкі з твора.

Ёсць на Беларусі татары. З тых, што калісьці ўзялі ў палон пры Батыі і пасля, падчас набегаў пры Вітаўце, і пасялілі асобнымі пасяленнямі на тэрыторыі краіны. Да нядаўняга часу яны адрозніваліся толькі рэлігіяй... ды часам імёнамі і прозвішчамі, у якіх, бывала, толькі з цяжкасцю можна было ўлавіць намёк на іхняе паходжанне. Скажам, Ян Мустафавіч Марушкевіч або Іван Багданавіч Асановіч (ад імя «Асан», «Гасан»). Нават іхні этнічны тып стаў падобны на беларускі. Нават свяшчэнныя іхнія кнігі «Аль-кітабы» гучаць на старой беларускай мове, хаця і запісаны арабскімі літарамі.

Склад насельніцтва нашай рэспублікі досыць аднастайны. Беларусаў тут 81 працэнт. Ды, акрамя таго, у апошні перапіс беларускую мову назвалі ў якасці роднай 328 тыс. чалавек іншых

Спампавана з сайта www.aversev.by

нацыянальнасцей, а 606 тыс. чалавек назвалі беларускую мову ў якасці другой мовы, якой вольна валодаюць.[1]

...Што гэта за чалавек беларус? Што гэта за народ? Уласна кажучы, адказаць на гэта пытанне дужа цяжка. Гэта задача амаль невырашальная. Як і паўсюль, ёсць сярод беларусаў мяшчане і падзвіжнікі, лайдакі і працаўнікі, «малюскі» і героі (нават у штодзённым змаганні за новае, за лепшае, за вынашаныя ідэі, што, уласна кажучы, і называецца жыццём), дурні і мудрацы. І кожны паступае адпаведна свайму характару, і мудрыя разважаюць мудра і па-свойму, а дурні — як паўсюль.

Так што не трэба абагульненняў.

Чарнявых сярод беларусаў няшмат. Найчасцей яны сустракаюцца ў Палессі, на поўдзень ад Прыпяці і чамусьці пераважна сярод мужчын, ды яшчэ ў некаторых мясцінах на Гродзеншчыне («гродзенцы — гракі»), што частка вучоных тлумачыць рэшткамі прымесі старажытнай яцвяжскай крыві. Пераважаюць на Беларусі валасы светла-русыя ці нават бялявыя. Цёмна-русых і шатэнаў менш. Адпаведна і колер вачэй часцей за ўсё блакітны, шэры ці сіні.

Рысы аблічча мяккія, склад здаецца, на першы позірк, крыху далікатным, але гэтая далікатнасць падманвае. Праявы знешняй сілы, якая ўразіць на хвіліну дый звяне, замяняе тут вынослівасць, жылаватасць, цягавітасць. Там, дзе другі можа апусціць рукі, беларус будзе цягнуць. Іначай у старыя часы чалавек проста не выжыў бы сярод гэтых дрымучых лясоў і неабсяжных балот, на гэтай скупаватай зямлі. І гарт той застаўся ў яго характары на вякі. Нездарма яшчэ ў даўніну беларусы лічыліся незаменнымі на такіх цяжкіх работах, як земляныя (грабарства) і лесасплаўныя. Ды і пазней гэта праяўлялася. Напрыклад, у нясцерпна цяжкіх сітуацыях на вайне і ў партызаншчыне.

Хаця, вядома, сустракаюцца і такія «зубры», што падковы гнуць, сталёвыя пруты звіваюць на руках у другога...

---

[1] Зараз лічбы іншыя, аўтар расказвае пра свой час.

Спампавана з сайта www.aversev.by

...Зямляк наш вызначаецца і ўтрапёнай любоўю да працы. Я нават сказаў бы: валовай упартасцю ў ёй. Гэта таксама добра тлумачыцца. Скупая зямля ой як нялёгка давала хлеб. Для новага поля даводзілася (а часам і зараз даводзіцца) карчаваць «ляду». Сячы лес, выдзіраць з зямлі карчы, зносіць на межы камяні.

Упартасць гэтая ва ўсім. У досыць бязлеснай мясцовасці пад Карэлічамі жанчына надумала сама, адна насадзіць цэлы лес. І насадзіла.

Адусюль цягала саджанцы бярозы, дубу, клёну. Старалася некалькі год.

Цяпер на гэтым месцы шуміць густы, досыць ужо высокі, паверхі на чатыры, лес.

Тая самая няшчодрая зямля прывучыла калісьці беларуса да разліку ў вядзенні гаспадаркі, да ашчаднасці, да таго, што «нішто не прападае», усё ідзе ў справу, нават падабраны цвік, нават лясіна ці калода, прыплаўленая ракой, і, аднак, дужа памыліўся б той, хто назваў бы яго скупым.

Беларус якраз адрозніваецца шчодрасцю, заўсёднай гатоўнасцю прыйсці на дапамогу ў бядзе. Калі раней у каго на вёсцы здараўся пажар — вёска талакою ішла красці панскі лес, калі не было свайго, за пару дзён ставіла пагарэльцу новую хату, дзялілася з ім жытам: кожны адсыпаў са сваіх засекаў колькі мог, каб чалавек дажыў да вясны і абсеяўся. Потым з кожнай хаты неслі рэчы: хто посцілку, хто падушку, хто палатно, хто гаршкі. Памагалі рабіць тыя рэчы, што селянін звычайна рабіў сам: хадакі, лыжкі, балеі і г. д. Гэта не таму, што былі такія ўжо добрыя. Без гэтага было не выжыць. Дужа добра сказаў пра гэта адзін з лепшых нашых паэтаў, вялікі Максім Багдановіч:

Зноў змяшай муку з карой таўчонай,
Бо памерзла ніва у суседа.

Раней падчас голаду іншым разам людзі з больш багатых мясцін прыходзілі на Беларусь за дапамогай (у нас вымачыць

Спампавана з сайта www.aversev.by

дажджамі жыта — уродзіцца бульба на пяску і авёс, не будзе бульбы — будуць грыбы, рыба, не будзе й таго — паляванне выручыць): сапраўднага голаду не бывала, калі не вымятала ўсяго вайна або ліхі пан ці чыноўнік, дый то заўсёды ўмелі людзі выкруціцца, прыхаваць, скамбінаваць — на гэтыя выпадкі яна і была, беларуская ашчаднасць. То вось я, прынамсі, не чуў, каб галадаючага адпусцілі з хаты з пустымі рукамі.

Часам праходзіла нейкай вёскай па пяцьдзясят на дзень і не бывала так, каб кожнаму не далі хаця вядзерца бульбы, хаця лусты хлеба ці жмені гароху і не пакармілі. Сабе пакідалі толькі, каб самім пратрымацца да вясны, да шчаўя, маладой крапівы, да першай рыбы, да «грыба бедных», майскага смаржка.

Гэта ў час бяды. Але і ў звычайныя добрыя часы ўсе, хто прыязджае да нас, адзначаюць як адну з галоўных рыс — гасціннасць, почасту досыць цяжкую для госця. ...І ганьба таму дому, дзе не зробяць усяго, нават немагчымага, каб госць быў задаволены. «Белорус отличается гостеприимством, склонностью к веселию и доверчивостью, хотя её можно и не сразу снискать. Отсутствие злопамятности в белорусе резко бросается в глаза всякому, кто с ним сталкивается. Вообще он обладает кроткой натурой».

На гэтую «рахманасць натуры» часта разлічваў вораг нашай зямлі. Ворагі, бо іх за нашу гісторыю бывала досыць. Адзін з членаў нацысцкага ўрада так проста і пісаў, што беларусы як народ інертны і мяккі, добры, бязвольны і рахманы павінны быць вынішчаны або выселены раней за ўсіх і што гэта будзе досыць лёгкай акцыяй, бо на якое-небудзь больш-менш арганізаванае і зацятае супраціўленне разлічваць не даводзіцца. Тут ён трохі-трохі памыліўся, крыху недаацаніў рахманага чалавека, які за гады акупацыі забіў цэлую кучу людзей дзейных, прадпрымальных, цвёрдых, жорсткіх, валявых і здатных на ўсё, апранутых у ваенныя мундзіры, у мундзіры СС, фельджандармерыі і гэтак далей, узброеных бязмерна лепшай зброяй. Сярод гэтых «лю-

Спампавана з сайта www.aversev.by

дзей, якія пройдуць паўсюль», было 47 генералаў, шмат вышэйшых чыноў адміністрацыі, нават гаўляйтар Беларусі. Я скажу аб гэтым у другім месцы, а тут дабаўлю толькі, што «інертны» і «бязвольны» мясцовы чалавек пусціў пад адхон 11 128 саставаў з надпісам «Deutsche Reichsbahn»[1]. Так што рахманасць беларуса таксама да пары да часу. Пяройдзеш мяжу — і тваім ворагам будзе страшны чалавек. Страшны асабліва тады, калі гнеў яго спакойны і разлічаны.

Галоўнае ў нашым характары — гасціннасць добрага да добрых.

Так, многія старыя гасцінныя звычаі пакрысе выміраюць, гарадскі чалавек можа часам не ведаць чалавека з суседняга пад'езда, але і цяпер у нас рэдка знойдзецца хата, у якой не паставілі б рубам апошняга рубля, калі ў доме госць. Часам гэта бывае нават смешна, і беларус кпіць са сваёй «празмернай» гасціннасці досыць злосна: «Госць, як нявольнік: ляжа, хоць і ў пярыну паложаць», «Добра было ў гасцях, толькі прынукі не было» (не прымушалі настойліва, ледзь не сілком, піць і есці, а сам саромеўся), «Госць сядзе, куды скажуць, хоць на покуць, а гаспадар, як скула, дзе захоча, там і сядзе», «Пры мілым госцю і гаспадар пажывіцца», «Ноч якая месячная! Каб быў госцем, даўно б дахаты пайшоў», «Госць першы тыдзень — золата, другі — серабро, а трэці — медзь, хоць і дадому едзь...».

Гэта, урэшце, жарты. Гасціна ёсць гасціна.

Уласціва нашым людзям знаходлівасць, нават некаторая хітрасць. Вось першы прыклад, які прыйшоў мне ў галаву. Падчас паўстання 1863—1864 гг. за невялічкім атрадам, коннікаў на 40, зраненым, выматленым у баях, знемагаючым — гналася карная ўрадавая часць у 200 шабляў. Дзяліла іх гадзіна адлегласці. Камандзір зразумеў: не ўцячы. Будзе няроўны

[1] Deutsche Reichsbahn — германская імперская чыгунка пасля Першай сусветнай вайны.

Спампавана з сайта www.aversev.by

бой, смерць у ім, а параненым — шыбеніца. І тады ён свядома скараціў гэтую гадзіну. Спыніў атрад у лесе непадалёк ад карчмы, прывязаў коней, загадаўшы аднаму паўстанцу рабіць так, каб тыя зрэдку гігаталі. Астатнія пайшлі ў карчму, узялі ў карчмара ўсе вёдры «паіць коней» і пачалі цягаць ваду са студні ў лес. За палову гадзіны перанеслі каля трохсот вёдраў і вылілі ваду пад дрэвы. Пасля пайшлі далей. Знясіленыя паўстанцы бурчалі на свайго камандзіра, але той ведаў людзей і ведаў, што робіць...

Карная частка спынілася ля карчмы. Афіцэр спытаў, ці не было тут «мяцежнікаў».

— Былі, паночку, коней паілі.

Ужо гэта было нязвыкла: паіць коней, калі табе наступаюць на пяты. Значыць, не баяцца.

— Доўга паілі?

— Доўга. Трыста вёдраў аднеслі ў лес. Арыфметыка была простая. Вядро на каня, бо рабілася ўсё ж наспех. Значыць, трыста шабляў, стрэльбаў або нават і проста кос. Афіцэр адмовіўся ад пагоні.

Іх аддзяляла тады ад паўстанцаў дзве вярсты, бо коні тых ледзь ішлі... Атрад уліўся ў большы і доўга яшчэ мужна ваяваў.

Беларус — вялікі аматар пажартаваць з суседа, але яшчэ больш з самога сябе. Ён назіральны і таму падмячае тыповыя рысы характару людзей.

...Па агульным назіранні, беларусам прыродна ўласцівая павага да іншых народаў і памяркоўнасць да таго, хто думае інакшай. Бываюць, вядома, сумныя выключэнні, але гэта сапраўды толькі выключэнні.

Рэаліст у рэальным жыцці, беларус вялікі фантаст, рамантык і летуценнік у марах. Ясна, што цяпер ужо ніхто не верыць у вадзянікоў, лесуноў, лазнікаў і ўсё такое іншае, але раней верылі. І расказвалі такія рэчы ў чоўне на рыбалцы або на начлезе ля вогнішча, што дыбарам уставалі валасы. І пра ваўкалакаў-

Спампавана з сайта www.aversev.by

абертняў, што бегаюць з ваўкамі, і пра тое, як на Дзяды (дзень памінання продкаў) можна ўбачыць усіх продкаў, аж да Адама, калі два дні не есці і не гаварыць з людзьмі (іронія, праўда, ёсць і тут, бо адзін бачыў іх і, у прыватнасці, свайго «святога жыцця нябожчыка-дзядзьку», які лез праз трубу, а яго не пускала ўкрадзеная пры жыцці барана — «і папу не выспавядаўся», — то пляменнік зарагатаў — і ўсё, яны зніклі).

Менавіта таму запісаныя фалькларыстамі беларускія казкі не ўлезлі б і ў сотню тамоў. І прычым такія казкі, якія почасту не маюць адпаведных сюжэтаў у суседзяў. Вось, напрыклад, адна, што адказвае на пытанне, чаму верабей скача адразу дзвюма нагамі, чаму ў савы рознакаляровае пер'е і чаму ледзь толькі птушкі ўбачаць тую саву, дык адразу навальваюцца на яе ўсёй хеўрай і тое пер'е з яе скубуць.

Праштрафіўся верабей. Усе птушкі пагналіся за ім і загналі ў дупло. Але той быў такі хітры, што выбраў дзірку ў дупле якраз па сабе: большы за яго не ўлезе, а меншы калі ўлезе — ён яго выкіне. Вырашылі браць яго, як моцную крэпасць, на змор. Чакалі-чакалі, аж настала ноч, і ўсе захацелі спаць. Каго пакінуць на варце? Ясна каго, саву. Яна ўначы не спіць. А сава была ў той час голая, як абшчыканая курыца. Ну і паставіла сваю ўмову: «Усе ў пер'ях, то чаго я маю голая хадзіць? Скідайцеся па перыйку». Ну, усе і скінуліся. Адзін шэрае пер'е даў, другі — рудое, трэці — белае ці карычневае. Стала сава як і ўсе, толькі што пер'е дужа рознае. Сядзела яна ўсю ноч, сядзела. А раніцай птушкі заспалі, і яна, начная істота, пачала куняць. Верабей вылез і ўцёк... Урэшце яго ўсё ж спаймалі. І ў знак пакарання звязалі ногі. Вось ён цяпер і скача адразу дзвюма. А птушкі як толькі ўбачаць саву, дык адразу кожная сваё пяро дзярэ з яе. З гвалтам: «Аддай мае перыйкі, бо няма чаго было браць, калі ўсцерагчы не магла».

...Гэта казка жартоўная, а ёсць тысячы фантастычных. Як змей абвіўся вакол горада, як хадзіў па свеце каток — залаты

Спампавана з сайта www.aversev.by

лабок, як хітры селянін абпаіў півам чорта і адабраў у яго душы добрых людзей, як зачараваны змяіны кароль пакахаў дзяўчыну... Усіх казак не назавеш, не пералічыш. Іх — безліч! Яны і дагэтуль складаюць неацэнны наш скарб, тым больш вялікі, што яны былі народу замест кнігі ў тыя часы, калі кніга беларуская і нават мова беларуская былі забаронены. Тады толькі казка вяла дзяцей у далёкі край, «за сем гор і мораў, трошкі бліжэй ад сонца і трошкі далей ад месяца».

1. Над якімі пытаннямі прапануе задумацца пісьменнік, калі расказвае пра людзей зямлі беларускай?
2. Да адзначаных аўтарам рыс характару беларусаў прывядзіце прыклады з тэксту.
   - Беларус адрозніваецца шчодрасцю, заўсёднай гатоўнасцю прыйсці на дапамогу ў бядзе.
   - Вызначаецца народ утрапёнай любоўю да працы, нават валовай упартасцю ў ёй.
   - Разлік і ашчаднасць уласцівыя характару беларуса.
   - Выдзяляецца беларус і сваёй цярплівасцю, але неабходна адзначыць, што гэта да пары да часу.
   - Адной з галоўных рыс у характары беларуса з'яўляецца гасціннасць да добрых людзей.
   - Уласціва нашым людзям знаходлівасць, нават некаторая хітрасць.
   - Беларус — вялікі аматар пажартаваць з суседа, але яшчэ больш — з самога сябе.
   - Самасуцяшэнне ў спалучэнні з гумарам і стойкасцю, здольнасць знайсці выйсце, хаця б маральнае, з самага безнадзейнага становішча вызначаюць характар беларуса.
   - Беларусам прыродна ўласцівая павага да іншых народаў і памяркоўнасць да таго, хто думае інакш.
   - Рэаліст у жыцці, беларус — вялікі фантаст, рамантык і летуценнік у марах.
3. Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Віталія Цвіркі «На зямлі беларускай» (гл. уклейку). Якім убачыў мастак людзей зямлі беларускай?

Спампавана з сайта www.aversev.by

Пытанні да твора

1. Якія з прачытаных нарысаў твора Уладзіміра Караткевіча «Зямля пад белымі крыламі» вам найбольш спадабаліся? Чым могуць ганарыцца беларусы?
2. Да якога віду прозы (мастацкай, публіцыстычнай, навукова-папулярнай, дакументальнай) можа быць аднесены гэты твор?
3. Што такое нарыс? Чым ён адрозніваецца ад мастацкіх празаічных твораў (апавядання або аповесці) ці вершаў (параўнайце з вершам «Хлеб роднай мовы» Міколы Арочкі)?
4. Чаму пісьменнік характарызуе твор як этнаграфічны? Аргументуйце свой адказ.
5. Зачытайце прыказкі, якія выкарыстоўвае аўтар, характарызуючы жыццё беларусаў. Прывядзіце іншыя прыклады блізкіх па сэнсе трапных выслоўяў.
6. На аснове нарыса Уладзіміра Караткевіча «Зямля пад белымі крыламі» падрыхтуйце вуснае паведамленне на тэму «Людзі зямлі беларускай». Звярніцеся таксама да рэпрадукцыі карціны Міколы Назарчука «Аднавяскоўцы» (гл. уклейку), прыгадайце вывучаныя вершы, працытаваўшы іх асобныя радкі. Выкарыстайце інфармацыю, атрыманую пры наведванні вамі беларускіх этнаграфічных і мастацкіх музеяў.
7. Разгадайце крыжаванку па творы Уладзіміра Караткевіча «Зямля пад белымі крыламі».
8. Як змянілася ваша ўяўленне пра беларуса, пра ўвесь наш народ, пра яго матэрыяльную і духоўную культуру пасля знаёмства з творам «Зямля пад белымі крыламі»? Абгрунтуйце вашу думку.
9. Беларусь як суверэнная краіна з багатай гістарычнай і культурнай спадчынай выклікае цікавасць у жыхароў усяго свету. Замежныя турысты мала знаёмыя з нашай краінай. Складзіце спіс турыстычных аб’ектаў, якія б вы параілі наведаць гасцям Беларусі. Звярніцеся да інтэрнэт-рэсурсаў, каб пашырыць уласны досвед пра багатую спадчыну і сучасныя дасягненні нашай краіны.

Спампавана з сайта www.aversev.by

НА СУМЕЖЖЫ З НАВУКАЙ

У мастацкай літаратуры блізкія сувязі і з літаратурай навуковай. Вы, напэўна, чулі пра навукова-фантастычныя раманы, гістарычныя аповесці. Гэта якраз і ёсць творы, якія ўзнікаюць на сумежжы мастацкай літаратуры і навукі.

Асаблівасці адлюстравання жыцця ў мастацкай і навуковай літаратуры. Мастацкая і навуковая літаратура — розныя па спосабе адлюстравання, пазнання жыцця. Мастацкая літаратура пазнае чалавека ў свеце праз вобразы і эмоцыі, навуковая — праз вымярэнні і эксперыменты.

Навуковая літаратура строга прытрымліваецца дакладных фактаў, грунтуецца на дакументальным матэрыяле. Мастацкая літаратура паказвае жыццё праз карціны, створаныя пры дапамозе вымыслу, фантазіі.

! Старажытнагрэчаскі вучоны Арыстоцель, які жыў больш за дзве тысячы гадоў таму, гаварыў, што розніца паміж гісторыяй (навукай) і мастацкай літаратурай у тым, што гісторыя расказвае пра тое, што адбылося, а літаратура пра тое, што магло адбыцца.

Пісьменнік таксама можа звяртацца да сапраўдных гістарычных падзей і герояў, але і ў гэтым выпадку ён не абавязкова прытрымліваецца дакладнай перадачы фактаў. Побач з гістарычнымі асобамі паказвае герояў, створаных толькі фантазіяй. Пісьменнік мае права даць волю сваім пачуццям, эмоцыям. Гісторык жа павінен гаварыць доказна, аб'ектыўна. Мастацкая літаратура шырока выкарыстоўвае вобразна-выяўленчыя сродкі — яркія метафары, эпітэты, эмацыянальныя звароты. У навуковым творы гэтыя сродкі сустракаюцца надзвычай рэдка. Мастацкая літаратура, асабліва мастацкая проза, паказвае жыццё ва ўсёй яго паўнаце і разнастайнасці, з падрабязнасцямі, навуковая — перадае галоўны сэнс падзей і з'яў.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Каб зразумець гэтыя асаблівасці, разгледзім творы (або ўрыўкі з твораў), у якіх расказваецца пра адны і тыя ж падзеі з далёкага мінулага нашай Радзімы, пра барацьбу нашых продкаў з нямецкімі заваёўнікамі — крыжакамі, што вялася пад кіраўніцтвам полацкага князя Вячкі (Вячаслава).

Першы тэкст узяты з вучэбнага дапаможніка па гісторыі Беларусі. Следам ідуць два мастацкія творы — празаічны ўрывак з рамана Леаніда Дайнекі «Меч князя Вячкі» і паэтычны твор «Балада пра Вячку, князя людзей простых» Уладзіміра Караткевіча.

ЗНЕШНЯЯ НЕБЯСПЕКА Ў ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIII ст.

(З вучэбнага дапаможніка па гісторыі Беларусі)

У канцы XII ст. у Еўропе заставалася зусім мала абласцей, якія яшчэ не ўвайшлі ў склад дзяржаў. Амаль уся тэрыторыя Заходняй Еўропы была падзелена паміж феадальнымі ўладальнікамі. Выключэннем была Усходняя Прыбалтыка. Тут жылі язычніцкія плямёны ліваў, эстаў (чудзі).

У канцы XII ст. у вусці Заходняй Дзвіны з'явіліся першыя германскія місіянеры. Гэта былі шчырыя вернікі, што прысвяцілі сваё жыццё пашырэнню хрысціянства. Аднак за імі пачалі прыходзіць іншыя, прагныя да багацця людзі. Для іх «выратаванне душ» язычнікаў служыла толькі спосабам усталявання ўласнага панавання.

Землі сучасных Латвіі і Эстоніі атрымалі гістарычную назву Лівонія — ад наймення плямёнаў ліваў. У 1201 г. брэменскі місіянер Альберт, які быў прызначаны лівонскім біскупам, з дапамогай нямецкіх рыцараў заснаваў у вусці Заходняй Дзвіны крэпасць Рыгу[1]. У 1202 г. тут быў створаны ваенна-манаскі ордэн мечаносцаў (ордэн братоў мяча). Яму даручылі дапамагаць

[1] *Ры́га* — зараз сталіца Латвіі.

Спампавана з сайта www.aversev.by

біскупу ў хрышчэнні мясцовых плямёнаў. А на іх землях рыцары планавалі ўтварыць феадальную гаспадарку, у якой падпарадкаванае насельніцтва мусіла служыць ордэну.

Планы нямецкіх місіянераў не адпавядалі інтарэсам Полацкага княства. Спачатку князь не ўбачыў небяспекі ў іх дзейнасці, дазволіўшы «несці крыж» да язычнікаў. Хутка за місіянерамі з'явіліся і рыцары — крыжакі, якіх рымскі папа заклікаў да крыжовага паходу ў Прыбалтыку. Яго ўдзельнікам даравалі грахі, а заваяваныя землі дазвалялі атрымаць ва ўласнасць. Крыжакі сілай зброі, прымусам распаўсюджвалі хрысціянства і лічылі, што робяць добрую справу.

Амаль кожны год рыцары нападалі на безабаронныя паселішчы язычніцкіх плямёнаў. Здараліся і паражэнні, калі даведзеныя да крайнасці прыбалты падымалі паўстанні.

Але рыцары хутка аднаўлялі сілы. З Заходняй Еўропы да іх прыходзілі новыя «змагары за веру». Каб замацавацца ў новых месцах, крыжакі хутка будавалі невялікія мураваныя замкі-крэпасці. Замкі былі апорнымі пунктамі для далейшага прасоўвання на ўсход і падпарадкавання чужых зямель.

Задоўга да з'яўлення ў Прыбалтыцы крыжакоў мясцовыя плямёны выплачвалі даніну Полацку. Магчыма, менавіта ў пунктах збору даніны ўзніклі гарады Герцыке і Кукенойс[1]. Яны сталі цэнтрамі асобных княстваў у складзе Полацкай зямлі. Герцыке і Кукенойс стаялі на беразе ракі Заходняя Дзвіна, на шляху крыжацкіх заваяванняў. Іх князі змагаліся з нямецкім націскам, пакуль мелі сілы. Але рыцары аказаліся мацнейшымі...

У больш моцным Герцыкскім княстве валадарыў князь Усевалад. Як піша нямецкая хроніка, ён быў сынам «караля Полацка». У барацьбе з крыжакамі Усеваладу дапамагалі літоўцы...

У Кукейносе ў пачатку XIII ст. кіраваў князь Вячка (Вячаслаў). У яго, наадварот, склаліся вельмі дрэнныя адносіны з літоўцамі. У барацьбе з імі князь нават быў гатовы карыстацца

[1] Назва ўжываецца ў дзвюх формах: Кукенойс, Кукейнос.

Спампавана з сайта www.aversev.by

дапамогай крыжакоў. Рыжскаму біскупу Вячка аддаў палову сваіх зямель, але хутка зразумеў, што крыжакі — дрэнныя саюзнікі. У 1208 г. ён знішчыў рыцараў, якія знаходзіліся ў яго горадзе. Вячка папрасіў дапамогі ў полацкага князя Уладзіміра, але, не дачакаўшыся яе, спаліў свой горад і адышоў у Вялікі Ноўгарад. Наўгародскі князь даручыў Вячку абараняць горад Юр'еў (цяпер — Тарту) і землі эстаў ад нямецкіх рыцараў. Падчас аблогі рыцарамі Юр'ева ў 1224 г. Вячка сярод апошніх абаронцаў загінуў.

1. Калі адбываюцца падзеі, пра якія расказваецца ў тэксце?
2. Чым адрозніваецца гэты тэкст ад мастацкіх твораў?
   - Ці ўжываюцца ў ім мастацкія, маляўнічыя выразы — параўнанні, метафары, іншыя вобразныя выказванні і сродкі?
   - Ці можна назваць эпітэтамі ўжытыя ў тэксце азначэнні: *безабаронныя паселішчы, крыжовы паход, шчырыя вернікі, язычніцкія плямёны, ваенна-манаскі ордэн, мураваныя замкі-крэпасці, дрэнныя саюзнікі*? Якая розніца паміж эпітэтам і азначэннем?
3. Як расказваецца ў гэтым урыўку пра падзеі далёкага мінулага: вельмі падрабязна, з ужываннем канкрэтных дэталей, заўваг, штрыхоў ці змест тых падзей перадаецца ў агульным плане?

Леанід Дайнека

МЕЧ КНЯЗЯ ВЯЧКІ

(Урывак з рамана)

Над Кукейносам загаралася вясновая раніца. Той, хто не спаў у гэты час (а не спалі воі-дазорцы на забаролах[1]), бачыў, як паступова цёмнае неба на ўсходзе напаўняецца кропелькамі, камячкамі святла. Спачатку гэта можна было палічыць падманам зроку, мігценнем у вачах, якое з'яўляецца пасля бяссоннай

[1] *Забаро́лы* — умацаванні вакол крэпасці.

Спампавана з сайта www.aversev.by

ночы, калі доўга і напружана ўзіраешся ў цемру. Ды край неба ўсё болей ружавеў, наліваўся трапяткой залацістасцю колеру спелых ячменных каласоў. Выступалі са змроку лясы. Ноччу яны палохалі, здаваліся велізарным чорным войскам, якое з усіх бакоў маўкліва падкрадваецца, падпаўзае да гарадскога вала. Але першы прамень зары ўпаў на макаўку старой сасны, аж засвяціліся, запалалі дробныя галінкі, потым разбудзіў маленькую сіняпёрую птушку, якая спала, умасціўшыся ў глыбокай утульнай ямачцы ў ствале. Калісьці тут быў сук, але выпаў, выкрышыўся, і птушка, палюючы на жукоў-караедаў, знайшла гэту ямачку, звіла ў ёй гняздо. Птушка, разбуджаная праменнем, здзіўлена і радасна ціўкнула.

Прачнуўся ў глыбіні лясоў вецер. Ён адразу ж ірвануўся ўвысь, у неба, уздыбіў над зямлёй карычнева-жоўтыя слаістыя хмары, змяшаў іх, збіў у адну кучу. Успыхнула маланка, крэсіва грому чэкнула ў хмарах. Здавалася, вось-вось пральецца адзін з першых вясновых дажджоў, ды ў хмар не хапіла сілы на такую вялікую работу. Толькі некалькі буйных і халодных кропель сарвалася, зляцела з нябёсаў.

Кропля ўдарыла Халадку, які стаяў на забаролах, па брыве, потым мякка спаўзла на вейку, але ён нават не міргнуў, толькі хітнуў галавою, скінуў кроплю з вейкі. І з яшчэ большай увагаю пачаў углядацца ў тое, што некалькі імгненняў назад насцярожыла яго. Са сваім сцягам Халадок стаяў у трэцяй варце. Апошнім часам князь Вячка толькі яму давяраў такі самы адказны занятак.

Што ж насцярожыла старшага дружынніка? Яму падалося, што ў прагалах між дрэў, якія густа раслі на беразе Дзвіны, там, дзе ў яе ўліваецца Кокна, мільганулі нейкія цені. Раніца была яшчэ такая нясмелая, такая цёмная, што ён, пры ягоных вострых вачах, не змог вызначыць, варухнуліся гэта галіны дрэў пад парывам ветру, прабег палахлівы звер ці, можа, прамчаліся ўзброеныя знузнікі[1] ў чорных плашчах.

---

[1] *Зну́знікі* — разведчыкі.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Халадок, не адрываючы позірку ад світальнага лесу, узняў дзясніцу ў баявой пальчатцы, гэтым рухам падклікаючы да сябе каго-небудзь з дружыннікаў. Падбег светлавалосы Грыкша.

— Што ты бачыш там, дзе над Дзвіною расце крывастволая сасна? — запытаўся ў Грыкшы Халадок.

Дзецкі[1] ўважліва паглядзеў у той бок, аж кончык вільготнага чырвонага языка высунуў з рота, адказаў:

— Нічога. Бачу адзін туман.

— Запалі паходню[2], — загадаў Халадок.

Грыкша, грукаючы ботамі па высланай каменнем сцежцы, пабег на сваё дазорнае месца, узяў там паходню, выбіў з крэменю іскру, запаліў звітыя ў клубок, аблітыя смалой сухія сасновыя галіны, якія былі насаджаны на доўгі арэхавы кій. Успыхнула яркае полымя, водбліскі ад яго заскакалі на кальчузе ў Халадка, поплеч з якім стаяў, высока трымаючы ў руцэ паходню, Грыкша.

— Мечаносцы! — усклікнуў Грыкша і ад нечаканасці выпусціў з рукі паходню. Яна паляцела з вала, чутно было, як плёхнулася ў роў з вадою. Зноў зрабілася цёмна, яшчэ цямней, чым было. Але ўжо і Халадок заўважыў вялікі атрад конных мечаносцаў, які няспешна выязджаў з лесу, вылiваўся на лугавіну, што была якраз насупраць пад'ёмнага моста Кукейноса.

— Рубон[3]! — крыкнуў Халадок і з ляскам выхапіў меч. І адразу ажыла, затупацела дзясяткамі ног, зазвінела мячамі і коп'ямі світальная імгла. Ярасна забрахалі вартавыя сабакі. Паходні ўспыхнулі наўкол. Грыкша ўдарыў у трывожнае біла[4].

— Усім — на забаролы! — загадаў Халадок, і тыя з вартавых, што спалі зараз у баявых адсеках, абсталяваных у тоўшчы гарадскога вала, прачыналіся, хапалі зброю і шчыты, па лесвіцах, па ствалах сукаватых дрэў, прыслоненых да вала, узбіраліся наверх, туды, дзе грымела, склікала ўсіх біла.

---

[1] *Дзе́цкі* — старшы дружыннік.

[2] *Пахо́дня* — факел.

[3] *Рубо́н* — баявы кліч: заклік быць гатовым да бітвы.

[4] *Біла* — прыстасаванне, каб падаваць сігнал трывогі, біць трывогу.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Кукейноскія лучнікі[1] ўжо нацягвалі цецівы сваіх лукаў, зробленых з рагоў тура і цісавага дрэва. Гартаваныя стрэлы са свістам паляцелі насустрач мечаносцам. І тут ірвануўся ўперад мечаносец-гарольд[2] на белым кані, затрубіў у срэбны рог, закрычаў:

— Слухайце, людзі Кукейноса! Слухайце, адважныя рыцары Кукейноса! Дачка вашага князя князёўна Соф'я прыбыла ў свой горад!

Да гарольда пад'ехаў яшчэ адзін мечаносец у чорнай епанчы[3], рэзкім рухам расхінуў яе, і ўсе, хто быў на забаролах, убачылі светлавалосую перапалоханую дзяўчынку, якая сядзела наперадзе мечаносца, моцна ўхапіўшыся тонкімі рукамі за конскую грыву. Яна аж зажмурылася ад нечаканасці, бо была пад епанчой, як у цёмнай клетцы, а тут святло ўдарыла ў вочы, людзі гучна і бязладна закрычалі, сабакі, захліпаючыся, забрахалі на высокім гарадскім вале, мячы зазвінелі.

— Соф'я, — здзіўлена і адначасна разгублена сказаў Халадок і, нібы просячы дапамогі, глянуў на Грыкшу. — Наша князёўна. Што рабіць?

Кукейноскія лучнікі перасталі страляць, хоць ніхто не аддаваў такога загаду. Баяліся патрапіць у князёўну. Маленькая Соф'я была тым шчытом, за якім хаваўся ўвесь атрад мечаносцаў.

— Пабягу да князя, — строга сказаў Грыкшу Халадок, — заставайся за мяне. Пад'ёмны мост не апускаць. Вароты не адчыняць. Палезуць тэўтоны на вал — біць, як псоў.

Халадок, закінуўшы за спіну шчыт і засунуўшы меч у ножны, хуценька спусціўся з вала. Тут, у горадзе, было значна цямней, чым на забаролах, бо прамені сонца, што пачало выкочвацца, вывальвацца з-за лесу, яшчэ не далятaлі сюды. Халадок пабег

---

[1] *Лу́чнікі* — стральцы з лука.

[2] *Гаро́льд* — галоўны рыцар.

[3] *Епанча́* — доўгі і шырокі плашч.

Спампавана з сайта www.aversev.by

па вузкай звілістай вуліцы да княжацкага церама. «Бяда падступіла, — думаў Халадок. — З-за дачкі князь Вячаслаў як перарадзіўся. Не ўсміхнецца, не пагаворыць толкам з дружынаю, меч Усяславаў на сцяну павесіў. Шкада, вядома, дачку. Родная кроў, родная душа. Узялі тэўтоны князя за кадык».

Халадок спяшаўся да церама і не ведаў, што ўжо другую ноч Вячка не спіць, паліць у царкве свечкі, адзін, без людскога вока. Моліцца, развітваецца назаўсёды з дачкой.

Другую ноч князь развітваўся з дачкой. Трапяталі агеньчыкі свечак, быццам пільныя жоўтыя вочы глядзелі, пранізвалі навылёт. Змрок, падаючы з-пад купала царквы, навальваўся на князя, прыгінаў да каменнай падлогі. Князь стаяў на каленях.

«Даруй мне, дочачка, даруй, ластавачка мая, — думаў князь. — Даруй свайму бацьку, што не можа вызваліць цябе са злыдневай клеткі. Ножкі і ручкі твае цалую. Даруй».

Калісьці ён чакаў сына, але нарадзілася дачка, і ён адразу ж забыўся пра сына, бо такой светленькай, такой сінявокай, такой усмешлівай была дачка. Ён браў на рукі маленькі цёплы камячок, і рукі, што прывыклі да мяча і кап'я, рабіліся мяккімі, лёгкімі.

«Даруй мне, — развітваўся з дачкою Вячка. — Я твой бацька, але я князь полацкага роду. Зямлю, што прадзеды перадалі ў спадчыну, трэба ад ворагаў бараніць, веру нашу адстойваць. Даруй, што выбраў зямлю і веру, а не цябе».

— Князь! — паклікалі яго раптам. — Князь!

Вячка ўсхапіўся, як шалёны тур, цяжка тупнуў нагою, закрычаў:

— Хто пасмеў парушыць маю размову з Богам?

Ён шумна дыхаў, шукаў рукою на поясе меч.

— Гэта я — твой старшы дружыннік, — дрогкім голасам сказаў Халадок, набліжаючыся з цемры да князя.

— Пёс! Галаву адсяку! — махнуў кулаком раз'юшаны Вячка.

— Бяры маю галаву, але спачатку выслухай мяне. — Халадок спыніўся насупраць Вячкі, глянуў яму ў твар. — Ля варот

Спампавана з сайта www.aversev.by

горада чакаюць твайго слова мечаносцы. Яны прывезлі князёўну Соф'ю.

— Прывезлі дачку? — Вячка нейкі час няўцямна стаяў на тым самым месцы, дзе заспела яго навіна. Твар ягоны то бляднеў, то чырванеў, быццам то заходзіла, то ўзыходзіла ў душы сонца.

— Кажаш, прывезлі дачку? — зноў перапытаў ён, потым левай рукою схапіў старшага дружынніка загрудкі, бліскаючы вачамі, прашаптаў: — Ну, Халадок, глядзі — калі не да дабра твая вестка, возьме цябе Карачун[1].

— Не баюся я Карачуна, — ціха сказаў Халадок і з нейкім шкадаваннем паглядзеў на Вячку, быццам развітваўся з ім назаўсёды.

Яны выбеглі з царквы на вуліцу, дзе ўжо ярка ззяла ранішняе неба. Вячка бег наперадзе, прытрымліваючы рукою ножны з мячом.

— Я — князь Кукейноса Вячаслаў Барысавіч! Што трэба вам, людзі з Рыгі?! — зычным голасам закрычаў Вячка, ускочыўшы на самую высокую пляцоўку надваротнай вежы. Вецер адразу ўдарыў яму ў грудзі, раскрыліў чырвонае карзно[2], якое было накінута на плечы. Збоку здавалася, што князь ахоплены полымем.

Гарольд-мечаносец на белым кані зноў затрубіў у рог, рыцар у епанчы расхінуў вопратку, і ўсе, і ў тым ліку Вячка, убачылі Соф'ю.

— Я — рыцар Данііл! — крыкнуў мечаносец, паклаўшы руку на плячо Соф'і. — Прывітанне табе, князь Вячка з Кукейноса, ад епіскапа Альберта! Адчыні вароты, пусці нас у горад і вазьмі сваю дачку!

Позіркі ўсіх, і мечаносцаў, і вояў-дазорцаў, скіраваліся на Вячку. Усе чакалі ягонага слова. Усе чакалі, што зробіць князь.

---

[1] *Карачу́н* — бог смерці ў старажытных беларусаў.

[2] *Карзно́* — накідка.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Ён зняў з галавы шлем, доўгімі смуглымі пальцамі пагладзіў лоб, заплюшчыў вочы. Ён пакутліва думаў. Дзве сілы, дзве страсці ярасна змагаліся ў ім.

Раптам на пляцоўку, дзе стаяў князь, узбег Халадок, упаў перад князем на калені, загаварыў:

— Загадай, князь, калёнымі стрэламі заткнуць раты чужынцам. Загадай ліць смалу на тэўтонскіх псоў. Чуеш — святая Сафія ў Полацку званамі грыміць! Гэта нашы прадзеды ў магілах варочаюцца, меч шукаюць, каб ударыць у грудзі заморскаму цуду-юду.

— Устань, Халадок, — ціха сказаў Вячка. Старшы дружыннік устаў, з надзеяй глянуў на князя.

— Ці ёсць у цябе дзеці, Халадок? Няма? А ў мяне ёсць дачка. Вунь яна. — Вячка рукою, з якой зняў баявую пальчатку, паказаў уніз, туды, дзе рыцар Данііл насцярожана сядзеў на кані. — Ідзі, Халадок, да Кліматы. Ён піша полацкі летапіс. Хай напіша там, што я, кукейноскі князь, люблю сваю зямлю, дужа моцна люблю і пакладу за яе галаву. І напіша хай там, што я дужа люблю сваю дачку. Зямля, Халадок, будзе пустою, ледзяною, калі няма на ёй роднай душы. Хай напіша ў летапісе, што я бяру на сябе ўсю адказнасць перад Богам за тое, што адбудзецца. Адчыніце вароты! Апусціце мост.

Адкінулі жалезныя брусы-завалы з варот. З цяжкім рыпеннем апусціўся пад'ёмны мост. Рыцар Данііл смела накіраваў на яго каня. Халадок з глухім стогнам выцягнуў з ножнаў і зноў загнаў у ножны меч.

Тэўтоны адзін за адным уязджалі ў горад. Воі князя Вячкі з нянавісцю глядзелі на белыя плашчы з чырвонымі мячамі і крыжамі, але маўчалі. Толькі чуўся глухі грукат конскіх капытоў.

Данііл пад'ехаў да Вячкі, злез з каня, сказаў, пакланіўшыся:

— Вітанне табе і твайму гораду, князь, ад рыжскай царквы.

— Вітаю цябе, высакародны рыцар, — спакойным, роўным голасам прамовіў Вячка. — Дзе мая дачка?

Спампавана з сайта www.aversev.by

— Князёўна Соф'я пад аховаю графа Пірмонта, — адказаў Данііл. Перад тым як уехаць у Кукейнос, ён перадаў дзяўчынку на рукі Пірмонту.

— Ці не той самы Пірмонт, якога я адпусціў жывым, хоць мог кінуць разам з Брацілам у Дзвіну? — спытаўся Вячка.

— Той самы, князь, — выгукнуў Пірмонт і здалёку пакланіўся Вячку.

— Не баішся ў скураным мяшку, як Браціла, на рачное дно легчы?

— Не баюся.

Вячка ўважліва паглядзеў на Пірмонта, павярнуўся да рыцара Данііла.

— Аддай маю дачку.

— Дачку я табе аддам, князь, — зноў пакланіўся рыцар Данііл. — Але епіскап Альберт хоча, каб на тым месцы, дзе суседзяць нашы землі, мы з табой пацалавалі святы крыж на вернасць і на дружбу.

— Добра, тэўтон, — згадзіўся Вячка. — Паехалі на тое месца. Няхай Бог памірыць нас.

— Не едзь, князь! — адразу ж закрычала некалькі вояў. — Не вер псам! Як сокала ў клетку, цябе заманяць, і складзеш галаву ў тэўтонскай цямніцы!

— Не едзь, князь Вячаслаў, — са слязамі на вачах папрасіў Халадок і схіліў калені перад Вячкам. Яго шырокая, абвітая кальчугай[1] спіна ўздрыгвала.

Вячка маўчаў, глядзеў на свой горад, на сваіх вояў. Потым спытаўся ў рыцара Данііла:

— Скажы, тэўтон, ці добры ваш Бог?

— Наш Бог добры, — з годнасцю адказаў Данііл. — За нас, рабоў сваіх, ён прыняў святыя раны.

Вочы ў Данііла былі вялікія, светлыя, з калючай іскрынкай.

---

[1] *Кальчу́га* — ваеннае, абарончае адзенне, кашуля з металічных кольцаў.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Вячка паглядзеў у гэтыя вочы, загадаў Халадку:

— Няхай ойча Сцяпан вынесе з царквы святы крыж.

Прыйшоў заспаны поп Сцяпан з крыжам. Разгублена глядзеў на князя, на мечаносцаў.

— Ці можаш ты, рыцар, пацалаваць святы крыж і паклясціся святым імем, што мяне з маёй дачкой Соф'яй адразу ж адпусцяць назад пасля таго, як на мяжы ўладанняў Рыгі і Кукейноса мы змацуем нашу дружбу і наша перамір'е? — спытаўся Вячка ў Даніила.

— Цалую крыж. Клянуся, — адказаў Даніил і пацалаваў крыж.

— Усе бачылі? Усе чулі? — гучна сказаў Вячка. — І неба таксама бачыла. І неба таксама чула. І Бог ведае пра ўсё. А вам, воі, — ён нізка пакланіўся, — дзякуй за клопат пра мяне. Усюды я быў, з сямі печаў хлеб еў, шмат што бачыў і з Божай дапамогаю думаю вярнуцца назад. Едзем.

Зрабілася так ціха, што было чутно, як вадзяныя кроплі падаюць на пясок. Гэта з дрэў, з дахаў скочвалася ранішняя раса. Вячка лёгка сеў на Печанега і, узяўшы з сабой трох вояў (першых, што трапіліся пад руку), узяўшы папа Сцяпана з крыжам, паехаў паперадзе мечаносцаў насустрач свайму лёсу. Ніхто з людзей — ні тыя, што калісьці жылі, ні тыя, што сёння жывуць, — не ведае свой лёс...

На беразе пагранічнай рачулкі злезлі з коней. Рыцар Даніил і князь Вячка апусціліся на калені. Кляліся зямлёй, вадой і крывёю. У вогнішча, якое хуценька расклалі мечаносцы, кінулі злепленыя з зямлі невялікія шары.

Перад гэтым поп Сцяпан кароценькім кордам[1] зрабіў надрэз на вялікім пальцы левай рукі ў князя і ў рыцара, кроплямі іхняй крыві расчырвоніў земляныя шары.

— Мір зямлі, вадзе і чалавечым душам, — сказаў Вячка.

---

[1] *Корд* — завостраны металічны стрыжань.

Спампавана з сайта www.aversev.by

— Мір зямлі, вадзе і чалавечым душам, — паўтарыў Данііл.

І ў гэты час граф Пірмонт з перакошаным ад нянавісці тварам схапіў загадзя падрыхтаваную вялікую палатняную торбу, у якую насыпаюць коням авёс, падбег да Вячкі ззаду, ускінуў яму на галаву торбу, рэзкім рыўком паваліў князя на спіну.

— Здрада! — закрычалі кукейноскія воі і адразу ж упалі пад мячамі тэўтонаў.

— Малайчына, граф, — сказаў Пірмонту Данііл, узнімаючыся з зямлі. — Лёгка ж мы з табой упалявалі гэткага звера.

Поп Сцяпан стаяў побач. Крыж дрыжаў у ягоных руках. Вочы заліваў халодны смяротны пот.

— Клятваадступнікі! — тонкім голасам закрычаў поп. — Ты цалаваў святы крыж! Бог пакарае, страшна пакарае цябе!

Ён замахнуўся крыжам, хацеў ударыць Данііла, але рыцар спрытным рухам заламаў яму руку, сказаў:

— Дзе ты бачыш святы крыж? Гэтыя дзве жалезкі, якія ты звязаў конскім воласам?

Ён наступіў нагою на крыж, усміхнуўся:

— Вось і ўсё. І няма твайго крыжа, дзікун. Ісцінны і адзіны крыж — у Рыме. Запомні гэта назаўсёды. А зараз я, рыцар Данііл, дарую табе жыццё. Ідзі, вяртайся ў свой Кукейнос.

І тут Данііл уздрыгнуў, міжволі зрабіў крок назад — на ягоных вачах доўгія цёмныя валасы айца Сцяпана зрабіліся белымі-белымі, як студзеньскі снег.

Вячка ляжаў з торбаю на галаве. Рукі і ногі ягоныя ўжо закоўвалі ў кайданы. Потым Данііл наступіў правай нагою князю на грудзі, урачыста абвясціў:

— Кароль Кукейноса, я, рыцар Данііл, аб'яўляю цябе сваім палоннікам.

«Як я мог паверыць ім? — думаў Вячка, лежачы з торбаю на галаве на зямлі, у той час як мечаносцы, смеючыся, падсілкоўваліся. — Пэўна, стаміўся я. Рашыў трошкі перадыхнуць, сабрацца з сіламі, заключыўшы перамір'е... Дапамогі з Полацка няма...»

Спампавана з сайта www.aversev.by

У ланцугах яго везлі па той самай зямлі, дзе ён нядаўна з мячом у руцэ на хутканогім войскім кані імчаўся штурмаваць Гольм і Рыгу. «Чаму тут, на гэтых берагах, шмат бурштыну[1]? — падумаў раптам зняволены князь. — Гэта слёзы людзей, якія запякліся пад ветрам і сонцам».

Зноў дзяцінства прыгадалася яму. Успамінамі пра дзяцінства ахоўваў, адгароджваў ён сваю душу ад жорсткай скрухі і знявагі палону.

Любіў ускочыць на каня і, без сядла, імчаўся ў лугі, на лясныя паляны.

Змрок стукаўся ў грудзі. Кажаны віліся над галавою. Спалоханыя зайцы і казулі ратаваліся, хто як мог. Кіпеў над галавой нябесны блакіт. Уздрыгвала зямля. Чулася бушаванне ветру ў далёкіх лясах. А ён імчаўся, імчаўся...

Ён рос і пачынаў разумець сваю зямлю, свой край, людзей гэтага краю. Працавіты, мужны, цвёрды народ бачыў ён вакол сябе. Чалавек да чалавека падбіраўся тут, як каменьчык да каменьчыка. Нязломнай сцяною ўставаў полацкі люд на шляху прыблудаў-тэўтонаў, хцівых ненажэрцаў, якія чорнымі вужакамі хацелі прапаўзці на Усход па берагах Дзвіны. І калі споўнілася Вячку шаснаццаць сонцаваротаў[2], пакляўся ён у Полацку, у святой Сафіі, што да апошняга дыхання будзе бараніць сваю зямлю.

У Рызе Вячку павезлі на епіскапскае падвор'е. Выйшлі з капэлы Альберт з Генрыхам, і Альберт, наліваючыся жорсткай чырванню, закрычаў кнехтам[3]:

— Раскаваць!

Падбег да князя, сам паспрабаваў зняць з яго ланцугі, але жалеза ёсць жалеза, і давялося чакаць каваля. Тоўсты нетаропкі каваль прыйшоў з усім сваім інструментам, выцер мяккім

---

[1] *Бурштын* — каштоўны мінерал, янтар.

[2] *Сонцаваро́т* — мера часу, роўная аднаму году.

[3] *Кнехт* — тэўтонскі наёмны воін.

Спампавана з сайта www.aversev.by

кулаком бліскучы ад поту лоб, ні разу не глянуўшы Вячку ў твар, раскаваў яго.

Кукейноскага князя павялі ў пакоі епіскапа. Вячка расціраў знямелыя ад халоднага жалеза рукі, у якіх, здавалася, спынілася кроў. Ён быў як у нейкім сне, ішоў, дыхаў, бачыў людзей і бачыў вінтавую лесвіцу перад сабою, бачыў высокія дзверы, на якіх былі выразаны крыжы і анёлы. Ён бачыў, як нямы служка епіскапа нялоўка спатыкнуўся на парозе, ледзьве не ўпаў, і епіскап так глянуў на служку, што той пабялеў, змізарнеў ростам.

Вячка сеў на мяккі пуф. Альберт, Генрых і тлумач Фрэдэрык стаялі насупраць. Свечак не палілі, бо яркае дзённае святло шырокімі струменямі ўрывалася ў пакой праз вокны, зашклёныя каляровым венецыянскім шклом. Толькі там, дзе на глухой сцяне вісела распяцце Хрыста ў цярновым вянку, было змрачнавата, бо прамені сонца не далятaлі датуль, расквечвалі бліскуча нацёртую воскам дубовую падлогу.

— Рыцар Даніил горш за язычніка, — сказаў епіскап. — Парушыў клятву, дадзеную на святым крыжы. Наш капітул[1] пакарае яго. Мы адбяром яго лен[2], які ўручыла яму рыжская царква.

Генрых і Фрэдэрык згодна кіўнулі галовамі. Вячка маўчаў.

— Кароль Кукейноса, пэўна, стаміўся? — падышоў да Вячкі Альберт і паклікаў: — Імануіл!

На парозе з'явіўся нямы служка.

— Дзе мая дачка? — глянуў у шэра-сталёвыя вочы епіскапу Вячка. Гэта былі першыя ягоныя словы за доўгі час палону.

— Няхай манашка Эльза прывядзе князёўну, — загадаў Альберт Імануілу.

Цяпер ужо Генрых адчуў, як падступае да сэрца нясцерпнае хваляванне. Хутка павінны былі прывесці Соф'ю. Як сустрэне яна бацьку? Як гляне на яго? Што скажа?

---

[1] *Капітýл* — рада, нарада кіраўнікоў царквы.

[2] *Лен* — спадчыннае зямельнае ўладанне ў эпоху феадалізму.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Больш года выкарчоўваў ён, Генрых, з дзіцячай няспелай душы валуны язычніцтва, святым словам здзіраў, выпальваў з яе каросту крывіцкай мовы.

Увялі Соф'ю. Манашка Эльза і абаціса[1] Марта стаялі побач з дзяўчынкай.

— Дочачка мая, — парывіста ўзняўся Вячка. Соф'я паглядзела на яго, потым на абацісу Марту, потым на Генрыха.

— Я твой бацька, — падышоў да яе, пагладзіў даччыны светлыя валасы Вячка. — Хіба ты не пазнала мяне? Хіба не помніш?

Ён з такой надзеяю, з такім болем пазіраў на дачку, што ў абацісы Марты нечакана павільгатнелі вочы. Генрых нешта шапнуў Соф'і, і маленькая князёўна, гледзячы паўз бацьку ў вузкае, асветленае жоўтым сонцам акно, сказала некалькі незразумелых слоў. Голас быў роўны і сухі, быццам драўляны.

У. Лукашык. Ілюстрацыя да твора Л. Дайнекі «Меч князя Вячкі»

— Што яна гаворыць? — разгублена глянуў на тэўтона Вячка.

— Князёўна Соф'я сказала, што яна дачка апостальскай рымскай царквы, — растлумачыў Фрэдэрык.

---

[1] *Абаці́са* — кіраўніца каталіцкага кляштара, манастыра.

Спампавана з сайта www.aversev.by

— Рымскай царквы? — здзівіўся, пабляднеў Вячка і аж зрабіў крок назад. — Але ж яна мая дачка. Мая! І княгіні-нябожчыцы Звеніславы. Можа, яна хворая? Соф'я, Соф'ечка! Я прыйшоў па цябе. Успомніла мяне? Успомніла Кукейнос?

Ён схапіў бледную і тонкую даччыну руку, пагладзіў яе, потым пацалаваў. Князёўна раптам заплакала, срэбныя ручайкі слёз густа і нястрымна пакаціліся з вачэй. Яна затрымцела ўсёй сваёй істотаю, сказала:

— Татачка, вось гэтая Эльза прымушае мяне гаварыць паіхняму... Б'е мяне...

— Я скручу табе шыю, чорная сава! — ірвануўся Вячка да Эльзы.

Манашка з абацісаю, быццам бура іх падхапіла, вылецелі з епіскапскіх пакояў.

— Выведзіце князёўну! — закрычаў служкам Альберт і нават нагамі затупаў.

Тыя спалохана схапілі пад рукі Соф'ю, зніклі за дзвярамі. У пакоі наступіла цішыня, халодная, гняўлівая.

Другую сядміцу[1] быў Вячка ў Рызе... На Вялікдзень Альберт шчодра частаваў кукейноскага князя. Праз дзень да Вячкі прыводзілі дачку, але толькі на некалькі імгненняў і адразу ж зноў забіралі ў манастыр. Часцей сустракаўся з князем Генрых. Прыходзіў, шнураваў няспынна па пакоі, гаварыў пра любоў да бліжняга, пра вялікія міласці, якімі асыпае Бог сваіх верных сыноў. Вячка маўчаў.

«Як я мог паверыць ім?» — думаў Вячка бяссоннымі начамі.

Мінуў Вялікдзень, і Альберт, павёўшы сваё войска на поўдзень ад Рыгі, прыгнаў у горад натоўп змардаваных палонных прусаў[2]. Гэта былі высокія светлавалосыя людзі з прамымі буйнаватымі насамі. Іх адразу ж прымусілі працаваць на будаўніцтве гарадской сцяны. Прусы пад наглядам латнікаў епіскапа

---

[1] *Сядмі́ца* — тыдзень, сем дзён.

[2] *Пру́сы* — балцкае племя, заваяванае крыжакамі.

Спампавана з сайта www.aversev.by

капалі ямы, білі каменне, мясілі гліну, сплаўлялі па Дзвіне плыты. Адзін з прусаў упаў са сцяны і зламаў нагу. Нагу яму вылечылі, і Альберт прыставіў пруса як служку да палоннага кукейноскага князя.

Напачатку яны не разумелі адзін аднаго — палонны палачанін і палонны прус. Маўчалі, думалі кожны сваё. Але няволя збліжае самых розных людзей, і паступова яны адкрыліся адзін аднаму, і аказалася, што ў іхніх мовах нямала падобных слоў.

— Я жыў на беразе мора, — павольна, каб Вячка яго разумеў, гаварыў прус. — Імя маё табе, князь, ведаць не трэба. Заві мяне прусам. У мяне была жонка Данутэ і трое дзяцей. Прыйшлі псы з Рыгі, і мая сям'я, як і ўсе нашы суседзі, схавалася ў зямной пячоры, пад каранямі свяшчэннага дуба. Але рыжскія псы каля ўвахода ў пячору расклалі велізарнае вогнішча, у якое кідалі яловыя лапкі, мухаморы, шышкі, мох... Дым забіў усіх. Я нават не ўбачыў трупы маіх дзяцей і маёй жонкі. Як я хачу адпомсціць тэўтонам!

— Я таксама хачу, прус, — даверыўся Вячка. — Давай думаць разам, што нам рабіць.

— Добра, князь, — адразу ж згадзіўся прус. — Мы не можам справіцца з тэўтонамі сілаю. Нас двое... Мы ў палоне... Толькі розум і хітрасць могуць нам памагчы. Хітрасці ж нам трэба вучыцца ў тэўтонаў.

Пасля гэтай размовы Вячка доўга не мог заснуць. Ён быў цалкам згодзен з прусам. Так, хітрасцю бяруць тэўтоны. А яшчэ бяруць сваёй дысцыплінай, арганізаванасцю.

Князь Вячка з кожным днём усё больш цішэў. Вочы памякчэлі, сцёрся з іх металічны халодны водсвет. Аднойчы князь нават папрасіўся паслухаць месу[1], і святыя песні, відно было па ўсім, уразілі яго, ашаламілі. Некалькі дзён ён хадзіў задумлівы, ціхі, толькі слабая ўсмешка набягала зрэдчас на твар. Яму

[1] *Мéса* — богаслужэнне.

Спампавана з сайта www.aversev.by

дазволілі адлучацца на падвор'е, і ён блукаў каля шэрых каменных сцен, разглядваў шчыліны ў сценах, мох, што вырас у гэтых шчылінах. Напаткаў лужок з аксамітна-зялёнай травою, сеў на траву, апусціў у яе рукі. Потым, азірнуўшыся наўкола — ці не цікуюць чужыя вочы, па самую шыю апусціў у траву галаву, нешта доўга нюхаў, да нечага прыслухоўваўся. І калі зноў узняў твар, на вачах былі слёзы.

«Ісцінны Бог уваходзіць у скамянелую душу», — думаў Генрых, які ўвесь час крадком сачыў за князем праз вузкае акно епіскапскай чытальні. Яго радавалі змены, што адбываліся з князем Кукейноса. Князь увачавідкі рабіўся спакойным, памяркоўным, ручным.

Калі скончыліся дзве сядміцы, Вячка папрасіў паклікаць епіскапа і аб'явіў Альберту, што аддае рыжскай царкве палову сваіх уладанняў, прымае ленныя сцягі[1] і гатоў пусціць у Кукейнос дойлідаў і рыцараў Альберта, каб узвялі яны каменны храм. Адразу сабралі капітул, на якім сам епіскап уручыў Вячку ленныя сцягі, абняў яго, пацалаваў, падарыў дзесяць баявых коней і дзесяць сталёвых рыцарскіх даспехаў. Вялікая радасць была ў Рызе...

Адслужылі месу, і Вячка, развітаўшыся з дачкою, Альбертам і Генрыхам, у суправаджэнні дваццаці рыцараў епіскапа накіраваўся ў Кукейнос. Над Рыгай бязважка плавалі маленькія пушыстыя воблачкі.

Усю дарогу князь маўчаў, нечаму ўсміхаўся, на прывалах часта і доўга маліўся. «Няўжо гэта той самы Вячка, адважны страшны князь, пра якога нам расказвалі столькі жахаў? — дзівіліся рыцары. — Ды гэта бяскрыўдны манашак, верабей, якога выпусцілі з клеткі». Некаторыя з рыцараў пачалі пазіраць на князя з пагардаю, пачалі кпіць з яго.

Радаснымі крыкамі сустрэў Кукейнос Вячку. Амаль усе воі і гараджане высыпалі на вал. Поп Сцяпан загадаў ударыць у

[1] *Ле́нныя сцягі́* — знакі ўлады.

Спампавана з сайта www.aversev.by

звон. Але твары ў кукейносцаў спахмурнелі і пацямнелі, калі яны зблізку ўбачылі свайго князя. Не, гэта быў не іхні князь! Стомлены соннавокі чалавек сядзеў на запырсканым гразёю кані, абыякава і лена глядзеў на забаролы, на пад'ёмны мост, які апускалі перад ім.

— Падмянілі нам князя, — разгублена сказаў старшы дружыннік Халадок, бачачы, як цяжка, па-старэчаму злазіць Вячка з каня. — Ён жа птушкаю вылятаў з сядла.

— А можа, тэўтоны мухаморамі атруцілі князя? — ціха і спалохана спытаўся ў стрыя Якава Мірошка. У Гарэлай Весі, чуў Мірошка, нявестка атруціла свайго свёкра — цэлы сонцаварот падлівала яму ў ежу адвар з мухамораў.

Якаў і Мірошка глядзелі праз шчыліну ў забаролах, як павольна, быццам з неахвотаю, уз'ехаў князь на мост, як не ўзняў галаву, калі яго віталі кукейносцы. Здавалася, на шыі ў князя вісіць нябачны камень-жарнавік.

Якаў прыкусіў губу, задумліва пазіраў на князя, потым сказаў:

— Не мухаморамі атруцілі нашага князя, Мірошка. Навошта тэўтонам атручваць? Яны, каб захацелі, мячамі б яго засеклі. Горам-бядой князя атруцілі.

У гэты час перад гарадскімі варотамі паказалася княгіня Дабранега ў суправаджэнні чалядніцы[1] Куліны. Якаў спусціўся з вала, працінуўся праз натоўп кукейносцаў бліжэй да Куліны, бо вельмі падабалася яму русакосая чалядніца. Куліна ўбачыла яго, усміхнулася, радасцю ўспыхнулі смуглыя шчокі.

— Добры дзень, княжа, добры дзень, мой гаспадар, — схілілася ў паклоне, а потым пацалавала стрэмя Дабранега. — Добра, што прыляцеў, голуб ясны, на свой двор.

Усе змоўклі, чакалі, што адкажа князь. Усе прагнулі пачуць першыя словы, якія ён прамовіць на роднай зямлі ў час вяртання. Але Вячка нічога не сказаў, марудна злез з каня, падышоў

[1] *Чаля́дніца* — жанчына з чэлядзі, прыслугі князя.

Спампавана з сайта www.aversev.by

да княгіні, тройчы пацалаваў яе і разам з ёю моўчкі пайшоў у свой церам.

Кукейносцаў гэта страшэнна ўразіла і пакрыўдзіла. З усіх бакоў толькі і чулася:

— Язык праглынуў князь у Рызе!

— Хвастом тэўтонскім зрабіўся!

— Моцнай бічоўкай прывязаў Вячку Альберт да свайго сядла!

Самыя нецярплівыя і гарачыя прапаноўвалі паслаць ганцоў у Полацк і Літву, каб хутчэй прысылалі дапамогу супраць тэўтонаў, бо на князя Вячку ўжо нельга спадзявацца.

— Заснуў наш князь, — з сумам і горыччу сказаў Клімята Аднарук Мірошку, калі ўсе дзеці, якіх ён вучыў, сабраліся на хорах у царкве. — Хто б мог падумаць? Але пойдзем, дзеці, далей у навучанні.

А князь Вячка і сапраўды спаў. Спаў ужо другі дзень. Заціх, як вымер, церам, чалядніцы і халопы хадзілі на пальчыках, жука-бурчуна, які аднекуль з Дзвіны заляцеў раптоўна ў церам, лавілі вялікай гурбою і ў рэшце рэшт злавілі, хацелі раструшчыць, але дваровы хлопчык Анісім захныкаў і панёс яго з сабою, як жывую цацку.

Дзіўныя сны сніліся князю. То стаяў ён пасярод жытнёвага поля, якое дыбілася крутымі жоўтымі хвалямі, пакрываючы князя з галавой, і толькі васількі, як халодныя сінія зорачкі, зрэдку мільгалі ў гарачай жаўцізне. То ўзбіраўся на высокую старую ліпу, і чым вышэй залазіў, тым усё болей маладзейшай рабілася ліпа, а на самым версе, на самай макаўцы дрэва, ён убачыў цёмна-зялёны пяшчотны ліст, які павольна калыхаўся, уздрыгваў на тоненькай карычневай ножцы. Захацелася князю сарваць гэты ліст, каб адчуць пальцамі клейкую ліпкасць зеляніны, але загула, зашумела, чалавечым голасам закрычала старая ліпа: «Гэта мой сынок! Гэта мой сынок!» — узмахнула ўсімі сваімі тоўстымі шурпатымі галінамі, напружылася ўсім маршчыністым ствалом і скінула князя-бедалагу на зямлю. Моцна стукнуўся ён аб карані і прачнуўся.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Ён ляжаў на мулкіх дошках свайго паходнага ложа і яшчэ адчуваў боль ад падзення. Ад удару аб цвёрдыя карані. Ён узняў над сабою рукі, сціснуў іх у кулакі і чакаў са страхам, што не адчуе ранейшую сілу ў кулаках. Але сіла была, бурлівая, хмельная, ранейшая. Тады ён рыўком скінуў з сябе покрыва, пругка ўскочыў на ногі, падбег да акна глянуць, светла або цёмна на дварэ.

Быў самы поўдзень. Сонца, як маленькая распаленая грыўня, стаяла высока-высока ў небе, і ягоныя прамені, як вострыя залатыя мячы, рассякалі згусцелы ад спёкі блакіт.

І Вячка засмяяўся. Ён смяяўся доўга, бязгучна. Было лёгка, было добра. «Я вярнуўся!» — крычаў у душы звонкі ярасны голас.

У. Лукашык. Ілюстрацыя да твора Л. Дайнекі «Меч князя Вячкі»

Якім паказаў князя Вячку мастак? Ці адпавядае бачанне мастака вашаму ўяўленню пра героя?

Маладой чалядніцы ён загадаў, каб паклікала княгіню Дабранегу. Неўзабаве ў спачывальню ўвайшла Дабранега, разгубленая, спалоханая. Вочы заплаканыя, і на шыі завязана чорная, прашытая залатой ніткай хусцінка.

Вячка пацалаваў княгіню, зняў з яе шыі чорную хусцінку, шпурнуў прэч, сказаў:

Спампавана з сайта www.aversev.by

— Дзе мая кальчуга? Дзе меч Усяславаў?

— Ой, князь, — прашаптала Дабранега і ўся засвяцілася ад радасці.

— А ты думала, што ў Рызе я зрабіўся манахам? — прытуліў яе да гарачых моцных грудзей Вячка. — Кліч сюды Халадка. Толькі кліч, каб чужыя вочы не ўбачылі, каб чужыя вушы не пачулі.

Прыбег старшы дружыннік Халадок.

Вячка спыніў яго:

— Што рабілі тэўтоны?

— Учора пілі віно і задзіраліся з полацкімі купцамі.

— Што робяць сёння?

— Сякуць камень-плітняк за гарадскім валам, хочуць будаваць побач з тваім церамам крэпасць. Рыцар Готфрыд у іх старшы.

— Зброю ўзялі з сабой?

— Яны заўсёды ходзяць са зброяй. І п'юць, і робяць з мячамі на поясе. Але зараз горача — яны могуць распрануцца і быць без кальчуг і мячоў.

Выслухаўшы такія словы Халадка, Вячка павесялеў, сказаў:

— Прышлі да мяне двух спрытных, вёрткіх хлопцаў, трэба, каб яны ўпільнавалі, чым займаюцца тэўтоны, якая ў іх зброя.

Здавалася, майская бура ўляцела ў церам. Дружыннікі апраналі кальчугі, надзявалі шлемы, стараючыся рабіць як мага меней шуму, бралі шчыты, мячы, коп'і і лукі. Вячку прынеслі кальчугу, шлем і Усяславаў меч.

Дабранега з паклонам падала цяжкі меч мужу, сказала:

— Будзь моцны душой і мячом, мой княжа. Святая Сафія глядзіць на цябе і чакае перамогі.

— Ты на мяне глядзіш, Дабранега, — сурова ўсміхнуўся Вячка. — Памру, але гонар палачан не аддам на знявагу. Добрая будзе валка[1].

---

[1] *Ва́лка* — бойка, бітва.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Ён рашуча трасянуў мячом.

У гэты час убеглі ў апачывальню Якаў Палачанін і Мірошка, абодва ўспатнелыя, чырванашчокія.

— Тэўтоны камень сякуць у вялікай яме, — выдыхнуў Якаў, — мячы і кальчугі звалілі на край ямы. Мокрыя ад поту, як балотныя жабы.

— Рубон, — ціха сказаў Вячка і выцягнуў меч.

— Рубон, — як парыў ветру, пранеслася па дружыне, што ўжо гуртавалася ва ўсіх пераходах церама.

Гарадскія вароты былі загадзя адчынены, і дружына Вячкі, не сцішваючы хады, знянацку атакавала тэўтонаў. Вячка бачыў белыя спалоханыя твары ворагаў. Храбусцела жарства пад нагамі. Пахла свежаўскапанай зямлёй. Біцца ў яме было цесна, не хапала размаху руцэ, і князь толькі калоў мячом. Некалькі тэўтонаў паспелі схапіць зброю і стараліся аддаць жыццё як мага даражэй. Яны былі голыя, беласкурыя, слізкія ад поту, як рыбіны. Пахла потам, і гэты ненавісны пах раз'ярыў Вячку.

Ён закрычаў:

— Нікога не выпускайце з ямы! Сячыце ўсіх! Дачку Альберт мне ўсё роўна не аддасць. Табой ахвярую, дачка!

Дружыннікі з новай сілаю, з вялікай ярасцю рынуліся на тэўтонаў. Жменька ворагаў, што заставаліся яшчэ жывымі, была пасечана на шматкі.

Валка скончылася. Лясныя пчолы гулі над мёртвымі тэўтонамі. Чаіцы сумна крычалі на Дзвіне. Вячка з хмурасцю глядзеў на справу сваіх рук, спытаўся:

— Хто з нашых Богу душу аддаў?

— Дзецкага Грыкшу забілі, — адказалі яму.

— Добры быў вой. Прыгожа загінуў, — прамовіў Вячка. — Клічце айца Сцяпана і халопаў з церама. Трэба пахаваць усіх мёртвых.

Спампавана з сайта www.aversev.by

1. Як пісьменніку ўдалося наблізіць нас да тых даўно мінулых часоў?
2. Параўнайце мастацкі паказ падзей з апісаннем іх у навуковай літаратуры.
   - Дзе адлюстраванне жыцця маляўнічае, зрокава-нагляднае, поўнае бытавых падрабязнасцей, дэталей? Дзе яно перадае толькі сутнасць таго, што адбылося?
   - Ці мог пісьменнік ведаць пра гэтыя падрабязнасці? Калі не мог, то якім чынам ён усё гэта ўзнаўляе, паказвае? Назавіце герояў твора, якія адпавядаюць сапраўдным гістарычным асобам, і тых, што створаны толькі фантазіяй пісьменніка.
   - Дзе апісанне падзей больш дакладнае — у навуковым творы ці ў мастацкім?
   - Ці разыходзіцца мастацкі паказ з навуковым у выяўленні галоўнай сутнасці падзей, што адбыліся ў далёкім мінулым? У чым?
3. Прачытайце дыялог і прыгадайце літаратурных герояў (трэнажор па творы Л. Дайнекі «Меч князя Вячкі»). Як характарызуюць гераіню словы, з якімі яна перадае меч князю?
4. Ахарактарызуйце князя Вячку. Якую ролю адыгрываюць пейзажныя замалёўкі, успаміны, сны князя ў абмалёўцы яго вобраза? Як праз адносіны да дачкі Соф'і аўтар паказвае Вячку — абаронцу роднай зямлі і бацьку?
5. Разгледзьце ілюстрацыі да твора, якія зрабіў Уладзімір Лукашык. Ці ўдалося мастаку, на ваш погляд, перадаць сродкамі графікі эмацыянальную атмасферу літаратурнага твора? Ці адчулі вы адносіны мастака да сваіх герояў?
6. Падзяліце герояў твора на абаронцаў Кукейноса і ворагаў-крыжакоў (трэнажор «Літаратурныя героі твора Л. Дайнекі "Меч князя Вячкі"»).
7. Параўнайце Вячку і яго дружыннікаў, з аднаго боку, і персанажаў з лагера тэўтонаў (рыцар Данііл, граф Пірмонт, епіскап Альберт) — з другога. Як характарызуюцца прадстаўнікі гэтых лагераў у навуковым творы — вучэбным дапаможніку па гісторыі?
8. Вызначце ролю гістарызмаў у творы. Разгадайце крыжаванку (Л. Дайнека. «Меч князя Вячкі»).
9. Праверце свае веды (тэст па творы Л. Дайнекі «Меч князя Вячкі»).

Спампавана з сайта www.aversev.by

Уладзімір Караткевіч

БАЛАДА ПРА ВЯЧКУ, КНЯЗЯ ЛЮДЗЕЙ ПРОСТЫХ

Як груганы на трупы з высокае гары,
Крыжакі наляцелі на вёскі і бары.
Няшчасная краіна тры доўгія гады
Нагбом хлябтала трунак[1] *смярцей і злой бяды.*
Цягнулі па кавалках яе ва ўсе бакі,
Загінулі героі, і здрадзілі князькі.
Агонь любові мужнай у брудных душах згас,
Адзін не здрадзіў Вячка, сумленны хлопскі князь.
Параненым і слабым яны яго ўзялі,
Ў кайданы ногі скулі і ў лагер прывялі.
Ад раны, непрытомны, ачнуўся ён тады,
Калі былі далёка айчыны гарады.
Меў сілы, каб змагацца і з сотняй варагоў,
Але шляхі да волі замкнулі для яго...
Па вуліцы смярдзючай, дзе скупчанасць і бруд,
Вядуць яго на плошчу. А там чакае суд.
А ў галаве чамусьці ўстае чырвоны снег,
Пажары чорных замкаў ў апошні іх набег...
Ў агні наперад з імі ляцелі бітвы дні,
Парчу і аксаміты тапталі ў бруд яны.
За подзвігі у бітвах супроць крыжацкіх зграй,
За мужнасць і за гонар трымай адказ, трымай!
Тут, як на браме пекла, магла б пісаць рука:
«Пакіньце спадзяванні — адсюль выводзіць кат».
Але сканаць пакорным і мяккім, быццам пух,
Як бык дурны на бойні, папаўшы пад абух?

Параўнайце вершаваныя радкі з празаічнай мовай: *Няшчасная краіна тры доўгія гады піла, захлынаючыся, атрутнае пітво смярцей і злой бяды.* Які з варыянтаў больш вобразна і эмацыянальна перадае аўтарскую думку?

Вядомы паэт Дантэ ў сваёй «Боскай камедыі» ўжыў гэты выраз над брамай у пекла.

[1] *Тру́нак* — напой, тут: атрутнае пітво.

Спампавана з сайта www.aversev.by

У. Лукашык.
Вячка

І просіць перад стратай ён путы развязаць,
Каб рукі на імгненне замлелыя размяць.
І ў гэты час апошні перад канцом сваім
Каня яму прывесці, каб развітацца з ім:
«Са мною разам зносіў ён дождж і халады,
Насіў мяне на бітву тры доўгія гады,
Таптаў нагамі лона сталочанай зямлі».

. . . . . .

І вось каня на плошчу два кнехты прывялі.
І Вячка грыву гладзіць, цалуе ў мяккі нос
І кажа, кажа сябру пра свой жахлівы лёс:
«Мой конь, мой конь, мой любы.
Як будзеш жыць цяпер?
Канец лясной свабодзе, мой добры, моцны звер.
Ты грэбаваў зямлёю, што слалася ў нагах;
Няўжо насіць ты будзеш чужога, варага?
Якому не пасуе і назва: «чалавек»,
Ў якога твар, як пятка, не чырванее век.
Не роднае, чужое усё нам тут з табой:
Не так, як на Радзіме, кабылы йржуць вясной,
Не так гамоняць дрэвы, не так звіняць лугі,
Не так куюць падковы для конскае нагі.
Дапамажы мне, косю, мой бездыханны труп
Не проста дол чакае — ганьба, ганебны слуп».
І, выпрастаўшы рукі, меч ката вырваў ён
І ссёк дубовы чэрап з крутых яго рамён,
І на каня узвіўся, і ў стрэмя горда стаў,
І зноў для бітвы волю ў апошні час дастаў.
Меч бліснуў у паветры над лютаю гурбой.
Адзін супроць дзясяткаў —
І ўсё ж не прэнг[1], а бой!

Падбярыце вершаваныя радкі, якія вобразна перадаюць змест мастацкага палатна.

[1] *Прэнг* — момант пакарання з прымяненнем катавання.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Конь варагоў хапае зубамі і храпіць.
Паўсюль пануе пекла і трупы, як снапы.
О, лепей дні пакончыць на полі баявым,
Ніж век глытаць ў кайданах чужынскіх вогнішч дым!
Вось уцякаюць суддзі, вось кроў плыве ракой:
«Я ў Мар'енбург[1] з'явіўся, і ён на час, ды мой.
Пакуль тугія лукі на вежах не звіняць,
Пакуль даўгія стрэлы адтуль не паляцяць».
Але слабеюць сілы, але дрыжыць далонь.
І вось аб труп запнуўся яго любімы конь.
«О конь, не давядзецца табе ў лугах іржаць,
І ў полі нам з табою ўжо болей не гуляць.
Я ў стрэлах, быццам вожык.
Бывай, мой конь, бывай!
Мы болей не пабачым лугі і родны край».
Аленя абступілі са зграяй злых сабак.
Ірвуць і раздзіраюць, сякуць на дробны мак.
І вось з крывёю гордай змяшаўся пыл і гразь.
Так у баі няроўным загінуў Вячка-князь.

Патлумачце выдзелены выраз.

1. Пра які эпізод з гераічнага жыцця Вячкі расказваецца ў вершаваным творы?
2. Зачытайце адпаведныя радкі з твора (цытаты), якія характарызуюць Вячку як сапраўднага героя, патрыёта, мужнага і смелага воіна.
3. Якую ролю ў творы адыгрывае вобраз баявога каня князя Вячкі? Як гэты вобраз дапамагае выразней паказаць самога князя?
4. Як характарызуюцца ворагі-крыжакі? Раскрыйце сэнс выразаў: *як груганы на трупы*, *крыжацкія зграі* і інш.
5. Знайдзіце ў тэксце гіпербалы. З якой мэтай у кожным канкрэтным выпадку яны ўжыты? Які пры гэтым дасягаецца эфект (узмацняецца напружанасць дзеяння, звяртаецца ўвага на асобныя рысы характару ці нешта іншае)?

[1] *Мар'енбу́рг* — крэпасць (зараз Алукснэ́ — горад у Латвіі).

Спампавана з сайта www.aversev.by

6. Якую ролю ў творы адыгрывае творчая фантазія паэта? У чым яна выяўляецца?
7. Выберыце адпаведныя радкі, у якіх сфармулявана мастацкая ідэя твора, і патлумачце свой выбар:

Меў сілы, каб змагацца і з сотняй варагоў,
Але шляхі да волі замкнулі для яго...

«Я ў Мар'енбург з'явіўся, і ён на час, ды мой...».

О, лепей дні пакончыць на полі баявым,
Ніж век глытаць ў кайданах чужынскіх вогнішч дым!

8. Параўнайце вобраз Вячкі ў празаічным і паэтычным творах. У якім з іх герой бліжэй да рэчаіснасці, надзелены ваганнямі і пакутлівым пошукам выйсця са складаных жыццёвых абставін, а ў якім больш нагадвае казачны ці легендарны персанаж?
9. Наколькі адпавядае змест твора гістарычнай праўдзе? Параўнайце героя балады з тым, што пра яго гаворыць гістарычная навука.
10. Праверце свае веды (тэст па творы У. Караткевіча «Балада пра Вячку, князя людзей простых»).

ПРА БАЛАДУ

Вы пазнаёміліся з паэтычным творам «Балада пра Вячку, князя людзей простых», створаным на аснове гістарычнага матэрыялу пра князя Вячку.

Сюжэт балады драматычна напружаны: уся ўвага сканцэнтравана на апошніх хвілінах жыцця героя. Князь Вячка, стоячы перад суддзямі ў чаканні смерці, знаходзіць магчымасць не стаць ахвяраю, а змагацца да канца, як і належыць сапраўднаму воіну. Вызваліўшыся з путаў, ён здабывае меч і кідаецца ў бой: *«Меч бліснуў у паветры над лютаю гурбой. / Адзін супроць дзясяткаў —/ І ўсё ж не прэнг, а бой!»*

Спампавана з сайта www.aversev.by

Герой надзелены незвычайнай сілай, ён змагаецца як казачны ці легендарны персанаж, але сілы няроўныя. Падзеі, пра якія расказваецца ў баладзе, маюць трагічную развязку, і твор заканчваецца смерцю героя.

Балада — невялікі верш казачна-фантастычнага, гераічнага ці легендарнага зместу з драматычна напружаным сюжэтам.

1. Чым балада адрозніваецца ад іншых вершаваных твораў?
2. Прыгадайце балады, з якімі вы пазнаёміліся на ўроках рускай літаратуры.

ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДА РАЗДЗЕЛА

1. Чым адрозніваецца публіцыстыка ад мастацкай літаратуры? Што яна запазычвае з мастацкай літаратуры для ўзмацнення ўздзеяння на чытача?
2. У некаторых творах мастацкая літаратура цесна зближаецца з публіцыстыкай. Прыкладам у прозе можа быць жанр нарыса, да якога звяртаюцца і публіцысты, і пісьменнікі. Прывядзіце прыклады такіх твораў і пакажыце, што ў іх ад мастацкай літаратуры і што — ад публіцыстыкі.
3. У чым заключаецца галоўная розніца паміж мастацкай і навуковай літаратурай? Для якога твора характэрна дакладнасць і гістарычная праўда, а для якога — творчае ўяўленне і фантазія?
4. Суаднясіце паняцці з мастацкай і навуковай літаратурай (трэнажор «Мастацкая і навуковая літаратура»).
5. Якая роля фантазіі, вымыслу ў творы мастацкім і ў творы навуковым? Пацвердзіце свае меркаванні, параўнаўшы творы пра князя Вячку.

Спампавана з сайта www.aversev.by

6. Ці ўласціва навуковай літаратуры ўжыванне вобразных сродкаў, эмацыянальных ацэнак? Пакажыце гэта на прыкладзе ўрыўка з вучэбнага дапаможніка па гісторыі Беларусі. Ці ёсць там эпітэты, метафары, параўнанні?

7. Падрыхтуйце пытанні і правядзіце літаратурную віктарыну па творах, вывучаных у раздзеле.

8. Разгадайце крыжаванку па раздзеле «Мастацкая літаратура і навука».

9. Праверце свае веды (трэнажор падагульняльны 1, 2).

10. Вы перагарнулі апошнюю старонку вучэбнага дапаможніка. Наперадзе ў вас цудоўны час захапляльных падарожжаў па Беларусі і за яе межамі, знаёмства з новымі сябрамі і літаратурнымі героямі.

Прапануем прыняць удзел у праекце «Чалавек чытае». Паназірайце ў час адпачынку за людзьмі, якія захоплены літаратурай: чытаюць часопісы і кнігі, спасцігаюць таямніцу слова ў смартфонах і на планшэтах у кафэ і ў вагонах метро, у парках і на прыпынках. Затым, выбраўшы цікавы момант, паспрабуйце сфатаграфаваць за гэтым заняткам вашых сяброў з іх дазволу. Да кожнага фотаздымка прыдумайце або падбярыце арыгінальную назву. У пачатку наступнага навучальнага года наладзьце ў школе выставу вашых работ, якія абудзяць большую цікавасць да чытання і здолеюць пераканаць вучняў вашага класа (школы), што шчаслівы той чалавек, які шмат чытае.

Спампавана з сайта www.aversev.by

СЛОЎНІК ЛІТАРАТУРАЗНАЎЧЫХ ТЭРМІНАЎ

Адухаўле́нне — прыпадабненне нежывога прадмета да жывой істоты або чалавека, адзін з відаў **метафары**.

Алего́рыя — іншасказанне, мастацкі прыём, калі абстрактная думка раскрываецца праз паводзіны жывёл, асаблівасці раслін, іншых прадметаў ці рэчаў: баязлівасць або безабароннасць — праз паводзіны зайца, драпежнасць і прагнасць — праз паводзіны ваўка і г. д.

Амфібра́хій — трохскладовая стапа з націскам на другім (сярэднім) складзе: __ ___ __. (Гл. верш «Роднае слова» Д. Бічэль.)

Ана́пест — трохскладовая стапа з націскам на трэцім складзе: __ __ ___. (Гл. паэму «Курган» Янкі Купалы, верш «Ручэй» Якуба Коласа.)

Апавяда́нне — невялікі празаічны твор, у якім расказваецца пра асобную падзею, здарэнне ў жыцці чалавека, героя твора.

Апіса́нне — спосаб паказу з'яў жыцця, падрабязная перадача, пералічэнне асобных прымет, адзнак, якасцей, рыс чалавека, з'явы, прадмета.

Апо́вед — спосаб раскрыцця зместу твора праз паведамленне пра падзеі, паводзіны, учынкі героя або герояў.

Арты́кул — жанр навуковай або публіцыстычнай ці крытычнай літаратуры, у якім ставіцца і вырашаецца пэўнае пытанне. (Гл. артыкул «Шануйце роднае слова!» Цёткі.)

Афары́зм — кароткі, арыгінальны, дакладны выраз, які ў сціслай, зручнай для запамінання форме ўтрымлівае глыбокую думку.

Бала́да — невялікі верш казачна-фантастычнага, гераічнага ці легендарнага зместу з драматычна напружаным сюжэтам. (Гл. «Балада пра Вячку, князя людзей простых» У. Караткевіча.)

Спампавана з сайта www.aversev.by

Во́браз маста́цкі — вобразнае адлюстраванне рэальнага жыцця, абагульненае і дапоўненае пісьменнікам па законах мастацкай творчасці, якое ўздзейнічае на пачуцці чалавека.

Вы́мысел — выдумка, фантазія, да якой звяртаецца пісьменнік у сваёй творчасці для стварэння вобразаў, карцін, сюжэтаў, важнейшы сродак мастацкага паказу жыцця.

Геро́й — дзейная асоба, персанаж, вобраз чалавека ў творы.

Гіпе́рбала — мастацкі прыём, моцнае перавелічэнне ўласцівасцей, якасцей ці памераў прадмета або з'явы з мэтай большай мастацкай выразнасці.

Гістары́змы — словы, якія абазначаюць прадметы, з'явы і паняцці пэўнай гістарычнай эпохі, якія з цягам часу выйшлі з ўжытку. (Гл. твор Л. Дайнекі «Меч князя Вячкі».)

Гу́капіс — ужыванне ў мастацкім, пераважна вершаваным, тэксце аднолькавых або падобных гукаў, якія ўзмацняюць мілагучнасць і сэнсавую выразнасць мовы.

Гу́мар, гумарысты́чны — паказ жыццёвых з'яў у смешным (камічным) выглядзе, нязлосны, добразычлівы смех. (Гл. урывак «Дзядзька-кухар» Якуба Коласа.)

Да́ктыль — трохскладовая стапа з націскам на першым складзе: ___́ ___ ___. (Гл. верш «Раманс» М. Багдановіча.)

Драматы́зм — крайняя напружанасць, вастрыня сітуацыі, падзеі, эпізоду, сюжэта.

Дыяло́г — размова дзвюх асоб.

Дэта́ль маста́цкая — падрабязнасць у апісанні пэўных аб'ектаў у творы (пейзажу, партрэта, дзеяння, персанажа і г. д.), якая з асаблівай сілай абуджае ўяўленне і творчую думку чытача і нясе значную эмацыянальную і сэнсавую нагрузку.

Ідэ́я — асноўная думка твора, якой прасякнуты яго вобразы і карціны, паэтычны сэнс твора, ацэнка тых з'яў, якія паказаны ў творы.

Інсцэніро́ўка — перапрацоўка празаічнага або паэтычнага твора для пастаноўкі на сцэне.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Інтана́цыя — тон, характар вымаўлення фразы, якія выяўляюць пачуццё, настрой, душэўны стан, адносіны чалавека да таго, пра што ідзе размова.

Іро́нія — мастацкі прыём, спосаб камічнага або сатырычнага паказу, у аснове якога ляжыць схаваная, стоеная насмешка.

Камі́чнае — смешнае ў жыцці і ў мастацкім творы.

Кампазі́цыя — будова мастацкага твора, размяшчэнне і спалучэнне асобных частак, эпізодаў, карцін.

Лагі́чны на́ціск — выдзяленне голасам слова ў сказе, фразе, якому надаецца асабліва важнае значэнне.

Літарату́ра маста́цкая — слоўна-вобразная мастацкая творчасць.

Літарату́ра навуко́вая — літаратура, якая грунтуецца на дакументальным матэрыяле, строга прытрымліваецца дакладных фактаў.

Мета́фара (гл. таксама **адухаўленне**, **увасабленне**) — мастацкі прыём і спосаб паказу жыцця, у аснове якога ляжыць схаванае параўнанне.

На́рыс — мастацка-публіцыстычны твор на актуальную тэму сучаснасці, у якім распавядаецца пра падзеі, што сапраўды здараліся ў жыцці, а персанажы маюць рэальных прататыпаў і выступаюць пад сваімі прозвішчамі.

Падтэ́кст маста́цкі — прыхаваны сэнс якога-небудзь выказвання, эпізоду ці твора ў цэлым.

Паме́р вершава́ны — паняцце, якое ўжываецца для вызначэння рытмічнай канвы верша і паказвае колькасць і характар стоп у вершаваных радках.

Параўна́нне — мастацкі прыём характарыстыкі аднаго прадмета, з'явы пры дапамозе супастаўлення іх з іншымі.

Партрэ́т — апісанне знешнасці персанажа, якое характарызуе яго як чалавека.

Па́ўза — адзін з элементаў інтанацыі, большы ці меншы па працягласці прыпынак голасу ў час чытання літаратурнага твора.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Паэ́зія — эмацыянальна-вобразная вершаваная творчасць.

Паэ́зія ў про́зе — невялікі па памерах празаічны твор, блізкі да верша дзякуючы сваёй эмацыянальнасці, лірызму, своеасаблівай рытмічнасці мовы. (Гл. твор «Шчасце не ў золаце» Змітрака Бядулі.)

Паэ́ма — вялікі вершаваны твор, у якім расказваецца пра важныя падзеі і яркія характары, выяўляюцца глыбокія перажыванні аўтара і яго герояў. (Гл. паэму «Курган» Янкі Купалы.)

Пейза́ж — апісанне прыроды, якое мае важнае значэнне для характарыстыкі дзеяння, душэўнага стану героя.

Персана́ж — дзейная асоба, герой твора.

Про́за — слоўна-мастацкая творчасць, заснаваная на празаічнай мове.

Публіцы́стыка — асаблівы від літаратуры, які ў паказе жыцця грунтуецца не на выдумцы-фантазіі, а на дакладным адлюстраванні сапраўдных, рэальных падзей і фактаў.

Рытм, рытмі́чнасць — раўнамернае паўтарэнне, чаргаванне націскных і ненаціскных складоў, стоп у вершы.

Ры́фма — сугучнасць канчаткаў вершаваных радкоў.

Рэ́квіем — урачыста-жалобны літаратурны або музычны твор, прысвечаны памяці загінуўшых.

Свабо́дны верш — верш, графічна разбіты на радкі, у аснове рытму якога — чаргаванне аднатыпных інтанацыйных і сэнсавых адзінстваў. (Гл. верш «Дрэвы паміраюць...» Максіма Танка.)

Сі́мвал — слова ці выраз, якія ўжываюцца ў пераносным сэнсе і абазначаюць нейкую жыццёвую ці грамадскую з'яву — дружбу, цвёрдасць, смеласць.

Стапа́ — група складоў з адным націскным, якія раўнамерна паўтараюцца ў вершаваным радку. Бываюць двухскладовыя (ямб, харэй) і трохскладовыя (дактыль, амфібрахій, анапест) стопы.

Страфа́ — частка верша з пэўнай рыфмоўкай радкоў, якая рэгулярна паўтараецца на працягу твора.

Спампавана з сайта www.aversev.by

Сюжэ́т — сістэма падзей у апавядальным творы, раскрыццё дзеяння твора і праз яго — характару героя ці герояў.

Трагі́чнае — вельмі вострая, напружаная сітуацыя або развіццё дзеяння, якія заканчваюцца гібеллю героя ў барацьбе за важныя ідэі.

Тро́пы — словы або выразы, якія маюць пераноснае значэнне, дадатковы мастацкі сэнс (эпітэт, параўнанне, метафара, сімвал, алегорыя і г. д.).

Тэ́ма — жыццёвая з'ява або кола жыццёвых з'яў, якія прыцягнулі ўвагу аўтара, зацікавілі яго.

Увасабле́нне — мастацкі прыём, разнавіднасць метафары, прыпадабненне з'яў прыроды да паводзін чалавека.

Фанта́стыка — карціны жыцця, створаныя ўяўленнем, з дапамогай выдумкі, неверагодныя або малаверагодныя ў жыцці, але цікавыя і змястоўныя ў творы.

Харэ́й — двухскладовая стапа з націскам на першым складзе: ___́ ___. (Гл. урывак «У яго быў свет цікавы...» Якуба Коласа.)

Эпі́граф — выказванне, якое змяшчаецца адразу пасля загалоўка і перадае асноўны сэнс твора.

Эпізо́д — пэўны момант у дзеянні (здарэнне, выпадак), у сюжэце мастацкага твора, важны для разумення, характарыстыкі дзейных асоб.

Эпіло́г — заключная частка твора, у якой паведамляецца пра тое, што адбывалася пасля асноўнага дзеяння.

Эпі́тэт — мастацкае азначэнне, якое адыгрывае важную ролю ў характарыстыцы жыццёвых з'яў, чалавека.

Ямб — двухскладовая стапа з націскам на другім складзе: ___ ___́. (Гл. урывак «Дзядзька-кухар» Якуба Коласа.)

Спампавана з сайта www.aversev.by

СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

Беларускі савецкі жывапіс. — Мінск : Беларусь, 1978.

Бохан, Ю. М. Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да канца XV ст. : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання : у 2 ч. / Ю. М. Бохан, С. М. Цемушаў ; пад рэд. Ю. М. Бохана. — Мінск : Выдавецкі цэнтр БДУ, 2016. — Ч. 1.

Брыль, Я. Сірочы хлеб / Я. Брыль [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : https://www.livelib.ru/author/310922/top-yanka-bryl.

Вашчанка, Г. Х. Мацярынскія крылы. 1975. [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : https://mozyrxxvek.blogspot.com.by/2014/06/blog-post_9516.html.

Дайнека, Л. Меч князя Вячкі / Л. Дайнека ; маст. У. А. Лукашык. — Мінск : Юнацтва, 1987.

Драздовіч, Я. Трывеж. Панарама месячнага горада. 1932—1933. [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : http://drazdovich.by/.

Драздовіч, Я. Падкружніковы краявід на планеце Сатурн (Saturland). 1931. [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : http://drazdovich.by/.

Кацар, М. С. Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка / М. С. Кацар. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 1996.

Колас, Якуб. Сымон-музыка / Якуб Колас ; маст. М. Селяшчук. — Мінск : Юнацтва, 1990.

Купала, Янка. Курган / Янка Купала ; маст. М. С. Басалыга. — Мінск : Юнацтва, 1987.

Купалаўскі мемарыяльны запаведнік «Вязынка» [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : http://www.fotobel.by/muzei-belarusi/muzej-vyazynka/.

Курган Славы, фота [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : https://belkraj.by/landmarks/kurgan-slavy.

Музей валуноў [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : http://www.fotobel.by/muzei-belarusi/muzej-valunov/.

Пяшкун, В. Вёска. 2013. [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : http://art-imena.com/authors/peshkun-vasilij/.

Ран, Л. Дзядзька Антось / Л. Ран // Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : http://dkmf.by/exhibitions/view-151/page-1.html?operation=select_current_author_item&item_id=&LNG_ID=&author_item_id=76151.

Римарович, Э. Живопись. Монументальное искусство / Э. Римарович. — Белорусский союз художников, 2006.

Чарных, Т. Вясковыя матывы [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : http://art-exhibitions.ru/kunstenaars/chernykh-tatyana/.

Шаранговіч, В. Кніжная графіка. Станкавая графіка. Акварэль. Малюнак / В. Шаранговіч. — Мінск : Беларусь, 2008.

Шчыракоў, М. Н. Творы выяўленчага мастацтва на ўроках беларускай літаратуры. IV—VII класы / М. Н. Шчыракоў. — Мінск : Народная асвета, 1978.

Спампавана з сайта www.aversev.by

ЗМЕСТ

Дарагія сямікласнікі! 3

ЧАРАДЗЕЙНАЯ СІЛА МАСТАЦТВА (5)

Якуб Колас. У яго быў свет цікавы *(Урывак з паэмы «Сымон-музыка»)* 8
Янка Купала. Курган 12
Пра паэму 21

У ВЕРШАХ І Ў ПРОЗЕ (23)

Якуб Колас. Ручэй 25
Тарас Хадкевіч. Крынічка *(Урывак)* 27
Васіль Быкаў. Незагойная рана 30
Васіль Зуёнак «З вайны сустрэлі мацяркі сыноў...» 42
Пра пейзаж 44

ЗАГАДКАВАЯ КРАІНА ПАЭЗІЯ (47)

Максім Танк. Паэзія 49
Пра вершаскладанне 50
Максім Багдановіч. Маёвая песня 53
Пра гукапіс 56
Данута Бічэль. Роднае слова 57
Мікола Арочка. Хлеб роднай мовы 58
Еўдакія Лось. Дзяўчаты мінулай вайны 60
Ніл Гілевіч. Маці 61
Пра падтэкст 63
Якуб Колас. Дзядзька-кухар *(Урывак з паэмы «Новая зямля»)* 65
Пра выразнае чытанне паэтычных твораў 74

ЦІКАВАЕ І ЗАХАПЛЯЛЬНАЕ Ў ЗВЫЧАЙНЫМ, ПАЎСЯДЗЁННЫМ. ПРОЗА (77)

Змітрок Бядуля. На Каляды к сыну 79
Пра мастацкую дэталь 87
Іван Навуменка. Настаўнік чарчэння 89

Спампавана з сайта www.aversev.by

Янка Брыль. Урокі пані Мар'і *(Урывак з аповесці «Сірочы хлеб»)* 95
Пра аповед, апісанне, дыялог 132
Уладзімір Шыцік. Лісцік серабрыстай таполі 134
Мікола Лупсякоў. Мэры Кэт 145

ПАЭЗІЯ Ў ПРОЗЕ І ПРОЗА Ў ПАЭЗІІ (161)

Змітрок Бядуля. Шчасце не ў золаце 162
Максім Танк. Дрэвы паміраюць... 164
Алесь Разанаў. «У парку...» 165

МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА, ПУБЛІЦЫСТЫКА І НАВУКА (167)

Цётка. Шануйце роднае слова! 168
Уладзімір Караткевіч. Зямля пад белымі крыламі *(Скарочана)* 172
Зямля мая беларуская 173
Вёска, о родная вёска мая! 173
Просім у хату, госцейкі нашы! 177
Хлеб і да хлеба 181
Каля хаты ў садочку 187
Людзі зямлі беларускай 191
На сумежжы з навукай 200
Знешняя небяспека ў першай палове XIII ст. *(З вучэбнага дапаможніка па гісторыі Беларусі)* 201
Леанід Дайнека. Меч князя Вячкі *(Урывак з рамана)* 203
Уладзімір Караткевіч. Балада пра Вячку, князя людзей простых 225
Пра баладу 228

Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў 231

Спіс выкарыстаных крыніц 236

Спампавана з сайта www.aversev.by

Лазарук, М. А.

Л17 Беларуская літаратура : вучэб. дапам. для 7-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / М. А. Лазарук, Т. У. Логінава, Г. А. Сухава. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2017. — 240 с. : іл.

ISBN 978-985-559-950-1.

УДК 821.161.3.09(075.3=161.3=161.1)
ББК 83.3(4Беи)я721

Вучэбнае выданне

Лазарук Міхаіл Арсеньевіч
Логінава Таццяна Уладзіміраўна
Сухава Галіна Анатольеўна

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА

Вучэбны дапаможнік для 7 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *Г. І. Бандарэнка*
Рэдактар *І. М. Лапанец*
Мастацкі рэдактар *З. П. Болцікава*
Вокладка мастака *А. П. Пратасені*
Мастакі *А. П. Пратасеня, Л. М. Рудакоўская, Г. А. Ламанава*
Камп'ютарная вёрстка *Ю. М. Галавейка*
Карэктары *Д. Р. Лосік, К. В. Шобік, Л. Г. Ганчарэнка*

Падпісана ў друк 06.09.2017. Фармат 70×90 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 17,5. Ул.-выд. арк. 11,7.
Тыраж 130 500 экз. Заказ

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Пасведчанне аб дзяржаўнай
рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/263 ад 02.04.2014. Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

ААТ «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа». Пасведчанне аб дзяржаўнай
рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 2/3 ад 04.10.2013. Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск

Спампавана з сайта www.aversev.by

(Назва і нумар установы агульнай сярэдняй адукацыі)

Навучальны год	Імя і прозвішча вучня	Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні	Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам
20 /			
20 /			
20 /			
20 /			
20 /			
20 /			

Спампавана з сайта www.aversev.by